АНАТОЛЬ РАЗАНОВІЧ

# ПРА ШТО ІГРАЕ ПІЯНІСТ

АНАТОЛЬ РАЗАНОВІЧ

# ПРА ШТО ІГРАЕ ПІЯНІСТ

Аповесці, апавяданні

Мінск
«Беларусь»
2019

УДК 821.161.3-31/-32
ББК 84(4Беи)44
Р17

**Разановіч, А. І.**
Р17 Пра што іграе піяніст : аповесці, апавяданні / Анатоль Разановіч. — Мінск : Беларусь, 2019. — 192 с.
ISBN 978-985-01-1333-7.

Гэтая кніга пра каханне. І да жанчыны, і ў цэлым да жыцця. «Пра што іграе піяніст», «Падае снег», «Чаканне жанчыны» і іншыя творы сведчаць пра тое, што пакуль чалавек жыве, пачуццё кахання ў ім пануе над іншымі пачуццямі і эмоцыямі. Гэта і ёсць тое галоўнае, дзякуючы чаму мы, людзі, былі, ёсць і будзем.

**УДК 821.161.3-31/-32**
**ББК 84(4Беи)44**

**ISBN 978-985-01-1333-7**

© Разановіч А. І., 2019
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2019



# ПРА ШТО ІГРАЕ ПІЯНІСТ

## I

Ён іграў пра каханне. Толькі вось пра якое — былое ці будучае — Андрэй не ведаў. І ведаць нават у гэтыя хвіліны не хацеў. Падпёршы далонню шырокі лоб, уздыбіўшы цёмныя віхрастыя валасы, у якіх ужо прыкметна пракралася сівізна, ён слухаў музыку, у гуках якой сплятаціся чаканні і стрэчы, абдымкі і прызнанні, і нават сваркі, надзеі, крыўды, дараванні...

Музыка, то спакойная і плаўная, то выбуховая і вірлівая, сцінала душу, вырывала яе з грудзей, спрабавала аднесці кудысь далёка-далёка і зноў вяртала назад, у тленнае цела, быццам пераконваючы, што яна служыць чалавеку, але не заўжды падуладная яго жаданням і летуценням. Нават самым запаветным, ужо амаль спраўджаным.

Прымружваючыся, хаваючы вільготную павалоку зеленаватых вачэй, Андрэй слухаў захапляльную музыку з такою

асалодаю і цікавасцю, што яго ахоплівала прага ўзляцець. Усё роўна як, на чым, але ўзляцець... Ды нечакана ўсё гэта змянялася разгубленасцю і няўцямнай, амаль адчайнай тугою, безвыходнасцю, нібы пад ім пачынала раз'язджацца падлога, расці бяздонная чорная яма, у якую вось-вось праваляцца ўсе і ўсё.

Андрэй слухаў доўга. Наколькі доўга — не ведаў: час неяк неўпрыкмет растварыўся і перастаў існаваць. Ён сядзеў за столікам у самоце і нерухома. А перад ім пацiху астывала ў кубачку амаль нечапаная кава, скручвалася і рассыпалася ў попельніцы яшчэ недатлелая цыгарэта, за вялікімі рэстараннымі вокнамі, на набярэжнай, задуменна стаялі тры мажныя чыгунныя статуі-бабы. Яны мясціліся проста перад уваходам у старую, з цёмна-чырвонай цэглы пошту нібы ў чаканні нейкага важнага для іх пісьма. І толькі ўнізе, на ўзроўні падлогі першага паверха двух'яруснай баржы-рэстарана «Барка», шумела і плюскатала ля борта цёмная вада ракі Брда — прытока Віслы. Штосьці было таямнічае ва ўсёй гэтай простай і ўадначас велічнай карціне жыцця, што зачароўвала і вабіла. Але чагосьці ў ёй не ставала.

Калі музыка скончылася, Андрэй убачыў невысокага пажылога музыку, які падняўся з-за піяніна і няспешна, з годнасцю схіліўся ў паклоне. Уважліва агледзеўшы нешматлікую публіку, ён павярнуўся і гэтак жа няспешна пайшоў да дзвярэй, што вялі на стромую лесвіцу, — яна ішла ўніз, на першы паверх, у таксама рэстаранную, толькі трошкі меншую залу. Вузкія плечы музыкі, на якія звісалі доўгія, мяккія і зусім белыя валасы, уся ягоная сутулая, хударлявая постаць выклікалі ў Андрэя жаль. Гэты жаль, няпрошаны і недарэчны, пачаў неўпрыкмет зносіць кудысь нядаўняе захапленне музыкай, як брудная пеністая хваля зносіць адзінокую трэску ад разбітай аб каменне лодкі.

Андрэй пасядзеў яшчэ з паўгадзіны, заплаціў за каву і ў няпэўным настроі выйшаў з баржы-рэстарана.

Над старым польскім горадам Быдгашчам займаўся красавіцкі непрацяглы вечар. Па небакраі, які напалову закрывалі ад людскіх вачэй высокія шпілі старадаўніх касцёлаў і зіхатлівае шкло паверхаў сучасных высотных будынкаў,

каціўся вялікі сонечны шар. Яго няяркія праменні пагойдваліся на вадзе, барвавелі на стогадовых цагляных будынках уздоўж набярэжнай, паблісквалі на голым жалезным чалавеку, што на адной назе прысеў на бясконца доўгім канаце. Прыкметна прагнуты пасярэдзіне канат цягнуўся ад аднаго берага ракі Брда, дзе швартавалася баржа-рэстаран, да другога, на самым краі якога глядзелася ў ваду разгалістая вярба. У адной руцэ жалезны чалавек трымаў доўгі шост, каб не паваліцца, а ў другой — стрэлы ад лука, што вісеў на плячы.

«У каго гэты жалезны чалавек рыхтуецца страляць?» — падумаў Андрэй.

У яго спакваля, потым усё хутчэй і больш рашуча пачала ўлівацца пустата — даўняя і ўжо добра знаёмая яму.

## II

Быдгашч з перарывістым дыханнем назіраў за Андрэем, які пры жоўтым падслепаватым святле адыходзячых у нябыт рэдкіх чыгунных лямпаў і пры яркім бляску новых, падвешаных на тонкіх жалезных слупах люмінесцэнтных свяцільніках, непрыкаяна блукаў па ціхіх вулачках і завулках, выбрукаваных камянямі і бетоннай пліткай, прысаджваўся на лаўкі ля высачэзных старадаўніх касцёлаў і курыў адну цыгарэту за другой. У ягонай душы ўсё яшчэ гучала тая музыка: вірлівая, усёпаглынальная, як набег хваляў. Неўзабаве яна прыціхла, стала далёкай і чужой. І сам ён зрабіўся ціхім, далёкім і чужым. Для горада, рэдкіх прахожых, для самога сябе. Жыццё ягонае нібы засталося там, у баржы-рэстаране, а тут, у горадзе, яго не было. А можа, і было, але блукала па іншых вулках і завулках альбо ціха і непрыкметна сядзела недзе ў паўцёмным скверы.

Андрэй самотна блукаў амаль усю ноч. Думаў пра сябе і пра людзей, сярод якіх жыў: у сям'і, у сваім доме, на рабоце і ў горадзе Пінску, дзе атайбаваўся, тут, у Быдгашчы, куды рэгулярна прыязджаў у камандзіроўку. Андрэй спрабаваў знайсці сэнс ва ўсім, што было, і ў тым, што ёсць. І гэты сэнс нібыта быў у неабходнасці працягу свайго роду Рамашэвічаў, выкананні сваёй работы, жаданні жыць. Але акурат гэтае жаданне блытала дум-

кі, збівала з тропу і зноў вяртала гукі нядаўняй музыкі, у якой разам з радасцю і неабходнасцю быцця настойліва прарывалася сумненне ў мэтазгоднасці цяпершчыны і нават прышласці. Сумненне, у сваю чаргу, спараджала разгубленасць, тугу, безвыходнасць і разам з тым няпэўнае чаканне чагосьці і кагосьці. Ці то добрага, ці то благога — не зразумець...

Пад раніцу, седзячы на лаўцы ля рэчкі, Андрэй задрамаў. Ён ачнуўся, калі веснавое сонца ўжо ўставала з-за ўскраінных гарадскіх новабудоўляў і накочвалася светлымі хвалямі на вялікі каменны горад. Андрэй зірнуў на супрацьлеглы бераг. Ён быў такі блізкі — рака ў гэтым месцы вузілася. Ля самага моста, па схіле, кусціліся густыя невысокія галіны шыпшыны, спрэс абсыпаныя буйнымі барвова-чырвонымі кветкамі, што распусціліся апошнімі днямі. Тут жа, у траве, ляжалі напалову гнілыя, напалову сухія леташнія ягады. У шыпшыне, траве, кветках, нават у апалых леташніх ягадах, якія спакваля перамешваліся з зямлёй і пераходзілі ў яе, было жыццё. Андрэй нібы ўпершыню ўбачыў яго. І яму страшэнна захацелася жыць. Жыць!..

Знячэўку прыгадаліся словы паэта, прачытаныя калісьці ў школе: «Чарвяк я, Бог я...»

Андрэй з палёгкаю ўздыхнуў, падняўся і хутка пайшоў у гатэль.

## III

Вуліца Шубінская, прамая і шырокая, упіралася ў дарогу, што вяла на Варшаву. У канцы гэтай вуліцы месцілася бензазапраўка «Орлен», а насупраць і збоку лесу ацяжэла ўрос у цёмную брусчатку шэры чатырохпавярховы гатэль з нечаканай для ягонага масіўнага выгляду назвай «Ікар». Назва нібы гаварыла сваім кліентам: «Ікар — стварэнне зямное. Лятайце, хто хоча лятаць, але памятайце: вы — людзі».

Андрэй таксама калісьці хацеў лятаць. Скончыў яшчэ савецкае вайсковае вучылішча, атрымаў спецыяльнасць верталётчыка. Адразу ж пасля выпуску маладзенькім лейтэнантам быў накіраваны на службу ў Афганістан. У першым жа баі ягоны

верталёт душманы збілі. На падлёце да Кандагара. Запомнілася толькі яркая ўспышка, страшэнны боль у нагах і нязвычная для верталёта цішыня. А пасля — глухі ўдар, трэск, скрыгат жалеза, працяглы звон, падобны да царкоўнага. А далей — цемень. Апрытомнеў ужо ў шпіталі з напалову адрэзанай левай ступнёй. Далей усё як зазвычай у такіх выпадках: лячэнне, дэмабілізацыя, маленькая пенсія, пошук хоць якой-небудзь работы. Калі знайшоў гэтую самую работу, якую ў народзе ахрысцілі проста і лёгка «купі-прадай», ажаніўся. Стала нібыта лягчэй, весялей удваіх, але зусім не гэтак, як жадалася, марылася. Напэўна, не хапала гэтага самага палёту — лёгкага, захапляльнага, вабнага. Таго самага, пра які марыў калісьці Ікар. І без гэтага палёту Андрэева душа пакутавала і, здаралася, плакала. І сам ён часам плакаў, але без слёз: яны высахлі яшчэ ў шпіталі, калі ўведаў, што чацвёра ягоных таварышаў, гэткіх жа, як ён, маладзенькіх лейтэнантаў, загінулі ў тым першым баі пад зусім чужым для іх афганскім горадам.

Ледзьве Андрэй пераступіў парог гатэля і падышоў да адміністрацыйнай стойкі, як круглатварая, чарнявая пані Ядзя паднялася. Падаючы ключ ад нумара, ветла ўсміхнулася:

— Цо, пан, у кабеты быў?

— Быў, — стомлена, каб не расчароўваць добрую ўсмешлівую пані, прамовіў Андрэй. — Пайду спаць.

— Ох, пан, — пахітала галавой пані Ядзя. — Нема жоны — нема ўправы.

Андрэй няспешна падняўся ў нумар і, не распранаючыся, паваліўся на ложак. Яму, страшэнна стомленаму, хацелася толькі аднаго — спаць.

## IV

У невялікім утульным гатэльным рэстаране Андрэй абедаў у поўнай адзіноце: ужо было каля чатырох гадзін дня і нікога з наведнікаў, акрамя яго, не было. Можа, і з гэтае прычыны есці не хацелася. Ён пасёрбаў крыху супу з флякаў — традыцыйнае польскае стравы, з'еў кавалачак стэйка з цяляціны, выпіў гарачую гарбату і, расплаціўшыся, зноў пайшоў у свой нумар, зноў прылёг на ложак.

Была субота, выхадны, і ніякіх клопатаў не прадбачылася. Паляжаўшы з паўгадзіны, Андрэй уключыў тэлевізар. Пашчоўкаў па каналах, польскіх і еўрапейскіх, аднак нічога цікавага не знайшоў. Выключыўшы тэлевізар, сеў у фатэль, насупраць акна, і пачаў глядзець на лес. Густыя вершаліны высокіх вострых соснаў прыкметна пагойдваліся пад свежым і яшчэ па-веснавому прахалодным ветрам. Удалечыні, на даляглядзе, неба спакваля налівалася густой чырванню.

«На дождж ці на марозік», — без упэўненасці зазначыў Андрэй.

У душы ў яго чынілася штосьці няўцямнае, трывожнае. Як перад навальніцай, якую ён прадчуваў інстынктыўна. Да ўсяго балела сэрца, востра ныла знявечаная ступня. Скрыгатнуўшы зубамі, Андрэй устаў, надзеў джынсы, лёгкую куртку і выйшаў з гатэля.

«Паеду ў горад, — наважыўся ён, — крыху пашпацырую, можа, стане лягчэй...»

Горад сустрэў яго ветла і шумна: яшчэ маленькае, кволае лісцейка дрэў і кустоўя паўставала перад ім у поўнай свежасці і красе; пышна зелянелі, набіраючы сілу, роўныя, яшчэ не стрыжаныя газоны; няспешна прагульваліся шматлікія прахожыя і маладыя пары; прабягалі міма і бесклапотна смяяліся дзеці, смела снавалі ў адзін і другі бок, лагодна сігналячы, аўтамашыны. І нават будынкі, старыя і новыя, проста і дружна злучаліся асветленымі сонцам чырвонымі, шэрымі, жаўтавата-зялёнымі сценамі, утвараючы той своеасаблівы, непаўторны еўрапейскі архітэктурны малюнак, у якім старадаўні касцёл не велічна пазірае на бліжэйшы да яго аднапавярховы прыватны дом, а паблажліва прыхоўвае яго сваім ценем, нібы праганяючы злых духаў.

Нейк адразу зрабілася лягчэй, спакайней. Аціхаў боль сэрца, а ступня, прызвычаіўшыся да хады, пакрысе супакоілася і засвярбела.

Андрэй прысеў на лаўку, незаўважна падняў калашыну, абхапіў пальцамі левую нагу трошкі вышэй чаравіка, з усяе сілы сціснуў. Ступня спачатку знямела, а затым пачала цяплець, размякаць...

«Хораша тут, — падумаў Андрэй. — Хораша...»

Яму падабаўся Быдгашч, цепліла душу польскае нетаропкае і спакойнае жыццё. Не такое, як у Беларусі і асабліва Расіі, небяспечнае і непрадказальнае, з заўсёднымі ўзрушэннямі-катастрофамі і канфліктамі, а мірнае і зусім не беднае. Калі б была мажлівасць — заўстаўся б тут назаўсёды. Зрэшты, нават не мажлівасць, а жаданне: пераехаць з Беларусі ў Польшчу не праблема. Гэта недалёка, ды й мова зразумелая, блізкая. Вывучыць можна хутка. Але да каго пераязджаць, дзеля чаго? Простыя і ўадначас пакутлівыя пытанні. Яны выспявалі ў галаве Андрэя даўно. А ўзніклі яшчэ даўней. Напэўна, у вайсковым шпіталі, калі, перавярнуўшыся ад болю на жывот і абхапіўшы рукамі жалезны ложак, Андрэй спытаўся ў самога сябе: «За што мы ваюем? Хіба мала ў нас, Савецкім Саюзе, сваёй зямлі, мала сваіх багаццяў?..»

Высветлілася, што мала. Мала было тым, хто кіраваў... Да сораму простых людзей і на здзіўленне ўсяму цывілізаванаму свету.

Хваравітыя думкі, з пошукам адказу на сваё пытанне, хоць і нудныя, зусім лішнія ў тыя далёкія гады, зноў нагадалі пра сябе тут, у Быдгашчы.

Андрэй уздыхнуў, закурыў.

Наперадзе, за метраў дваццаць ад яго, купкай таўпіліся модна апранутыя юнакі, пэўна, студэнты. Яны штосьці захоплена абмяркоўвалі, ухвальна ківалі адзін аднаму, усміхаліся. Іх сумкі стаялі побач, ля ног: маладыя людзі нікуды не спяшаліся.

«Пайду я ў рэстаран, на баржу, — сцепануўся Андрэй. — Там музыка, можна не думаць, не задаваць сабе пакутлівых пытанняў, а толькі слухаць...»

У ягонай галаве ледзь чутна, а затым усё гучней і выразней адзываліся гукі вірлівай, хвалюючай музыкі ў выкананні пажылога рэстараннага піяніста, які ў нейкія імгненні, калі яго ўважліва слухаеш, здаецца, іграе не для публікі, а для самой вечнасці.

## V

У рэстаране наведнікаў было мала: вечар толькі-толькі пачынаўся. Андрэй сеў ля акна, бліжэй да сцэны. Заказаў, як звы-

чайна, каву. Маладзенькі хударлявы афіцыянт, які чымсьці нагадваў стараннага курсанта вайсковай вучэльні, тут жа прынёс кубачак водарнага напою.

— Дзенькуе, — кіўнуў Андрэй.

Ён зрабіў некалькі глыткоў, закурыў і пачаў чакаць выхаду пажылога піяніста. Але яго не было. Праз нейкі час выйшла высокая, сухарлявая, з доўгімі цёмна-каштанавымі валасамі жанчына гадоў трыццаці ў шыкоўнай чырвонай сукенцы з глыбокім дэкальтэ. Акінуўшы невідочным паглядам публіку, яна ледзь заўважна кіўнула афіцыянту. Той уключыў магнітафон, і пад ягоную музыку жанчына заспявала меладычную, але тужлівую песню, у якой былі амаль адны й тыя ж словы:

Ніц, напраўду, не паможаш.
Ніц, напраўду.
Ніц, напраўду, не паможаш...

Андрэй не ўсё разумеў, пра што спявала жанчына і хто каму не можа дапамагчы. Але ейны грудны, трошкі дрыготкі голас выказваў трывогу і выклікаў жаль. І таму песня ўспрымалася не розумам, а сэрцам.

— Ніц, напраўду, не паможаш, — на тужлівай ноце скончыла песню жанчына.

Андрэй глытнуў кавы і пачаў пільна глядзець на спявачку: яму падалося, што ён яе ўжо дзесьці бачыў. Можа, нават гаварыў з ёю. Жанчына заўважыла ягоны пагляд, ледзь прыкметна ўсміхнулася, няспешна падышла да яго, спытала:

— Вы рускі, беларус?

— Беларус, — кіўнуў Андрэй. — З Пінска — палескага горада.

— Гэта добра, — задаволена сказала жанчына. — Я сама беларуска і праспяваю для вас. Беларусы ў Быдгашчы, ды яшчэ з Палесся — рэдкія госці.

Яна ўзышла на сцэну, рэзка і патрабавальна кіўнула афіцыянту. Афіцыянт тут жа ўключыў магнітафон, і павіслая было цішыня, нервова здрыгануўшыся, саступіла месца чароўным, знаёмым гукам шчымлівай мелодыі, услед за якой палілася такая ж шчымлівая песня:

Аб чым іграе піяніст...
Спявала музыка, звінела.
У маёй руцэ — кляновы ліст.
Душа сцішалася і млела...

Маладая стройная жанчына нервова сціскала мікрафон тонкімі пальцамі з доўгімі, завостранымі пазногцямі і амаль краналася яго пульхнымі, вогненнымі, пад колер сукенкі, выразна акрэсленымі вуснамі, над якімі мякка і ганарліва быў прыпадняты па-дзіцячы круглявы нос.

Спявачка неадрыўна глядзела на Андрэя: у песні яна нібы звярталася да яго, прасіла дапамогі ці абароны. Андрэй, адчуваючы ейны шчымлівы і роспачны пагляд, міжволі адвярнуўся і ўтаропіўся ў акно. За шыбамі ў жаўтлявым паўзмроку скрушліва і задуменна, у маўклівым чаканні, стаялі тры чыгунныя статуі-жанчыны. Яны таксама чакалі дапамогі.

— Вам спадабалася мелодыя песні? — спытала, ціха падышоўшы, спявачка.

— Чаму толькі мелодыя? — прамовіў Андрэй. — Мне спадабалася мелодыя, спадабаліся словы песні. І...

Ён хацеў сказаць, што спадабалася і сама спявачка, але прамаўчаў.

— Гэта добра, — уздыхнула жанчына і журботна ўсміхнулася. Пастаяўшы, нерашуча спытала: — А да вас можна прысесці?

— Калі жадаеце... Столік вольны, — ужо зусім разгублена прамовіў Андрэй. Ён падняўся, адсунуў ад стала крэсла. — Калі ласка, сядайце.

Спявачка прысела і дапытліва ўгледзелася ў Андрэя. Ён міжволі апусціў вочы долу: яму было ніякавата.

— Закажыце мне віна, — ціха папрасіла жанчына, — калі можна... І сабе.

Андрэй паклікаў афіцыянта, заказаў бутэльку чырвонага «Бардо».

— Такое віно вы п'яце?

— Так.

Андрэй наліў.

— Давайце вып’ем, — спявачка задуменна падняла фужэр. — Вып’ем, вы толькі не здзіўляйцеся, за доўгае чаканне і... І надзею. Добра?

Андрэй на імгненне зазірнуў жанчыне ў вочы. Вялікія, цёмныя, яны нечакана заблішчэлі, і з куточкаў выплылі дзве маленькія, разбаўленыя чорнай тушшу слязінкі.

— Гэта проста так, проста так... Не звяртайце ўвагі, — прамовіла жанчына.

Яна паднесла фужэр да сваіх пульхных вуснаў, хвіліну-другую патрымала яго, быццам вагаючыся, піць ці не піць, і хуценька, з адчаем, асушыла яго да дна.

Андрэй таксама выпіў. Віно падалося яму крыху засалодкім, прытарным.

— Прыходзьце ў наш рэстаран паслязаўтра, — падымаючыся, запрасіла жанчына. — Я выступаю тут цераз дзень. Дзякую вам за размову і за віно.

Сэрца ў Андрэя ўскалыхнулася ад вострага і нечаканага болю. Цьмяная трывога і ўадначас невядомае прадчуванне хуткай сустрэчы з блізкім, даўно чаканым чалавекам пачалі закрадвацца ў яго неспакойную душу.

«Шкада, што сёння не было піяніста», — чамусьці падумаў Андрэй, выходзячы з баржы-рэстарана.

## VI

Цэнтр Быдгашча — старое места. Іншымі словамі, стары горад. Тут, у спляценні вузкіх вулачак і завулкаў, спалучэнні старых цагляных дамоў і вышынных новабудоўляў з бетону і шкла, у цяні высачэзных велічных касцёлаў з крапаснымі сценамі, неглыбокай, звілістай між будынкаў і сквераў ракой Брдой, Андрэй, калі быў вольны, шпацыраваў падоўгу і з асалодаю. Тут ён належаў сам сабе: сваім думкам, жаданням, летуценням. А да ягоных паслуг быў увесь старажытны і прыгожы горад, няспешнае жыццё якога супакойвала і аддаляла ад мітусні. Андрэй зазіраў у шматлікія крамкі, заседжваўся ў невялікіх утульных кавярнях, наведваў рынак, размешчаны ў самым цэнтры горада, з цікавасцю разглядаў усё, што там прадавалася. Было яно звезена практычна з усяго свету. Часта

ён стаяў на плошчы, гледзячы, як кормяць людзі галубоў-буркуноў, пасля сядаў дзе-небудзь на лаўку, падстаўляў твар сонцу і сам сабе ўсміхаўся.

Знаёмства з Быдгашчам, прагулянкі па гэтым старадаўнім і адначасова маладым горадзе ператварыліся для Андрэя ў сапраўдны адпачынак, які, здавалася, аніколі не надакучыць. Але гэтак было напачатку. З кожнай чарговай камандзіроўкай Андрэя ўсё больш вабіла пайсці ў самы цэнтр горада, да вузкага невялікага моста праз раку Брда, ля набярэжнай якой швартавалася баржа-рэстаран. Тут настрой яго мяняўся: спакой і ціхамірнасць знікалі, а душу ахоплівала хваляванне, як бывала перад палётамі на верталёце.

Вечары ў баржы-рэстаране пачалі нагадваць Андрэю тое даўняе, ужо напаўзабытае хваляванне, якое ён зведаў яшчэ ў юнацтве. Гэтыя вечары сталі адхланнем у ягонай працы і нават жыцці — простым, звычайным, але складаным і заблытаным.

Андрэй цяпер ужо знарок больш часу праводзіў у Быдгашчы. Яго неспакойная натура ў польскім горадзе набывала раўнавагу, а колішнія думкі пра багатае і размернае жыццё зводзіліся да сціплага жадання пасядзець у баржы-рэстаране, выпіць філіжанку духмянай кавы і атрымаць асалоду ад узрушлівай музыкі пажылога піяніста, паслухаць у чарговы раз ужо завучаную на памяць песню «Пра што іграе піяніст» у выкананні халоднай, на першы погляд, але добрай і прывабнай беларускай спявачкі, што жыве і працуе ў Польшчы.

«Як мала чалавеку трэба, — думаў Андрэй, седзячы дзе-небудзь на лаўцы ў скверы ці за столікам рэстарана-баржы. — Усяго нейкую драбязінку».

У сярэдзіне красавіка, у чарговы раз прыехаўшы ў Быдгашч, як звычайна надвячоркам, Андрэй уладкаваўся ў гатэль «Ікар» Вячэраць у гатэльным рэстаране не захацеў. Хуценька сабраўся і, не чакаючы гарадскога маршрутнага аўтобуса, узяў таксі.

— У «Барку», — нецярпліва кінуў ён маладому акулярыстаму таксісту.

Нецярпенне ахапіла Андрэя яшчэ ў дарозе да Быдгашча, у экспрэс-аўтобусе з Варшавы, які нетаропка і асцярожна каціўся па роўнай вузкай дарозе.

Праз хвілін пятнаццаць Андрэй пераступіў парог баржы-рэстарана. Нічога не змянілася ў рэстаранных залах ніжняга і верхняга ярусаў «Баркі»: на першым паверсе цямнела дыхтоўная мэбля з суцэльнага дрэва, а на другім — да паслуг наведнікаў стаялі сплеценыя з лазы шыкоўныя крэслы, круглыя, аб'ёмныя столікі, накрытыя шклом, прыцягвалі да сябе ўвагу свяцільнікі з цёмна-бардовымі абажурамі з тоўстай тканіны на сплеценых тонкіх прутках, узвышаліся вазоны ў вялізных гліняных гаршках, зямля ў якіх была закладзена рачнымі і марскімі каменьчыкамі. Сталы і крэслы разгароджваліся невысокімі прыгожымі шырмамі. На сваім месцы сядзеў пажылы музы́ка, стаяла старое, пацямнелае ад часу піяніна, якое, аднак, не страціла з гэтае прычыны свой дзівосны голас.

Андрэй прысеў за столік і чакальным паглядам утаропіўся на піяніста. Той прывітальна кіўнуў і ўдарыў сваімі тонкімі, але моцнымі пальцамі па падатлівых клавішах. Цішыня ў зале гайданулася, расчыняючы прастору для меладычных, але рэзкіх і гучных музычных акордаў. У іх чуліся навальніца, маланка, бег пад праліўным дажджом, шум бурлівай ракі, працяжны крык, падобны на выклік...

Гэта было нешта новае ў рэпертуары пажылога піяніста. Прынамсі, Андрэй слухаў гэтую музыку ўпершыню. У ёй смела падымалася і заяўляла пра сябе вялікае пачуццё кахання, магчыма, апошняга ў жыцці чалавека, што напісаў гэтую музыку, гучаў нейкі пратэст, жаданне на ўвесь голас заявіць пра сябе, бараніць сваё «я».

Андрэй хутчэй здагадваўся, чым разумеў сэнс блытанай думкі і пранізліва-кранальнай — ажно рвала душу — мелодыі, але ён бачыў музы́ку: чымсьці ўсхваляванага, нервовага і, падалося, хворага.

Калі піяніст скончыў, Андрэй падняўся, падышоў да яго. Прыкметна хвалюючыся, шчыра сказаў:

— Я хачу падзякаваць вам за вашу музыку... Шчыра дзякую. Ад усяго сэрца...

— Няварта мяне хваліць, — на чыстай рускай мове сказаў пажылы піяніст, узіраючыся ў Андрэя. — Гэта мая прафесія, мая работа.

— Вы добра гаворыце па-руску, — адчуваючы нечакана рэзкі боль у ступні, паспрабаваў усміхнуцца Андрэй.

— Я нарадзіўся і вырас у Брэсце, — сказаў музы́ка. — Пасля вайны пераехаў у Польшчу. Тут, у Быдгашчы, калісьці жылі мае продкі. Гэта цудоўны горад. Ён жывы і чуллівы, як і людзі, што ў ім жывуць. Не ўсе, вядома, але... — Пажылы піяніст тужліва ўсміхнуўся. — Галоўнае, што горад дае спажыву для творчасці. Я сыграю для вас.

— Дзякую, — пакланіўся Андрэй.

— Сыграю менавіта для вас, — ужо сур'ёзна паўтарыў музы́ка. Вы малады, можа, і не зразумееце, пра што я іграю. Але вам і неабавязкова разумець. Галоўнае — адчуваць. Адчуваць радасць.Так. Радасць заўсёды павінна лучыць людзей. І адчуваць боль. Чужы боль, каб разумець свой і вакольнае жыццё. Гэта няпроста, вельмі няпроста...

Пажылы піяніст змоўк, стомлена апусціў сівую галаву. Праз хвіліну падняў. Вочы ягоныя пры гэтым былі напаўзаплюшчаныя. Тонкі, з невялікай гарбінкай нос шумна ўцягваў задушлівае паветра.

— Нагаварыў я вам. Выбачайце. Ідзіце за свой столік, мне трэба працаваць.

Гэтым разам Андрэй пакінуў баржу-рэстаран расхваляваны: ён прыехаў сюды знайсці спакой, а выйшаў з трывогай, болем, прадчуваннем блізкай бяды.

«Гэта мне за маё жыццё, — нервова і злосна думаў Андрэй. — За тое, што не люблю сваю работу, падманваю жонку, абяцаючы вярнуцца хутчэй, што не хачу жыць на сваёй роднай зямлі, дзе вырас і якая мяне пакуль што корміць... Даруй мне, Божа...»

Андрэй закурыў і няўцямна паглядзеў у шумлівую ваду ракі. Праз нейкі час яму закарцела ўбачыць спявачку і абавязкова пагутарыць з ёй. Пагутарыць проста, па-чалавечы, адкрыта.

Ён з тугою зірнуў на вялікія вокны рэстарана-баржы. Святло ў іх пагасла.

## VII

Уначы Андрэй амаль не спаў: думаў пра сябе, пра сваё жыццё. Зноў і зноў перабіраў у памяці добрае і благое. То ён лічыў,

што добрага было больш, то яму падавалася, што ўсё ж пераважала благое. З гэтымі пакутамі, ужо на самым світанку, заснуў.

Прысніўся Андрэю сон. Кароткі, просты і настолькі рэальны, што пасля яго ён доўга не мог даўмецца: праўда гэта ці начны міраж. А ўбачылася яму ў сне тое, што цалкам магло быць у жыцці. Як быццам ён замест жалезнага чалавека прысеў над ракой Брда на жалезным канаце. Узіраецца ў вокны рэстарана-баржы. Бачыць, як іграе на піяніна пажылы музы́ка, і яго ная рэзкая музыка віхурыцца ў навакольнай прасторы, гойдае канат. Ён разгойдваецца ўсё мацней і мацней. Андрэй ледзьве трымаецца, вось-вось зваліцца. Ім апаноўвае злосць. Ён хутка здымае лук, устаўляе стралу, з сілай нацягвае цеціву, прыцэльваецца ў няўтомнага музы́ку...

«Пусціў я стралу ці не? — прачнуўшыся, доўга і пакутліва думаў Андрэй. — Ён жа мне нічога дрэннага не зрабіў. Ды й не можа зрабіць. Чаму ж я гэтак... Непрыгожа... Вельмі непрыгожа...»

Разбалелася галава. Зноў рэзка заныла, хоць ты крычы, знявечаная ступня, і нібы камень лёг на сэрца. А тут яшчэ зазваніў тэлефон: польскі партнёр па сумесным бізнесе прасіў сустрэцца.

— Добжэ, — асільваючы боль і праганяючы раздражненне, пагадзіўся Андрэй. Хутчэй машынальна, чым усвядомлена, назваў месца спаткання: «Пшыедзь до рэстарацыі ў «Барку», на дзве гадзіны дня, заадно папалуднуем...»

Ён намагаўся гаварыць па-польску, але гаварыў на гэтай мове з памылкамі, бо толькі пачынаў асвойваць яе.

У дзве гадзіны дня чыста паголены, апрануты ў цёмна-шэры касцюм, светла-ружовую сарочку з чорна-чырвоным гальштукам, у чорных чаравіках Андрэй сядзеў ля рэстараннага акна за столікам і чакаў свайго кампаньёна. Той з'явіўся хвіліна ў хвіліну.

— Чэсць, — падняўся Андрэй.

Кампаньён, малады зухаваты паляк у стылёвым джынсавым касцюме, цёмных тонкіх акулярах у залатой аправе, прывітальна схіліў коратка падстрыжаную лабатую галаву:

— Дзень добры.

Ён цёпла паціснуў руку і, блытаючы польскія і рускія словы, заўважыў:

— Я вас длуга не затрымаю. Прошэ пана ўвагі, — паляк адразу ж перайшоў да справы. — Мае нямецкія партнёры просяць дрэва. Не два-тшы вагоны, як было раней, а два-тшы саставы. На месяц. Можна марскім шляхам.

— Цо гэтак шмат? — пацікавіўся Андрэй, звыклы не пакідаць без увагі ў здзелках не толькі істотныя праблемы, але й дробязі, нават калі пытацца пра іх лічылася непрыстойным.

— То не мая справа, — развёў рукамі паляк. — Я толькі ведаю, цо немцы атрымалі заказ на будоўлю велькага аб'екта. Велькага. Мо, у Іраку, а мо, у Югаславіі. Не вем. Мая справа купіць у вас дрэва, а ваша справа пшэдаць мне, калі мы партнёры.

— Ясна.

Андрэй задумаўся: здзелка абяцала быць прыбытковай.

— То добры заказ, — прыкметна хвалюючыся, зазначыў польскі кампаньён, праціраючы квяцістай хусцінкай акуляры. — Бардзо добры. Мы заробім пянёндзаў. Бардзо шмат пянёндзаў.

— Я падумаю, — паабяцаў Андрэй. — Добжэ памыслю: то справа складана. Да пабачэння. Я пазваню.

— У пана вшыстко в пажондку? — насцярожыўся польскі бізнесмен.

— У пажондку, — усміхнуўся Андрэй і дадаў: — Усё ў парадку.

— Добжэ, — падняўся партнёр. — Кеды назад, у Беларусь?

— Не ведаю, — паціснуў плячамі Андрэй. — Тут у мяне яшчэ справы.

— Разумею. — Паляк падаў руку. — До відзэння. Я пайду. Але прашу пана памятаць: бізнес ёсць бізнес, тшэба шыбко працаваць. То добры заказ...

Ён пайшоў. Андрэй застаўся адзін. Ля барнай стойкі стаяў афіцыянт і запытальна глядзеў на яго. Андрэй толькі цяпер успомніў, што абяцаў свайму кампаньёну разам з ім папалуднаваць.

«Што са мной? — падумалася. — Усе нейк апошнім часам наўскасяк, не гэтак, як раней. Старэю, ці што?..»

Андрэю ішоў сорак чацвёрты год, але ўзрост ужо, нягледзячы на прыроднае здароўе, якое пакуль супраціўлялася болю ў ступні і сэрцы, усё ж адчуваўся: калісь стройны, падцягнуты, ён ацяжэў, на лбе пачала прарэзвацца маршчына, усё часцей нагадвала пра сябе забыўлівасць, з'явілася асцярожнасць у словах, учынках, справах. Усё гэта ў апошнія гады, і асабліва месяцы, часцей і часцей адбівалася на ягоным прадаўгаватым, буйным твары.

«Старэю, — са шкадаваннем падумаў Андрэй. — Нікуды ад гэтага не ўцячэш...»

Ён паклікаў афіцыянта, заказаў каву і цыгарэты. І не паспеў афіцыянт адысціся, як у дзвярах рэстарана вырасла высокая стройная постаць спявачкі. Яна была ў белым плашчы, вострамысковых чорных туфлях на абцасах-шпільках, з парасонам-кійком колеру сланowай косці. На шыі жанчыны быў павязаны доўгі, амаль да каленяў, чорны шалік у белы буйны гарошак. Андрэй міжволі падняўся, выцягнуўся па стойцы «смірна», нібы быў не ў цывільным касцюме, а зноў у вайсковай афіцэрскай форме. Жанчына, звычна акінуўшы трошкі рассеяным позіркам пустую залу рэстарана, падышла, прывіталася.

— Добры дзень, — адчуваючы, як разліваецца па целе цяпло, прыветліва прамовіў Андрэй. — Вы прысядзеце?

— А вы тут адзін? — замест адказу спытала спявачка.

— Як бачыце, — нацягнута ўсміхнуўся Андрэй.

— Вып'ем кавы? — ці то спыталася, ці то прапанавала жанчына.

— Так, я ўжо заказаў, — сказаў Андрэй і, павярнуўшыся да афіцыянта, падняў на секунду руку. Афіцыянт зразумеў яго жэст.

Спявачка зняла плашч, павесіла на спінку суседняга крэсла. Для Андрэя яна была ў нязвычных строях: замест сукенкі ў светлым шэрым касцюме, які шчыльна аблягаў і падкрэсліваў яе стройнае цела. У гэтым элегантным касцюме яна здавалася вышэйшай, чым звычайна, крыху паўнейшай і прыгажэйшай.

Андрэй міжвольна залюбаваўся ёю. Жанчына заўважыла гэта, задаволена ўсміхнулася.

— Давайце знаёміцца.

Андрэй нахіліў галаву.

— Андрэй Іванавіч Рамашэвіч. Для вас — проста Андрэй.

— А мяне завуць Мартай. Дарэчы, вы ведаеце, як называецца гэтае месца, дзе стаіць наша «Барка»?

— Не.

— Венецыя. Гэтак паэтычна і з любоўю ахрысцілі яго быдгашцы.

— Цікава.

— Так, цікава... Чым вы займаецеся, Андрэй?

Жанчына глядзела ўважліва, сур'ёзна і, як падалося яму, строга.

— Купляю і прадаю лес, піламатэрыялы. У мяне невялікая фірма. На жыццё хапае.

— А на адпачынак? — крыху какетліва ўсміхнулася жанчына. — Без гэтага нельга.

— Я працую пераважна ў Беларусі, а тут, у Быдгашчы, амаль адпачываю.

— Чаму амаль?

— Пакуль не ведаю.

— Не хочаце ведаць?

— Не хачу, — шчыра прызнаўся Андрэй. — Не хачу, каб не грызлі сумненні: ці правільна жыву.

— Значыць, пакутуеце, — апусціла вочы спявачка.

Яе густыя доўгія вейкі спусціліся на сіняв族тыя, ужо прыкметныя, нягледзячы на маладосць, мяшкі пад вачыма.

Андрэй прамаўчаў.

Афіцыянт прынёс дзве філіжанкі кавы і цыгарэты.

— Дазвольце? — папрасіла жанчына, зірнуўшы на цыгарэты.

— Калі ласка, — Андрэй дастаў запальнічку, — курыце.

Закурыў і сам.

Яны доўга маўчалі, паглядваючы ў акно. За ім ледзь заўважна гайдаўся на доўгім жалезным канаце жалезны чалавек з лукам і стрэламі ў руцэ.

«Уначы я стаяў на канаце замест яго, — прыгадаў свой сон Андрэй, — і хацеў страляць...»

— Вам падабаецца Быдгашч? — нечакана спытала спявачка.

— Але, — прызнаўся Андрэй.

— А мне — не, — сказала яна.

Гэта здзівіла Андрэя.

— Чаму?

— Бо жыццё тут мне вядома да дробязей на шмат гадоў наперад, — тужліва ўсміхнулася жанчына. — Маё жыццё. А гэта, згадзіцеся, ужо нецікава.

Яна, няўмела скамечыўшы цыгарэту, патушыла яе ў попельніцы.

— Аднак хутка вечар. Мне трэба рыхтавацца да работы. Публіка, ведаеце, чакаць не любіць.

— Я застануся і буду слухаць вашы песні, — чырванеючы сказаў Андрэй. — Калі трэба, пачакаю.

Жанчына дапытліва зірнула Андрэю ў вочы, паклала сваю далонь на ягоную руку, мякка сціснула і ціха сказала:

— Не трэба. Ідзіце дадому. А то...

Яна недагаварыла. Паднялася і, ужо адыходзячы, раптам нагнулася, прашаптала:

— Хочаце, я прыеду да вас?

— Да мяне? — Андрэя як варам абліло.

— Да вас, — хуценька прамовіла спявачка, нецярпліва і проста гледзячы яму ў вочы. — Вы дзе спыніліся?

— У гатэлі «Ікар», нумар 157.

— Добра. Я заўтра буду ў вас. А шостай вечара. А цяпер, калі ласка, ідзіце. Ідзіце...

Андрэй, ашаломлены, выйшаў з баржы-рэстарана. Тое, чаго ён унутрана прагнуў, але палохаўся ў гэтым прызнацца нават самому сабе, было гэтак блізка, што захацелася закрычаць ад нечаканага шчасця, а лепш растварыцца ў музыцы пажылога піяніста і разам з ёй узляцець высока-высока ў неба, каб там, у самоце, усвядоміць усё і, можа быць, убачыць прышласць.

## VIII

Назаўтра Андрэй увесь дзень правёў у салодкім і трывожным чаканні. Ён адключыў тэлефон. Не выходзіў з нумара ні

на сняданак, ні на абед. Падоўгу і задуменна глядзеў у акно. За ім, зусім побач, пагойдваліся верхавінкі высозных соснаў. Схіляючыся адна да адной, яны быццам перамаўляліся між сабою: магчыма, перадавалі якіясьці навіны, пляткарылі пра суседак, проста гамანілі аб усім, як гамоняць між сабой блізкія людзі.

Андрэю так хацелася таксама схіліцца да Марты і пагаварыць пра ўсё, што было, што ёсць і што мае быць. Толькі вось з чаго пачаць гэтую гаворку, ён не ведаў. Пра няўдалую вайсковую кар'еру, аб якой марыў калісьці ў дзяцінстве, а пасля ў вучылішчы, гаварыць не было сэнсу: яна абарвалася адразу, пасля вучобы. Пра жонку, з якой жыў ужо больш чым пятнаццаць гадоў, а дзяцей усё яшчэ не займеў, распавядаць было няёмка ды і недарэчы. Пра пошукі работы, цяжкае і доўгае станаўленне на ногі, заробленыя хоць і невялікія, але параўнальна прыстойныя грошы, распавядаць Андрэй не любіў.

«Можа, пачне сама Марта, — з надзеяй падумаў Андрэй, — а я буду пакуль маўчаць і ўважліва слухаць, як слухаю, калі яна спявае. Асабліва сваю любімую песню — песню пра піяніста...»

Прыгадаліся словы гэтай песні. І не проста прыгадаліся, а быццам загучалі ў гатэльным нумары. Спачатку нясмела і ціха, а пасля ўсё гучней, напаўняючы невялікую гулкую прастору шчымлівай і пяшчотнай мелодыяй...

> Сыграй, сыграй жа, піяніст,
> Абрынь тугі салодкай гукі,
> Сыграй, сыграй мой лёс на «біс»,
> Мае спатканні, мае мукі...

«Мае спатканні, мае мукі», — некалькі разоў паўтарыў сам сабе Андрэй, міжволі параўноўваючы сваё жыццё з жыццём Марты, якога ён не ведаў, але чамусьці быў упэўнены, што яна нешчаслівая. Інакш чаму б яна гэтак часта спявала тужлівыя песні...

Калі ў дзверы пастукалі, Андрэй здрыгануўся: «Яна!..»

Падняўся, паправіў на сабе касцюм, гальштук і з дрыжыкамі ў нагах падышоў да дзвярэй. Пастаяўшы, нерашуча адчыніў. Марта, у лёгкай ружовай куртцы, з-пад якой ледзь выглядвала кароткая спадніца, стаяла, глядзела на яго і маўчала. Гэтак доўжылася хвіліны дзве-тры, а можа, і больш.

— Заходзьце, — адступіў нарэшце ад дзвярэй Андрэй.

Жанчына прайшла ў нумар, наблізілася да яго, правяла халоднаю рукою па ягонай гарачай шчацэ і ціха папрасіла:

— Нічога не кажы і ні аб чым не пытайся.

Марта тут жа падышла да акна, завесіла цяжкія шторы і пачала распранацца. Андрэй як укапаны стаяў сярод пакоя і з-пад ілба, крадком, назіраў за яе рухамі. Праз некалькі хвілін яна паўстала перад ім зусім голай. Яе маладое белае цела, якое ў адзенні падавалася хударлявым, было шчодра напоўнена жаночай красою і сілай. Доўгія, роўныя, як у балерыны ногі, цёмная радзімка над самым сэрцам, доўгая шыя, прамыя, густа рассыпаныя па плячах валасы.

Андрэй, праганяючы прэч няёмкасць і сорам, таксама распрануўся. Цяпер ён і Марта стаялі адно перад адным, як, напэўна, калісьці стаялі Адам і Ева, упершыню ўбачыўшы сваю галізну, прыгажосць сваіх цел, жадалі кахання, а пасля, нягледзячы на забарону, спазналі гэтае каханне.

Потым, шчаслівыя і адлучаныя ад усяго навакольнага свету, яны пілі халоднае шампанскае, якое стаяла ў халадзільніку, загадзя купленае Андрэем для гасцей — партнёраў па бізнесе, усміхаліся, але, дзіўна, ні пра што не гаварылі: паўната іх пачуццяў была красамоўней за ўсялякія словы.

Толькі адзін раз, парушыўшы цішыню, Марта спытала:

— Што ў цябе з нагой?

— Раненне. Я ваяваў... У Афганістане, — дабрадушна, не думаючы аб той вайне, адказаў Андрэй.

Між тым мінула гадзіна, другая, трэцяя. Быдгашч засвяціўся начнымі агнямі. Праз ссунутыя шторы гатэльнага нумара праглядваўся белаваты, круглы, пушысты клубок, падобны на надзьмуты дзіцячы шарык. Гэта ярка гарэў ліхтар ля самага акна. У ягоным святле нябачныя стрэлкі часу блізкасці і растані Андрэя і Марты хутка плавіліся і выпарваліся.

## IX

«Ці было гэта ўсё ў гатэлі?» — думаў Андрэй, седзячы на лаўцы ля помніка ахвярам Другой сусветнай вайны. Помнік,

што ўяўляў сабой аб’ёмную кампазіцыю з групай асуджаных на смерць людзей, ужо даўно стаў сумнай часцінкай горада. Спераду са скульптурнай кампазіцыі паўстае жанчына. Валасы яе развяваюцца, рукі раскінуты. Яны закрываюць сабой мужчыну з паднятымі ў смутку рукамі, у адной з іх ён трымае невялікі крыж. Справа ад жанчыны стаіць другая. Яна заклікае да справядлівасці і праклінае забойцаў. Рукі пакутліва прыпадняты і сціснуты. Злева ад яе схіліўся ў жалобе мужчына, над ім, закрыўшы твар рукамі, стаіць другі. З адваротнага боку скульптурнай кампазіцыі заклікальна глядзіць у невядомую далеч маладая маці, а ў ейныя грудзі ўткнулася галавою дзяўчынка, просячы абароны. За скульптурнай кампазіцыяй у беспарадку ляжаць бетонныя блокі з напісанай на іх з двух бакоў горкай і крывавай гісторыяй.

Андрэю ўсё гэта нагадала Афганістан, вайну. Але ён прагнаў прэч гэтыя думкі. Занадта ціхамірна было тут гэтым сонечным днём. Андрэй глядзеў на старую плошчу забрукаваную калісьці ўручную і вышараваным падэшвамі да бляску каменем. Па плошчы шпацыравалі гараджане, але найбольш было турыстаў і дзяцей. Ля ног у людзей мірна буркаталі галубы, смела бралі з рук корм: хлеб, семкі, пірожнае. Галубы прывыклі да людзей, яны не баяліся нават пстрыкання фотаапаратаў, гуду таксі, нечаканых і гучных дзіцячых крыкаў.

Андрэй, падставіўшы твар сонцу, заплюшчыў вочы. «А ці не ўсё роўна, было тое ў гатэлі ці не, — нечакана падумаў ён. — Галоўнае, што мы ёсць: я і Марта... А ўсё астатняе няважна».

Андрэй сядзеў доўга. Нават задрамаў. Ачнуўся ад ціхага, настойлівага голасу:

— Пан, пан, дзень добры.

Ён расплюшчыў вочы. Перад ім стаяла мажная скуластая цыганка сярэдняга веку, ахінутая стракатаю цёплаю хусткаю, нягледзячы на зыркае сонца. Ейная чырвоная, доўгая, у буйны белы гарошак сукенка прыкрывала чорныя стаптаныя туфлі, амаль падмятала фальбонай брукаванку, а зашпіленая на ўсе гузікі бардовая куртка шчыльна абціскала вялікі пукаты жывот.

Цыганоў у Быдгашчы было няшмат. Аціраліся яны пераважна паблізу рынку і тут, на плошчы. Часткова ведалі многія мовы, у тым ліку і рускую.

— Чы пан мне слышы? — спытала цыганка.

— Чую, — адказаў Андрэй.

— У пана баліць сэрца?

— Баліць? У мяне? — трохі здзіўлена перапытаў Андрэй. — Не, юж не баліць.

— Юж можа быць, але баліць, — спагадліва паўтарыла цыганка.

— Можа быць, — задуменна пагадзіўся Андрэй, прыгадаўшы мінулую бурную ноч, стому пасля яе, горкае пачуццё страты, шчымлівае чаканне паўтору палкіх, незабыўных хвілін, гадзін... — А ці можна, пані, прыдбаць лекі ад сэрца?

— Можна, пан, — сур’ёзна сказала цыганка і пранізлівым паглядам абвяла ўсё ягонае разамлелае, а можа, й папраўдзе невылечна хворае цела.

— Іле каштуюць такія лекі? — жартам, але і з пэўнай бояззю перад магчымай ракавой хваробай пацікавіўся Андрэй.

— То каштуе дужа.

— Іле?

— Быць можа, дзесенць, можа, двадзесьце, а можа, і пенцьдзесёнт злотых.

Андрэй дастаў партманет, абыякава перабраў у ім грошы, дастаў пяцідзесяцізлотавую банкноту і падаў цыганцы. Яна тут жа схапіла грошы, схавала кудысь пад куртку:

— Дзенькуе.

Доўга трымала руку пад курткай: ці то грошы хавала больш надзейна, ці то шукала нешта. Нарэшце, выцягнуўшы руку, падала Андрэю нейкае шкельца.

— Прошэ, пан. То лякарства ад сэрца. — Твар цыганкі быў сур’ёзны. — Напраўду.

Аддаўшы лекі, яна павярнулася і хутка, падмятаючы плошчу доўгай чырвонай сукенкаю, пайшла.

Андрэй зірнуў на сваю далонь. Пасярод яе ляжала маленькая шкляная сувенірная кветачка — белая ружа. Яна зіхацела ўсімі сваімі гранямі, нібы жывая...

«Усё было і ўсё ёсць», — з палёгкаю падумаў Андрэй, адчуваючы, як у цела ўліваецца сіла і жаданне жыць доўга, шчасліва і абавязкова з каханай жанчынай.

## X

Пасля Афганістана і працяглага лячэння Андрэя сур'ёзна непакоілі нервы, боль у сэрцы, знявечаная ступня, якая часта ныла, асабліва пры змене надвор'я. Нярэдка ён задумваўся пра смерць. Але яна ўяўлялася яму яшчэ далёкай, ненатуральнай і чужой. Толькі часам, больш начамі, ён выразна адчуваў блізкае дыханне некага страшнага, замагільнага, што ўважліва, падоўгу глядзіць на яго і нечага чакае. У гэтыя хвіліны рабілася сапраўды страшна, нібыта ён зноў ляжаў у вайсковым шпіталі на аперацыйным стале, гатовы да ўсяго.

У сябе дома, у Беларусі, а яшчэ больш у суседняй Расіі Андрэй нагледзеўся на гора ды бяду. Ставіўся да гэтага як да рэальнасці, абавязковага складніка жыцця кожнага чалавека. Тут жа, у Быдгашчы, забыўся на сваё мінулае жыццё і намагаўся жыць па-іншаму, па-новаму: як мага радзей прыгадваў старое, вучыўся дараваць крыўды, не думаць пра падманы, спадзявацца толькі на лепшае. Часам нават заходзіў у касцёл, хрысціўся. Але не па-каталіцку — злева направа, а па-праваслаўнаму — справа налева. Хрысціўся неўпрыкмет, стоячы ля самага ўвахода ў храм ці дзе ў куточку. Прасіў у Бога даравання за свае грахі, маліў Збаўцу скіраваць яго, Андрэя, на шлях існы. Але гэты шлях, пачаты ў Беларусі, не жадаў набываць святасць ці нават адносную бязгрэшнасць, калі такая на зямлі была: Андрэй, купляючы і прадаючы лес, піламатэрыялы, стараўся зарабіць як мага больш. Гэтая цяга да грошай, якія ён мог патраціць таксама лёгка, без асаблівага шкадавання, як і зарабіць, рабілася ці не хваробаю. У сваіх працяглых і частых камандзіроўках Андрэй нярэдка здраджваў жонцы, хоць і рыхтаваўся, але не хацеў мець дзяцей — лічыў, што яны будуць замінаць ягонаму бізнесу. «Рана яшчэ», — казаў ён жонцы, якая з гадамі звыклася з бяздзетнасцю і ўжо сама не хацела абцяжарваць сябе сямейнымі турботамі.

Такое было Андрэева жыццё, яго ўнутраная сутнасць, а значыць, і шлях, які вёў пакуль што невядома куды, да каго, і мог абарвацца ў любы дзень, у любую хвіліну.

Самотна седзячы ў гатэлі, Андрэй ужо звычна глядзеў на пагойдванне верхавінак блізкіх соснӑў. Міжволі згадалася пакутлівае і шчымлівае чаканне Марты ў той першы, блізкі для іх абаіх вечар, што зрадніў іх, яе прыход, распрананне, тугі, трошкі дрыготкі жывот, вонкавая цемень і ўнутранае святло, якое быццам акрыляла яго, Андрэя, і прыўздымала над гатэлем і ўсёй зямлёю.

Вось дык сапраўды супярэчлівая рэч — жыццё! Мала хто распавядае пра яго каму б там ні было шчыра, пра ўсё да драбніц. Нават самым блізкім і родным людзям. Ды ўсё ж надыходзіць, напэўна, такі момант, калі не распавесці пра сваё жыццё, не вывернуць душу — раўназначна хваробе, што прыводзіць спачатку да духоўнай, а пасля і да фізічнай смерці.

Андрэю знячэўку нясцерпна захацелася паспавядацца і распавесці пра сябе Марце. Акурат Марце — жанчыне, без якой, адчуваў Андрэй, ён ужо не зможа жыць. З гэтым нечаканым і моцным жаданнем зноў згадаліся словы шчымлівай песні ў яе выкананні:

> У руцэ дрыжыць кляновы ліст,
> Нібыта ветразь без прычала.
> Сыграй, сыграй жа, піяніст,
> Як я кахала, як чакала.

Андрэй хуценька сабраўся і паехаў у «Барку». Рэстаран-баржа ўжо свяціўся жоўтымі вокнамі. Па яго чырванаватым жалезным даху бегалі белыя зайчыкі — блікі святла ад недалёкага яркага шчыта, на якім рэкламаваўся тэлевізар «Соні» апошняй мадэлі. Не заўважаючы яго, адзінока і непрыкаяна стаяў жалезны чалавек на драцяным канаце з лукам і стрэламі. Ён цярпліва ўзіраўся ў цемень далечы. У ёй, далёка-далёка, у прасвеце цяжкіх аблокаў, вымалёўваўся чыйсьці знаёмы твар...

Андрэй не зайшоў, а, падскокваючы ад калючага болю ў ступні, амаль убег у рэстаран. Сеў за столік ля акна побач з высокім густым вазонам, адразу за шырмай, каб не ўбачыла Марта. Але яе не было. Замест Марты на сцэну выйшаў пажылы піяніст. Ён акінуў позіркам залу, сеў за інструмент і, нязвычна

для Андрэевага вуха, зайграў ціха і плаўна. Андрэй паклікаў афіцыянта, спытаў:

— Цо, пані спявачкі дзісяй нема?

— У пані болі глова, — суха сказаў афіцыянт і стаў чакаць заказу.

«Болі глова, — падумаў Андрэй. — Чаму ж у яе баліць галава?»

Яму стала шкада Марты.

«Гэта я вінаваты. Лепш бы ў мяне балела...»

— Прынясіце мне кавы і шклянку гарэлкі, — заказаў Андрэй і раздражнёна паўтарыў: — Каву і шклянку гарэлкі.

Афіцыянт здзіўлена паглядзеў на Андрэя, неяк нерашуча павярнуўся і паволі пайшоў па заказ.

Музыка, нетаропкая, мяккая, неахвотна і нясмела парывалася ў глыбіню рэстараннай залы, але тут жа вярталася назад, да сцэны, на якой цьмяна паблісквала старое піяніна і ў дрыготкім прыцемку бялела і нервова торгалася зусім сівая галава піяніста, нагадваючы сабою пушысты ваўняны клубок, якім здаваўся ліхтар праз захінутыя шторы той бурнай і грэшнай ноччу. Ноччу, што надышла тады гэтак жа нечакана, як нечакана ён, Андрэй, убачыў тут Марту.

«Гэта вальс», — слухаючы лёгкую, паветраную музыку, здагадаўся Андрэй. Яму згадалася тая ноч. Ён нават задыхаў цяжка, похапкам, быццам не сядзеў за столікам, а бег да яе, Марты, якую хацеў бачыць, чуць, зноў і зноў кахаць.

«Божа, як мала чалавеку трэба, — каторы раз падумаў Андрэй. — І як шмат, — міжволі бліснула ў галаве. — А й сапраўды шмат...»

Калі афіцыянт прынёс каву і гарэлку, Андрэй цяжка ўздыхнуў, узяў паўнюткую шклянку і, не адрываючыся, выпіў. Хацеў быў запіць выпітае кавай, але яна была гарачая і чамусьці нясмачная.

Андрэй закурыў. Музыку ён больш не слухаў. Сядзеў, звесіўшы галаву, падрэмваў.

Перад закрыццём рэстарана, калі наведвальнікі ўжо амаль усе сышлі, за столік да Андрэя падсеў піяніст.

— Пан хоча быць п'яны? — спытаўся.

— Хачу, — сказаў Андрэй. — Мне блага.

Пажылы музы́ка ўздыхнуў, паглядзеў у акно, за якім усё гэтак жа маўкліва, непарушна стаялі тры чыгунныя статуі-бабы, і сказаў:

— Калі маладому здароваму мужчыне дрэнна — значыць, да яго прыйшло каханне. Гэта вялікае пачуццё, асноўны інстынкт чалавека. Гэты інстынкт вышэй за ўсё, мацней страху самой смерці. І прыкладаў, якія пацвярджаюць гэта, вельмі многа. Ведаеце, у Другую сусветную вайну ў Польшчы быў страшны выпадак. І хто ведае, ці адзін... Дык вось, тады савецкі салдат закахаўся ў маладую прыгожую палячку. Простая, звычайная гісторыя, калі б, вядома, не вайна, будзь яна праклятая... Каханне гэта было хуткім і вельмі моцным. Вайсковая дывізія гэтага салдата наступала, з ёй трэба было ісці яму наперад, на Нямеччыну, а ён без дазволу камандзіра двое сутак са сваёй каханай на хутары мілаваўся. Што было рабіць яго камандзіру? Ён даў загад салдата знайсці. Калі знайшлі, тут жа вывелі ў поле і расстралялі. Нічога яму не дапамагло: ні словы раскаяння, ні горкія слёзы і просьбы маладой і ўжо цяжарнай палячкі...

Вочы музыканта ўзмакрэлі. Ён уздыхнуў яшчэ цяжэй, пасля чаго спытаў:

— Хочаце, я сыграю для вас?

— Хачу, — выдыхнуў Андрэй, хоць насамрэч яму было ўсё роўна: Марта не прыйшла, а без яе музыка падалася ў гэты вечар нейкай асірацелай і нават лішняй.

Піяніст сеў за інструмент, і мелодыя, знаёмая, родная, тужлівая паплыва па вялізнай рэстараннай зале. Яна кружылася вакол Андрэя, працінала наскрозь, хапала за душу, вырывала яе з цела і спрабавала знесці туды, дзе спакой і воля, паразумеласць і любоў. Не хапала толькі слоў:

У руцэ дрыжыць кляновы ліст,
Нібыта ветразь без прычала.
Сыграй, сыграй жа, піяніст,
Як я кахала, як чакала.

Сыграй, сыграй жа, піяніст,
Хай запалоняць залу гукі.

Сыграй, сыграй мой лёс на «біс»,
Мае спатканні і разлукі...

Скончыўшы іграць, музыка зноў падышоў да Андрэя. Прысеўшы, паклікаў афіцыянта:

— Вудкі мне.

Маладзенькі афіцыянт яшчэ больш здзіўлена паглядзеў на пажылога піяніста, чым перад гэтым глядзеў на Андрэя, і яшчэ больш нерашучым марудлівым крокам пайшоў выконваць заказ. Вярнуўся толькі праз хвілін дзесяць-дванаццаць. Асцярожна паставіў на столік няпоўную чарку гарэлкі.

— Дзенькуе, — неяк стомлена прагаварыў піяніст.

Ён узяў чарку, паволі выпіў, паставіў і, нахіліўшыся да Андрэя, ціха сказаў:

— Я хутка памру.

Андрэй, ужо крыху п'яны, ад такой шчырасці тут жа працверазеў. Яму зрабілася няёмка, сорамна за свае паводзіны, за нясцерпнае жаданне неадкладна ўбачыць Марту, зноў кахаць яе.

— Чаму вы кажаце гэта мне? — амаль шэптам, адчуваючы, як язык робіцца шурпатым, непаваротлівым, спытаў Андрэй.

— Чалавек павінен пра гэта каму-небудзь сказаць. Абавязкова павінен сказаць. Інакш ягоная душа пасля смерці цела можа ніколі не адарвацца ад грэшнай зямлі.

Пажылы музыка глядзеў проста ў вочы, не міргаючы.

— Але чаму мне?

Піяніст няспешна і цяжка прамовіў:

— У мяне мала сяброў. Вельмі мала. Папраўдзе іх ужо амаль няма. Мяне таксама неўзабаве не будзе — узрост. У дадатак я сур'ёзна хворы. Але вы не палохайцеся, — пажылы музыка іранічна і крывавата ўсміхнуўся, — мая хвароба вас аніякім чынам не закране. Я не заразны. А чаму сказаў пра гэта вам, не ведаю... Забудзьце, калі вам гэта непрыемна ці калі вы думаеце, што мая шчырасць прынясе вам непрыемнасць. Забудзьце...

— Напэўна, вы не баіцеся смерці, — падумаўшы і супакоіўшыся сказаў Андрэй.

— Не, не баюся, — пахітаў сівой галавой музыка. — Але

я люблю жыццё і не хачу гэтак хутка пакідаць яго. Прынамсі, не спяшаюся. Ды й не маю права. Пакуль што не маю права...

— Я разумею, я ваяваў у Афганістане, — шчыра прызнаўся Андрэй. — Бачыў смерць і сам ледзь не памёр. Я не баяўся смерці. Мне было толькі шкада сваіх бацькоў, якія маглі мяне страціць. Для іх гэта была б трагедыя.

— Так-так, гэта праўда, — ускінуў галаву пажылы піяніст. — Вы добры чалавек, не разбэшчаны, ведаеце, што такое абавязак перад блізкімі людзьмі... Я адразу гэта зразумеў.

— Не-не, — запратэставаў Андрэй. — Гэта не так. Я прадпрымальнік, купляю ў адных, прадаю другім. Часта завышаю цану на свае тавары, стараючыся зарабіць болей. Значыць, падманваю. Вось... — Ён з горыччу, шумна ўздыхнуў. — І сябе падманваю...

— Гэта жыццё, — памаўчаўшы, разважліва сказаў піяніст. — Звычайнае, простае жыццё. Папраўдзе жыццёвая мітусня. Сапраўдны падман — гэта не гандаль, не. Гэта калі прадаеш самае дарагое, калі спрабуеш узяць тое, што табе не належыць. Гэта падман, гвалт, крадзеж, грэх... Так, грэх...

Пажылы музы́ка адкінуўся на спінку крэсла, заплюшчыў вочы і быццам заснуў. Андрэй сядзеў моўчкі, баючыся паварухнуцца. Нарэшце піяніст расплюшчыў вочы, незаўважна паглядзеў на Андрэя, паволі падняўся:

— До відзэння, пан.

Ледзь-ледзь хістаючыся, ён пайшоў да дзвярэй. Яго прыгорбленая спіна ў гэтую хвіліну выправілася і не выклікала жалю.

Андрэй выпіў астылую каву і таксама накіраваўся да дзвярэй. Ужо на набярэжнай ён прагавіта ўдыхнуў свежае паветра і няспешна пайшоў у гатэль. Усю дарогу яму здавалася, што паперадзе яго ідзе прыгорблены пажылы музы́ка. Праўда, у начной цемры, якая нясмела кружыла між ліхтароў, ён быў амаль нябачны.

## XI

Андрэй яшчэ спаў, калі ў дзверы ягонага нумара пастукалі. Спачатку ціха, пасля гучней, настойлівей. Ён падхапіўся,

апрануў спартыўны касцюм, адчыніў дзверы. Перад ім стаяла пані Ядзя.

— Дзень добры, — прывіталася яна. — Прошэ пана до тэлефона. Шыбко.

«Хто гэта? — недаўменна падумаў Андрэй і хуценька, падскокваючы ад кальнуўшага ў ступню болю, пайшоў услед за пані Ядзяй. — Можа, з Мартай ці дома, у Пінску, што здарылася...»

Унізе на адміністрацыйнай стойцы ляжала трубка, знятая з апарата.

— Прошэ, — кіўнула Ядзя.

Андрэй узяў трубку асцярожна, з унутранай бояззю перад невядомасцю.

— Слухаю.

— Гэта я, — пачуўся ціхі і ўстрывожаны голас Марты.

Андрэй разгублена маўчаў.

— Гэта я, Марта, — паўтарыла яна.

— Так, я слухаю, — ажывіўся Андрэй. — Слухаю, — паўтарыў ён, баючыся, што Марта можа пакласці трубку. — Што здарылася?

— Я прыеду да цябе. Праз паўтары-дзве гадзіны, — замест адказу сказала Марта. — Нікуды не едзь і не сыходзь. Прашу цябе.

Голас яе дрыжэў. Андрэю падалося, што яна плакала.

— Добра, добра, я чакаю, — выдыхнуў ён у трубку, усё трымаючы яе ля вуха, хоць ужо чуліся кароткія гудкі.

Пані Ядзя асуджальна зірнула на Андрэя і стала вывучаць нейкую паперыну.

— Дзенькуе, — не забыўся сказаць Андрэй і, азадачаны, пайшоў у нумар, прысеў на ложак, задумаўся: «Можа, на працы што ў Марты. У наш час усё можа быць: звольняць і дзякуй не скажуць...»

Андрэй памыўся, пагаліўся, пазваніў свайму польскаму партнёру, папрасіў адмяніць сустрэчу і пачаў чакаць Марту. Яна не зайшла, а ўляцела ў нумар. Скінуўшы плашч, прысела на ложак і дрыготкім блытаным голасам паведаміла:

— Мой муж сёння раніцай сказаў, што будзе прасіць у мяне разводу.

Андрэй, не зусім разумеючы сэнс ейных слоў, легкадумна спытаў:

— А хіба ты замужам?

Марта паглядзела на Андрэя асуджальна:

— Я ж казала табе, што замужам. Тады, ноччу.

— Не памятаю, — прызнаўся Андрэй. — Прабач.

Ён нервова захадзіў па пакоі, асэнсоўваючы сказанае. «Гэта добра, добра, — пакуль цьмяна ўсё ўсведамляючы, думаў Андрэй. — Значыць, я магу ажаніцца з ёю. Так, ажаніцца...»

Андрэй запыніўся насупраць Марты, прысеў на калені і, пяшчотна абдымаючы ногі, аддана гледзячы ў вочы, прамовіў:

— Я таксама развядуся са сваёй жонкай, і мы будзем разам. Мы пажэнімся.

Марта нейкі час маўчала, пасля, цяжка ўздыхнуўшы, тужліва сказала:

— Ты не разумееш. Я беларуска і тут, у Быдгашчы, чужая. Я жыву ў доме свайго мужа, на ягоныя грошы. У рэстаране я зарабляю капейкі і спяваю там дзякуючы мужу. Спяваю не свае, а чужыя песні. Пераважна гэта песні латвійскай спявачкі Лаймы Вайкуле. Гэта мой муж уладкаваў мяне ў рэстаран. Калі мы развядзёмся, я страчу ўсё: жыллё, працу, грошы. Нават цябе. Цябе... Мы не зможам больш бачыцца.

— Зможам, — усхваляваўся Андрэй. — У мяне ёсць грошы. Невялікія, але ёсць. Нам хопіць. Мы купім у Быдгашчы кватэру і будзем жыць... Я так вырашыў. Зараз... Ты паможаш мне ў гэтым, паможаш.

— Гэта праўда? — недаверліва спытала Марта. — Праўда, што ты ажэнішся са мною і купіш для нас кватэру?

— Хоць сёння, — рашуча сказаў Андрэй.

— Але табе могуць не прадаць, — ужо дзелавіта прамовіла Марта. — Ты не грамадзянін Польшчы, у цябе, як я зразумела, тут няма сваёй фірмы.

— Гэта не праблема. Я куплю кватэру на тваё імя, — радуючыся, што знайшоў выйсце са становішча, сказаў Андрэй. —

Хутчэй разводзься. І з сённяшняга дня шукай кватэру. Добрую, прасторную. Пажадана ў цэнтры, паблізу ад ракі.

Твар Марты пасвятлеў, у вачах паявіўся бляск. Яна нахілілася да Андрэя, з удзячнасцю прыціснула ягоную галаву да сваіх грудзей, пасля павабіла да сябе, на ложак...

Замест начнога ліхтара ў акно зазірала ранішняе сонца. Яно весела і іранічна ўсміхалася, міжволі назіраючы за тым, што дзеелася, і ведаючы, што будзе заўтра.

— Прыходзь увечары ў «Барку», я буду спяваць, — развітваючыся запрасіла Марта. — Буду спяваць для цябе. Толькі не спазняйся, а то мне чамусьці боязна.

Адыходзячы, яна запісала нумар Андрэевага мабільнага тэлефона і пакінула яму свой.

## XII

Напэўна, гэта быў самы радасны і шчаслівы вечар у жыцці Андрэя, калі яму здавалася, што яшчэ трошачкі — і ён узляціць. Як Ікар.

Марта выйшла на сцэну баржы-рэстарана ў той самай чырвонай сукенцы з глыбокім дэкальтэ. Яе пульхныя вусны палалі. На грудзях прыкметна паблісквала загадкавым бляскам срэбная ружа. Андрэй, убачыўшы яе, прыгадаў скуластую цыганку, ейны падарунак — маленькую шкляную кветачку. Усміхнуўся і паглядзеў на Марту. Яна кіўнула афіцыянту, і з магнітафона пачуўся рэзкі звон гітары, дружна зазвінелі званочкі, надрыўна грымнуў барабан...

Марта, прыціснуўшы левую руку да свайго бядра, падалася ўперад, да трошкі аддаленага мікрафона, які трымала ў правай руцэ, і рашуча заспявала:

Як раньш, танцуе Кармэн.
Звіняць залатыя струны.
Ах, як жа яна танцуе,
Трывожыць спакой лагуны.

Нядбала, як звон манеты,
Стрыжэ ў тумане нагамі.
Бы клінкі скрыжаваліся
Над целам тваім цыганскія.

Марта ва ўсе вочы глядзела на Андрэя. Яна, як і абяцала, спявала яму. Толькі яму. Адчайна, моцна, з надрывам у голасе. Але не з тым звычайным і тужлівым, а з іншым, што падкрэсліваў шчырасць слоў, гаварыў пра пяшчотны і выбуховы характар гераіні песні, вабіў і адштурхоўваў, зноўку клікаў...

Як раньш, танцуе Кармэн,
Ды толькі няма ёй пары.
І сумна мігцеюць трубы,
І струны п'янкой гітары...

«І струны п'янкой гітары», — паўтарыў сам сабе Андрэй. Яму хацелася падняцца, падбегчы да Марты і пусціцца з ёю ў скокі. Хай усе бачаць, ведаюць, што яны кахаюць адно аднаго, што яны заўсёды будуць разам. Нават у смерці...

Зухаватасць, бляск, грацыя, безагляднасць віхурыліся ў музыцы. Яе хуткі тэмп мог узбадзёрыць, захапіць любога, нават старога чалавека, калі б ён выпадкова забрыў сюды. Голас Марты, моцны і насычаны, працінаў наскрозь, як гарачка і як мароз...

Як раньш, танцуе Кармэн
Паэму бяссонных ночак.
І сотняй яркіх спаднічак
Не схаваць ейных ножак.

Ах, як жа яна танцуе,
Бянтэжачы сум лагуны.
Цыганы клінкі крыжуюць,
Звіняць залатыя струны.

Публіка ў рэстаране, забыўшыся на пітво і ежу, нават на сябе, зачаравана глядзела на вабную спявачку, слухаючы ў ейным натхнёным выкананні палымяную песню, у якой была весялосць, але гучалі ноты смутку і адчаю.

Як раньш, танцуе Кармэн,
Ды толькі няма ёй пары,
І сумна мігцеюць трубы,
І струны п'янкой гітары.

Лірычныя, жалобна-трагічныя гукі музыкі падымаліся ўсё вышэй і вышэй, выляталі праз напаўадчыненыя вокны на волю. А разгарачаны твар Марты, яе вогненныя вусны, уся

ейная постаць ірвалася да яго. Ён, адчуваючы гэта, навальваўся грудзямі на стол і паволі падаваўся да Марты. Ледзьве яна скончыла спяваць, як наведнікі баржы-рэстарана ўсе як адзін падняліся і гучна, дружна запляскалі ў далоні. Ускочыў на ногі і Андрэй і, не звяртаючы на прысутных увагі, закрычаў, быццам быў на канцэрце Марты:

— Брава!..

— Брава, брава!.. — падхапілі астатнія наведнікі рэстарана.

Андрэй быў па-сапраўднаму шчаслівы і глухі да ўсяго і ўсіх, акрамя Марты і песні, праспяванай як у першы і, можа быць, у апошні раз.

Вярнуўшыся ў гатэль, Андрэй зноў доўга не спаў: перад ім стаяла Марта і спявала. Ён глядзеў на яе выразныя, бліскучыя ў паўзмроку вусны. Вось толькі слоў песні ўжо разабраць не мог. Спрабаваў успомніць, ды ніводзін радок не прыходзіў на памяць. Гэтак і заснуў.

## XIII

Некалькі дзён Андрэй хадзіў пад уражаннем выступлення Марты ў баржы-рэстаране. Тым вечарам ён канчаткова зразумеў, што закаханы ў Марту. Яму вельмі хацелася падзяліцца гэтай радасцю хоць з кім-небудзь. І ён вырашыў распавесці пра сябе і Марту пажылому піяністу.

«Пайду сёння ў «Барку», ён павінен іграць. Марта сказала, што ўвечары не будзе спяваць: у яе зноў разбалелася горла».

Андрэй прыгадаў, як яны пілі ў першую ноч сваёй блізкасці халоднае шампанскае, і ўсміхнуўся: «Гэта мінецца. Марта паправіцца і зноў будзе спяваць. Пра піяніста, пра Кармэн, іншыя песні...»

Увечары ён сядзеў у баржы-рэстаране за столікам і чакаў піяніста. Пажылы музы́ка спазняўся. Нарэшце ён паявіўся і, ні на кога не гледзячы, сеў да інструмента, гучна і адчайна ўдарыў па клавішах. З піяніна вырваўся стогн, і цяжкім працяглым уздыхам загучалі рэзкія і нервовыя гукі музыкі. Андрэй адчуў іх вастрыню і боль. Ён убачыў, як уздрыгваў, у імгненне падымаючы і апускаючы рукі, піяніст. «Напэўна, — падумаў

Андрэй, — пажылы музы́ка з горыччу і адкрытасцю распавядае пра сябе, пра сваіх знаёмцаў, нязбытныя жаданні, наогул, пра жыццё, мінулыя і цяперашнія падзеі».

Так гэта ці не, Андрэй пэўна не ведаў, але са спачуваннем да піяніста слухаў музыку, схіліўшыся над сталом і падпёршы галаву далонню.

«Радасць агульнай не бывае, — прыгадаліся Андрэю чыесьці словы, — як і гора... Не, я ні аб чым музы́ку распавядаць не буду. Пакуль што не буду...»

Пад канец вечара пажылы музы́ка моўчкі падсеў да Андрэя за столік. Апусціўшы галаву, скрыжаваўшы пальцы, ён быццам нечага ці некага чакаў. Андрэй не вытрымаў, спытаў:

— Пан віп’е?

Музы́ка падняў галаву, уважліва паглядзеў на Андрэя і ціха, з тугою, сказаў:

— Пан не будзе больш піць. Нельга.

Андрэй сціснуў зубы, правёў пецярнёй па нервова задрыжэўшым горле.

— А вы можаце выпіць, — прамовіў пажылы піяніст. — Вам — можна. — Падумаўшы, дадаў: — Вам пакуль што можна ўсё — вы маладыя, здаровы...

Андрэй нічога не сказаў: словы вязлі недзе ўсярэдзіне.

— Я, напэўна, вам замінаю? — глуха спытаў музы́ка.

— Не-не, — Андрэй нават прыўстаў, узяў руку пажылога піяніста, сціснуў. — Сядзіце, калі ласка. Я закажу кавы ці проста пасядзім, а калі хочаце, дык пагамонім за жыццё. У нас, у Беларусі, гэта называецца так.

Музы́ка ўдзячна ўсміхнуўся, няспешна, цераз сілу, загаварыў:

— Дзякую. Беларусь — добрая краіна. Але людзі ў ёй занадта цярплівыя, нерушачыя, і таму многа бедных. Уся гэтая дастаеўшчына, адвечнае пытанне «Што рабіць?» — ад гэтай самай беднасці, а нярэдка і ад безвыходнасці. Я ўжо стары чалавек, для вас нават дзед, таму ведаю, адчуваю гэтую беднасць і безвыходнасць.

— Што ж рабіць? — Андрэй нечакана, сам таго не жадаючы, задаў тое ж самае адвечнае пытанне.

Піяніст зноў уважліва, але гэтым разам, як падалося, злосна паглядзеў на́ Андрэя і з раздражнёнасцю адказаў:

— Багацець. Духоўна і матэрыяльна. Гэта адзінае выйсце.

Пажылы музы́ка задумаўся, паглядзеў у сцямнелае ўжо акно.

— Я казаў вам, што нарадзіўся і вырас у Брэсце. Ведаю Беларусь, а таксама Расію, Украіну, Казахстан, Прыбалтыку, Арменію. Ведаю, бо ў свой час аб'ездзіў амаль увесь Савецкі Саюз — выступаў. Папраўдзе музіцыраваў. Многа пабачыў. Але тады я не цікавіўся палітыкай. Я ведаў толькі сваю музыку. І іграў добра. Мяне паважалі і нават любілі многія. Можа, і цяпер яшчэ памятаюць. Ведалі пасля і ў Еўропе. Я мог бы жыць у Празе, Берліне і нават Парыжы. Але я выбраў Быдгашч — тут пахаваны мае дзяды, бабулі, многія сваякі і сябры.

— А бацька, маці? — спытаў Андрэй.

— Бацькі памерлі. — Музы́ка закрыў дрыготкімі рукамі твар і гэтак сядзеў хвіліны дзве-тры. — Бацька і маці загінулі ў канцлагеры Майданак.

Усярэдзіне ў Андрэя пахаладзела, усё цела ацяжэла, пачало ціснуць на знявечаную ступню.

— Даруйце, я не ведаў.

— Старайцеся ніколі не прабачацца, — тужліва і павучальна сказаў пажылы піяніст. — Гэта няцяжка, калі не рабіць памылак. — Ён уздыхнуў. — Толькі вось не рабіць іх можна, мусіць, толькі на нябёсах. Прынамсі, трэба старацца рабіць іх як мага менш.

— Вы зараз гаворыце не для некага, а як быццам для сябе, — заўважыў Андрэй. — Я вам не суддзя.

— Гэта добра, што вы думаеце, заўважаеце, — прамовіў музы́ка. — Значыць, у вас ёсць душа і я не памыліўся, калі сказаў, што вы не разбэшчаны чалавек.

— Вам відней, — пацiснуў плячыма Андрэй. — Я жыву так, як мне дазваляюць абставіны.

— Не, як дазваляеце вы сабе самі, — удакладніў піяніст. — Але досыць размоў. Я стаміўся, ды і вам час адпачываць. Да пабачэння. Спадзяюся, мы яшчэ пагамонім.

Ён цяжка падняўся і пайшоў на выхад. Андрэй закурыў, задуменна гледзячы ў акно. Насупраць чырванела пад яркім бляскам ліхтароў старая польская пошта. Ля ўвахода ў яе адзінока стаяла нейкая жанчына ў белым плашчы. «Марта!» — мільганула ў Андрэя ў галаве. Ён паўзіраўся: «Не, не яна...»

Затушыўшы цыгарэту, паклікаў афіцыянта, расплаціўся за каву.

— До відзэння.

## XIV

Неабходна было абдумаць сваё далейшае жыццё, якое прымала рэзкі і досыць небяспечны, хоць нібыта і добра бачны паварот.

Пасля ранішняй бізнес-сустрэчы з заказчыкамі лесу немцамі, што прыехалі ў Быдгашч, з якімі Андрэй, нягледзячы на незадаволенасць і пэўную асцярогу польскага партнёра, вырашыў пазнаёміцца асабіста, ён, усцешаны дзелавой гаворкаю, падумаў, што няблага было б пабыць сам-насам у лесе, які сцяной стаяў адразу ж за гатэлем.

Паабедаўшы, Андрэй апрануў спартыўны касцюм і пакіраваў да высокіх стромкіх соснаў. Яны сустрэлі яго, як падалося, незадаволеным шумам. Але толькі ён зрабіў некалькі крокаў, як шум сціх. Андрэй спыніўся сярод невялікай паляны, агледзеўся. Вакол яго буяла разнатраўе, цягнулася да цёплага сонца кустоўе малін, ажын, чарніц. У суседстве з соснамі раслі тонкія бярозы, уздымаліся дужымі стваламі дубы. «Як дома», — адразу ж падумалася Андрэю.

Сэрца ў Андрэя сціснулася ад любові і горычы, захацелася дадому. Гэтае пачуццё было вострае і моцнае, але доўжылася яно кароткі час: смолкае паветра супакойвала нервы, расслабляла цела. «Свежа тут, хораша, — ужо цвяроза разважыў Андрэй, — усё знаёмае, нібы блукаў па гэтых мясцінах неаднойчы. Калі застануся ў Быдгашчы, буду прыходзіць сюды. Тут пахне домам...»

Андрэй нібы наяве ўбачыў сваіх бацькоў: сівога каржакаватага бацьку са строгім паглядам ясных, нягледзячы на ўзрост,

шаравата-зялёных вачэй, распаўнелую з гадамі, добрую і спагадлівую маці з гладка зачэсанымі назад, як у маладосці на старой фатаграфіі, чорнымі валасамі. Бацькі ўсё жыццё практычна бязвыезна пражылі ў сваёй вёсцы, працавалі ад цямна да цямна і лічылі найбольшым шчасцем тое, што ёсць хлеб і няма вайны. Для жыцця ім трэба было мала, зусім мала. Напэўна, гэта і ёсць мудрасць.

Прыгадалася Андрэю жонка Людміла. Яна нібы стаяла перад ім і журботна глядзела на яго: невысокая, яшчэ маладая, але прыкметна распаўнелая жанчына з каротка падстрыжанымі аржанымі валасамі, якія густой грыўкай спадалі на мутнавата-блакітныя пакорлівыя вочы. Усё-такі яны, Андрэй і Людміла, былі розныя людзі: ён — неспакойны шукальнік чагосьці, а яна — ціхая, маўклівая, хоць і нарадзілася, вырасла ў горадзе — Пінску.

— Ты насварыся на мяне, — адчуваючы за сабою віну, часам гаварыў Андрэй.

Людміла паварочвалася і моўчкі адыходзіла: не зразумець — крыўдавала ці ёй было ўсё адно. Хутчэй за ўсё апошняе.

«Трэба сказаць ёй, — са шкадобаю падумаў Андрэй. — Так больш жыць нельга. Мы абое пакутуем, трываем... І хто гэта выдумаў: прытрэшся — пакахаеш...»

Андрэй скрыгатнуў зубамі, як пасля рэзкага болю ў ступні, і рашуча пакрочыў у глыб лесу. Пакрысе думкі пра дом, сям'ю пакінулі яго. Андрэй суцішыў крок, пачаў прыглядацца да зямлі. На яе паверхні, сярод травы, яловага моху і леташніх лісцяў, ішло сваё жыццё: дружна працавалі мурашы, узвышаючы свой дом — невялікі вострым стажок, што тырчэў сярод кусцікаў; гулі, высоўваючыся з норак, чмялі.

На шырокай просецы, падымаючыся насустрач, Андрэй убачыў канваліі. У атачэнні доўгіх прамых лістоў іх маленькія белыя кветачкі былі падобны да званочкаў. Здавалася, яны звінелі і пераліваліся. Гледзячы на гэтыя кветкі, Андрэй прыгадаў маладога бязногага паляка, апранутага ў старую брудную джынсавую куртку. Ён сядзеў ля моста цераз рэчку Брда, у самым цэнтры горада, і прадаваў букецікі лясных канвалій. Яго

няголены худы твар меў змучаны і жаласны выгляд. У вялікіх і выразных вачах быў сорам. «Трэба было купіць у яго гэтыя кветкі, — з запозненай спагадай падумаў Андрэй. — Можа, ён былы вайсковец, як і я, афіцэр, скалечаны ў якой-небудзь гарачай кропцы. Ці мала іх цяпер такіх... Без вайны ваюем...»

Андрэй прысеў, зняў чаравікі, пасля чаго прыхіліўся спінай да высокай сасны. Доўга сядзеў, грэўся, слухаў лясныя гукі. Разамлеўшы, задрамаў. У дрымоце ўбачыў Марту. Яна, зусім голая, з зялёна-брудным налётам на целе, нібы толькі што вылезла з балота, вабіла-звала Андрэя да сябе...

«Іду, іду...»

Андрэй, як яму здавалася, спрабаваў падняцца, але якісьці неадольны цяжар наваліўся на ягоныя плечы і гнуў да зямлі.

«Іду...»

Андрэй упарта намагаўся падняцца. І пачаў ужо ўставаць...

## XV

Урэшце, канчаткова наважыўшыся развесціся з жонкай і застацца ў Быдгашчы, Андрэй пазваніў Марце, прызначыў сустрэчу. Яна папрасіла прыйсці да «Баркі» заўтра апоўдні, толькі ў баржу-рэстаран не заходзіць, а чакаць яе на мосце.

— Пасядзім лепш на набярэжнай, пагаворым без лішніх вушэй, — слушна сказала яна.

Андрэй прыйшоў на месца сустрэчы раней прызначанага часу: падганяла нецярпенне хутчэй убачыць Марту. Прайшоўся сюды-туды, спыніўся пасярэдзіне і стаў глядзець на жалезнага чалавека. Пад праменнямі няяркага, у смузе, сонца жалезны чалавек холадна і адчужана палісквау сваім голым, мускулістым целам. Перад ім на драцяным канаце, за метраў дзесяць, бездапаможна вісела ці то жывая, ці то мёртвая маленькая птушка. Андрэй раней не заўважаў яе і цяпер здзівіўся: «Я й не бачыў... Птушка, па ўсім, падае...» Прыгледзеўшыся да яе, зазначыў: «Сапраўды, падае... Знак бяды...»

Адвярнуўшыся, Андрэй пачаў глядзець удалеч, на горад. Ужо блукалі надвячорныя цені, з вышыні паволі і асцярожна апускалася на зямлю цішыня. У вокнах «Баркі» заклікальна замігцелі жоўтыя дрыготкія агні...

Марта, апранутая ў светла-блакітныя джынсы і такую ж блакітную джынсавую куртку, прыйшла са спазненнем: Андрэй ужо пачаў хвалявацца.

— Пайшлі ўніз, да рэчкі, — замест прывітання папрасіла Марта.

Яны спусціліся па прыступках да ракі, прайшлі ўсцяж яе метраў сто, прыселі на лаўку. Андрэй унутрана наструніўся: мелася быць канкрэтная, а значыцца, нялёгкая гаворка. Балюча заныла скалечаная ступня. Тарганулася набухлая на шыі вена. Марта, разумеючы Андрэеў настрой, узяла яго за руку, лёгка сціснула.

— Мы будзем разам. — Яна памаўчала. — Калі ты, вядома, гэтага хочаш.

— Мы ж дамовіліся, — рэзка і нервова выдыхнуў Андрэй.

— Але ж ты нічога пра мяне не ведаеш. Нічога.

— Так, — пагадзіўся ён.

— Амаль нічога. — Марта быццам абвінавачвала яго ў гэтым.

— Раскажы пра сябе, — папрасіў Андрэй.

— Гэта не надта цікавы аповед, — папярэдзіла яна. — І невясёлы.

— Цяпер ужо ўсё адно. Ды й не гэта галоўнае ў жыцці.

— Тады слухай. — Марта вызваліла сваю руку з Андрэевай, схавала ў кішэнь. — Мне ўжо амаль трыццаць два гады. Я выйшла замуж у дзевятнаццаць. Гэта было ў Беларусі, у Мінску. Мой муж тады быў там у камандзіроўцы.

— Хто ён па прафесіі?

— Гэта няважна, — рэзка адказала Марта. — Цяпер няважна. Мы разводзімся. Дык вось... — Яна на хвіліну задумалася і працягвала: — Я пакахала яго, хоць ён быў нашмат старэйшы за мяне... Так, пакахала... За вядомасць, далікатнасць, галантнасць, з якой ён заляцаўся да мяне. Гады тры, нават больш, я, як гавораць, жыла з ім душа ў душу, пылінкі здзьмухвала. Як жа: жыву са славутасцю, за мяжой, сытна і ўтульна. А пасля ўсё раптам адразу знікла: маё каханне, прывязанасць, нават удзячнасць за тое, што звёз мяне за мяжу, у Польшчу, і возіць з сабой

па ўсёй Еўропе. Я нават не ведаю, куды ўсе гэтыя мае пачуцці да мужа зніклі і чаму. Можа, з той прычыны, што ў нас няма дзяцей і ўжо не будзе.

Андрэй, гледзячы на Марту, запытальна ўскінуў бровы, напяўся. Яна гэта заўважыла, супакоіла:

— Не бойся, я здаровая. Гэта ў яго праблемы: у вайну, у дзяцінстве яшчэ, моцна перамёрз, ледзьве акрыяў.

Андрэй не ведаў, што сказаць: з аднаго боку, яму было шкада Марту, з другога — ён спачуваў ейнаму мужу. Спытаў:

— Як ты жыла столькі гадоў без кахання?

— А як людзі жывуць? — спытала Марта. — Як ты жывеш са сваёй жонкай?

Андрэй прамаўчаў.

— Так вось і жыла. Кожны сам па сабе, як у касмічным караблі, ведаеш? Нібыта разам, блізка адно да аднаго, а паасобку.

— Ты яму здраджвала? — гледзячы на мутную ваду ракі, ціха спытаў Андрэй.

Марта не адказала. На яе бледнай шчацэ нервова тарганулася цёмная радзімка.

Яны зноў памаўчалі.

— Такое жыццё стала невыносным, — зноў загаварыла Марта. — Я даўно хацела сысці ад яго. Але куды, да каго? І вось з'явіўся ты. У тваіх вачах, — я гэта адразу ўбачыла, — былі неспакой, туга. Таму й падышла тады да цябе... Ведаеш, мне тым вечарам страшэнна хацелася напіцца, па-нашаму, ці зрабіць што-небудзь такое... Я нібы ўбачыла роднага, блізкага мне па духу чалавека. І я не памылілася... Праўда?

Марта выняла руку з кішэні, паклала на калена Андрэю. Ён удзячна ўзяў далонь, моцна сціснуў.

— Праўда.

— Цяпер ты ведаеш амаль усё, — Марта вінавата ўсміхнулася, паружавела. — Астатняе пасля. У нас, спадзяюся, для гэтага будзе час.

— І ты даведаешся пра мяне яшчэ, — сказаў Андрэй. — А пакуль што для гэтага трэба многае зрабіць, вырашыць... На наступным тыдні я перавяду грошы з Беларусі ў адзін з варшаўскіх банкаў. На нашу з табой кватэру. Мы дамовіліся пра гэта. Так?

— Так.

Андрэй абняў Марту, закінуў яе галаву і ўпіўся вуснамі ў пульхныя, мяккія вусны. Яна квола супраціўлялася...

На горад апусцілася ноч. Калі яны развіталіся, ужо было зусім позна. Але гэтага не адчувалася: гарэлі ліхтары, па мосце гаманліва шпацыравалі гараджане і турысты, з бліжэйшага дома, праз расчыненае акно, далятала музыка.

— Ты куды? — развітваючыся, спытала Марта.

— У «Барку», — сказаў Андрэй. — Мне хочацца пабачыць вашага рэстараннага музы́ку. Ён хараша, вельмі хараша іграе. І сам слаўны, добры чалавек. Але, здаецца, нешчаслівы.

Марта, апусціўшы вочы, сумна ўсміхнулася, хуценька павярнулася і шпарка пайшла ўздоўж рэчкі да моста. Андрэй, не спяшаючыся, пакіраваў у рэстаран-баржу, сеў за свой столік ля акна.

Піяніст зноў спазняўся. Калі ён з'явіўся, Андрэй прыпадняўся, пакланіўся. Пажылы музы́ка, зашпіліўшы пінжак на ўсе гузікі, сеў і асцярожна націснуў на клавішы. Інструмент спарадзіў працяглы жаласны гук. Піяніст пасядзеў нейкі час нерухома, пасля рыўком падняў рукі і гэтак жа рэзка апусціў іх на клавішы. Цішыня здрыганулася і надоўга стаілася, саступаючы месца выбуховай, бурлівай мелодыі.

У галаве ў Андрэя мільганула думка, што піяніст іграе тут апошні раз. Мільганула на імгненне, і ён тут жа забыўся пра яе. Сядзеў, слухаў музыку. Думаў пра сябе, пра Марту. Прыгадваў штосьці з мінулага, спрабаваў уявіць сваю прышласць тут, у Быдгашчы...

Думкі рваліся, блыталіся. Востра, недарэчы заныла скалечаная ступня. Андрэй нагнуўся, звычна і моцна сціснуў левую нагу вышэй чаравіка, пачаў паволі расціраць. Калі музыка скончылася, Андрэй крайком вока ўгледзеў, што піяніст ідзе да яго. Андрэй выпрастаўся, правёў далонню па ўспацелым гарачым ілбе, прыпадняўся, ветліва запрасіў:

— Калі ласка, прысаджвайцеся.

Пажылы музыка кіўнуў, моўчкі сеў, падазваў афіцыянта:

— Прошэ кавы.

Гледзячы на Андрэя, спытаў:

— Якая музыка вам больш даспадобы?

— Ваша — уся, — прызнаўся Андрэй.

— Гэта не мая музыка, — сурова заўважыў піяніст. — Гэта музыка вялікіх кампазітараў: Баха, Шуберта, Глінкі, Шумана, Бізэ, Ліста, Агінскага, Рахманінава... Гэтыя кампазітары даўно сышлі ад нас. Сучасных я ведаю мала. Але музыку тых, каго ведаю, выконваю з асалодаю. Напрыклад, Раймянда Паўлса. Я цаню яго як кампазітара і выканаўцу. Люблю ягоную бліскучую музыку. Іграю яе.

Пажылы піяніст напаўзаплюшчыў вочы: аб чымсьці задумаўся.

— Я проста іграю, — ачуўся ён і паўтарыў: — Так, проста іграю...

Афіцыянт прынёс каву. Музы́ка адпіў крыху і паставіў кубачак на стол.

— Я зноў стаміўся. Вельмі стаміўся. Пайду дадому, а вы сядзіце, сядзіце.

Ён падняўся, але сыходзіць не спяшаўся. Панура стаяў, пазіраючы то на сцэну, дзе сіратліва і адзінока чарнела старое піяніна, то ў цёмнае акно, за якім несла свае брудныя воды рака.

— Ведаеце што, — павярнуўшыся да Андрэя, глуха сказаў піяніст, — прыходзьце заўтра ў абед да мяне дадому. Я падару вам на памяць адзін з сімвалаў нашага горада. Прыходзьце, я буду чакаць.

Пажылы музы́ка назваў вуліцу і нумар свайго дома.

— Абавязкова прыходзьце, — адыходзячы, паўтарыў піяніст.

— Прыйду, — паабяцаў Андрэй.

Ён зноў не спаў амаль усю ноч. Падхопліваўся з ложка, хадзіў па пакоі, уяўляў сваё жыццё з Мартай. А яшчэ — прыгадваў пачуццёвыя словы яе песень...

## XVI

Апоўдні Андрэй быў ля дома піяніста: шыкоўнага двухпавярховага старога асабняка, пабудаванага ў гатычным стылі з чырвонай пацямнелай цэглы. Асцярожна пастукаў. Праз не-

калькі хвілін адчыніліся цяжкія дзверы. На парозе стаяў музы́ка. Ён вяла ўсміхнуўся і падаў сваю па-дзіцячы маленькую сухарлявую руку.

— Дзень добры. Я ведаў, што вы чалавек слова і абавязкова прыйдзеце. Так... Праходзьце, праходзьце.

Андрэй нерашуча пераступіў парог. У вялікай вітальні цьмяна гарэў свяцільнік. Ён звісаў са столі на тоўстым ланцугу, пафарбаваным у залацісты колер. На сценах віселі цяжкія чыгунныя падсвечнікі са свечкамі. Змрочна паблісквоў дубовы паркет.

— Праходзьце ў гасцёўню, — запрасіў піяніст, — але перш чым зайсці туды, давайце пазнаёмімся. Мы ж з вамі і не пазнаёміліся, хоць і пілі разам каву.

Андрэй развёў рукамі, нібы ў гэтай недарэчнасці быў вінаваты акурат ён.

— Мяне завуць Тадэвуш, — музы́ка схіліў галаву. — Прозвішча — Смычкоўскі.

— А па-бацьку? — спытаў Андрэй.

Піяніст усміхнуўся. Гэтым разам весялей, больш прыязна.

— У нас у Польшчы па-бацьку звычайна не называюць. Вы, пэўна ж, заўважылі. Калі хочаце, дык завіце мяне, як завуць усе, — пан Тадэвуш.

— Добра, пан Тадэвуш, — павесялеў Андрэй.

— Ну што ж, праходзьце ў гасцёўню, — яшчэ раз папрасіў піяніст і расчыніў дзверы ўнушальных памераў залы.

Гасцёўня, пасярод якой Андрэй праслізнуўся і ледзь не ўпаў, была абстаўлена з густам, але трошкі мрачнавата, старамодна: на сценах віселі карціны ў рамках з медзі і багета, увесь кут займала высокая і раскошная канапа з цёмна-карычневай скуры, па адзін і другі бакі залы адсвечвалі цьмянай лакіроўкай шырокія прыземістыя тумбы, пасярод, на ўзорыстай паркетнай падлозе, узвышалася чорнае адпаліраванае піяніна.

— Гэта мой гонар, — паказаў на яго музы́ка. — Гэта старое піяніна. Па гадах амаль такое ж, як я. Але гучыць яно куды лепш, чым многія самыя новыя інструменты. Яно нібы жывое: не іграе, а гаворыць, распавядае. Можа й спяваць. Але пра гэта я не буду гаварыць, а то проста абрыдну. Пройдзем лепш у мой кабінет.

Андрэй, думаючы, што кабінет пана Тадэвуша будзе гэткім жа вялікім, як і вітальня з гасцёўняй, у якіх можна катацца на дзіцячым веласіпедзе, запыніўся ў лёгкім недаўменні перад расчыненымі дзвярамі невялікага паўцёмнага пакойчыка, шчыльна застаўленага высокімі кніжнымі шафамі, сярод якіх бліжэй да кута масціўся невялікі рабочы столік з двума сціплымі крэсламі.

— Праходзьце, праходзьце смялей, — мякка падштурхнуў у спіну Андрэя піяніст. — Тут мая келля, мой храм, мая, калі хочаце, майстэрня. Тут я разважаю і ў думках іграю.

«А рэшта дома як?» — хацеў быў запытацца Андрэй, але не спытаў: задаваць такія пытанні яму было няёмка ды й непрыстойна.

— Прысаджвайцеся, — пан Тадэвуш махнуў рукой у бок аднаго з крэслаў.

Андрэй сеў. Музы́ка ўключыў святло, дастаў з шафы невялікую статуэтку з цёмнай медзі, паставіў на стол і сеў у крэсла насупраць Андрэя.

— Паглядзіце ўважліва, — паказваючы на статуэтку, сказаў піяніст. — Вы нідзе яе не бачылі?

Перад Андрэем стаяла мініяцюрная медная жанчына. Адной рукою яна трымала лук, другой, нацягнуўшы цеціву са стралой, рыхтавалася пусціць яе ў невідочную ахвяру.

— Не, не бачыў, — сказаў Андрэй, міжволі любуючыся вытанчанай работай невядомага яму скульптара.

— Такі помнік ёсць у Быдгашчы. Гэта адзін з сімвалаў нашага жыцця. Вы, напэўна, не раз глядзелі ля «Баркі» на жалезнага чалавека. Ён толькі трымае стрэлы. А лук вісіць у стральца на плячы. А гэтая жанчына, — пан Тадэвуш, прыжмурыўшыся, неадабральна глядзеў на статуэтку, — гэта жанчына цэліцца, гатовая безразважна пусціць смяротную стралу ў свайго праціўніка. Жанчына заўсёды гатова стрэліць першай. Недарэмна акурат Ева спакусіла Адама ў райскім садзе, а не Адам Еву. Будзьце асцярожныя з жанчынамі, асабліва з тымі, каго вы мала ведаеце. Ці наогул не ведаеце.

Пан Тадэвуш быў сур’ёзны.

— Мужчыны страляюць больш і часцей, — запярэчыў Андрэй. — Паперадзе жалезнага чалавека вісіць на канаце птушка. Я мяркую, мёртвая птушка. Можа, яе застрэліў гэты самы стралец.

— Можа, — пагадзіўся пажылы піяніст. — А можа, і не: птушка проста зачапілася за канат. Ды хоць бы й не зачапілася... Мужчыны вымушаны страляць, таму што яны здабытчыкі, воіны. А жанчына не павінна браць у рукі зброю. Яна — захавальніца, берагіня ачага. А гэта цалкам мірны клопат.

Запярэчыць на гэта Андрэю не было чаго: сапраўды, жанчына і зброя — гэта несумяшчальна, хоць і не рэдкасць. Асабліва апошнім часам.

— Цалкам мірны клопат, — падкрэсліў музы́ка.

Ён прыўзняўся, узяў з кніжнай паліцы маленькага меднага слоніка, падаў Андрэю:

— А гэта вам на шчасце.

— Дзякую, — не ведаючы, чым аддзячыць пану Тадэвушу, прамовіў Андрэй.

— Няма за што. Гэта проста сувеніры, проста сувеніры, — неяк раптам вельмі марудна, напаўзаплюшчыўшы вочы і, здаецца, страціўшы цікавасць да госця, сказаў піяніст і апусціў сівую галаву.

Андрэй тут жа адчуў сябе лішнім у маленькім кабінеце і ва ўсім гэтым велізарным багатым доме.

— Вы прабачце, — падняўся ён, — я наогул зайшоў да вас на хвілінку. У мяне важная сустрэча сёння.

Пан Тадэвуш падняў галаву.

— Не-не, гэта вы прабачце. Проста зноў мне стала блага. Зараз мінецца... Мінецца...

Твар пажылога музы́кі пабляднеў. На адкрытым маршчыністым ілбе выступілі прыкметныя кроплі поту.

— Ужо лепей... Вы не звяртайце ўвагі. Гэта мой хворы арганізм гэтак рэагуе на блізкую старасць... Не люблю яе. Нават ненавіджу.

— Вы не маеце рацыі, — запярэчыў Андрэй. — Старасць па-свойму прывабная, неабходная для асэнсавання сваёй прошласці і прышласці.

Пан Тадэвуш, абапіраючыся на падлакотнік крэсла, з цяжкасцю падняўся.

— Вы не ўмееце падманваць, Андрэй. У старасці няма будучыні. Вам пра гэта яшчэ прыйдзецца даведацца. А пакуль я пазнаёмлю вас са сваёй жонкай, якую вы, напэўна, бачылі. Замест бескарысных спрэчак мы лепш вып'ем кавы і па глытку каньяку. Сёння апошні дзень красавіка і заўтра, папраўдзе ўжо сёння ноччу, першага мая, Польшча ўступае ў Еўрасаюз. Нарэшце-такі, дзякуй Богу, не будзе ў нас у Еўропе войнаў. Гэта добра. Гэтага чакалі многія. Вельмі і вельмі многія.

— Ваша праўда, гэта так, — пагадзіўся Андрэй.

— Праводзьце мяне ў сталовую, — папрасіў музыка. — І адчувайце сябе як дома.

Андрэй падхапіў піяніста пад локаць і, асцярожна падтрымліваючы яго, няспешна пайшоў з ім праз прасторную гасцёўню ў сталовую.

— Дзякую, — вызваліў руку пан Тадэвуш у дзвярах сталовай. — Я сам, сам. — Ён прайшоў у глыбіню прасторнага пакоя. — Вось мая жонка.

Андрэй скамянела запыніўся: ля пліты, у белым напаўрасшпіленым махровым халаце стаяла Марта. У яе вачах палыхнуў страх. Нейкі час яна маўчала, потым скавана падышла да нечаканага госця, паволі падала яму руку. Андрэй, адчуваючы, як дрыжыць яе далонь, злёгку пацісну́ў.

— Сядайце за стол, — чужым і нейкім далёкім голасам запрасіла Марта. — Кава зараз будзе гатова.

— Не-не, — Андрэй адхінуўся ад яе, як ад пракажонай. — Я не хачу... Мне пара. Мяне чакаюць...

Пажылы піяніст, абапіраючыся на цяжкі дубовы стол, уважліва пагледзеў на Марту, потым на Андрэя і зноў на Марту.

— Я праводжу вас, — халодным і абыякавым голасам сказаў пан Тадэвуш. — Але мы ўсё-такі вып'ем: я абяцаў. Марта, налі, калі ласка, усім нам каньяку.

Дрыготкай рукой Марта пачала наліваць. Калі паднесла бутэльку да мужавай чаркі, трошкі разліла на падлогу і баязліва паглядзела на яго.

Пажылы музы́ка падняў чарку, доўга маўчаў, абдумваючы, што сказаць. Потым, гледзячы ў стол, на пусты кубачак для кавы, ціха, паволі і развітальна прадэкламаваў:

Я п'ю за апусцелы дом,
За злыбяду маю,
За адзіноту п'ю нагбом
І за цябе я п'ю, —
За вуснаў подлую ману,
За мёртвы лёд вачэй,
За свет, як вечную вайну,
За Бога без надзей.

Усталявалася маўчанне: цяжкое, працяглае, няёмкае.

— Гэта Ахматава. Верш «Апошні тост», — сказаў пан Тадэвуш. — Яна напісала яго ў 1934 годзе. У тым самым, калі я нарадзіўся...

Андрэй паставіў пустую чарку, глуха выціснуў:

— Я пайду.

— Пачакайце хвілінку.

Музы́ка, пахістваючыся, пайшоў праз гасцёўню ў свой кабінет. Андрэй і Марта засталіся адны. На тры-чатыры мінуты, не больш. Не глядзелі адно на аднаго, не вымавілі ні слова.

Андрэй хацеў быў зірнуць на Марту, але не змог. Яна стаяла нерухома і скрушна, як чыгунная статуя ля ракі Брда, скрыжаваўшы на грудзях рукі з нявыпітай чаркай каньяку. З напаўрасшпіленага халата выглядвала радзімка, якая месцілася над ейным сэрцам. Радзімка была падобная ці то да маленькага, толькі-толькі з пупышкі, вясновага лісточка, ці то на засохлую кроў ад шалёнай кулі.

Калі пачуліся крокі піяніста, Андрэй павярнуўся да дзвярэй.

— Вось, гэта вам. Не забудзьце. — Пан Тадэвуш уручыў Андрэю медную статуэтку жанчыны-лучніцы і маленькага слоніка. На шчасце... А цяпер хадземце...

Развітваючыся, пан Тадэвуш нервова вымавіў:

— Я разводжуся са сваёй жонкай. Памятаеце, я вам гаварыў, што самы вялікі грэх, гэта калі ты спрабуеш узяць тое, што табе не дадзена, што не для цябе. А я спрабаваў гэта зрабіць. Досыць... Да таго ж у мяне засталося дужа мала часу. Трэба ду-

маць ужо не пра зямное, а пра вечнае, маліць Бога дараваць за ўсё. Яшчэ разводжуся, таму што не хачу, каб Марта засталася ўдавой. Дом і ўсю сваю маёмасць я перапісаў на яе... Бывайце...

Андрэй, быццам невідушчы, прыкметна накульгваючы, ішоў ад дома піяніста, сціскаючы ў адной руцэ медную статуэтку, а ў другой — меднага слоніка. У нейкі міг яму падалося, што Марта ідзе следам. Андрэй узрадаваўся: яна павінна была ісці за ім. Абавязкова...

Але яна не ішла, а была дома — з панам Тадэвушам.

## XVII

Увесь астатні дзень, вечар і ўсю ноч Андрэй, не выходзячы з нумара, прасядзеў у адзіноце перад тэлевізарам. Па ўсіх каналах, польскіх і еўрапейскіх, ішлі сюжэты аб краінах, што ўступалі ў Еўрасаюз. Вядучыя тэленавін пастаянна падкрэслівалі, што гэта вельмі магутнае аб'яднанне. Палітычна і эканамічна. Задаволеныя дыктары радасна паведамлялі, што да пашырэння Еўрасаюза засталося вось столькі гадзін і столькі хвілін. «Не выключайце тэлевізар, — папярэджвалі яны. — Нашы спецыяльныя выпускі ў пастаянным эфіры...»

Андрэй і не выключаў: іншай справы ён не меў, а застацца сам-насам са сваімі думкамі было страшна. Можа быць, нават больш страшна, чым калісьці ў шпіталі...

Сядзеў нерухома ў крэсле і халоднымі сухімі вачыма глядзеў на экран.

— Вітамы! — трыумфавалі палякі ў чарговым сюжэце.

З экрана, ва ўсю ягоную шырыню, свяціліся палотнішчы транспарантаў: «Еўропа без межаў!», «Не войнам!», «Мы — разам!..», «Свабода!..»

У прыадчыненае акно гатэля сягалі гучныя галасы людзей, якія ішлі на галоўны пляц горада, дзе праходзіў урачысты мітынг, а пасля яго павінен быў пачацца святочны канцэрт.

— Вітамы! Вітамы! — чуліся крыкі.

Андрэй разумеў: вялікае свята надыходзіць у Польшчы. Дый ва ўсёй Еўропе. Яно нясе людзям мір. А ён патрэбны ўсім: беларусам і палякам, бацькам Андрэя і пажылому піяністу, яму,

Андрэю, і Марце... Закрычаць бы: «Вітамы!» Разам з усімі. Але яму не хацелася крычаць. Не было нават голасу. Быццам знямеў, перастаў разумець тое, што адбываецца.

«Усё, усё...», — час ад часу білася ў галаве. «Усё», — паўтараў Андрэй, сам сябе не чуючы.

У акно нешта грукнула. Шкло працягла зазвінела. Андрэй быццам апрытомнеў пасля цяжкога пахмелля. «Марта!» — апякло яго. Ён тут жа падняўся, падышоў да акна, расхінуў шторы. Насупраць, метрах у трыццаці, стаяў худы невысокі падлетак. Перакідваючы каменьчык з адной рукі ў другую, ён усміхаўся.

Андрэй моўчкі і панура захінуў штору. Сеў у крэсла і ў адчаі апусціў галаву. Яму прыгадаліся словы песні, якую ён пачуў у выкананні Марты ў першы раз:

Ніц, напраўду, не паможаш.
Ніц, напраўду.
Ніц, напраўду, не паможаш...

«Няўжо ўсё мінула, знікла і ўжо больш нічога добрага ў мяне не будзе? — скрушна і пакутліва думаў Андрэй. — Ніц, напраўду... Ніц, ніц, ніц...»

Андрэй, нарэшце, выключыў тэлевізар, паглядзеў на акно. Праз штору сіратліва прабіваўся светлы клубок, падобны да дзіцячага шарыка. Гэта гарэў ліхтар...

Андрэй зірнуў на стол. На ім паблісквала жоўтай меддзю лучніца. Андрэю здалося, што гэта Марта. І страляе яна ў яго. А маленькі слонік, падораны піяністам на шчасце, не хоча яго, Андрэя, абараніць.

Ад бяссілля захацелася закрычаць і... памерці. Магчыма, ён бы й памёр. Але ў душы, недзе ў самым таемным яе куточку, тлела мізэрная часцінка надзеі, што Марта хаця б патэлефануе... І яна патэлефанавала. Якраз перад раніцай.

— Гэта я... — ціха прамовіла Марта. — Мой муж спіць. Ён згодны, каб мы былі разам. Я толькі ўчора ўсё яму расказала. Усё... Да сустрэчы. Цалую...

Андрэй паклаў слухаўку і бяссільна праваліўся ў небыццё, скрозь якое да яго слыху аднекуль данесліся аглушальныя гукі

музыкі. Але гэтакімі яны былі толькі некалькі секунд, пасля чаго станавіліся цішэйшымі, яшчэ цішэйшымі, пакуль не зніклі зусім.

Прачнуўшыся, Андрэй падумаў не пра Марту, не: яна ўжо была ягоная. Андрэй падумаў аб пажылым і паміраючым піяніcце, яго аповедзе пра каханне савецкага салдата і палячкі, жорсткім расстрэле за гэтае каханне... Жаль, горыч, надзея — усе гэтыя пачуцці разам балюча заварушыліся ў параненай душы Андрэя.

«Пан Тадэвуш іграў пра сваё і наша жыццё, — раптам зразумеў Андрэй. — Жыццё!..»

Нечакана яму прыгадаўся радок з песні «Кармен» у выкананні Марты: «Ды няма ёй на свеце пары». Гэты радок навязліва паўтарыўся некалькі разоў. Пасля загучалі словы пачуццёвай і кранальнай песні, якую Марта спявала штовечар, выходзячы на сцэну баржы-рэстарана:

У руцэ дрыжыць кляновы ліст,
Нібыта ветразь без прычала.
Сыграй, сыграй жа, піяніст,
Як я кахала, як чакала.

Сыграй, сыграй жа, піяніст,
Абрынь тугі салодкай гукі,
Сыграй, сыграй мой лёс на «біс»,
Мае спатканні, мае мукі...

«Я зраблю ўсё, каб яна больш ніколі не ведала ніякіх мук, — цвёрда верачы ў гэта падумаў Андрэй. — Каб больш не ведала ніякіх страт».

Яму зрабілася лёгка. Не адчувалася ні цяжкасці, ні болю. З-за гэтага ў нейкае імгненне стала нават страшна, як быццам бы ён ляцеў. Ці то як Ікар, ці то зноў у сваім верталёце пад нечым прыцэлам. Напэўна, гэты страх узнік з непрывычкі жыць так, як хочаш.



# ПАДАЎ СНЕГ

## I

У гэты нядзельны летні дзень Брэст знемагаў у душным марыве. На набярэжнай ракі Мухавец, за якой віднеўся памежны пераход «Варшаўскі мост», было людна. Гараджане павольна шпацыравалі ўздоўж воднай роўнядзі, каталіся на цеплаходзе, тоўпіліся каля шапікаў, каб купіць марожанае і прахаладжальныя напіткі. Да вечара адпачываючых паменьшылася: ім пачалі дапякаць камары. Баючыся, што яны пакусаюць і яе, станістая высокая дзяўчына ў кароткай стракатай сукенцы выліла з пластмасавай бутэлькі рэшту вады сабе на далонь, асвяжыла твар, паправіла густыя русыя валасы, якія спадалі на аголеныя плечы, і па вытаптанай дарожцы накіравалася ў бок цэнтральнага ўнівермага.

Ягор Руцкі, шыракалобы рослы мужчына спартыўнага целаскладу, убачыўшы дзяўчыну, інстынктыўна рушыў ёй насустрач. Калі яна падышла да яго на адлегласць выцягнутай рукі, ён злёгку нахіліў галаву і павітаўся. Дзяўчына некалькі секунд маўчала, пасля чаго неяк запаволена, нізкім голасам, адказала:

— Добры вечар.

Яе голас нагадваў яму голас Таццяны Даронінай — вялікай савецкай акторкі. Руцкі здзівіўся і ў той жа час крыху разгубіўся, бо ні ў кога з яго знаёмых прыгожай паловы роду чалавечага не было такога голасу — народжанага недзе глыбока ў грудзях, што адразу заварожвала і прыцягвала, як зачароўвае і прыцягвае ўсё незвычайнае і рэдкае.

— Хацелася б, каб было менавіта так, — сказаў Руцкі, адчуваючы, як да яго галавы прылівае кроў. — Па-добраму.

Дзяўчына зноў на нейкі час замоўкла, але ўжо ўважліва паглядзела Руцкаму прама ў вочы, — яна была аднаго з ім росту, — пасля чаго добразычліва вымавіла:

— Мне б таксама гэтага хацелася. Але не заўсёды нашы жаданні супадаюць з нашымі магчымасцямі.

— Шкада, — шчыра прамовіў Руцкі.

— Так, шкада, — сумна пагадзілася незнаёмка. — Прабачце, мне пара.

Руцкі, спрабуючы затрымаць дзяўчыну, якая яму з першага погляду спадабалася, паспрабаваў працягваць з ёй размову.

— Вы сапраўды спяшаецеся? — спытаў ён.

Яна сцвярджальна кіўнула:

— Так.

І гэтае «так», сказанае з прыдыханнем, абдало Руцкага невядомым яму дасюль цяплом, якое адразу ж пачало ператварацца ў жар. А яшчэ ў гэтым кароткім слове яму пачуўся нейкі знак, абяцанне, якое абавязкова павінна спраўдзіцца.

— Тады, калі так, магу вас падвезці. — Ад хвалявання голас Руцкага ўздрыгнуў. — Тут побач прыпаркавана мая машына. Абяцаю даставіць вас з камфортам туды, куды скажаце. Хоць на край свету.

Шэра-блакітныя вочы дзяўчыны ледзь-ледзь пацямнелі. Руцкі падрыхтаваўся пачуць ад яе строгі, а то і рэзкі адказ, але яна нічога падобнага не сказала. Наадварот, краем губ усміхнулася і з разуменнем прагаварыла:

— Дзякуй, але гэта лішняе.

На жаль, так і было. Але ўсё ж толькі для яе, а не для Руцкага, які нечакана для сябе не проста захацеў, а адчуў, што абавязкова павінен пазнаёміцца з гэтай дзяўчынай.

— Разумею: мы чужыя людзі, — як мага больш тактоўна вымавіў ён, жадаючы зрабіць на яе самае добрае ўражанне. — А гэта, калі падумаць, няправільна: чужых людзей не павінна быць. Вы згодны?

— Збольшага, — добразычліва кіўнула дзяўчына.

— Вось, — канстатаваў Руцкі. — Менавіта таму мне нічога не застаецца, як спытаць: як вас завуць?

На гэта старое як свет пытанне Руцкі мог наогул не атрымаць адказу. І гэта была б цалкам натуральная рэакцыя з боку дзяўчыны. Але яна назвала сваё імя:

— Данута.

— Гэта праўда? — Руцкі зрабіў выгляд, што не верыць. — Польскае імя.

— Менавіта, — пацвердзіла дзяўчына. — Так калісьці мяне назвалі мае бацькі.

— А я Ягор, — узрадаваўся Руцкі, падсвядома разумеючы, што паміж ім і Данутай ужо ёсць нейкі віртуальны кантакт. Больш за тое, гэта не выпадковае знаёмства. — Дзе вас можна ўбачыць?

— Навошта? — паціснула яна плячыма, ужо з відавочнай цікавасцю гледзячы на Руцкага.

— Ну, хаця б для таго, каб мы не былі чужымі, — адказаў ён. — Ва ўсякім разе, не адчувалі сябе такімі.

У яго голасе з'явілася ўпэўненасць. Але яна была слабай, нібы парастак, які толькі што вылез з зямлі і яшчэ не паспеў адужэць, але ўпарта цягнецца да цёплага сонца. Дзяўчына адчула гэта і тут жа адказала:

— Я працую ў гатэлі «Інтурыст». Перакладчыца.

— А з якой мовы перакладаеце? — пацікавіўся Руцкі.

— З англійскай, плюс добра ведаю польскую, — адказала Данута. — Я адказала на ваша пытанне?

— Вядома, — з удзячнасцю выдыхнуў Руцкі.

— Тады поспехаў вам, Ягор, — пажадала дзяўчына. Зрэнкі яе вачэй пры гэтым пашырыліся. — Поспехаў, — паўтарыла яна.

— Узаемна, — шчыра і з узбуджэннем прамовіў ён.

Яна хутка пайшла, пакінуўшы пасля сябе водар саладкаватых і незнаёмых Руцкаму духоў. І яшчэ ён адчуў жаданне блізкасці з ёй, пра якое пакуль стараўся не думаць, але якое ўжо ўвайшло ў яго сэрца.

«Убачымся... — Руцкі быў у гэтым чамусьці ўпэўнены. — Можна яшчэ сёння, час ёсць... Ёсць...»

Нягледзячы на тое, што Руцкаму ішоў пяты дзясятак, у яго было досыць сіл і энергіі, каб адразу ж бегчы ў «Інтурыст». Балазе, гатэль размясціўся па суседстве з універмагам. І Руцкі пабег бы, але ўсё-ткі стрымаў сябе, разумеючы, што спяшацца бязглузда: неадкладнае навязванне сваёй дружбы дзяўчыне, якую бачыш у першы раз, звычайна ні да чога добрага не прыводзіць. Яму гэта падказваў чужы, а таксама асабісты вопыт.

«Пачакаю...»

Калі Руцкі падышоў да сваёй машыны — «БМВ» пятай мадэлі, — настрой у яго раптам рэзка памяняўся. Яшчэ некалькі хвілін таму радасны і амаль па-дзіцячы шчаслівы, ён насупіўся, зайграў жаўлакамі, з сілай сціснуў пальцы правай рукі ў кулак, быццам заўважыў пагрозу, да якой не быў гатовы, але з якой прыйдзецца змагацца.

## II

Родны горад Руцкага — Брэст. Невялікі, памежны, ён прыцягвае да сябе ў любую пару года, прывабны ў любы час сутак, а вось найбольш прыгожы і загадкавы ноччу, калі гараць ліхтары. Яны розныя і іх шмат. Асабліва на вуліцы Савецкай, дзе яны газавыя, зробленыя па старой тэхналогіі і іх па вечарах запальвае штатны ліхтаршчык у форме далёкіх пятроўскіх часоў. Калі на брэсцкія ліхтары доўга глядзець, то, здаецца, што агні ў іх дрыжаць, цягнуцца скрозь шкло да цябе, нібы спрабуюць абняць і быццам абяцаюць сагрэць. Гэта зачароўвае, расслабляе, дорыць пачуццё яднання і агульнасці з гора-

дам, яго святлом. Менавіта таму Руцкі заўсёды, калі хадзіў па горадзе, асветленым ліхтарамі, спрабаваў дацягнуцца да іх рукамі, не баючыся аднойчы згарэць і не вярнуцца да сваёй сям'і, якую любіў. Праўда, не настолькі, каб дарыць ёй спакой і быць спакойным самому.

І ў гэты раз Руцкі больш думаў пра сябе, чым пра сваю жонку, сваіх дзяцей. Калі казаць шчыра, то думаў ён пра «Інтурыст». Туды ён і ехаў, перавышаючы дазволеную ў горадзе хуткасць. Яго «БМВ» падрульваў ужо да праспекта Машэрава — галоўнай магістралі Брэста, каб павярнуць налева і праз пяць-сем хвілін спыніцца ля ўвахода культавага гатэля, але тут дарогу машыне перагарадзіў цыбаты інспектар ДАІ ў званні капітана.

«Стась, — пазнаў яго Руцкі. — Якога чорта!..»

Ён рэзка націснуў на тормаз і прыадчыніў дзверцы.

— Ну?

— Баранкі гну. — Стась быў не ў гуморы. — Я стаю тут, таму што на працы, а ты чаго не спіш?.. Ноч даўно...

— Не спіцца, — буркнуў Руцкі.

— Не спіцца, — перадражніў яго Стась і пачухаў свой кашчавы нос. — І таму перавышаеш хуткасць?

— Прабач, спяшаюся. — Руцкі нецярпліва націснуў на газ. Рухавік зароў. — Потым пазваню табе.

— Адчуваю, зачапіла цябе нейкая фіфа ... — Стась крыва ўхмыльнуўся. — Да яе спяшаешся?

— Магчыма.

— Глядзі, каб не застаўся з пустымі кішэнямі.

Словы Стася Руцкаму не спадабаліся.

— Табе якая справа? — сказаў ён, адчуваючы, як да твару па набраклых венах хлынула кроў. — Калі і так, то галаўны боль у мяне, а не ў цябе.

— Ты што, пакрыўдзіўся?.. — Стась, пакруціўшы галавой, сплюнуў на чорны асфальт. — Нічога такога не думай... Проста ў мяне нервы на ўзводзе.

— У кожнага нервы, — заўважыў Руцкі. — Паглядзі вакол: амаль ва ўсіх няма настрою. Людзі хмурныя, заклапочаныя, кудысьці спяшаюцца.

— Гэта так, — стаў апраўдвацца Стась. — Пустая марнасць. Але я, плюс да ўсяго, са сваёй жонкай пасварыўся. Хоць дадому не прыязджай. Уяўляеш?

— Бывае, — прамовіў Руцкі. — У мяне ў гэтых адносінах справы не нашмат лепшыя.

— Слухай, а давай паедзем у прывакзальны бар, — прапанаваў Стась. — У ім ноччу малалюдна, ціха. Ніхто не патрывожыць. Вып'ем, пагаворым.

Падумаўшы, Руцкі пагадзіўся:

— Добра, паехалі.

Праз дзесяць хвілін яны сядзелі ў чырванаватай паўцемры за круглым столікам адзін супраць аднаго і пілі віскі. Стась пры гэтым яшчэ і курыў. Пасля чарговай чаркі ён цяжка выдыхнуў:

— Ну, выкладвай. Лягчэй будзе.

— Каму лягчэй? — Руцкі не спяшаўся гаварыць пра Дануту. — Мне ці табе?

— Табе, вядома, — развёў тонкія далоні Стась. — Ну і мне трохі. Ты ж для мяне не чужы чалавек, так?

— Спадзяюся, — кіўнуў Руцкі.

— Вось...

Калыхнуўшыся, Стась ледзь не дастаў галавой абажур свяцільніка, які вісеў над столікам. Яго святло як быццам цямнела і, здавалася, вось-вось павінна было згаснуць. Але яно не згасла.

Руцкі ўздыхнуў, з сілай прыгладзіў свае валасы, якія пачалі ўжо сівець і радзець, затым глуха прамовіў:

— На мінулым тыдні на беразе Мухаўца сустрэў я дзяўчыну. Данутай клічуць. Прыгожая.

— Яны ўсе прыгожыя, — канстатаваў гэты практычна бясспрэчны факт Стась. — Таму што маладыя, здаровыя, а галоўнае — свабодныя.

— Не, не ўсе такія, — запярэчыў Руцкі.

— Большасць, — трымаўся свайго меркавання Стась. — Цікава, чым твая новая знаёмая так прыцягнула цябе да сябе?

— Голасам. — Сказаўшы гэта, Руцкі як быццам пачуў ад Дануты яе груднoе «так». Яно прагучала смела, з выклікам. — Голасам, — паўтарыў ён і дадаў: — А потым усім астатнім.

— Усё астатняе — часткі мілага маладога цела?

— Ты кемлівы.

— Яшчэ б, — задаволена ўсміхнуўся Стась. — Я ж мужчына. Яшчэ не стары мужчына.

— Не спрачаюся, — прабурчаў Руцкі.

— Карацей кажучы, цябе гэтыя часткі цела вабяць да сябе?

— Груба, але гэта праўда. Прычым не ўся. Мяне яшчэ прыцягвае і тое, што ўнутры Дануты ёсць нешта такое, што мне пакуль незразумела, але хочацца зразумець.

— Нават так? — Стась зрабіў выгляд, што здзівіўся. — Становіцца цікавей.

— Так, — пацвердзіў Руцкі. — Менавіта так.

— Што ж, гэта натуральнае жаданне, — уздыхнуў Стась. — Прыроду не падманеш.

— Ты пра што?

— Не пра што, а пра каго. Канкрэтна: пра нас, мужчын. Мы заўсёды гатовы закахацца за хвіліну, нават за секунду. І, дарэчы сказаць, разлюбіць можам яшчэ хутчэй.

— Ведаеш, жанчыны ў гэтым сэнсе не горшыя і не лепшыя за нас.

— Гэта зразумела: усе шукаюць сваю палавінку. Але што да цябе, то хачу табе нагадаць: ты — чалавек жанаты, у цябе два сыны.

— Я гэта памятаю, — з міжвольным раздражненнем вырвалася з Руцкага. — Але што ёсць, тое ёсць: убачыў яе і хачу быць з ёй. Што, у цябе такога не было?

— Было, але даўно.

— А ў мяне зараз, зараз... Як быццам я пад гіпнозам. Разумееш?

— Я ўжо сказаў, што разумею. — Стась паклаў локці на стол, падаўся наперад. — Ты не паверыш, але ў мяне нават з'явілася жаданне ўбачыць тваю кралю.

— Гэта не абавязкова.

— Ну, як хочаш.

— Табе не абавязкова, а не мне, — падкрэсліў Руцкі і павёў па зале вачыма, нібы раптам убачыў Дануту, але тут жа згубіў

яе. — Сорамна, а прызнаюся... Хоць не, не сорамна... Уяві сабе... Я не ведаю, што ў яе галаве, замужам яна ці яшчэ ў пошуку свайго хлопца, годнага мужчыны, але мне за гэтыя дні і ночы стала зразумела адно: альбо гэтая дзяўчына будзе са мной, альбо я застрэлюся. Шчыра кажу...

— Ты гэта што, сур'ёзна?

— Хацеў бы пажартаваць, ды не магу.

— Чым я магу дапамагчы?

— Нічым. Кажу ж табе: я нібы пад гіпнозам. Прычым разумею, што гэта подла ў адносінах да маёй жонкі, дзяцей, але нічога з сабой зрабіць не магу. Ды і не хачу... Не хачу!..

— Ты мяне палохаеш.

— Палохаю?.. Так, напэўна. Я і сам ужо сябе пачынаю баяцца.

— Прабач, але ў галаве ў цябе не ўсё нармальна, раз такое з табой робіцца, — няўхвальна і неяк павольна прамовіў Стась. Ён задраў сваю галаву ўверх, з хвіліну ўзіраўся ў столь, пра нешта думаючы, затым прадоўжыў сваю думку: — Наколькі мне вядома, і гіпноз, і каханне, асабліва нечаканае, карты з адной калоды. Выцягнуў не тую — прайграў. А прайграў... Не хачу і гаварыць, што можа быць далей... Спадзяюся, ты пісталет з сабой не носіш?

— На лецішчы... У падвале.

— Гэта, вядома, абнадзейвае. Але калі сур'ёзна, то я табе раю: выкінь з галавы сваю новую знаёмую, а то, баюся, быць бядзе.

— Як выкінуць, калі Данута сядзіць у мяне тут?.. Тут!.. — Руцкі стукнуў кулаком сабе ў грудзі. — Не выб'еш.

— А ты спрабаваў выбіваць?

— Калі?.. Мы знаёмы з ёй па часе — усяго нічога.

— Адразу трэба было. — Стась рассёк далоняй пракуранае паветра. — Адразу і кропка!

— Кропка, — хмыкнуў Руцкі. — Скажаш... Я, як і ты, яшчэ не стары, мне жыць хочацца.

— Дык жыві, — уставіў Стась. — У цябе ёсць з кім.

— Хопіць табе, мараліст знайшоўся... — Руцкі разліў віскі па чарках. — Давай вып'ем.

— Давай, але гэта табе не дапаможа, — зрабіў несуцяшальны для Руцкага вывад Стась. — Можа, табе да якой шаптухі схадзіць, няхай пашэпча. Раптам яна з цябе гэтую цягу да Дануты выб'е.

— Ты што, здзекуешся?.. Ці ўжо п'яны?.. — Руцкі прыўстаў, рука яго пацягнулася да рыльца бутэлькі. — Зараз ты ў мяне працверазееш... Не пагляджу, што сябар.

— Добра, добра... — Стась замахаў рукамі. — Супакойся, я ж хачу як лепш...

— І ты супакойся, — сеў на месца Руцкі. — Моташна ад тваёй маралі і тваёй парады...

Выпіўшы, яны прыкусілі бутэрбродамі з каўбасой. Памаўчалі, думаючы адзін пра другога. У іх замутнёных спіртным галовах пранеслася суцэльнае і дробязнае, мэтанакіраванае і ілжывае, мімалётнае і вечнае, без чаго жыццё — пустое.

— Ведаеш, я дзесьці прачытаў, што самае вялікае, што мы ўмеем — гэта быць нешчаслівымі, — прамовіў Руцкі.

— Вось гэта праўда, — пацвердзіў Стась. Падумаўшы, заключыў: — Ад таго і злыя, як сабакі.

— Пара мне. — Руцкі пракашляўся, выганяючы з сябе непрыемны пах віскі. — Паеду.

— Дадому? — пацікавіўся Стась.

— Не ведаю, — шчыра прызнаўся Руцкі. — Дадому не хочацца, а Данута, сам разумееш, пакуль да сябе не запрашае.

— Тады чакай: запросіць.

— Я і чакаю... Як сабака, у якога няма сілы ўжо нават злавацца.

— Не нагаворвай на сябе.

— Я не нагаворваю, так ёсць... Добра, пакатаюся па горадзе, з'езджу на памежны пераход.

— Едзь, — ужо без эмоцый выціснуў Стась. — Хаця пачакай. — Ён наблізіў свой расчырванелы твар да ап'янеўшага сябра. — Справа ёсць.

— Якая?

Руцкі прыблізна здагадваўся, пра што папросіць Стась, але хацеў ведаць, што канкрэтна ад яго патрабуецца, боката

ў мяшку купляць небяспечна: раптам гэта кошка або наогул незразумелы звер...

— Справа не вельмі сур'ёзная, але каштоўная, — ухмыльнуўся Стась. — Невялікая кантрабанда. Трэба дапамагчы праз мяжу перавезці.

— Што менавіта? — проста спытаў Руцкі. — Калі нарката, дапамагаць не буду.

— Не, не нарката, — супакоіў яго Стась. — Біжутэрыя.

— Золата, камяні?

— І тое, і другое... Патрошку. Толькі для жонкі.

— І трохі, вядома, на продаж, каб адкласці на чорны дзень. Ведаю я цябе.

— А ты як думаў? — Стась надзьмуўся. — На адну зарплату жыць цяжка, а адкладваць нешта з яе — тым больш. Гэта ты добра ўладкаваўся.

— Перастань.

— А што?.. Усё ж такі не наша балотнае, а адно замежнае польскае дэтэктыўнае агенцтва... Думаю, яно нядрэнныя табе грошы плаціць. Як, дарэчы, гэтае агенцтва называецца?

— «Максімус».

— Так-так, я ўспомніў... Мне б такое шчасце — у сэнсе працы.

— Кінь, — адмахнуўся Руцкі. — Праца як праца... Ну, на пасашок?

— Налівай. Раз ты ў «Максімусе», то будзем піць па максімусу... Дакладней, па максімуму... Цікава, чаму такая назва ў тваёй канторы? — не супакойваўся Стась. — Не разумею.

— Ды далі — па імені галоўнага героя фільма «Гладыятар», — патлумачыў Руцкі. — Глядзеў?

— Два ці тры разы, — махнуўшы, нібы конь, сівой галавой, адказаў Стась. — Добрае кіно. Мужык за справядлівасць стаяў... Ведаеш, у цябе — гэта не камплімент — таксама ёсць нешта ад гэтага Максімуса.

— Знешне?

— Прабач, але да Расела Кроў, — так, здаецца, сапраўднае імя і прозвішча кіношнага Максімуса, — ты не дацягваеш. Ён,

я думаю, за цябе маладзейшы, мацнейшы, ды і прыгажэйшы. А вось, што тычыцца характару, настырнасці, то тут ты з ім па адной паласе едзеш. Але можаш, як і Максімус, павярнуць на сустрэчны бок і каго-небудзь пратараніць, забіць. І сам разбіцца.

— Нечаканы вывад.

— Для цябе нечаканы, а для мяне просты і ясны.

— Ты пра тое, што я сказаў: застрэлюся?

«Не трэба было гэта казаць, — падумалася Руцкаму, — а то яшчэ сапраўды штосьці падобнае здарыцца».

— Не, я пра тое, што ты на самай справе можаш забіць, — падкрэсліў сваю думку Стась. Ён падняў указальны палец уверх. — Пуф-ф...

— Каго я магу забіць? — вырашыў удакладніць Руцкі.

— Ды хоць бы мяне. — Стась глядзеў прама ў вочы Руцкаму. На яго твары блукала нядобрая ўсмешка. — Я маю рацыю?

— Дзякуй за шчырасць, — замест адказу падзякаваў Руцкі, адводзячы позірк убок: чуць такія словы ад Стася, свайго сябра, яму было непрыемна.

— Калі ласка, — буркнуў Стась. — Наступае дваццаць першае стагоддзе, здавалася б, да дэмакратыі ідзём, а ў галовах людзей — феадалізм, нават рабаўладальніцкі лад.

— Людзі заўсёды такімі былі.

— Вось-вось... Некаторыя мае калегі, афіцэры, між іншым, звольненыя ў запас, падаліся ў бандыты. Падумаць толькі... А чаму?.. Да гэтага іх штурхаюць грошы...

— Мужчыны павінны быць здабытчыкамі, — сказаў Руцкі.

— А жанчыны? — выдыхнуў Стась. — Жанчыны таксама сталі здабытчыцамі. Цяпер яны са школьных гадоў спяшаюцца знайсці сваё месца пад сонцам, каб мець свае грошы. Пажадана, вядома, валюту. Прыгледзься, сам убачыш...

— Не ўсё тое золата, што блішчыць.

— Згодзен, — стомлена вымавіў Стась і нагадаў: — Дык я спадзяюся на цябе.

— Зраблю, хоць, шчыра кажучы, любая кантрабанда — справа небяспечная, непрадказальная.

— Ды якая ж гэта кантрабанда?.. Так, усяго толькі біжутэрыя, трохі... Я ж сказаў...

— Добра... Як разлічвацца з перавозчыкам будзеш? — спытаў Руцкі. — Перавозчык у мяне чалавек яшчэ малады, але сур'ёзны, цану сабе ведае.

— Ну, калі так, то няхай возьме для сябе з таго дабра, што перавязе, любы выраб, — дазволіў Стась. — Думаю, гэтага будзе дастаткова. А табе?..

Руцкі, скрывіўся, перабіў Стася:

— Калі мне нешта спатрэбіцца з тваёй біжутэрыі, я скажу...

Стась, развітваючыся, з вінаватым выглядам працягнуў Руцкаму руку:

— Дзякуй. Тэлефануй. А наконт таго, што я да цябе пастаянна звяртаюся, то так атрымліваецца. Я таксама гатовы для цябе зрабіць усё, што ты папросіш. Усё, павер. Таму і перажываю, калі з табой нешта не так...

У гэтым Руцкі не сумняваўся, таму ён і дапамагаў Стасю вырашаць яго шматлікія жыццёвыя праблемы. Праўда, пры гэтым употай спадзяваўся, што гэта яму залічыцца. Не Стасем, вядома. А там, наверсе. І ўсё роўна, у якім жыцці: гэтым або ў тым, якое яшчэ будзе ці можа быць.

Пакатаўшыся па Брэсце, пабываўшы на памежным пераходзе «Варшаўскі мост», Руцкі вярнуўся дадому а чацвёртай гадзіне ночы. Жонка, зірнуўшы на яго, са стомленасцю і болем прамовіла:

— Старая карціна.

«Старая і ўжо новая», — падумалася Руцкаму, але ўголас прамармытаў:

— Прабач, Каця: праца ў мяне такая — матацца туды-сюды. Ты ж ведаеш...

— Ведаю, — выціснула яна і дадала: — Усё я ведаю...

Руцкаму было крыху больш за дваццаць гадоў, калі ў яго з'явілася настойлівая думка: «Трэба ажаніцца». Прычым ажаніцца з самай прыгожай дзяўчынай. Гэта глупства, бо кожная дзяўчына прыгожая па-свойму. У гэтых адносінах Стась гаварыў праўду. І ўсё ж Руцкі знайшоў тую, якую шукаў. Невы-

сокая, стройная, з цёмнымі тонкімі бровамі, выразнымі блакі
нымі вачыма, невялікім, злёгку кірпатым носам, сакавітым
быццам саспелая вішня, пачуццёвымі вуснамі, яна адразу
вельмі моцна ўразіла яго тады, калі ўпершыню ўбачыў яе.

— Вітаю вас, — здзіўлена і з захапленнем усклікнуў ён. —
Як вас, дзяўчына, завуць?

— Кацярына, — сціпла, але годна адказала яна.

— А я Ягор.

— Значыць, мы цяпер знаёмыя. Спадзяюся, добрыя знаёмы

— Ес, — прамовіў Руцкі.

Яны засмяяліся.

Перад тым, як зрабіць Каці прапанову, ён купіў касцю
капялюш і прыдумаў тэкст, які павінен быў сказаць пер
чым стаць мужам сваёй выбранніцы. Пасля гэтага заказа
білет на самалёт і паляцеў да будучай жонкі. Яна працавала
іншым горадзе. Убачыўшы Руцкага ў капелюшы, Каця стр
га паглядзела на яго і сказала: «Здымі». Пакрыўдзіўшыс
ён зняў. З таго дня Руцкі ўсё менш і менш гаварыў адкры
з Кацяй. Ён амаль не казаў ёй пра яе прывабнасць, не пр
знаваўся ў каханні, затое ўсё часцей з яго языка зрываліся не
вовыя словы, якія адштурхвалі маладую жонку. Чаму Руцкі т
сябе паводзіў?.. Адпомсціць хацеў, ці што?.. Ён не разумеў гэт
га, а з гадамі перастаў нават спрабаваць разумець. Так і жыў —
самотна, хоць вакол яго амаль заўсёды былі людзі, і сярод і
вядома, самыя блізкія. Жыў неяк няпрыкаяна.

## III

Раніцай з Варшавы Руцкаму патэлефанаваў Богдан і сказа
адно слова:

— Прыязджай.

«Нешта здарылася», — зразумеў Руцкі.

Офіс дэтэктыўнага агенцтва «Максімус» знаходзіўся ў дом
па суседстве з гатэлем «Наватэль Цэнтрум». Гэта не офіс
звыклым разуменні, а звычайная трохпакаёвая кватэра,
якой сядзеў бухгалтар агенцтва і збіраліся яго работнікі. У а
ноўным яны прыязджалі на сваіх машынах, паркаваліся поба
з домам або каля гатэля. Але некаторыя прынцыпова ехалі

Варшаву на цягніках, каб ні ў кога не выклікаць падазрэнне і быць, як яны казалі, «як усе грамадзянскія». Справа ў тым, што за выключэннем двух-трох чалавек, у тым ліку Руцкага, усе астатнія члены «Максімуса» некалі насілі пагоны, бо былі супрацоўнікамі былой польскай Службы бяспекі, якую расфарміравалі, калі ўладу ў Польшчы ўзяў Незалежны самакіравальны прафсаюз «Салідарнасць», а прэзідэнтам краіны стаў заснавальнік і лідар гэтага прафсаюза Лех Валенса.

— Толькі нікому нічога не кажы, — папярэдзіў Богдан Руцкага. — Пры сустрэчы я ўсё растлумачу.

Ад чыгуначнага вакзала да офіса «Максімус» было каля пяці хвілін хады. Гэта зусім блізка, што ў аператыўнай рабоце адыгрывае немалаважную ролю. Да таго ж наўрад ці хто за такі кароткі час мог, як кажуць, сесці каму-небудзь на хвост.

Руцкі ўжо быў у гатэлі, калі ўбачыў Богдана — шыракаплечага цяжкаватага мужчыну за шэсцьдзясят. Ён прыехаў на цягніку «Люблін — Варшава», але паспеў ужо выпіць піва і быў у тым настроі, калі можна было прама спытаць, навошта яму, Руцкаму, так тэрмінова трэба было ехаць у польскую сталіцу.

— А ты што, не ведаеш? — прахрыпеў Богдан.

— Не, — закруціў галавой Руцкі.

— Збігнева забілі.

— Як?

— Задушылі. — На барвовым твары Богдана не ўздрыгнуў ні адзін мускул. — Шчыра скажу табе, што гэта незвычайнае забойства.

— А ў чым яго незвычайнасць? — Руцкаму было непрыемна, што смерць Збігнева не выклікала ў Богдана ніякіх эмоцый. — Нешта я не разумею.

— У тым, што задушылі Збігнева не адразу, — патлумачыў Богдан. — Экспертыза ўстанавіла, што спачатку ўдарылі па галаве нечым вострым, металічным. А потым ужо адбылося тое, што адбылося...

Паверыць у смерць Збігнева было цяжка: яшчэ не стары, фізічна дужы мужчына, ён займаўся арганізацыяй аховы маёмасці новаспечаных польскіх багацеяў. Працаваў асцярожна, але эфектыўна, дзякуючы чаму прыносіў немалы даход агенцтву.

— Вядома, за што забілі Збігнева? — спытаў Руцкі.

— За тое, што любіў грошы, — з ноткамі пагардлівасці і той жа час з нейкай таямнічай зайздрасцю да нябожчыка ад казаў Богдан. — А яшчэ за тое, што захапляўся жанчынам Чужымі жанчынамі. Гэта, дружа, страшная сумесь. Хіба дл цябе гэта навіна?

— Больш канкрэтна можна? — паспрабаваў удакладніц Руцкі.

Богдан не стаў утойваць.

— Тыповы выпадак, — пачаў распавядаць ён. — Збігне таемна сустракаўся з маладой жанчынай, а яна, як выявілас замужняя. Клічуць Хэленай. Яе муж — чалавек вельмі багат і досыць вядомы ў дзелавых колах. Думаю, Збігнеў гэта веда А калі не ведаў, то неўзабаве даведаўся. І даведаўся, вядома, а Хэлены. Яна — жанчына хоць куды: прыгожая, здаровая, д яшчэ і разумная. Палец у рот не кладзі. Я яе два разы бачы і павінен прызнацца: яна вартая таго, каб яе любілі. Але Збі неў, мне здаецца, не столькі быў у яе закаханы, колькі хаце палепшыць сваё матэрыяльнае становішча. Таму невыпадков каб ажыццявіць сваю мэту, пачаў працэс разводу са сваёй жо кай. Гэта значыць, рыхтаваўся прыбраць да сваіх рук і Хэлен і яе багацце.

— Як ты можаш так гаварыць?! — абурыўся Руцкі. — Збі неў на такое не быў здольны.

— Ты ў гэтым упэўнены? — крыва ўсміхаючыся спыта Богдан.

— Мы адна каманда, ведаем адзін аднаго не адзін год, — адказаў Руцкі.

Богдан спадылба паглядзеў на Руцкага.

— Ведаем... А ты ведаў, што наш сябар акучвае чужую жо ку?.. Вось так...

— Я ніколі не паверу, што Збігнеў вырашыў завалодац чужым багаццем, — звузіўшы вочы, нібы рыхтаваўся да бо кі, прамовіў Руцкі. — Наколькі мне вядома, яму і сваіх гроша хапала.

— Значыць, не хапала, — амаль урачыста вымавіў Богдан. — І гэта, між іншым, усе ведалі. Мала таго, што Збігневу пера

пала спадчына яго бацькі, былога партыйнага функцыянера, які раптам стаў саўладальнікам адной буйнай нафтавай фірмы, дык наш калега яшчэ нядрэнна зарабляў. І не толькі ў нашай арганізацыі. Але калі шмат грошай, згадзіся, хочацца мець іх яшчэ больш.

— Не ўсім, — з раздражненнем кінуў Руцкі.

— Я цябе зразумеў, — павольна вымавіў Богдан. — Табе, магчыма, і хапае. Але калі ты маеш на ўвазе мяне, то я не супраць мець столькі злотых, даляраў і еўра, каб не думаць пра грошы. Наогул не думаць. Але гутарка цяпер не пра мяне, а пра Збігнева. Суд, на якім павінны былі развесці Збігнева з яго жонкай, планавалася правесці ў пачатку наступнага месяца.

— У жніўні, значыць, — уставіў Руцкі, імкнучыся трымаць сябе ў руках.

— Вось-вось, — Богдан запаліў. — А ўчора паліцыя знайшла Збігнева мёртвым. Адразу за Варшавай. Ён ляжаў каля трасы на Брэст. Вакол шыі Збігнева быў закручаны тонкі медны дрот.

— Гэта пра нешта гаворыць? — пацікавіўся Руцкі.

— У тым і справа, што гаворыць, — ажыўлена выдыхнуў Богдан. — Муж каханай нябожчыка Збігнева гандлюе металам. Яго імя Фелікс. Прозвішча — Дзяжынскі.

— Амаль Дзяржынскі, — з іроніяй і нечаканай пагардай заўважыў Руцкі. — Нядобрая паралель.

— Так.

— Яго затрымалі?

— Не. — Богдан закруціў галавой. — Не паспелі.

— Чаму?

— Дзяжынскі з'ехаў у Расію. Ва ўсякім выпадку, ён заказаў білеты туды і назад.

— Як гэта нашай арганізацыі стала вядома?

— Даты і шлях следавання Дзяжынскага нам распісала яго жонка Хэлена.

— А патлумачыла, што яму трэба ў Расіі? — паспрабаваў высветліць Руцкі хоць нешта канкрэтнае, што магло яму спатрэбіцца, калі прыйдзецца займацца расследаваннем гэтага страшнага злачынства.

— Не, — адрэзаў Богдан. — Толькі сказала, што ў яго та
ёсць партнёры па бізнесе.

— Пастаўшчыкі металу?

— Напэўна.

— Добра, мая задача?

— Нічога складанага, а тым больш небяспечнага. Праз ты
дзень Дзяжынскі будзе вяртацца на цягніку ў Варшаву. Ты пав
нен праверыць, ці так гэта. Гэта значыць, пераканацца ў тым
што ён жывы, здаровы і едзе дадому.

— На якой чыгуначнай станцыі я павінен ладзіць гэтую пра
верку?

— На Брэсцкім чыгуначным вакзале, — сказаў Богдан. –
Практычна ў сябе дома.

— А як я даведаюся, што гэта Дзяжынскі? — Руцкаму был
незразумела таму, што камандны тон Богдана выклікаў абурэ
не, раздражненне, да ўсяго той злаваў і не даваў засяродзіцца. –
Буду хадзіць па вакзале і пытацца?

— Не шумі, — буркнуў Богдан. — Фатаграфію Дзяжынска
га, нумар цягніка і вагона я табе скіну на тэлефон. Калі пера
канаешся, што едзе менавіта Фелікс, патэлефануеш.

— Табе?

— Мне. Гэта рашэнне нашага дырэктара. У гэтай спра
ён прызначыў мяне за старшага. Можаш патэлефанаваць ям
зараз і пераканацца.

Напрамую Руцкі не падпарадкоўваўся Богдану, але той кож
ны раз стараўся навязаць сваю волю тым, кім камандаваў, п
казваючы, што больш кваліфікаваны і вопытны, чым усе я
калегі. А калі браць маладых, дык тут аб гэтым і размовы ням

— І што ты зробіш з Дзяжынскім?

Руцкі запытальна ўтаропіўся на шырокі мясісты твар Богд
на. Той ухмыльнуўся:

— Тое ж, што зрабіў Дзяжынскі або тыя, каму ён заплаці
са Збігневам: задушу. А ты што, супраць?

— Нават не ведаю.

— Тады ведай: так і будзе.

— Гэта рашэнне нашага кіраўніцтва? — пацікавіўся Руцк

— Ты здзівішся, але гэта рашэнне жонкі Фелікса Хэлены, –

хітра ўсміхаючыся прагаварыў Богдан. — Пасля смерці Дзяжынскага, калі ён, вядома, сапраўды пакіне гэты свет раней сваёй благавернай, усе актывы пяройдуць да яе. Не хачу памыліцца, але думаю, што Хэлена была ў курсе, дзе і ў якой арганізацыі працуе Збігнеў і пры яго дапамозе хацела забіць Дзяжынскага. Гэта, вядома, усяго толькі мая версія, але яна, пагадзіся, мае пад сабой амаль бетонавую падставу. Зрэшты, гэта ўжо ўсё роўна.

— У якім сэнсе?

— У тым, што яго жонка па-ранейшаму жадае пазбавіцца ад Фелікса. Але ўжо з дапамогай нашага агенцтва.

— Не падманвай. Не з дапамогай нашага агенцтва, а з тваёй дапамогай.

— Разумей, як хочаш. Хэлена плаціць, таму заказ будзе выкананы. Руцінная работа.

— І крывавая, — дадаў Руцкі. — Хіба не так?

— Не без гэтага, — абыякава кіўнуў Богдан і раптам эмацыянальна дадаў: — Ты гэта запомні!.. Старыя і правераныя кадры, да якіх я сябе адношу, практычна ніколі не працавалі ў пальчатках. Гэта значыць, не грэбавалі ніякай працай. Калі яна ёсць — трэба выконваць. Вось я і выконваю.

— Бачу.

— Добра, што бачыш. Я цаню тваю шчырасць. Яна неабходная, калі ў цябе добрыя адносіны з кіраўніцтвам. А цяпер я і ёсць менавіта тваё кіраўніцтва. Калі ты будзеш паводзіць сябе разумна, то я, зрабіўшы справу, буду абапірацца на цябе і далей. А ў мяне вялікія планы. І яны выходзяць за межы маёй роднай Польшчы. Ты разумееш?

— Здагадваюся, — прамовіў Руцкі.

— Калі здагадваешся, то я не дарма дзялюся з табой падрабязнасцямі смерці Збігнева, яго адносінамі з жонкай Дзяжынскага, раскрываю свой інтарэс.

— Ты вярбуеш мяне?

— Можна і так сказаць.

— Я магу перадаць нашу размову дырэктару агенцтва. Не баішся?

— Не, не баюся. — Богдан кінуў на Руцкага пагардлі
позірк. — Ну, раскажаш ты... І што далей?.. Табе медаль д
дуць, прэмію выпішуць?.. Нічога не дачакаешся... Да таго ж
скажу, што нашу размову ты выдумаў.

— Цікава.

— Яшчэ як цікава. Тым больш, што павераць мне, а не таб
нашага дырэктара я ведаю амаль трыццаць гадоў, разам з
працаваў не адзін год. Менавіта таму я табе яшчэ раз паўтара
у мяне вялікія планы і гэтыя планы я хачу ажыццяўляць з тва
дапамогай. Не бясплатна, вядома. Што тычыцца майго асаб
тага інтарэса, то дарога да ўзбагачэння амаль заўсёды ляжы
праз злачынства. У тым ліку і ў адносінах да сябе, сваіх кал
сяброў. І нават да сваёй сям'і. Я маю на ўвазе падаўленне сва
думак, жаданняў, абавязацельстваў і гэтак далей, калі яны п
рашкаджаюць справе. Гэта для таго, каб на сваім «я» пабуд
ваць іншае — больш саліднае, важнае, адпавядаючае сваім
асабістаму запыту на дадзены момант. Не больш, не менш.

— А калі гэты час не лепшы?

— Ну і што? Галоўнае, што з'явілася ці вось-вось з'явіц
магчымасць злавіць поспех за хвост і ажыццявіць задумана

— Сёння не толькі я шчыры. Ты мне таксама выдаеш то
чаго ніколі раней не дазваляў сабе. Дзіўна.

На нейкую хвіліну Руцкаму здалося, што Богдан распав
дае яму ўсё гэта наўмысна, каб ператварыць большасць сва
выказванняў у жарты, якія не варта аналізаваць. Гэта значыц
каб у далейшым, калі ён сапраўды заб'е Дзяжынскага, ніхто
агенцтва «Максімус» не западозрыў яго, Богдана, што ён, ху
чэй за ўсё, зрабіў гэта ў асабістых, больш за тое — карыслів
інтарэсах.

— Думай, што хочаш, але мая прапанова застаецца ў сіле. —
Богдан глянуў на гадзіннік. — Ідзём у офіс. Пара.

Варшава ўжо даўно прачнулася, і жыццё ў ёй не ішло,
бегла: спяшаліся не толькі людзі, але і машыны, аўтобусы, ця
нікі. І гэта асабліва кідалася ў вочы на цэнтральным чыгуна
ным вакзале і прылягаючых вуліцах і завулках.

Перш чым зайсці ў офіс, Богдан папярэдзіў:

— Я б не хацеў, каб пра нашу гутарку хто-небудзь ведаў. Гэта сур'ёзна... Няхай гэта застанецца паміж намі.

— Добра, — паабяцаў Руцкі, разумеючы, што з Богданам трэба быць увесь час напагатове, каб не апынуцца крайнім, калі яго небяспечныя планы спраўдзяцца.

## IV

У купэ міжнароднага цягніка «Масква — Варшава» Дзяржынскі ехаў адзін. З ім Руцкі павітаўся, папрасіў прабачэння, што зайшоў нібыта не ў сваё купэ і, адразу ж выйшаўшы з цягніка, які стаяў на Варшаўскім баку Брэсцкага вакзала, патэлефанаваў Богдану. Вымавіў усяго адно слова:

— Едзе.

Настрою ў Руцкага і так не было, а ў гэтую хвіліну сапсаваўся зусім. Яму захацелася напіцца. Але быў варыянт лепей: сустрэцца з Данутай. Нядоўга думаючы, Руцкі накіраваўся ў гатэль «Інтурыст».

«Можа яна яшчэ на працы? — з надзеяй падумаў ён. — Запрашу ў рэстаран. Пасядзім, пагаворым пра жыццё...»

Мужчыны, як вядома, аддаюць перавагу праследаванню здабычы, а не ловяць тое, што само ідзе або ляціць ім у рукі. Гэта закладзена ў свядомасці і падсвядомасці мужчын. Менавіта таму Руцкі вырашыў больш не спадзявацца на выпадак, дзякуючы якому зноў дзе-небудзь у Брэсце ці ў іншым месцы сустрэнецца з Данутай. Больш за тое, у Руцкага было такое адчуванне, што яна і сама чакае гэтай сустрэчы. Да яго радасці так і адбылося.

— А я вас успамінала, — павітаўшыся грудным голасам, які так прыцягваў да сябе, паведаміла Данута. — Нават падумала, што вы пра мяне забылі.

— Ніколі, — крыху па-тэатральнаму выдыхнуў Руцкі.

Данута, не расціскаючы вуснаў, заўсміхалася.

— Ніколі, — паўтарыў Руцкі, адчуваючы ў сэрцы пяшчоту. — Я таксама ўспамінаў вас, думаў... Практычна кожны дзень...

— Мне прыемна, але не гаварыце пра гэта.

— Чаму?

— Мы нічога не ведаем адно пра аднаго. Наогул нічога.

— Калі мы сябры ці будзем сябрамі, то гэта не праблема — галовы і языкі ў нас ёсць.

— Я разумею, але баюся памыліцца.

— Наконт мяне?

— І сябе таксама... Такое ўжо было... — Дзяўчына міжво падалася да Руцкага. — Ведаеце, мне прысніўся гэтай ноч дзіўны сон. — Яна злёгку расцягвала словы, якія, здавалас часткова заставаліся ў яе горле. Заставаліся для таго, каб с размоўца быў больш уважлівы і цаніў не толькі тое, што пачу ужо, але і з нецярпеннем чакаў наступных слоў. — Так, вель дзіўны сон... Быццам наша рака Мухавец выйшла з берагоў затапіла палову горада. Амаль усе будынкі, жылыя і нежылы уключаючы чыгуначны вакзал. А я якраз сабралася з'язджаш Ужо і білет купіла, накіравалася ў вагон. І тут заўважыла, ш у мяне ў руках няма чамадана. Уяўляеце?..

— Вядома.

— Ці то ў мяне яго скралі, ці то ён застаўся дома... Незраз мела. А ў гэтым чамадане мае рэчы, дакументы, грошы. Ш рабіць?.. Стаю і думаю. І раптам заўважаю, што мой чамада ляжыць каля лавы, дзе я сядзела. Цуд!.. Бягу да чамадана, а крываю яго, а ў ім замест адзення, біжутэрыі, дакументаў грошай — вада. Яна брудная, з жоўтай пенай, выліваецца... Н разумею, што азначае мой сон.

— Давай не будзем адно аднаму выкаць, — мякка прапан ваў Руцкі. — Ці ты лічыш, што я ўжо стары?

— Ды не, — сказала Данута, гледзячы на свайго суразмоў і як быццам скрозь яго. — Галоўнае, каб мужчына быў мужчы нам, а яго ўзрост — справа другарадная.

Руцкі быў не тое каб усцешаны, але яму стала неяк спака ней: пасля такіх слоў можна было размаўляць з Данутай так, быццам яны былі аднагодкамі. Гэта значыць проста, без агля кі на гады, вопыт, сям'ю.

— Не магу забыць свой сон, — зноў загаварыла Данута.

— А ты куды-небудзь хочаш з'ехаць? — спытаў Руцкі.

— Так.

У гэтым «так» адчулася нешта большае, чым пераезд з аднаго горада ў іншы або з адной краіны ў другую. У яе «так» быў выклік і прыхаваная гатоўнасць да ахвярнасці дзеля ажыццяўлення сваіх планаў.

— І куды, калі не сакрэт? — пацікавіўся Руцкі.

— У Польшчу, — з упэўненасцю і рашучасцю адказала Данута. — Мая бабуля — чыстакроўная палячка, а дзед — беларус. Так што мой дом і тут і, атрымліваецца, у Польшчы.

— Мяркуючы па тым, што табе прыснілася, ты нікуды не з’едзеш, — выказаў сваё меркаванне Руцкі.

— Не кажы так. — Данута напусціла на сябе строгасць, але праз некалькі секунд яе голас стаў больш мяккім, лагодным. — Я хачу з’ехаць. Вельмі хачу.

Яе «хачу» выклікала ў Руцкага дадатковы прыліў пяшчоты, жаданне абараніць Дануту. Ён нават міжволі павёў вачыма па баках, быццам шукаў таго, хто мог яе пакрыўдзіць. На шчасце, не ўбачыўшы нікога небяспечнага і падазронага, спытаў:

— Навошта табе ехаць?

— У Польшчы жыць лепш, прасцей, а галоўнае — больш магчымасцей для самарэалізацыі, — прывяла аргументы Данута ціхім, плаўным голасам. — Еўропа ўсё ж.

— Гледзячы для каго больш магчымасцей. — Руцкі сказаў гэта такім тонам, нібы Данута ўжо сапраўды з’язджала, а ён прыйшоў яе прасіць не рабіць гэтага. — Ты падумай. А што тычыцца Еўропы, то мы таксама еўрапейцы. Хіба не так?

— Так, — не стала спрачацца Данута, выдыхаючы з сябе ледзь не ўсё паветра. — Толькі мне асабіста ад гэтага не лягчэй і не лепш. Разумееш?

— Сёння не лягчэй і не лепш, а заўтра ці паслязаўтра ўсё наладзіцца і ўсё зменіцца, — пачуццёва гледзячы на яе ледзьледзь пачырванелы твар, сказаў Руцкі. — Вось пабачыш.

У глыбокіх вачах дзяўчыны з’явілася сумненне і нейкая разгубленасць.

— Не ведаю, ці спраўдзяцца мае планы, ці стане рэальнасцю мая мара, — задуменна прамовіла яна, робячы паўзы і звыкла расцягваючы словы.

Было незразумела, адрасавала яна іх Руцкаму або самой сабе.

— Вось іменна, — прамовіў ён. — Добра ехаць, калі ёс
грошы, ці да таго, у каго ёсць грошы. Павер, мне гэта вядо
лепш, чым многім з тых, хто думае, што за мяжой рай.

— Напэўна, ты кажаш праўду, — ужо амаль не аспрэчваю
аргументы Руцкага з нейкай нечаканай пакорай сказала Да
та. — Але я ўсё ж веру, што мне пашанцуе і з'явіцца шчаслі
выпадак. Той самы шчаслівы выпадак, які прыносіць поспе
які я выкарыстаю з выгадай для сябе.

— Выпадак?.. — У памяці Руцкага пачуўся голас Богда
«Галоўнае, што з'явілася ці вось-вось з'явіцца магчымас
злавіць поспех за хвост і ажыццявіць задуманае». Таму Ру
нагадаў Дануце вядомы выраз: — Добрымі намерамі выбру
вана дарога ў пекла.

Пачырванеўшы, Данута спытала:

— Ты пра тое, што жаданні не заўсёды супадаюць з магч
масцямі?

— І пра гэта таксама, — пацвердзіў Руцкі. — Мне памята
ца, што менавіта гэта ты сказала ў час нашай першай сустрэч
Так што, на жаль, няма нічога новага ні пад сонцам, ні п
месяцам.

— Так, я гэта добра ведаю і не пераацэньваю свае магч
масці, — шчыра сказала Данута. — Але іх у мяне, як у кожн
чалавека, нямала. Трэба гэтыя магчымасці проста бачыць.

— А ты бачыш?

— А ты хіба не бачыш?

— Маладосць, прыгажосць, розум. Што яшчэ?

— Яшчэ цярпенне. Павер, трываць я ўмею: навучылася.

— Цярпенне цярпенню не роўнае, — павучальна прамо
Руцкі. — Што ты будзеш рабіць, калі дзеля сваёй мары та
прыйдзецца паступіцца нечым вельмі дарагім для цябе?

— Што ты маеш на ўвазе?

— Напрыклад, калі ты заплаціш свабодай, шчасцем. Вос
Простым жаночым шчасцем.

Дзяўчына ўся сціснулася, нібы на яе вылілі вядро халодн
вады. Памаўчаўшы, папрасіла:

— Не палохай.

Каб перамяніць тэму і пагаварыць пра што-небудзь іншае, больш істотнае на той час, Руцкі пацікавіўся:

— Ты вячэрала?

— Не-э, — запаволена, не жадаючы ў гэтым прызнавацца, закруціла галавой Данута. — Не паспела.

— У такім выпадку прашу прайсці са мной у рэстаран, — запрасіў Руцкі. — Калі ласка.

Яны селі за столік каля акна. Інтурыстаўскі рэстаран знаходзіўся на другім паверсе, таму з яго вокнаў добра быў бачны галоўны ўваход у гатэль. Каля ўвахода, як і заўсёды, было мнагалюдна: тоўпіліся як прыезджыя, так і мясцовыя жыхары. Адны спяшаліся пасяліцца ў гатэль, другія прыйшлі сюды, каб зрабіць свой маленькі бізнес: купіць крыху ў замежнікаў валюты, выпіць у бары кубак кавы, пару чарак добрага віскі, джына або пагуляць у рэстаране. Трэція круціліся тут таму, што жылі побач і ў «Інтурысце» адчувалі сябе як дома. Сярод гэтай публікі вылучаліся больш за іншых сваіх супляменніц так званыя блудніцы. Большасць з іх была апранута ў ласіны і кароткія спадніцы. Маладыя і ўжо сталыя жанчыны, яны выглядвалі сваіх патэнцыйных кліентаў.

— Ведаеш, мне заўсёды сумна назіраць гэтую карціну, — прамовіла Данута. Яе дыханне пачасцілася, быццам яна ўбачыла сябе на месцы гэтых шчодралюбных асоб і рыхтавалася бегчы далей ад «Інтурыста». — Та-ак, сумна, — падкрэсліла яна. — Але я нікога не асуджаю: кожны зарабляе, як можа.

— Гэта зразумела, — пагадзіўся Руцкі. — У Бібліі ёсць такі выраз: «Што ж ты глядзіш на парушынку ў воку брата твайго, а бервяна ў сваім воку не заўважаеш?»

— А ты чытаеш Біблію?

Данута са здзіўленнем глядзела на Руцкага.

— Так, — кіўнуў ён. — Але калі чытаю, то не ўсё разумею.

— З часам зразумееш.

— Думаеш?

— Чалавек заўсёды ідзе ад простага да складанага. І ты прыйдзеш. Гэта значыць, пачнеш разумець.

«Цікава, што менавіта ты зразумела», — падумалася Руцкаму.

Дзяўчына як быццам пачула яго думку і прамовіла:

— Мне здаецца, што ў цябе таксама ёсць парушынка ў во

— Можа, і цэлае бервяно, — задуменна сказаў Руцкі. Хутчэй за ўсё, менавіта бервяно.

— Раскажы што-небудзь пра сябе, — папрасіла Данута. Калі ласка.

— Што?

— Што хочаш. А лепш тое, што сядзіць у табе і ты ведае яно нікуды не сыдзе.

Руцкаму чамусьці прыгадаўся Стась, хоць можна было ра казаць пра сваю жонку, для якой, нягледзячы ні на што, ё Руцкі, быў блізкім і родным чалавекам.

— Гадоў дзесяць таму адзін з маіх сяброў, клічуць я Станіславам, а па-простаму — Стасем, трапіў у нядобру амаль бязвыхадную сітуацыю, — пачаў Руцкі свой аповед. Стась — інспектар ДАІ. Цяпер ён ужо капітан, а ў той час бі малодшым лейтэнантам. На сваім дзяжурстве Стась убачыў м тацыкліста, які перавышае хуткасць. Паспрабаваў яго спыні але матацыкліст не спыніўся. Што рабіць?.. Стась пагнаўся ім на міліцэйскай «Волзе». А гэтага нельга было рабіць, тады дзейнічала сакрэтнае ўказанне: матацыклістаў не да няць, каб яны, уцякаючы, не разбіліся. Стась, атрымліва ца, праігнараваў указанне начальства. Як вынік, матацыклі малады хлопец, разбіўся. Пачалося расследаванне. На Ста завялі адміністрацыйную, а потым і крымінальную спра адхілілі ад службы. Ён звярнуўся да мяне за дапамогай. І я д памог: угаварыў раённага пракурора замяць гэтую справу. Гэ значыць апынуўся, па сутнасці, саўдзельнікам злачынства. М навіта злачынства, хоць фармальна быццам бы вінаваты мат цыкліст, а не Стась і тым больш я.

— А кім ты ў той час працаваў? — пацікавілася Данута. Калі, вядома, гэта не сакрэт.

— Загадчыкам аддзела абласной газеты, — не без гона вымавіў Руцкі.

— Ты журналіст?

— Быў журналіст, але практычна пакінуў гэтую прафесі Можа, на які час, а магчыма, назаўсёды.

— Шкадуеш?

— Бывае, — прызнаўся Руцкі. — Мяне сапраўды перыядычна мучыць настальгія па сваёй прафесіі, атрыманай ва ўніверсітэце. Бо журналістыка — творчая праца. Хоць і рэдка, але амаль паэзія. А мая сённяшняя дзейнасць — гэта проза. Суцэльная проза.

— А што гэта за дзейнасць? — праявіла жывую пацікавілася Данута.

— Нічога цікавага. — Руцкі развёў рукамі. — І нічога асаблівага, чаму можна было б зайздросціць, хоць я і працую ў адным польскім агенцтве.

— І што гэта за агенцтва?.. — У вачах дзяўчыны бліснуў агеньчык. — Як яно называецца?.. Толькі не падманвай.

— Навошта мне падманваць? — Пацiснуўшы плячыма, Руцкі ўсё ж такі сказаў няпраўду, бо праўду распавесці не мог, не меў права. — Наша арганізацыя ціхая і сціплая. Аказвае юрыдычныя паслугі насельніцтву.

— Але ты не юрыст.

— На факультэце журналістыкі я вывучаў пытанні такой навукі, як юрыспрудэнцыя. Не думаў, што спатрэбяцца гэтыя веды, а аказалася, што спатрэбіліся.

— Ты задаволены?

— Не тое каб вельмі, але ў цэлым мяне гэта работа задавальняе. Сумаваць не прыходзіцца.

— А я вучыла ў школе дзяцей англійскай і польскай мовам, — з сумам прамовіла Данута. — Цяпер вось тут, у гатэлі. Не працую, а хутчэй падзарабляю: перакладаю жывую гаворку, складаю на рускай, англійскай і польскай мовах дагаворы, кантракты, пішу нейкія даведкі. Карацей кажучы, час ідзе, а ні грошай, ні перспектыў. Таму і хачу з'ехаць. Ва ўсякім выпадку да сённяшняга вечара планавала гэта зрабіць.

— А што кажуць твае бацькі?

Руцкаму гэта было цікава, бо іх працяг — дзеці. А Данута яго не проста цікавіла, ён хацеў пра яе ведаць усё. Па магчымасці, вядома.

— Бацькі ў мяне няма... Дакладней, ён звязаўся з іншай, чужой жанчынай, а мама памерла... — Дзяўчына журботна апусціла галаву. — Анкалогія... Менавіта яна, праклятая...

— Прабач.

— Што ёсць, то ёсць, — выціснула Данута, выціраючы павільгатнелыя вочы. — Я ўжо змірылася. Ды і вярнуць ужо нічога нельга. Ні-чо-га, — па складах паўтарыла яна.

— Гэта жыццё, — прамовіў Руцкі. — Ёсць пачатак і ёсць канец. Давай больш не будзем гаварыць пра сумнае, страшнае.

— Давай.

— Тады скажы, што б ты хацела паесці?

— Марожанае.

Сказаўшы гэтае слова, Данута павесялела. Разам з ёй падняўся настрой і ў Руцкага.

— І ўсё?

— Усё. Ты здзівішся, але я марожанае люблю з дзяцінства. Праўда, у дзяцінстве я яго амаль не ела — у мамы вечна не хапала грошай, бо атрымлівала яна мала. Да ста рублёў на савецкія грошы. За іх і пракарміцца трэба было, і апрануцца, і за кватэру заплаціць.

Руцкаму стала шкада Дануту. Так шкада, што яму захацелася літаральна заваліць яе марожаным, як завальвае снег маленькую навагоднюю ёлку, што ставяць і ўпрыгожваюць дзеці ў двары. Ён падняў руку, паказваючы гэтым, што хоча зрабіць заказ.

Афіцыянтка, ужо немаладая, у парыку каштанавага колеру, паклала на столік, за якім сядзелі Руцкі і Данута, меню і ветліва запыталася:

— Будзем заказ рабіць адразу ці падумаем?

— Адразу, — з гумарам адказаў Руцкі. — Нясіце нам марожанае. Па дзве порцыі. На ваш выбар.

— Зразумела, — лагодна і паблажліва, як малым дзецям, усміхнулася ім афіцыянтка. — Я хутка.

Яна прынесла марожанае: з вяршкоў і шакаладнае. Руцкі і Данута з задавальненнем пачалі есці. Дзяўчына краёчкам языка раз-пораз міла аблізвала сваё марожанае. Руцкі назіраў за ёй і любаваўся яе прастатой і натуральнасцю.

— Хочаш, паедзем у Польшчу? — прапанаваў ён Данусе, ледзь стрымліваючы сябе, каб не абняць яе.

Гэта быў такі своеасаблівы дэсерт, які паднёс Руцкі пасля марожанага, хоць яно таксама з'яўляецца нічым іншым, як самым сапраўдным дэсертам. Данута адразу прыняла прапанову Руцкага:

— Хачу.

— Добра, — ужо дзелавіта прамовіў ён, абдумваючы, калі паехаць у суседнюю краіну, у якім горадзе і ў якім гатэлі спыніцца.

## V

Усё складалася так, як Руцкі нават і не думаў. Неўзабаве адным буднім днём пачуўся званок мабільнага тэлефона Руцкага і добра знаёмы яму голас прахрыпеў:

— Запрашаю на банкет. Будзе ў наступныя выхадныя.

Гэта гаварыў Богдан.

— Што за свята? — не зусім ветліва пацікавіўся Руцкі.

— Сыходжу на пенсію, — не звяртаючы ўвагі на яго тон, весела паведаміў Богдан. — Усё, хопіць гарбаціцца на другіх. Хачу пажыць для сябе. Думаю, што заслужыў. Як лічыш?

— Табе лепш відаць, — разважліва сказаў Руцкі, пачынаючы разумець, што гэтая паездка для яго можа стаць удалай і нават шчаслівай, калі ўзяць з сабой Дануту.

— Так, лепш відаць, — з выклікам прамовіў Богдан. — Банкет у гасцініцы «Наватэль Цэнтрум». Можаш прыехаць з жонкай ці сяброўкай. Гэта ўжо як вырашыш.

Руцкі тут жа патэлефанаваў Данусе і, ледзь стрымліваючы радасць, адкрыта выклаў:

— У мяне з'явілася магчымасць правесці на наступным тыдні пару дзён разам з табой у Варшаве. Як ты на гэта глядзіш?

— Гляджу так, як дамаўляліся ў рэстаране, — мяккім голасам адказала Данута. — Я гатова.

— Тады чакай майго званка. Будзем выязджаць раніцай. Галоўнае — не праспаць.

— Не турбуйся, — весела дыхнула ў трубку Данута. — У прызначаны час я буду цябе чакаць каля мэблевай крамы, што насупраць набярэжнай.

— Ты там жывеш? — У голасе Руцкага былі ноткі здзіўлення і роспачы. — Не ведаў.

— Та-ак, толькі я жыву не ў доме, дзе мэблевы магазін, а за ім, — патлумачыла Данута. — Другі пад'езд, уваходныя дзверы пафарбаваны ў зялёны колер.

«Як святлафор», — падумаў Руцкі, але ўголас сказаў:

— Я зразумеў, Данута, зразумеў.

Яму здавалася, што Данута, памятаючы сваё беднае дзяцінства, прадала старое жыллё, пасля чаго зарабіла грошай ці ўзяла крэдыт і купіла сабе вялікую кватэру, каб жыць у цэнтры горада, у элітным доме. Руцкі не ведаў, чаму так думаў. Напэўна, падсвядома накладаў кідкую знешнасць Дануты на яе лад жыцця, які павінен быў вылучацца рознакаляровымі фарбамі сярод усеагульнага, усё яшчэ шмат у чым шэрага савецкага побыту правінцыйнага Брэста.

— Не зблытай, — папярэдзіла яна.

— Буду глядзець уважліва, — з гатоўнасцю слухацца яе ледзь не ва ўсім сказаў Руцкі. — Сама пераканаешся...

У нейкі момант яго стала напаўняць пачуццё салодкага чакання чагосьці яркага, ні на што не падобнага, быццам ён вярнуўся ў дзяцінства, упершыню ў жыцці асядлаў ровар і вось-вось панясецца з высокай гары ўніз, набіраючы хуткасць.

— Дом наш стары, з сілікатнай цэглы, — уздыхнула дзяўчына, вяртаючы Руцкага на зямлю. — Часам мне хочацца, каб пад нашым домам утварылася якая-небудзь расколіна, а лепш вялізная яма і ён у яе праваліўся.

— Гэта жорстка, — заўважыў Руцкі, амаль не надаючы значэння сваім словам.

— А хіба не жорстка жыць увесь час у адной і той жа кватэры? Прычым маленькай, з шасціметровай кухняй? — У голасе Дануты чуўся жаль і адначасова дакор. Гэты дакор, хутчэй за ўсё, быў адрасаваны Руцкаму. — У цябе першая ці другая кватэра, у якой ты зараз жывеш?

— Чацвёртая, — не падумаўшы сказаў ён.

— Напэўна, вялікая.

— Не маленькая.

— Ты шчаслівы, — выціснула дзяўчына.

— Не ў кватэрах шчасце, — паспяшаўся запэўніць яе Руцкі як настаўнік, які вучыць сваю падапечную жыццю.

— Так, але ў кватэрах таксама, — стаяла на сваім Данута. — І не спрачайся, калі ласка.

— Не буду, — вінавата сказаў ён. — Толькі ты не думай пра мяне дрэнна. Добра?

— Пастараюся...

Пачуццё незвычайнай лёгкасці, якое напаўняла Руцкага хвіліну таму, знікла, і нешта цяжкае пачало ціснуць на яго і прыцягваць да зямлі, ад якой ён ужо амаль адарваўся, а цяпер зразумеў, што зрабіць гэта не так проста.

— Не крыўдуй, але я ведаю, што кажу. — Дзяўчына як быццам прасіла прабачэння, але ў той жа час даказвала, што мае рацыю. — Вось сёння мне патэлефанавала аднакласніца і запрасіла паабедаць у шыкоўным кафэ на вуліцы Савецкай. Там такія ўстановы, ты ведаеш, паўсюль. Я адразу ж прыкінула, колькі ў мяне грошай у кашальку. А ў ім усяго нічога, бо да зарплаты яшчэ больш за тыдзень, а аванс я ўжо праела. «У нас у гадзіну дня нарада, — схлусіла я аднакласніцы. — У другі раз абавязкова сходзім куды-небудзь на абед разам. Ты прабач». А з гэтай аднакласніцай я не бачылася чатыры ці чатыры з паловай гады. Карацей кажучы, у абедзенны час дастала я хатнія бутэрброды і стала есці. Ем і ледзь не плачу. Так што не трэба мне распавядаць, якое яно — шчасце. Яно ў тых, каму ў жыцці шанцуе.

— І шчасце, і няшчасце не вечныя, — ціха ўставіў Руцкі. — Сёння адно, а заўтра другое.

— Так, але не для ўсіх. Асабіста я часта не магу дазволіць сабе самае элементарнае. Напрыклад, купіць скуранае паліто. Не самае дарагое, а тое, якое не шкада апранаць у дрэннае надвор’е, калі дождж, снег... Смешна?

— Не, сумна.

— Вось і мне сумна, — амаль холадна і неяк адчужана сказала Данута.

«Не варта было казаць ёй, колькі ў мяне было кватэр, — падумаў Руцкі. — Вырашыла, напэўна, што я хвалюся. І наогул...»

На жаль, задні ход ужо даць было немагчыма.

## VI

Нумар, які Руцкі зняў у гасцініцы «Нäватэль Цэнтрум», Дануце спадабаўся. Ён быў прасторны і стыльны. Цэнтральную частку нумара займаў шырокі ложак. Каля акна стаяла скураная канапа. Да сцяны, якая цешыла вока сваёй белізной, прымыкаў доўгі стол, на ім стаяў вялікі тэлевізар. На падлозе — светла-шэрае дывановае пакрыццё. Увогуле, усё стандартнае. Але вось на ложку і на канапе вылучаліся чырвоныя падушкі. На іх Руцкаму хацелася тут жа пакласці галаву, а лепш — прыціснуцца да іх і адпачыць. І не аднаму, а з Данутай.

— Дзякуй, — падарыла яна Руцкаму сваю чароўную ўсмешку, прысеўшы на канапу і паклаўшы чырвоную падушку сабе на калені.

Пасядзеўшы так з хвіліну, дзяўчына раптам ускочыла, хутка падышла да Руцкага і пацалавала яго ў шчаку. Гэта было, з аднаго боку, нечакана, а з другога — Руцкі чакаў і нават рыхтаваўся да гэтага прыемнага моманту. Тым больш, што ён быў знаёмы з Данутай ужо два месяцы, а яны яшчэ ні разу нават не пацалаваліся. У адказ Руцкі хацеў яе абняць, але яна, упёршыся рукамі яму ў грудзі, ціха і пачуццёва вымавіла:

— Потым.

Руцкі не пакрыўдзіўся: потым дык потым. Больш за тое, ён адчуў упэўненасць і лёгкасць, нібы зноў быў малады нежанаты чалавек ва ўзросце крыху больш за дваццаць гадоў.

— Адкрый акно, — папрасіла Данута. — Нешта душна.

— Можа, уключыць кандыцыянер? — Турбота Руцкага за яе была шчырай. — Пяць хвілін — і стане халаднавата.

— Не, я баюся холаду, — адмовілася яна. — І нават прахалоды. Ведаеш, калі б гэта залежала ад мяне, то я назаўсёды скасавала б зіму ці хаця б зрабіла яе самай кароткай парой года.

— У такім выпадку ў мяне прапанова, — сказаў Руцкі, выразна зірнуўшы на халадзільнік, знешне падобны на драўляную тумбачку.

— Здаецца, я ўжо ведаю, што ты хочаш прапанаваць, — здагадалася Данута.

— Значыць, ты не будзеш супраць, — усміхнуўся ён і, адкрыўшы халадзільнік, убачыў у ім некалькі буйных яблыкаў, груш, мінеральную ваду, бутэльку французскага чырвонага віна з Бургундыі і бутэльку шатландскага віскі. — Прыемна, што ў гасцініцы «Наватэль Цэнтрум» умеюць прымаць гасцей.

— Я ў гэтым не сумнявалася, таму і не буду супраць, — пацвердзіла Данута сваю гатоўнасць трохі выпіць з дарогі, каб расслабіцца і проста сагрэцца. — Толькі вымыю рукі.

— Я зраблю тое ж самае ...

Ванны пакой прыемна ўразіў Руцкага і Дануту: малочна-белы, утульны, з доўгімі электрычнымі плафонамі, сушылкамі для рук і валасоў, шматлікімі слоічкамі з рознымі мазямі, шырокімі ручнікамі, а галоўнае — вялікай ваннай.

— Можна змясціцца ўдваіх, — жартаўліва, але ў той жа час з намёкам сказала Данута і глыбока ўдыхнула ў сябе крыху вільготнае паветра. — Так?

— Так, — пагадзіўся Руцкі, не ўнікаючы ў сэнс яе слоў, што адбывалася з ім усё часцей, калі побач была яна.

Як сказаў бы Стась, гэта ўжо парушэнне самакантролю, якое вядзе да аварыі.

Вада Дануту асвяжыла, а Руцкаму дадала яшчэ і аптымізму. Выйшаўшы з ваннай, ён хутка разрэзаў яблык і грушу на долькі, разліў у шклянкі віскі, кінуў у іх па некалькі кавалачкаў лёду, які ляжаў у маразільнай камеры, і прапанаваў:

— За цябе, Данута.

— І за цябе, — сур'ёзна сказала яна, не прамовіўшы ні слова з нагоды таго, што Руцкі, не пытаючыся яе, напоўніў шклянкі не віном, а значна больш моцным напоем. — За нас абодвух...

Данута выпіла, пакідаючы густую фарбу памады на шклянцы, пасля чаго села ямчэй, паклаўшы адну нагу на другую. Яе і так кароткая спадніца сабралася ў гармонік і стала яшчэ

карацейшай, ледзь не да паловы агаліўшы далікатна-белае цела сваёй гаспадыні. Погляд Руцкага мімаволі прыліп да яе каленяў, папоўз вышэй. Данута гэта заўважыла і сарамліва апусціла вочы. Але Руцкі бачыў, што ёй было прыемна.

— Вып'ем яшчэ, — прапанавала яна ўжо сама.

Яны выпілі, з апетытам даелі фруктовую закуску. Потым нейкі час маўкліва сядзелі, пажадліва пазіраючы адно на аднаго. Рухі Дануты паступова замарудзіліся, а вочы пацямнелі, сталі неапісальна прывабнымі і загадкавымі. А яшчэ набылі нейкае вядзьмарства, якое паліла Руцкага знутры, нібы ён выпіў не віскі, а чысты, не разведзены спірт.

— Добра тут, — заўважыла дзяўчына.

— Так, — ціха, нібы баяўся спалохаць сваё шчасце, прамовіў Руцкі.

— Для мяне нязвыкла, — дадала яна.

— Можа, спусціцца ў рэстаран? — прапанаваў Руцкі, хоць у яго не было ніякага жадання кудысьці ісці, не хацелася ні з кім, акрамя Дануты, у гэты час быць.

— У рэстаран?

Данута ці не пачула, ці не зразумела. Але ўжо праз імгненне прыйшла ў сябе і, на радасць Руцкаму, звыкла расцягваючы словы, мякка адмовілася:

— Не, позна ўжо.

Руцкі глянуў у акно. За ім плыла цемрадзь, скупа разведзеная дрыготкім святлом ад ліхтароў, вітрын крамаў і вокнаў дамоў.

— Лепш прыняць душ і спаць, — быццам для сябе, але ў той жа час і для Руцкага сказала Данута. — Спаць...

Сказала так проста і спакойна, нібы яны былі муж і жонка, закаханыя адно ў аднаго.

— Так, — заківаў галавой Руцкі, адчуваючы нарастаючую ўзрушанасць ва ўсім целе.

«Так...»

Час для яго замарудзіўся. У нейкі момант як бы спыніўся: Руцкі, нічога не заўважаючы вакол, утаропіўся на дзверы ваннага пакоя і стаў чакаць, калі з яго выйдзе Данута. Калі б яна

паказалася на парозе, Руцкі ўскочыў бы і кінуўся да яе. Але дзяўчыны ўсё не было. Прайшло дзесяць хвілін, дваццаць, дваццаць пяць, трыццаць... Цела Руцкага пачало камянець, а гасцінічны нумар як быццам стаў згортвацца, робячыся коканам, з якога немагчыма было выбрацца. Жаданне Руцкага стала згасаць, ды і сам ён як быццам пачаў сціскацца, рабіцца меншым, ператвараючыся з чалавека ў нейкую не зусім зямную, затарможаную істоту. Напэўна, гэта была стомленасць, а яшчэ падзейнічаў выпіты алкаголь.

— Добра, — расчаравана выціснуў Руцкі, закрываючы вочы і адчуваючы, што можа заснуць, — пакуль адпачну...

З ванны, нарэшце, з'явілася Данута. Убачыўшы яе, Руцкі ўзбадзёрыўся, прыліп поглядам да яе цела, шчодра напоўненага прыродным хараством і жаноцкасцю.

«Прыйшла...»

Круглыя грудзі Дануты, выглядаючы з-пад халата, панадліва блішчалі ружовым макроццем, а на яе далікатным твары гулялі ружавата-чырвоныя плямы, на якія Руцкаму хацелася падзьмуць, каб трохі іх астудзіць, а потым прыціснуцца да цёплых шчок дзяўчыны вуснамі і доўга не адпускаць, атрымліваючы асалоду ад кахання. Тым часам Данута стаяла, нічога не казала і неяк дзіўна глядзела не на Руцкага, а скрозь яго.

— Нешта не так? — устрывожыўся ён.

— Я чакала цябе ў душы, — засмучана, а больш за тое — расчаравана прагаварыла Данута. — Ты не прыйшоў да мяне...

Руцкаму хацелася крыкнуць: «Я таксама цябе чакаў! Вельмі чакаў...» Але ён не закрычаў і наогул не сказаў ні слова. Усё і так было зразумела: яго жаданне блізкасці з Данутай спатыкнулася аб яе нечаканую халоднасць і адхіленасць.

— Я не падумаў, што ты мяне чакаеш у ваннай, — з горыччу і надзеяй, якая так і не спраўдзілася, прагаварыў Руцкі. — Прабач...

Данута не спяшаючыся, з нейкай унутранай стомленасцю і абыякавасцю, зняла халат. Голая, яна пастаяла так з хвіліну, быццам была адна ў нумары і ёй няма каго саромецца, затым легла на ложак, накрылася коўдрай і пакрыўджана адвярнулася да сцяны, закрыўшы ў дадатак твар чырвонай падушкай.

Руцкі, выбраўшы для сну канапу, доўга не мог заснуць: глядзеў у цемру, але бачыў раскошнае белае цела Дануты, якое, здавалася, ледзянела і станавілася больш ватным. Калі б яна ў гэты момант паклікала яго, ён імгненна б апынуўся каля яе. Але дзяўчына не паклікала.

## VII

Ранак абяцаў ясны дзень. Ён шчодра ліў сонечнае святло ў гатэльны нумар. Данута, памыўшыся, падышла да акна, доўга і ўважліва глядзела, потым з настроем вымавіла:

— Гэта выдатны горад. У ім ёсць нешта такое, чаго няма ў іншых гарадах. Так, менавіта так... Я ўсё больш хачу жыць у Польшчы. Няхай спачатку будзе цяжка, няхай... Але потым... Я хачу, хачу...

— Калі чагосьці моцна жадаць, то гэта збудзецца, — заўважыў Руцкі, забыўшыся, што адгаворваў Дануту мяняць свой родны горад на іншае месца жыхарства і наогул, забыўшыся пра мінулую ноч...

— Няпраўда, — запярэчыла яна. — Аднаго жадання мала. Важны яшчэ выпадак. Шчаслівы выпадак. Я табе пра гэта неяк казала.

— Гэта значыць, каб у офіс, дзе працуе, напрыклад, незамужняя дзяўчына, якая марыць стварыць сям'ю, раптам прыйшоў прынц і звярнуў на яе ўвагу?

У Руцкага нечакана прачнулася нешта з'едлівае, нязвыклае для яго. Але Данута гэтага не заўважыла ці зрабіла выгляд, што не заўважыла.

— Так. — Яе дыханне стала глыбейшым. — Шмат-шмат разоў — так, так!..

— А калі гэты прынц прыйдзе, вырашыць нейкія свае вытворчыя або фінансавыя пытанні і пойдзе? — сказаў Руцкі.

— Не пойдзе, — упэўнена сказала Данута. — А калі пойдзе, то гэтая дзяўчына проста не заслугоўвае прынца.

— А як яго заслужыць?

— Ты гэта пытаеш сур'ёзна ці проста так?

— Сур'ёзна.

— Тады я таксама сур'ёзна адкажу. У першую чаргу, трэба думаць, сістэмна думаць.

— Гэта як?

— Калі казаць навуковымі словамі, то неабходна вызначыцца з сістэмай сваіх каштоўнасцей, а таксама з сістэмай сваіх жаданняў. — Данута прамаўляла чыесьці чужыя словы, якія даходзілі да Руцкага з цяжкасцю. Ды і яна, напэўна, выказвала гэта для таго, каб быць больш упэўненай у сабе, сваіх планах. — Я пра гэта прачытала ў адной разумнай кнізе.

— А ты ўжо канчаткова вызначылася? — асцярожна спытаў ён.

— Амаль, — адказала дзяўчына. Яна падышла да яго і, абняўшы, прашаптала: — Прабач, учора я памылілася. Мне няёмка... Праўда.

— Гэта ты мяне прабач, — папрасіў і Руцкі прабачэння, цяплеючы душой. — Мне няёмка і брыдка, што выйшла не так, як планаваў, як хацелася, нарэшце, як магло быць. Я паводзіў сябе не як мужчына, а як школьнік. Ты вось знервавалася.

— Гэта бывае, — паспрабавала апраўдаць яго Данута. — Не мучай сябе.

Руцкі яе перапыніў:

— Не трэба мяне выгароджваць. Не трэба... Наогул, хутка банкет, нам пара збірацца...

У рэстаран яны ўвайшлі, узяўшыся за рукі, але ў іх рухах была хоць і невялікая, але напружанасць.

Праводзіць на пенсію Богдана прыйшло каля дзесяці чалавек. Ні аднаго супрацоўніка дэтэктыўнага агенцтва «Максімус», акрамя Руцкага, не было.

— Не хочуць свяціцца, — патлумачыў Богдан. — Яны мне пра гэта сказалі загадзя. Хто пры сустрэчы, а хто па тэлефоне.

Руцкі адчуваў, што Богдан не хоча гаварыць, чаму адсутнічаюць яго калегі. І гэта было менавіта так.

— Слухай, — звярнуўся Руцкі да Богдана пасля таго, як пазнаёміў з ім Дануту, — хацеў цябе спытаць, але па тэлефоне не наважыўся.

— Пытай, — дазволіў ён.

Данута, разумеючы, што размова паміж Руцкім і Богданам пойдзе пра службовыя справы, адышла ад іх і далучылася да

двух высокіх, апранутых у доўгія сукенкі жанчын, якія, не саромеючыся, абмяркоўвалі развод нейкага іх блізкага знаёмага. Адначасова з Данутай да жанчын падышоў сярэдняга росту мужчына ў белым касцюме. На выгляд яму было пад пяцьдзясят. Нягледзячы на ўзрост, мужчына вылучаўся падцягнутасцю, стройнасцю, а таксама ідэальна авальнай формай твару, на які злёгку спадалі доўгія прамыя пасмы, падкрэсліваючы прывабнасць мужчыны. Ён быццам бы ўсміхаўся, але на самай справе глядзеў на ўсіх з іроніяй.

«Герой-палюбоўнік», — у думках абазваў Руцкі мужчыну ў белым касцюме і, страціўшы да яго цікавасць, усю сваю ўвагу перавёў на Богдана.

— Ты зрабіў, што казаў мне? — задаў яму Руцкі пытанне.

— Ты пра што? — Богдан зрабіў выгляд, што не разумее Руцкага. — Гавары ясней.

— Я пра нябожчыка Збігнева і яго забойцу. — Нервы Руцкага пачалі нацягвацца, як лёска, да якой прывязаны кручок з прынадай, праглынуты буйнай рыбай. — Часу ў цябе, каб забіць Дзяжынскага, было дастаткова.

— А табе гэта навошта? — Богдан прыжмурыўся, быццам яму ў твар накіравалі яркі прамень ліхтарыка. — Мне памятаецца, ты ўспрыняў тады мае словы досыць прахалодна. Нават крытычна.

— Было, — не стаў адмаўляцца Руцкі, — але ўсё ж вырашыў: забойца павінен быць пакараны. Інакш навошта мы, для чаго наша арганізацыя?

— Не, не забіў я Дзяжынскага, — ухмыльнуўся Богдан. — І забіваць, а менавіта душыць, як абяцаў, не буду. Нават ніяк караць не збіраюся.

— Чаму? — Руцкі ледзь не закрычаў ад злосці. — Збігнева няма і што?.. Кропка, справа закрыта?..

— Давай без эмоцый, — спакойна прамовіў Богдан, папраўляючы чырвоны гальштук на сваёй тоўстай шыі. — Дзяжынскі жывы і хай жыве далей.

— Вось як?

— Менавіта.

— Што ж, застаецца спадзявацца на яго жонку... Хэлена, думаю, не адступіць: адправіць Фелікса на той свет.

— Не адправіць. Яна, небарака, трапіла ў лякарню для псіхічна хворых.

— Як?

— Нервовы зрыў. Увогуле, нешта такое... — Богдан пацiснуў плячыма. — Гэта натуральная рэакцыя чалавечага арганізма на непрыемнасці... Вялікія непрыемнасці.

— Але Хэлена была здаровай жанчынай, — нагадаў Руцкі. — Ты сам казаў.

— Цалкам здаровыя жанчыны не плануюць забойства сваіх мужоў, — рэзка і павучальна вымавіў Богдан. — Ты гэта павінен ведаць. А калі не ведаеш, дык ведай.

— Здаровая, не здаровая, — буркнуў Руцкі. — Хіба ў гэтым справа?

— А ў чым?

— У тым, што загінуў наш калега, таварыш. Мяне менавіта гэта кранае і мучыць.

— А калі б не кранала і не мучыла?

— Не іранізуй. Гэта не жарты.

— Так, не жарты: Збігнеў загінуў, — ціха вымавіў Богдан. — А табе вядома, колькі загінула асабіста маіх калег і таварышаў?.. Не?.. Дзясяткі. А па ўсёй Польшчы — сотні. Хто ад кулі, нажа, а хто потым ад алкаголю, наркотыкаў, але горш за тое — ад пачуцця адзіноты... Ты глядзеў фільм «Псы»?.. Польскі фільм «Псы»... Не?.. Паглядзі... Гэта я, мае калегі і таварышы па Службе бяспекі ў тым фільме названы сабакамі. А мы не сабакі. І асабіста я не сабака. Не сабака... Я такі ж чалавек, як і ўсе. Але мяне многія не любяць, нават пагарджаюць мной. А за што?.. За тое, што служыў у гэтай польскай дзяржаўнай службе. Што займаўся палітычным вышукам. А хіба такім вышукам сёння не займаюцца?.. Займаюцца. Прычым усюды, ва ўсіх краінах. Дык я павінен таксама гінуць?.. Га?.. Я хачу жыць, добра жыць. Як Дзяжынскі, якога я, па тваіх словах, абавязаны быў забіць ці хаця б пакараць. Але я не забіў яго і не пакараў, чым вельмі засмуціў усіх, хто працуе ў «Максімусе». Здзіўляюся... Ведаеш, палякі не злы народ, але прынцыповы.

Прызнаюся: з-за прынцыповасці сваіх сяброў-таварышаў, напэўна ўжо былых, і сыходжу на пенсію. Праўда, не заўтра і не паслязаўтра, як планаваў, а праз месяц-два, калі скончу свае справы — на жаль, наш дырэктар папрасіў мяне напісаць заяву... Так-так... Ты, праўда, не ў курсе, бо жывеш у іншай краіне. Жыў бы тут, у Польшчы, таксама напэўна б ведаў. Больш за тое, праігнараваў бы маё запрашэнне. Так?

Руцкаму не хацелася разводзіць банкетны пачастунак Богдана горкай прыправай, таму ён адказаў unikліва:

— Магчыма.

— Дзякуй, што не хітруеш, — падзякаваў Богдан. — Калі хочаш, магу пазнаёміць з Феліксам Дзяжынскім. Як аказалася, ён даволі бяскрыўдны і шчодры чалавек.

— Настолькі бяскрыўдны і шчодры, што аддаў табе амаль палову свайго бізнесу?

— Адкуль ты ведаеш?

— У «Максімусе» гэта ўсе ведаюць... Усе! — У Руцкага, што называецца, набалела, і таму ў яго словах не было ні жалю, ні ласкі. — І я гэта ведаю, нягледзячы на тое, што жыву ў Брэсце, а не ў Любліне ці Варшаве.

— Так, гэта так — Дзяжынскі адкупіўся, — прызнаўся Богдан. — Проста адкупіўся. І ведаеш, я задаволены. Вельмі задаволены, таму што, паўтараю і буду паўтараць, хачу жыць. Менавіта жыць, а не існаваць. Як жыве сёння Дзяжынскі, як жывуць яго багатыя і знакамітыя сябры... Так, дружа, так: сёння і цяпер.

— Ты змяніўся. — Руцкі прыжмурыўся, быццам разглядаў і раптам разглядзеў нейкую істоту, якая можа пусціць атрутную бруе ў яго вочы. — Прычым змяніўся ўсяго за некалькі тыдняў.

— Усяго? — хмыкнуў Богдан. — Не, не за некалькі тыдняў. Тут ты памыляешся.

— Магчыма.

— Памыляешся, — паўтарыў Богдан.

— Усё ж я не хачу верыць, што Дзяжынскі табе даражэй, чым нябожчык Збігнеў, памяць пра яго. — У Руцкага расла пагарда да чалавека, з якім не было дружбы, але яшчэ захоўва-

лася павага да яго жыццёвага і прафесійнага вопыту. — Цяпер твой кумір Дзяжынскі?

— Не, не кумір ён мне, а нешта накшталт маяка, — глуха, з упартасцю паправіў Руцкага Богдан. — Маяк у акіяне нашага жорсткага свету.

— Свет заўсёды быў жорсткі, — кінуў Руцкі. — І не мне табе пра гэта казаць.

— Не скажы, — не пагадзіўся Богдан. — Падчас сацыялізму мы жылі цішэй і спакайней. Ва ўсякім выпадку ўсе атрымлівалі за сваю працу прыкладна аднолькава, і ў нас не было такой зайздрасці, якую мы бачым сёння ў людзях.

— Ты пра сябе кажы, — зазначыў Руцкі. — Асабіста пра сябе.

— А я пра сябе і кажу... Вось, дарэчы, і ён, Дзяжынскі.

Богдан паказаў на мужчыну ў белым касцюме. Той нешта расказваў, а на яго з любоўю глядзелі жанчыны ў доўгіх сукенках. Амаль гэтак жа глядзела на Дзяжынскага і Данута.

Унутры ў Руцкага закіпела. Яму захацелася падысці да гэтага самаўпэўненага польскага багацея і ўдарыць яго ў твар. Ударыць так, каб ён упаў. А потым на вачах ва ўсіх біць яго нагамі за самаўпэўненасць, жорсткасць, прагнасць, здраду — якасці, дзякуючы якім Фелікс прыйшоў да свайго багацця. Доказ гэтаму — задушаны Збігнеў. Біць да таго часу, пакуль Дзяжынскі не папросіць прабачэння, не стане маліць аб літасці. Але Руцкі толькі і сказаў:

— Я маўчу.

— Гэта правільна: часам лепш маўчаць, чым гаварыць, — ухваліў пакорнасць Руцкага Богдан. — Нездарма ж кажуць у вас у Беларусі і Расіі: маўчанне — золата. Але маўчанне — гэта не толькі мудрасць, але і страх.

— Гэта я ведаю, — злосна прамармытаў Руцкі.

— Ведаеш, — прамовіў Богдан. — Але ведаеш свой страх, унутраны... Хочаш, я табе пакажу той жудасны страх, пра які ты не раз думаў, уяўляў сабе, але не перажыў яго?

— Навошта?

— Таму, што тэорыя сухая, прыяцель, а дрэва жыцця пышна зелянее.

— Гэта будзе нешта ненатуральнае?

— Наадварот, гэта будзе самае натуральнае, што можна ўбачыць у нашым жыцці. Скажаш мне, калі гэта табе спатрэбіцца ўбачыць.

— Я падумаю. — З гадамі ў Руцкага выпрацаваўся прынцып: ніколі не кажы «ніколі». Праўда, не заўсёды ім Руцкі карыстаўся. — Падумаю...

У гэтую хвіліну загучала песня Сальваторэ Адамо «Падаў снег»:

Падае снег,
Ты не прыйдзеш сёння ўвечары.
Падае снег
І маё сэрца апранаецца ў чорнае...

Сальваторэ Адамо можна слухаць бясконца. Але ў той момант Руцкі быў усім незадаволены, на ўсіх злы. Асабліва на Дзяжынскага, Дануту. А тут яшчэ гэтыя словы знакамітай і бясконца сумнай песні:

Ты не прыйдзеш сёння ўвечары,
Мне крычыць мой адчай.
Але падае снег,
Не парушны прыём

Руцкі здзівіўся: «Навошта паставілі гэтую мелодыю, для каго і для чаго гучаць такія словы?.. На двары толькі пачатак восені...»

Тут да Руцкага за руку Дзяжынскі прывёў Дануту. Злёгку нахіліўшы галаву, з усмешкай прамовіў:

— Я вяртаю вам вашу даму.

Літаральна праз пару секунд няветлівы і хмурны выраз твару Руцкага прымусіў Дзяжынскага схаваць сваю ўсмешку і неадкладна сысці.

— Сволач, — ціха сказаў Руцкі сам сабе.

Данута гэта пачула і асуджальна паглядзела на яго.

На наступны дзень у Брэст яны вярталіся моўчкі.

## VIII

Пакінуты мужчына адзінокі, а той, якога пакінула жанчына, яшчэ і сентыментальны. Ва ўсякім выпадку ён нярэдка становіцца такім.

Руцкі адвёз дзяцей да сваіх бацькоў, купіў кветкі, накрыў стол і стаў чакаць жонку з працы. Яна прыйшла пазней чым звычайна.

— Ужо восем гадзін вечара, — з ноткамі рэўнасці прамовіў Руцкі. — Ты з кімсьці сустракалася?

— Сустракалася, — здымаючы плашч, адказала Каця. Яе сакавітыя вусны задрыжалі. — Сустракалася з класнай кіраўніцай нашага старэйшага сына. Яна папрасіла мяне прыйсці на размову.

— Дзіўна, — буркнуў Руцкі. — Звычайна на размову выклікаюць бацьку, а не маці.

— А цябе і выклікалі, але ты сказаў, што едзеш у Польшчу. Забыўся?

— Так...

Руцкі ўспомніў званок класнай кіраўніцы старэйшага сына. Яна тэлефанавала, калі Руцкаму было не да яе і наогул ні да каго: праходзіў на мяжы з Данутай мытны дагляд, жадаючы толькі аднаго: хутчэй апынуцца з ёй за мяжой. А там усвядоміць і адчуць: Данута з ім і толькі з ім.

— Так, — адганяючы ад сябе назойлівыя, але такія прыемныя для сябе ўспаміны, паўтарыў Руцкі жонцы. — Даруй.

Яна ўздыхнула:

— Я, можа, і дарую, а дзеці?..

Гэта было не пытанне, а крык, ціхі, але балючы. І таму ён разрываў Руцкаму сэрца. Шкада, што яно ў яго было адно, а акрамя дзяцей і жонкі з'явілася яна — Данута. Цяпер у яго сэрцы жылі яны ўсе, і ён нічога з гэтым не мог зрабіць. Нездарма ўсё ж такі ёсць у адной старой і ўжо амаль забытай песні такія словы: «Любовь нечаянно нагрянет...» І невыпадкова людзі кажуць пра такое каханне: «Праклятае...»

— Дзеці таксама даруюць, — няпэўна выціснуў Руцкі і дадаў: — Калі зразумеюць.

— Калі, — выдыхнула Каця, з якой ён пасля службы ў арміі так хацеў ажаніцца, а цяпер з такім жа жаданнем імкнуўся сысці да Дануты. — У твайго старэйшага сына пераходны ўзрост. Яго паводзіны мяне палохаюць: на ўроках ён няўважлівы, не слухае настаўнікаў, разбіў у школе акно. Баюся, што гэтым

самым наш сын хацеў звярнуць на сябе тваю ўвагу. Менавіта тваю. Праз выклік цябе ў школу. Але ты не прыйшоў. Не прыйшоў!..

— Калі ласка, не рабі з гэтага трагедыю, — з надрывам у голасе папрасіў Руцкі. — Усё наладзіцца.

Гэта было добрае жаданне — адно з тых, якое жыло ў галаве Руцкага. Яно з цягам часу павялічвалася, узмацнялася, і ён усё больш разумеў, што д'ябал старанна і мэтанакіравана ўкладваў з гэтым жаданнем яму, Руцкаму, дарогу ў пекла.

— У цябе, можа, і наладзіцца, а ў нас, у нашай сям'і, наладзіцца? — спытала яго Каця. — Ты ў апошні час амаль не бываеш дома, а калі прыходзіш, то часцей за ўсё ноччу. Хіба не так?

— Так.

У горле Руцкага застыў крык, а разам з ім стогн.

— У цябе з'явілася жанчына?.. — Твар Каці пабялеў. — Гавары праўду.

Што было сказаць? Ён адказаў:

— Так.

Гэтае «так» Руцкага яго жонку вывела з сябе. Яна паказала яму на дзверы:

— Ідзі...

— У гэтай жанчыны ёсць мужчына, — міжволі вымавіў Руцкі.

Вымавіў ці то проста апраўдваючыся, ці то для таго, каб Каця яго пашкадавала і даравала яму. Але яна маўчала. Потым заплакала. Ён апрануўся і выйшаў з кватэры.

«Нічога, — у роспачы падумаў Руцкі. — Нічога, гэта жыццё...» Праз некалькі хвілін у яго зазваніў мабільнік. Руцкі схапіў яго, спадзеючыся, што гэта тэлефануе Данута. Не Каця, а менавіта Данута. Але гэта была Каця. Яна стомлена, з надзеяй, спытала:

— Мужчына, які ёсць у тваёй новай жанчыны, разбурае твае планы?.. Ці ўжо разбурыў?..

Гэта былі не пытанні, а канстатацыя факта: Руцкі адчуваў, што Данута не з ім. І наўрад ці будзе з ім. Ён з сілай шпурнуў мабільны тэлефон у сцяну дома. Мабільнік у тую ж секунду разбіўся. Руцкаму здалося, што разбілася яго сэрца і яго кавалкі ўпалі ў гразь.

## IX

Самае людна месца ноччу ў Брэсце — памежны пераход «Варшаўскі мост». Сюды, каб патрапіць у Еўропу, едуць людзі не толькі з Беларусі, але і з усёй постсавецкай прасторы. Менавіта гэты пагранпераход быў для Руцкага галоўнай тэрыторыяй, дзе ён выконваў большасць даручэнняў кіраўніцтва дэтэктыўнага агенцтва «Максімус»: сустракаў і праводзіў важных персон, суправаджаў машыны праз мяжу, аказваў паслугі па перавозцы маёмасці праз мытны пункт. Усё рабіў практычна легальна, бо меў два пропускі. Адзін даваў Руцкаму права праязджаць памежны пераход без чаргі з беларускага боку, а другі — з польскага. Тое, што не мог Руцкі зрабіць законна, ён рабіў па дамове, а дакладней — па змове з памежнікамі і мытнікамі, якія былі не супраць выкарыстаць сваё службовае становішча для асабістага ўзбагачэння, а таксама з тымі людзьмі, якія, зноў жа за грошы, згаджаліся перавезці што заўгодна, калі заўгодна і куды заўгодна. Трэба сказаць, што такое адбывалася вельмі рэдка: дэтэктыўнае агенцтва «Максімус», атрымаўшы ліцэнзію на сваю дзейнасць, з'яўлялася памочнікам дзяржаўных службаў, якія ахоўвалі мяжу як з польскага, так і з беларускага боку. Але... Гэтае маленькае «але» адкрывала шчыліну для сваіх людзей...

«Біжутэрыю» для Стася па просьбе Руцкага прывёз з Польшчы яго знаёмы Раман, якому Руцкі аднойчы аказаў паслугу: не здаў праваахоўным органам, калі сачыў за адным брэсцкім гандляром старадаўнімі абразамі. Гэтыя абразы дапамагаў перавозіць праз беларуска-польскую мяжу гэты самы Раман.

«Ён мне яшчэ спатрэбіцца», — цынічна разлічыў тады Руцкі.

Раман спатрэбіўся. Цяпер ён чакаў свайго выратавальніка на стаянцы каля прыгранічнага кафэ. Да яго Руцкі пад'ехаў каля дзесяці гадзін вечара. Было ўжо цёмна. Перад Руцкім, нібы прывід, вырасла грузная фігура, і ён пачуў знаёмы голас:

— Добры вечар, Ягор Фёдаравіч.

— Добры, Раман, — павітаўся Руцкі. — Усё нармальна?

— Раз стаю перад вамі, то нармальна, — скупа ўсміхнуўся

Раман. — Прыйшлося, вядома, панервавацца, але гэта заўсёды так: не булкі вёз.

— Так, не булкі, — згадзіўся Руцкі. — Ты тут груз аддасі ці ад'едзем?

— Ад'едзем, — сказаў Раман, з падазрэннем паглядзеўшы па баках. — Руліце за мной.

Яны спыніліся, не даязджаючы да бліжэйшай запраўкі. Выйшлі з машын.

— Бяры тавар і сядай на задняе сядзенне ў маю машыну, — загадным тонам сказаў Руцкі Раману.

— Я зараз, — замітусіўся той. — Адну хвіліну...

Узяўшы ў Рамана важкі мяшочак, Руцкі прыўзняў яго.

— Не менш кілаграма?

— Роўна кілаграм, — буркнуў Раман. — Я ўзважваў.

Руцкі высыпаў змесціва мяшочка на гумовы кілімок для ног, падняў яго і паклаў на сядзенне побач з Раманам, пасля чаго ўключыў у салоне святло.

— Выбірай, што падабаецца.

— Гэта замест грошай?

— Так, — кіўнуў Руцкі.

Раман доўга глядзеў на кольцы, пярсцёнкі, кулоны, ланцужкі. Спачатку ўзяў сабе тоўсты ланцужок, але тут жа паклаў яго і выбраў прыгожы пярсцёнак з дыяментам.

— Можна? — Раман глядзеў на Руцкага, нібы паднявольны рабочы, які чакае, калі яму выдадуць зарплату. — Гэта для маёй дзяўчыны.

— Забірай, — дазволіў Руцкі. — Але ў мяне ёсць адно пытанне.

— Якое? — Раман насцярожыўся. Тоўстая блакітная жылка на яго шыі задрыжала. — Не люблю я, калі мяне пытаюць аб чым-небудзь.

— А я не люблю, калі мне не адказваюць, — павысіў голас Руцкі. — Тым больш, што ты мой даўжнік. Памятаеш?

Раман нервова выціснуў:

— Я слухаю вас, Ягор Фёдаравіч.

— Пытанне простае і бяспечнае для цябе, — супакоіў Руц-

кі Рамана. — Скажы, як ты змог правесці каштоўнасці праз мяжу? Дамовіўся з мытнікамі, каб цябе не правяралі, ці схаваў кантрабанду ў машыне?

— Схаваў.

— Дзе менавіта?

— Гэта абавязкова мне казаць?

Раман не хацеў выдаваць свае сакрэты, але Руцкі настойваў:

— Гавары. Для мяне твае сакрэты — дробязь. Але раптам які-небудзь з іх спатрэбіцца?

— Добра, — махнуў Раман рукой. — Усё гэта дабро я перавёз у выхлапной трубе.

— Не падманвай, — не паверыў Руцкі. — Яно б там дэфармавалася ці ўвогуле расплавілася.

— У мяне дзве выхлапныя трубы, — сказаў Раман. — Адна з іх перакрытая — заваранная. У яе я запакаваў каштоўнасці і спакойна праехаў мяжу.

— Усё геніяльнае проста.

— Гэта праўда. Спатрэблюся — тэлефануйце.

— Пазваню, — паабяцаў Руцкі, хоць сам сабе падумаў, што пара завязваць аказваць нават сябрам сумнеўныя паслугі, бо яны мала чым адрозніваюцца ад паслуг Богдана. — Поспехаў.

Раман, задаволены, выйшаў з машыны Руцкага і паехаў у горад. Руцкі ж, сабраўшы каштоўнасці і склаўшы іх у мяшочак, направіўся на сустрэчу са Стасем. Па дарозе патэлефанаваў яму:

— Вязу абяцанае.

— Я чакаю цябе, — узбуджана выгаварыў Стась. — Жонка з дзецьмі паехала да сваіх бацькоў, так што акрамя мяне ў доме нікога няма.

## X

Дом Стась пабудаваў гадоў пятнаццаць таму на тэрыторыі дачнага таварыства ў Чырвоным Двары. Зараз гэта горад. Ёсць электрычнасць, каналізацыя, праведзены газ, гэта значыць маюцца ўсе гарадскія выгоды. Двухпавярховы асабняк Стася з чырвонай цэглы ўзвышаецца над двухметровым жалезным плотам. Вароты таксама, натуральна, жалезныя. У іх, пад'ехаўшы,

Руцкі пастукаў нагой. Стась спешна адкрыў. Заехаўшы на двор, Руцкі дастаў з бардачка мяшочак з каштоўнасцямі, сунуў яго ў рукі сябра.

— Вось тваё дабро. Пярсцёнак з дыяментам я аддаў перавозчыку, астатняе тут.

— Разбяромся, — хрыпла выдыхнуў Стась. — Праходзь на кухню. Я мяса запёк. Ты такое яшчэ не еў.

— Думаеш?

— Не думаю, а ведаю. Я нядаўна паглядзеў адну цікавую тэлеперадачу пра ежу, у якой нейкі знакаміты парыжскі кухар раіў замест сланечнікавага алею выкарыстоўваць сметанковае масла, як гэта робяць французы. Я так і зрабіў. Карацей, сам адчуеш, што за страва ў мяне атрымалася.

Мяса, запечанае ў духоўцы на сметанковым масле, і праўда было вельмі смачным, мяккім, з цыбуляй, грыбамі і сырам.

— Малайчына, — пахваліў Руцкі Стася. — Прымаць гасцей ты майстар. Гэта я даўно ведаю.

— Для цябе, дружа, стараўся, — падкрэсліў Стась. — Ты ж не вячэраў. Так?

— Так.

— Вось. Гэта адна прычына. А другая — думаю сыходзіць з ДАІ. Мажа, закінеш за мяне слоўца, каб мяне ўзялі ў тваё дэтэктыўнае агенцтва. Я цябе не падвяду, можаш быць упэўнены. Ды і тваё кіраўніцтва будзе, думаю, мною задаволена: у міліцыі ўсё ж такі служу, па вашым профілі. Калі афармяць мяне на працу, век буду ўдзячны... Га?..

— Пагавару, — паабяцаў Руцкі.

— Давай за гэта вып'ем, — прапанаваў Стась, — а то ядзім на сухую. Як быццам нічога няма або чужыя.

— Піць не буду, — адмовіўся Руцкі. — І без алкаголю ў апошні час адчуваю сябе так, быццам п'ю кожны дзень. П'ю непрабудна. Разумееш?

— Разумею, — матнуў галавой Стась. — Гэта ўсё твая любоў.

— У цябе таксама ёсць жанчына на баку. І не адна, наколькі я ведаю.

— Ёсць, — прызнаўся Стась. — Але мая галава ў парадку: я сваю жонку ніколі не думаў і не думаю кідаць. Гэта ж, прабач, не торба з ношаным адзеннем, не мяшок смецця, а маці маіх дзяцей. Маіх, а твая жонка — тваіх. Правільна?

— Ты па сутнасці кажы.

— А я і кажу па сутнасці, толькі ты не хочаш пра гэта слухаць, разумець.

— Я цябе слухаю і разумею. — У Руцкага пачаў падымацца ціск, твар яго як быццам абдало гарачай парай. — Усё разумею. Але што ёсць, тое ёсць: зачапіла мяне Данута так, як ніколі і ніхто не чапляў. Выгнаць бы яе з сябе, выцягнуць, а не магу... Не магу!.. А казаў...

— Хацеў бы я табе дапамагчы, але бачу, што таксама не магу, — спачувальна выціснуў Стась. — Справа ў цябе, значыць, да разводу ідзе?

— Ідзе, — не стаў хаваць Руцкі. — Нават не ідзе, а бяжыць. Ды і што рабіць: не любіць мяне жонка.

— А ты ўпэўнены?

— Вядома.

— Гэта яшчэ падумаць трэба. — Стась запаліў. — Я вось нядаўна фільм ці ролік глядзеў на YouTube. Дык там Яўген Грышкавец, расійскі акцёр, рэжысёр і яшчэ ў нейкай дзейнасці вялікі аўтарытэт, сказаў, што адзін чалавек любіць другога не таму, што ён такі добры, а таму, што чалавек, які любіць, мае добрыя якасці. Значыць, нас, мяне і цябе, нашы жонкі любяць не таму, што мы такія выдатныя, а таму, што нашы жонкі такія добрыя.

— Лухта, — кінуў Руцкі. — Калі пагадзіцца са сцвярджэннем Грышкаўца, то я лепшы, чым Данута, бо люблю яе, а яна маю любоў не прымае. І наогул, не хоча са мной сустракацца.

— А чаму ты не можаш быць лепшым за тваю Дануту? — задаўся пытаннем Стась. — Ты лепшы за яе. Адназначна лепшы. Бо з-за яе твая сям'я распадаецца, а Дануту гэта не хвалюе. Яна нават пра гэта не думае. Гэта нармальна?.. Не.

— Я ёй не казаў, што жанаты.

— А то яна дурная: не разумее, не бачыць?.. Ты ж не запрашаеш яе дадому, таму што жывеш у кватэры не адзін. Правіль-

на?.. Правільна. А твая Данута не задае лішніх пытанняў, таму што ёй такія адносіны і трэба.

— Не буду спрачацца, але ў тым, што распадаецца мая сям'я, больш за ўсіх вінаваты я і толькі крышачку мая жонка, — прас-крыгатаўшы зубамі, павольна вымавіў Руцкі. — Тут Данута ні пры чым.

— Памыляешся, яна тут як раз пры чым, — не пагадзіўся Стась. — І твая жонка гэта ведае. Таму, дарэчы, і спадзяецца, што ты адумаешся. Значыць, што б ты ні казаў, яна любіць цябе.

— Мая жонка не ведае нічога пра Дануту.

— Данута, Марыя, Анжэла... Не ў іх справа. Твая жонка адчувае, што ў цябе, акрамя яе, ёсць яшчэ жанчына. Але ўсё роўна жыве з табой пад адным дахам, у адной кватэры. Значыць, паўтараю, любіць цябе, даруе твае прыгоды.

— Хутчэй, шкадуе, — заўважыў Руцкі. — Жанчыны такія.

— А жаль — гэта таксама любоў, — пацвердзіў сваю думку Стась. — Ну, ці блізкае пачуццё да кахання.

— Магчыма, але мне ад гэтага не лягчэй, — прагаварыў Руцкі. — Нават цяжэй.

— Зразумела: ты сапраўды больш за ўсіх вінаваты, — зрабіў выснову Стась.

— Вось-вось, дайшло, нарэшце, — не стаў сябе апраўдваць Руцкі і падкрэсліў: — Менавіта больш за ўсіх.

— Значыць, не хвалюйся так, — параіў Стась. — Ты вінаваты, табе і выпраўляцца прыйдзецца. А больш, менш — гэта не важна.

— Я не хвалююся, я пакутую, — з болем вырвалася з горла Руцкага. — Так вось здарылася... Ведай. А шкадаваць, шкадаваць не трэба...

Яму прыгадаліся словы з верша Сямёна Гудзенкі «Мое поколение»: «Нас не нужно жалеть, ведь и мы никого не жалели...»

І хоць у гэтым вершы гаворыцца пра вайну, але ж каханне ў нейкім сэнсе і ёсць вайна. І гэтая вайна не заўсёды абыходзіцца без крыві.

# XI

Лета неяк хутка скончылася, наступіла восень. Яна не была халоднай, але і цяплом не песціла. У адзін з кастрычніцкіх вечароў, калі ішоў дождж і на сэрца Руцкага ціснула штосьці нябачнае, але да болю цяжкае, ён патэлефанаваў Дануце і спытаў:

— Ты дзе?

— На працы, — адказала яна.

— Можа, цябе да твайго дома адвезці? — спытаў ён. — На вуліцы холадна.

— Завязі, — абыякава пагадзілася Данута.

— Праз дзесяць хвілін выходзь, — сказаў Руцкі. — Буду чакаць цябе ля ўвахода ў гасцініцу.

Сеўшы ў машыну, Данута папрасіла:

— Давай ад'едзем і дзе-небудзь пастаім.

Прыпаркаваўшы «БМВ» у глухім завулку, Руцкі ўзяў руку дзяўчыны, паднёс да сваіх вуснаў і пацалаваў. Потым, перабіраючы яе пальцы, доўга ўдыхаў іх пах, употай спадзеючыся, што вось-вось яна паверне да яго галаву і яны прыціснуцца адно да аднаго.

— Я сёння паглядзела ў люстэрка і ўбачыла на лбе першую маршчынку, — прамовіла Данута грудным голасам, у якім пачулася нешта трагічнае і непазбежнае. — Я пачынаю старэць.

— Не старэць, а станавіцца дарослай жанчынай, — паправіў Руцкі дзяўчыну.

— Не трэба хітраваць, — уздыхнула Данута. — Гэта непрыемны, жорсткі, але натуральны працэс.

— Да чаго гэта ты? — уважліва паглядзеўшы на Дануту, пацікавіўся Руцкі. — Нешта адчуваеш?

— Не ведаю, — прамовіла яна, рассеянаназіраючы на лабавым шкле за кроплямі дажджу і прыліпаючым жаўтлява-чорным лісцем, якое ападала з дрэў. — Паехалі.

Руцкі выціснуў счапленне і ўключыў хуткасць. Ехаў павольна, так павольна, нібы ў машыне спусцілі ўсе чатыры колы і ён баяўся пашкодзіць гуму і дыскі. Да дома Дануты ехалі каля дваццаці хвілін, хоць звычайна даязджалі за пяць-сем.

— Дзякуй, што падвёз, — вымавіла яна. Яе рука пацягнула-

ся да дзвярной ручкі і на імгненне застыла. — Ты неяк спытаў мяне: што я буду рабіць, калі дзеля сваёй мары мне давядзецца пастпіцца сваім шчасцем?

— Так, гэта калі мы вячэралі ў рэстаране «Інтурыст», — кіўнуў Руцкі і абняў рукамі руль, быццам ён быў жывым, здольным зразумець свайго гаспадара, разагнаць яго сум і нават развесяліць.

— Дык вось я ім, сваім шчасцем, пастпілася, — працягла, злучаючы словы ў адну непадзельную, пакутную фразу, вымавіла Данута. — Так атрымалася, атрымалася...

У галаве Руцкага адразу ж закруціліся, нібы вюны на патэльні, словы Богдана: «Дарога да ўзбагачэння амаль заўсёды ляжыць праз злачынства. У тым ліку і ў адносінах да сябе асабіста, сваіх калег, сяброў. І нават да сваёй сям'і. Я маю на ўвазе падаўленне сваіх думак, жаданняў, абавязацельстваў і гэтак далей. Гэта для таго, каб на сваім «я» пабудаваць іншае — больш саліднае, важнае, адпаведнае сваім запытам на дадзены момант. Не больш, не менш».

«А Богдан мае рацыю, — падумалася Руцкаму. — Мае...»

— Я хацела спачатку знайсці сваё шчасце тут, у Брэсце, — прамовіла Данута. — Але як гэта было зрабіць?.. Адпаведнага для сябе мужчыну наўрад ці можна сустрэць у рэстаране або бары «Інтурыста». Але і ў бібліятэцы цяпер не пазнаёмішся — такі час ужо прайшоў. Значыць, мужчыну трэба шукаць па інтарэсах: падарожжы, дзелавыя паездкі, сур'ёзная работа, пажадана за мяжой. Такога я сустрэла — цябе. І ўсё, напэўна, было б у нас добра, калі б не адна праблема — ты жанаты... Жанаты... А тут з'явілася яшчэ адна перашкода... Разумееш?

Разумеў Руцкі або здагадваўся — няма розніцы. Зараз усе яго надзеі заставаліся ў мінулым, рассейваліся там, застаючыся толькі ў памяці. І няхай гэтая памяць з любоўю, перажываннямі, кіпучай крывёю, што з таго?..

— Пасля бою кулакамі не махаюць, — ціха прамовіў Руцкі. — Што цяпер казаць?..

— Вось і добра, — ухваліла Данута. — Так, добра.

— Не ўпэўнены, — кінуў Руцкі.

— А гэта таксама добра, — адказала дзяўчына. — Можа нешта зменіцца...

Выйшаўшы з машыны, яна хацела яшчэ нешта сказаць, але не сказала нічога. Руцкі таксама прамаўчаў. Гэта была дзіўная і самая кароткая іх сустрэча.

## XII

З жонкай у Руцкага адносіны цалкам разладзіліся, і ён вырашыў зняць кватэру, каб пажыць аднаму. Некалькі разоў спрабаваў запрасіць да сябе ў госці Дануту, але яна не прыходзіла. Між тым прайшла восень і наступіла зіма. Данута патэлефанавала Руцкаму і сказала, што ў яе сёння дзень нараджэння.

— Прыязджай, адзначым, — запрасіла яна.

Руцкі прыехаў і здзівіўся: у кватэры нікога, акрамя імянінніцы, не было.

— Чаму толькі я? — спытаў ён, адчуваючы, як сэрца яго радасна — даўно такога не было — забілася.

— У мяне няма мамы, няма цёткі, наогул няма нікога, хто б мяне моцна любіў, — адказала Данута, апранутая ў доўгую белую сукенку, падобную на вясельную. — А ты, Ягор, мне здаецца, мяне менавіта так любіш.

«Так», — хацеў адказаць Руцкі, але стрымаў свае эмоцыі.

Яны селі за стол. Данута, адкінуўшы з ілба свае, як здалося Руцкаму, парадзелыя валасы, сама адкрыла бутэльку шампанскага, разліла пеністы напой у бакалы і прапанавала тост:

— Вып’ем за жыццё.

Ён чамусьці не здзівіўся, але заўважыў, што твар Дануты нейкі белы, а сама яна на дзіва пакорная.

— Што з табой?

Яна сумна і зусім спакойна адказала:

— Я паміраю.

— Ты жартуеш! — ашаломлена прамовіў Руцкі. — Гэтага не можа быць. Не можа.

— Можа, — краёчкам спалатнелых вуснаў усміхнулася Данута. — Можа.

— Што я магу для цябе зрабіць?

Калі б яна сказала «памры», Руцкі, напэўна, памёр. Але дзяўчына спытала:

— Я прыгожая?

— Вельмі, — шчыра, з любоўю сказаў ён. — Кажу як ёсць, як я бачу. Праўда.

— Дзякуй. — У вачах Дануты ўспыхнуў слабы агеньчык, але тут жа згас. — Была прыгожая. Была.

— Гэта не так, не...

— Маўчы, — нервова, з надрывам у голасе перабіла яна Руцкага. — Дзеля ўсяго святога маўчы... Прашу...

— Прабач, — прыгнечана прамовіў ён.

Данута нічога не сказала. Проста сядзела і глядзела ў сцяну. Потым, успомніўшы пра свой тост, прыўзняла бакал з шампанскім:

— Ну, мы забылі пра галоўнае... Так што выпівай. Толькі не за жыццё, а за мяне...

Яны выпілі. Данута зноў памаўчала, потым з унутраным болем прамовіла:

— Я заўсёды, колькі сябе памятаю, хацела з'ехаць у Польшчу. Але не проста з'ехаць і жыць у дастатку, ні ў чым не маючы патрэбы, а каб ажыццявіць сваю мару: вывучыцца на акторку і здымацца ў кіно. Каб стаць такой, як Пола Ракса. Ведаеш яе?

— Не, — пакутліва ўспамінаючы, што гэта за актрыса, прызнаўся Руцкі.

— Яе ўсе ведаюць, і ты ведаеш, — упэўнена сказала Данута. — Яна нарадзілася ў нас у Беларусі, у Лідзе. Потым з'ехала з бацькамі ў Польшчу. Там паступіла ў Вышэйшую школу тэатра і кіно, скончыла яе. Пачала здымацца. У адным фільме, другім, трэцім... Яе заўважылі рэжысёры і палюбілі гледачы. Асабіста я Полу Раксу ўпершыню ўбачыла, як, напэўна, і ты, у папулярным тэлесерыяле «Чатыры танкісты і сабака».

— Добры фільм, — уставіў Руцкі.

— Так, — пацвердзіла Данута. — Вельмі добры, жыццёвы... Пола Ракса сыграла ў ім ролю медсястры Марусі, у якой была мянушка Агеньчык. Дарэчы сказаць, я гэтую мянушку ўспрымаю лепш, чым імя і прозвішча Полы Раксы. Агеньчык — і гэтым усё сказана. Наогул, яе біяграфію я ведаю на памяць — вывучыла. І не таму, што шмат разоў чытала пра жыццё гэтай

вельмі прыгожай і таленавітай жанчыны, якая зрабіла сама сябе, а таму, што яна мне блізкая. Па духу, светаўспрыманню... Амаль па ўсім... Часам мне здаецца, што мы сёстры. Так... Толькі яна намнога старэйшая за мяне.

— Маруся, — успомніў Руцкі Полу Раксу. — Мне здаецца, што яна ўсё такая ж маладая і прыгожая, як у гэтым фільме... Мілая дзяўчына, цяпер, вядома, сталая жанчына... Менавіта... Шчыра кажучы, мне больш памятаецца Янэк — камандзір танка. Маруся і Янэк — выдатная пара. Так бы ў жыцці...

— Так бы, — усхліпнула Данута, выціраючы слёзы. — Мне да болю шкада, што я не стала актрысай... Хоць магла... Калі мы былі ў Польшчы, я пра сваю мару — зрабіць кінакар'еру — распавяла Феліксу Дзяжынскаму. Ён сказаў, што сябруе з Вайдай, вядомым на ўвесь свет рэжысёрам, абяцаў мяне з ім пазнаёміць. Запэўніваў, што Вайда зробіць з мяне кіназорку, таму што я не такая, як усе, а лепш, лепш... Я паверыла Феліксу, нават запрасіла яго да сябе ў госці.

— У Брэст?

Руцкі не мог гэта нават уявіць, але Данута пацвердзіла:

— Так, у наш горад Брэст.

— І ён, Дзяжынскі, прыязджаў?

— Два разы. — У пацямнелых і страшэнна стомленых вачах Дануты бліснулі агеньчыкі, але тут жа згаслі. — А потым не стаў прыязджаць. Нават перастаў тэлефанаваць і адказваць на мае званкі... Для мяне гэта так балюча, пакутліва, што я не ведала і не ведаю, як быць далей... Няхай нават гэта маё «далей» вельмі кароткае... Разумееш?

— Ці разумею я? — На некалькі секунд Руцкі задумаўся, пасля чаго глуха вымавіў: — Вядома, разумею... Ты закахалася ў Дзяжынскага... Закахалася...

— Так, я люблю яго. Люблю... Ва ўсякім выпадку, любіла... — Дзяўчына ўтаропілася ў сцяну, быццам праз яе бачыла Фелікса. На сцяне на нейкае імгненне і напраўду з'явіўся нейкі цень. — Гэта ён — тая галоўная перашкода, якая раптам з'явілася паміж мной і табой і пра якую я табе казала. Але цяпер гэтая

перашкода, як і мая надзея на лепшае і шчаслівае жыццё засталася ў мінулым: у мяне анкалогія... Жыць засталося мала... Давай вып'ем яшчэ...

— Гэта Дзяжынскі вінаваты, — павольна і злавесна вымавіў Руцкі. — Ён! Мала яму Хэлены, дык ён у цябе ўпіўся. Як клешч.

— У сваіх бедах мы вінаваты самі, — дрыготкім голасам сказала Данута. — Памятаеш, як ты прывёў словы з Бібліі: «Што ты глядзіш на парушынку ў воку брата твайго, а бервяна ў сваім воку не адчуваеш?»

— Памятаю.

Данута гаварыла Руцкаму тое, што гаварыў ён ёй.

— Вось, — з націскам вымавіла яна.

— Гэта некалькі іншае, — паспрабаваў не пагадзіцца Руцкі.

— Няма нічога іншага, — асуджана выдыхнула Данута, пераконваючы ў гэтым не толькі яго, але, напэўна, і сябе. — Усё адно і тое ж: людзі, іх думкі, жаданні, грахі... А ў аснове ўсяго ўсё тая ж мара, да якой трэба ісці. Ісці ўпарта, крок за крокам, каб яна спраўдзілася. Згадзіся, аднойчы гэтая мара ў кагосьці абавязкова спраўджваецца. Так-так... На жаль, у мяне не атрымалася. Не, не атрымалася, хоць я верыла... Вельмі верыла...

Руцкі Дануту не слухаў: думаў пра Дзяжынскага і пра тое, што ў размове са сваёй жонкай не памыліўся, калі сказаў: «У гэтай жанчыны ёсць мужчына». Гэта значыць, у Дануты ёсць мужчына... Адчуваў...

— Ён яшчэ прыедзе да цябе? — адводзячы позірк убок, хрыплавата запытаў Руцкі.

— Наўрад ці, — са смуткам вымавіла дзяўчына. — Не, не прыедзе.

— Шкада, — сказаў Руцкі. — Але нічога, нічога.

— Што ў цябе ў галаве? — Вочы ў Дануты шырока адкрыліся, зрэнкі ў іх павялічыліся і яшчэ больш, чым звычайна, пацямнелі. — Што?

— У мяне адна думка, — прызнаўся Руцкі. — Забіць Дзяжынскага. Гэта самае малое, што мне можна зараз для цябе зрабіць.

«Не забіў Богдан, заб'ю я...»

— Не рабі гэтага, — забараніла Данута. — Тым больш, што ты верыш у Бога, чытаеш Біблію... Святая кніга... Я таксама веру... Паверыла... Не памятаю дзе, калі, у якім месцы, але я ўбачыла Ісуса. Ён усміхнуўся і сказаў: «Не бойся ...» Я чула яго словы, але ў той жа час як бы і не чула, а глядзела на Яго, усё разумеючы... Нават не на Яго глядзела, а на Яго вочы... Уяўляеш, яны зялёныя...

— Хіба гэта так важна?

Руцкі пытаў гэта не для таго, каб пачуць адказ, а каб гаварыць з Данутай, пакуль яна побач, з ім, тут і цяпер...

— А як жа, — ажыла яна. — Зеляніна — гэта вясна, жыццё, здароўе, каханне... Гэта ўсё лепшае, што ёсць на ўсім свеце. А мы гэтае лепшае часта не прымаем. Затое прыцягваем да сябе, як магніт, горшае. Бяром не сваё, а чужое, хоць ведаем: на чужым няшчасці шчасця не пабудуеш... Я добра зразумела. І ты гэта разумееш. Я па табе бачу, ведаю...

— Не ўсё ведаеш, — запярэчыў Руцкі і дадаў: — Мне і самому пра сябе не ўсё вядома. А часам наогул не зразумела, хто і што мною рухае, кіруе... Прабач.

— За што?

— За ўсё.

— Вяртайся да сваёй жонкі, — параіла Данута, зрабіўшы паўзу. — Вяртайся... Гэта самае важнае, што я магу табе параіць і самае большае, што магу яшчэ даць...

Яны абняліся. Стаялі так хвілін пяць-шэсць. Моўчкі. У гэты час у суседняй кватэры іграла музыка і нехта гучна смяяўся.

— Прабач, — паўтарыла Данута са звыклым прыдыханнем, але з нязвыклым сіпеннем у голасе, якое здалося Руцкаму чужым і лішнім. — Ты можаш дараваць. Бо ў цябе таксама вочы зялёныя і ў іх таксама ёсць любоў...

Ён пацiснуў плячыма:

— Напэўна.

Яны развіталіся, але верылі, што яшчэ пабачацца. Усё роўна дзе, калі, у якім жыцці, але пабачацца.

## XIII

Праз месяц Дануту паклалі ў бальніцу. Руцкі хацеў наведаць дзяўчыну, але яго да яе не пусцілі.

— Яна пад кропельніцай, — растлумачыў яму малады барадаты ўрач з вялікай лысінай на маленькай галаве. — Прыходзьце заўтра, а лепш паслязаўтра...

Да Руцкага дайшло: Данута з бальніцы жывой ужо не выйдзе. Ніколі. Гэтае «ніколі» засела не толькі ў яго мозгу, але і ў горле, не даючы свабодна дыхаць. Яно амаль бесперапынна раздзірала сэрца Руцкага і не давала спакою яго душы. Гэта было гора. Руцкага гора. Чым ён мог дапамагчы Дануце, каб яна падоўжыла свае дні?.. Маліцца?.. Руцкі маліўся. Магчыма, ёй станавілася лепш, але ненадоўга... Ад гора, якое звалілася на яго, ён напіўся. Страшэнна напіўся. А калі працверазеў, вырашыў неадкладна ехаць у Варшаву, каб зрабіць тое, што не зрабіў Богдан і пра што ён, Руцкі, сказаў Дануце: «У мяне адна думка — забіць Дзяжынскага». Цяпер гэтая думка, нібы тонкі медны дрот, абхапіла галаву Руцкага і здушвала яе так, што, здавалася, упілася ў скуру, рэзала косткі чарапной каробкі...

«Забіць...»

Прыехаўшы ў польскую сталіцу, Руцкі паставіў машыну на стаянцы каля чыгуначнага вакзала, каб быць «як усе грамадзянскія». Агледзеўшыся, пешшу накіраваўся ў гатэль «Наватэль Цэнтрум», дзе ў бары выпіў фужэр тэкілы. Яна, адчувалася, была разбаўлена вадой.

— Навошта ты гэта зрабіў? — спытаў рудавалосага барадатага бармэна Руцкі, наліваючыся злосцю, якая ў ім у апошнія дні настойвалася і мацнела, як той каньяк у дубовай бочцы.

Бармэн зразумеў пытанне, але нічога не сказаў, толькі крыва ўсміхнуўся. Злосць у Руцкага пачала закіпаць і пераходзіць у шаленства. У гэты час да стойкі бара падышоў Дзяжынскі. З усмешкай гледзячы на Руцкага, павітаўся па-польску:

— Чэсць.

Руцкі не адказаў.

— Сумуеш? — спытаў Дзяжынскі ўжо па-руску.

— Гэта мая справа, — агрызнуўся Руцкі. — Ты адзін тут?

— Калі не лічыць вакол нас людзей, то адзін.

На прыгожым твары Дзяжынскага разлілася алеістая ўсмешка.

— Не жадаеш расслабіцца?.. Я вазьму віно?..

— Бяры, — выціснуў Руцкі, міжволі азіраючыся па баках. — Бутэльку чырвонага.

— Чаму чырвонага?

— Не ведаю. Кажуць, яно карыснае, дапамагае лячыць розныя хваробы... Анкалагічныя хваробы... А можа таму, што гэтае віно часцей п'юць людзі ўжо немаладыя і адзінокія, каб узбадзёрыцца, адчуць упэўненасць...

— А ты ў чымсьці не ўпэўнены?

— А ты?

Дзяжынскі прамаўчаў.

— Добра, не адказвай. — Погляд Руцкага слізгануў па стойцы бара, спыніўся на штопары, які ляжаў каля пустой бутэлькі. Яго Руцкі непрыкметна паклаў сабе ў кішэню пінжака. — Бяры віно... Сам захацеў... Я адкрыю...

Яны пайшлі ў дальні кут, дзе нізка вісела лямпа. Яе святло было барвовым. Водбліскі яго злавесна гулялі на раскошнай чорнай канапе. Не сядаючы на яе, Руцкі ўзяў з рук Дзяжынскага бутэльку «Марсалы» — віна, якое вырабляецца на Сіцыліі. Адкрыўшы яе, разліў чырвонае, а ў барвовым святле лямпы амаль чорнае віно ў бакалы.

— Прысядзем? — Дзяжынскі глядзеў на Руцкага насцярожана. Напэўна, адчуваў небяспеку. — Не разумею, нешта душыць... Сэрца, ці што?..

— Зараз табе будзе лепш, — са здзеклівай усмешкай сказаў Руцкі. У яго правай руцэ быў штопар, а ў левай — куфаль з віном. — Пі...

Дзяжынскі выпіў. У гэты час у Руцкага зазваніў тэлефон. Ён паставіў віно, дастаў з кішэні мабільнік. На яго экране гарэла зялёным святлом адно слова: «Данута».

— Так, — адказаў Руцкі. — Слухаю...

Напэўна, яна адчула, што можа здарыцца бяда і амаль шэптам, з адчаем, папрасіла:

— Калі ласка, не чапай Фелікса.

— Добра, — паабяцаў Руцкі, хоць у падсвядомасці разумеў, што зараз будзе забіваць Дзяржынскага.

Будзе і ўсё. Гэта было не проста жаданне, а фізічная неабходнасць, патрэбнасць, якая запаўняла не толькі запалёны мозг Руцкага, але і ўсё яго цела. У рэшце рэшт для гэтага ён і прыехаў у польскую сталіцу.

— Навошта ты так з Данутай? — скрозь зубы спытаў Руцкі Дзяржынскага, укладваючы ў свае словы ўсю злосць да яго, якая неўзаметку, але хутка перайшла ў нянавісць.

Гэтая нянавісць у Руцкага яшчэ некалькі месяцаў таму была невялікай, але потым разраслася. А ўсё з-за забойства Збігнева, здрады Хэлены, а цяпер яшчэ і страшэннай, невылечнай хваробы Дануты. Здаецца, Дзяржынскі ўсё зразумеў. Ён стаўналівацца фарбай, чырванець, як святло ліхтара, і як быццам згасаць. Зрэнкі яго пры гэтым пашырыліся, а дыханне стала цяжкім і шумным.

— Навошта? — глуха паўтарыў Руцкі.

— У мяне сын, — разгублена прасіпеў Дзяржынскі. — Маленькі яшчэ...

— У мяне два сыны і ў Дануты таксама маглі быць дзеці, — прашыпеў Руцкі. — Ты разумееш?.. Разумееш, я пытаюся?..

Дзяржынскі маўчаў. Рот яго крывіўся, па ніжняй губе пацякла сліна...

— Дрэнь, — працадзіў Руцкі.

Ён рэзка, з сілай, усадзіў штопар у грудзі збялелага як снег Фелікса — трохі вышэй сэрца.

«Жыві, калі выжывеш...»

У апошні момант Руцкі выконваў не просьбу Дануты, не, а проста пашкадаваў малалетняга сына Дзяржынскага і пакінуў яму шанс выжыць.

— Баліць?.. — Руцкі заскрыгатаў зубамі. — Баліць.

Дзяржынскі, адкрыўшы шырока рот, выдыхнуў з сябе паветра, пасля чаго застыў, збіраючыся ці то падаць, ці то працягваць стаяць. Дзіўна, але ён не войкнуў, не закрычаў, не выдаў ніводнага гуку. Толькі канвульсіўна затузаўся. Можна было

падумаць, што Фелікс вырашыў патанчыць. У гэтыя хвіліны якраз гучала працінаўшая сваёй шчырасцю песня Сальваторэ Адамо:

Падае снег,
Ты не прыйдзеш сёння ўвечары.
Падае снег,
Усё белае ад роспачы.
Сумная ўпэўненасць,
Холад і пустата.
Гэта ненавісная цішыня,
Белая адзінота...

Руцкі кінуў штопар на столік і пайшоў да выхада з бара ў марозную імглу вячэрняй Варшавы. У дзвярах азірнуўся. Дзяжынскі ці то яшчэ сядзеў, ці то ляжаў на канапе, закрываючы правай рукой рану. У левай руцэ ў яго быў бакал з віном. Яно павольна вылівалася на падлогу, утвараючы лужыну. Гэтая лужына была падобна на чорную бяздонную дзірку, якая цягнула ў сябе ўсё, што было вакол.

## XIV

Дзіўны стан — адзінота. Як правіла, яна прыходзіць нечакана, раптоўна, несучы з сабой спусташэнне, расчараванне, боль, адчужэнне ад тых, хто яшчэ ўчора быў блізкім табе чалавекам, сябрам або проста добрым знаёмым. Адзінота нацягвае нервы, цісне на сэрца, гаспадарыць у мозгу. Яна пачынае шаптаць табе: «Ты ёсць, і цябе ўжо няма». Надыходзіць поўнае раздваенне асобы. Адна палова жыве ў табе яшчэ з надзеяй і верай у жыццё, а другая — памірае. Вярнуцца ў нядаўні шчаслівы і бесклапотны стан немагчыма. Адзінота каго павольна, а каго хутка, бязлітасна і холадна забівае.

У Руцкага з-за адзіноты прапала ўсякае жаданне жыць, і ён зразумеў, што на самай справе можа сарвацца: узяць пісталет і пусціць сабе кулю ў лоб. Не адразу, вядома, а пасля таго, як выпье ў сябе не менш за паўтары-дзве бутэлькі гарэлкі або віскі, а то і спірту. Гэта была ўжо не проста адзінота, а і народжаная адзінотай дэпрэсія. Яна давіла волю Руцкага і ўсяляла ў яго бязволле, выклікала ў ім пачуццё голаду і асабліва смагі, ад

якой — ён гэта добра ўсведамляў — можна пазбавіцца толькі ў тым выпадку, калі напіцца. Зноў страшна напіцца і зрабіць тое, пасля чаго ўжо нічога не будзе трэба. Нічога...

Аднекуль з вышыні Руцкаму пачуліся словы Сямёна Гудзенкі:

«Нас не нужно жалеть, ведь и мы никого не жалели...»

«Никого», — з пачуццём тугі і безвыходнасці канчаткова зразумеў Руцкі. Ён паехаў у краму, купіў скрыню гарэлкі, пасля заехаў да сябе на дачу і патэлефанаваў Стасю, сказаўшы яму адно слова:

— Прыязджай.

Так Руцкі звычайна запрашаў Стася на моцную выпіўку. Той гэта ведаў і заўсёды прыязджаў. Але ў гэты раз Стась ад запрашэння свайго сябра адмовіўся.

— Чаму? — спытаў Руцкі.

— Таму што я цябе ведаю, — адказаў Стась. І дадаў: — Спадзяюся, гэта пройдзе. Едзь дадому...

Руцкі наліў сабе шклянку гарэлкі і паставіў перад сабой на стол. Гарэлка ў шклянцы дрыжала. Разам з ёй дрыжала і душа Руцкага.

«Можа, дастаць пісталет са склепа, — падумаў Руцкі. — Дастану...»

Пасля таго, як ён спустошыў шклянку з гарэлкай, яму ў галаву прыйшла шалёная, бязлітасная да сваіх родных і да сябе, але, як ён думаў, рацыянальная ў яго выпадку думка: «Трэба нанасіць у дом дроў, зачыніць дзверы на ключ, абліць усё саляркай, падпаліць, а пасля як мага хутчэй стрэліць у сябе... Няхай дом і ўсё, што ў ім, згарыць... Няхай згару я... Дашчэнту...»

Руцкі выпіў яшчэ. Потым яшчэ. Хістаючыся, падышоў да акна. За ім блішчаў лёд ракі Лясной, якая агінала дачны ўчастак Руцкага з двух бакоў. Ён доўга глядзеў на замёрзлую раку, а калі яна пачала размывацца і знікаць, перавёў погляд на зморшчаны і застылы на марозе пад самым акном мак. Яго было ўсяго два кусты і на кожным толькі па галоўцы маку. Паміж галоўкамі маку, сыходзячы ўніз, вісела тонкая застыглая

павуціна. На яе падала скупое ў зімовую пару сонечнае святло. Пад ім павуцінне блішчэла і быццам бы размывалася, знікала... Руцкаму стала яе шкада. Але больш за ўсё яму стала шкада сябе.

«Я згару, згару... І нічога ад мяне не застанецца... Нічога... Толькі галавешкі...»

З вачэй Руцкага пацяклі слёзы — яму стала страшна. Ён паглядзеў на пісталет, павольна ўзяў яго, доўга стаяў з ім, потым рэзка накіраваў ствол у акно і стрэліў. Шкло ў акне ў тое ж імгненне разляцелася, але перад гэтым нібыта выбухнула, а дакладней — лопнула. Руцкаму здалося, што гэта лопаецца яго скура, і ён успомніў, як тыдзень таму сусед па дачы смаліў тушу кабана. Але не саломай, як гэта было раней, а паяльнай лямпай... Амаль чорны кабан ляжаў спінай на дошках. Ногі, напалову адрэзаныя, у яго стаялі тарчма. Скура кабана пачала трэскацца, пырскаць тлушчам...

«І ад мяне будзе пырскаць...»

Руцкі павольна, але дакладна пачаў цверазець. Жаданне паміраць у ім прапала, але страх у яго ўсё роўна не праходзіў. І што дзіўна, яму не хацелася, каб гэты страх, блізкі да жаху, пакідаў яго, Руцкага, таму што ён баяўся здзейсніць задуманае...

Выпадкова ці невыпадкова, але ў яго запаленым мозгу ўсплыла размова з Богданам: «Хочаш, я табе пакажу той жудасны страх, пра які ты не раз думаў, уяўляў сабе, але не перажыў яго.

— Навошта?

— Таму, што тэорыя сухая, прыяцель, а дрэва жыцця пышна зелянее.

— Гэта будзе нешта ненатуральнае?

— Наадварот, гэта будзе самае натуральнае, што можна ўбачыць у нашым жыцці. Скажаш мне, калі гэта табе спатрэбіцца ўбачыць...»

Руцкі зразумеў, што хоча гэта ўбачыць, каб не страляць у сябе. І наогул, не страляць ні ў кога.

## XV

— Прыехаў?.. — Богдан усміхнуўся, але рукі не падаў. — Я ведаў, што ты прыедзеш.

— Адкуль? — спытаў Руцкі, дыхнуўшы на марозе парай.

— Мы ўсе аднолькавыя, Ягор, — упершыню назваўшы яго па імені, павучальна вымавіў Богдан. — І я, і ты, і ўся наша кантора «Максімус». І нават увесь чалавечы свет... Больш за тое, мы ўсе сядзім у яме, якая называецца выграбной. Не верыш?.. Зараз пераканаешся...

На машыне Богдана яны прыехалі на нейкае закінутае прадпрыемства. Яго цагляныя сцены былі цёмнымі, абсмаленымі, быццам па іх прайшліся паяльнай лямпай. Бялёсы ад снегу асфальт на ўсёй тэрыторыі палопаўся. Скрозь яго лезла леташняя ссохлая трава і тырчалі голыя галіны кустоў. Дзесьці на вышыні другога паверха манатонна пляскала пад пранізлівым ветрам разбітая аконная рама, а пад нагамі валяўся пабіты шыфер. Некалькі разоў слаба забрахаў, потым заскуголіў сабака. Руцкі запытальна паглядзеў на Богдана. Маўляў, адкуль сабака тут?..

— Гэта мой, — усміхнуўся Богдан. Яго ўсмешка была абыякавай. — Ідзі за мной...

Яны прыйшлі ў велізарнае памяшканне, дзе гаспадарыў скразняк. Напэўна, раней тут быў завадскі цэх і ў ім стаялі фрэзерныя і слясарныя станкі, ад сцяны да сцяны ішлі вытворчыя лініі, але цяпер было пуста і гола.

— Пачакай тут, — кінуў Руцкаму Богдан.

Ён пайшоў у бакавыя дзверы і неўзабаве выйшаў, трымаючы на павадку худога дварняка з вільготнай і доўгай поўсцю. Прывязаўшы сабаку да халоднай батарэі, зняў пальчаткі і выняў пісталет «Беретта».

— Гэта навошта? — спытаў Руцкі.

Падсвядома ён разумеў, для чаго патрэбна зброя, але верыць у гэта яму не хацелася.

— Цудоўны пісталет, — замест адказу прамовіў Богдан. — Можна сказаць, адзін з самых лепшых у свеце. Страляе дакладна і кучна. Праўда, цяжкаваты і дзяржанне не вельмі зручнае, але ў цэлым амаль незаменная штука... У цябе такі ж?..

— У мяне «ТТ», але ён у Брэсце. — Руцкі не ведаў, што здарылася б, калі б пры ім была баявая зброя. Але яе не было. Таму Руцкаму нічога не заставалася, як стрымліваць свае эмоцыі. — «ТТ» таксама нядрэнная рэч... Але мы не пра тое гаворым.

— А пра што трэба гаварыць?

— Я табе задаў простае пытанне: «Гэта навошта?..»

— А навошта мы ўваходзім у склад «Максімуса»? — хітра і холадна пацікавіўся Богдан і сам жа адказаў: — Каб паказаць сваю сілу, значнасць, а калі казаць прама, то даказаць сабе і ўсім, што мы мужчыны і штосьці ў гэтым жыцці значым, цвёрда стаім нагамі на зямлі, кімсьці кіруем... Я даказваю, ты даказваеш.

— Я нічога не даказваю, — нервова вырвалася ў Руцкага. — Проста жыву, працую.

— Кінь, — суха прамовіў Богдан. — Мы не на палітінфармацыі... Гэта я ўжо не даказваю, таму што дапрацоўваю апошнія дні, а ты даказваеш. Менавіта даказваеш. Сведчанне гэтаму — Данута, з якой ты прыязджаў у Варшаву на банкет з нагоды майго зыходу на пенсію. Табе ёй неабходна было нешта даказаць... Хіба не так?..

Руцкі прамаўчаў.

— Так, — выдыхнуў Богдан. — Усе людзі аднолькавыя, усе... Ты чуў, што сёння кажуць пра Дзяжынскага, якому ты ўсадзіў у грудзі штопар?.. Не?.. Дык я табе скажу... Дзяжынскага абвінавачваюць у сексуальных дамаганнях і згвалтаваннях маладых акторак. З-за гэтага ад яго адвярнуліся многія ўплывовыя людзі, а яго бізнес накрыўся медным тазам. У апошні месяц як мінімум чатыры жанчыны падалі іскі на Дзяжынскага ў суд... З аднаго боку, зразумела, што ўсе гэтыя актрысы самі вінаватыя, бо яны аддаваліся дзеля поспеху і славы. Кажучы прама, яны проста кар’ерныя давалкі, але хацелі даказаць, што гэта не так, што яны вялікія...

— Змоўч, — пагрозліва сказаў Руцкі.

— Як скажаш, — амаль такім жа тонам прамовіў Богдан. — Дзяжынскі выжыў, але не ўсім жа так шанцуе.

— Ты пра мяне? — нервова заварочаў вачыма Руцкі. — Гавары прама.

— Сам падумай...

Богдан нетаропка, але з майстэрствам дасведчанага стралка ўставіў у пісталет абойму з патронамі, накіраваў яго ў бок сабакі і, амаль не цэлячыся, стрэліў. Сабака, зваліўшыся на грудзі, віскліва заскуголіў, прыціснуўся да халоднага бетона, апусціў вушы, выцягнуў наперад галаву і застыў. Прыгледзеўшыся, можна было бачыць, як сабака дрыжыць. Усім целам дрыжыць, уключаючы хвост. І толькі вочы ў яго былі нерухомымі. У іх калыхаліся боль, непаразуменне, а больш за ўсё — страх. Нават не страх, а жах. Самы сапраўдны жах...

— Бачыш? — крыкнуў Богдан. — Гэта тое, што мы баімся ўбачыць у сабе, але затое хочам бачыць у іншых. У іншых!.. Калі хочаш, вазьмі пісталет, дабі сабаку. Яму ўсё роўна ўжо не жыць. — Богдан працягнуў «Беретту» Руцкаму. — Ты не любіш мяне. Магчыма, жадаеш мне смерці. Сабака будзе маленькай, але ўсё ж кампенсацыяй табе за тое, што я яшчэ жывы.

— А калі я выстралю ў цябе? — Руцкі спадылба, са злом, паглядзеў на Богдана. — Не баішся?

— Баюся! — выгукнуў ён. — Калі ты ледзь не забіў Дзяжынскага, то можаш прыкончыць і мяне... І таму пісталет я табе даваў проста так, каб паглядзець на тваю рэакцыю.

— Паглядзеў?

— Вядома. І нават зрабіў выснову.

— Якую?

— Зброю табе давяраць нельга.

— А табе?

— Мне таксама. Са зброяй мы аднолькавыя. Ну, ці амаль аднолькавыя. У тым сэнсе, што ад нас можна чакаць чаго заўгодна. Зрэшты, як ад усіх людзей. Так?.. Так...

Богдан адвярнуўся ад Руцкага і з нянавісцю пачаў паліць у беднага сабаку, пакуль не скончыліся патроны. Уся абойма...

— Ты здурнеў, — праз зубы выціснуў Руцкі.

— А ты не здурнеў?.. Не? — Богдан, счырванеўшы, прашыпеў: — Скажы мне, навошта табе здалася наша арганізацыя?.. Што ты ў ёй знайшоў?.. Дзеля каго і дзеля чаго табе рызыкаваць?.. Жыві ў сваім Брэсце, працуй там, расці дзяцей,

чакай унукаў... Лічыш, што гэтага мала?.. Няма драйва?.. Я табе, калі хочаш, зараз яго дам... — Богдан перазарадзіў пісталет і накіраваў на Руцкага. — Ты зараз памрэш... Здохнеш, як гэты сабака... Здохнеш... Маліся...

Губляючы адэкватнасць, Богдан узвёў курок. Віскі Руцкага раздзімаліся, ствараючы ў яго целе такое напружанне, якое да гэтага яму не даводзілася адчуваць ніколі. Нават тады, калі ён рэзка ўсаджваў штопар у грудзі Дзяжынскага. На твары Руцкага не было ні крывінкі. Твар выцягнуўся, а вочы застылі, быццам у іх глядзела сама смерць... Яго смерць... І ён раптам зразумеў, што так і ёсць. Гэтая смерць — не староння, а сапраўды яго, Руцкага. Яна прыйшла і вось-вось забярэ яго на іншы свет, які на імгненне паказаўся ў лужыне разлітага Дзяжынскім віна. Руцкі гэта ўбачыў, але яшчэ не да канца верыў у тое, што адбываецца. Ён нават паспрабаваў уявіць не гэтую, прыйшоўшую да яго смерць, а нейкую другую. Але другой смерці няма і не можа быць. Яна адна для ўсіх. Смерць ужо тут і цяпер. На імгненне ўсвядоміўшы гэта, Руцкі стаў увесь халаднець і паміраць, нібы смерць ужо ўзяла яго за горла і пачала ціснуць... Але яна яшчэ не ўзяла, а толькі прыглядалася да яго. Прыглядалася і злосна смяялася...

— Ха-ха-ха!.. — Гэта смяяўся Богдан. Смяяўся нервова і працяжна, быццам глядзеў камедыйны фільм. — Ты таксама баішся...

— Страляй! — закрычаў Руцкі, адчуўшы, што ў ім нешта разарвалася, і страх раптам знік. А разам са страхам знікла бачанне смерці. — Мне ўсё роўна...

— Гэтыя словы я ўжо чуў, — стомлена вымавіў Богдан, апусціўшы пісталет. — І не адзін раз... Яны сведчаць пра тое, што ты хочаш жыць. Жыць!..

— Хачу, — выціснуў Руцкі. — Але не ў выграбной яме, у якой — так, так! — шмат людзей. Шмат, але ж у ёй не ўсе людзі... Не ўсе... Хтосьці ўжо вылез з гэтай ямы і стаіць там, наверсе...

— Наверсе?

— Так!

— Гэта святыя, — упэўнена прамовіў Богдан. — Нам да іх як да месяца. І нават далей, нашмат далей. Таму і страляем...

«Можа быць, — падумалася Руцкаму. — Можа быць...»

— Страляем, — паўтарыў Богдан. — Добра, прадстаўленне скончана... Калі хочаш, развітвайся з сабакам. Ён уратаваў табе жыццё...

«Дзякуй», — пра сябе падумаў Руцкі.

Падзякаваў, але не зразумеў каму: мёртваму дварняку, Богдану або Збаўцу, які даў яму, Руцкаму, магчымасць выжыць, разабрацца, нарэшце, у сабе, сваіх пачуццях і жаданнях.

«Я жывы...»

Варшаву ён пакінуў пад шум аўтамабільных шын і ледзь чутны гук рухавіка. За ўсю дарогу толькі адзін раз уключыў магнітафон, з якога вырваўся канец песні Сальваторэ Адамо:

Падае снег,
Ты не прыйдзеш у гэты вечар —
Крычыць мой адчай.
Але падае снег...

У Брэсце Руцкі ўсё радзей успамінаў пра Дануту, якая, як яму сказалі, памерла пад кропельніцай, і ўсё часцей думаў пра тое, як жыць далей. Але не проста жыць, а зрабіць нешта добрае для сваёй сям'і і тых людзей, якія яму, Руцкаму, блізкія і дарагія. Гэта так проста і так неабходна. Ён жа сам сказаў: «Чужых людзей не павінна быць».

Не павінна.



# ПОМСТА

## I

Дэпрэсія дэпрэсіі не роўная. А ў гэты дзень яна ў Івана Васільевіча Раброва была нейкай безвыходнай, пакутлівай. Чагосьці яму не хапала, нешта яго прыгнятала, незразумела што да яго набліжалася. Змрочны, згорблены больш звычайнага, быццам на ўсю яго высокую, хударлявую, а таму не зусім устойлівую постаць ціснула пачуццё гэтай безвыходнасці, ён хадзіў туды-сюды ў гасцінічным нумары і, глыбока ўцягваючы дым, курыў цыгарэту за цыгарэтай. Спыніўшыся, выглянуў у акно, скрозь шчыліну якога цягнуў лёгкі, але халаднаваты скразняк, і думаў: «Можа, кінуць усё і з'ехаць куды вочы глядзяць?..»

Па сутнасці, яму было ўсё роўна: можна з'ехаць, а можна і застацца. Так і не вырашыўшы, што рабіць, Раброў у думках вылаяўся, шкадуючы, што не шанцуе. Ён рэзка выняў з рота цыгарэту, скамячыў яе і са злосцю кінуў у кут.

— Усё не так, як трэба, — выдыхнуў ён.

Былы начальнік участка аднаго з тэлевізійных заводаў, а цяпер загадчык аддзела забеспячэння дробнай камерцыйнай фірмы, а дакладней — звычайны штурхач, даставала, як называюць у народзе такую пасаду, Іван Васільевіч прыехаў у раённы палескі гарадок, каб заключыць дамову на пастаўку ягад, у асноўным журавін, у Германію. Дамовы такія з мясцовымі прадпрымальнікамі Раброў падпісваў, але ўпэўненасці ў тым, што ўсё будзе нармальна, у яго не было. Ды і не магло быць: у прыродзе гаспадарыў ліпень, і да збору ягад заставалася процьма часу. А яно, вядома, магло як дапамагчы, так і нашкодзіць. Быць можа, ад гэтай няўпэўненасці на душы Раброва было прыкра.

«Павячэраю, а там будзе відаць, што рабіць», — вырашыў Іван Васільевіч.

Апрануўшы пінжак і прычасаўшыся, Раброў выйшаў з гасцініцы і накіраваўся ў невялікі ўтульны рэстаран, які славіўся сваёй простай, але сытнай беларускай кухняй і да таго ж знаходзіўся непадалёк — на суседняй вуліцы.

## II

У рэстаране амаль нікога не было. За суседнім столікам сядзеў загарэлы мужчына ў паўрашпіленай клятчастай кашулі і самотна піў гарэлку, запіваючы півам, а за другім — аб нечым сваім лапаталі дзве паўнагрудыя дзяўчыны. Па ўсім, мясцовыя.

Прысеўшы каля акна за акуратна прыбраны столік, Раброў замовіў сабе салат з агуркоў, бульбачку з катлетамі, паўлітровую бутэльку настойкі горкай «Белавежскай», фірмовы напой з ягад каліны і стаў чакаць свой заказ.

На двары ўжо вечарэла. Па паўпустыннай, выкладзенай яшчэ польскім брукам вуліцы ішлі каровы, вяртаючыся з пашы. За імі клыпаў пастух — крываногі рыжы хлопец у доўгім, да пят, брудным брызентавым плашчы. У тоўстых, як быццам вывернутых вуснах пастуха дымілася самакрутка. Ён ляніва азіраўся па баках, нібы правяраў, ці не адстала якая карова, і машынальна, мабыць па даўно выпрацаванай звычцы, махаў пугай. Параўняўшыся з рэстаранам, пастух затрымаў свой позірк на акне, у якое глядзеў Іван Васільевіч, пасля чаго

на момант спыніўся, дэманстратыўна выплюнуў дакураную самакрутку і з крывой усмешкай нешта сказаў. Напэўна, хлопец, убачыўшы ў рэстаране сумнага Раброва, захацеў ці то абразіць яго, ці то выказаць сваё негатыўнае стаўленне да піцейных устаноў і тых, хто гэтыя ўстановы наведвае. Ад гэтага Івану Васільевічу стала непрыемна і ён адвярнуўся ад акна. Пачуццё безвыходнасці яшчэ больш абвастрылася, яго ахапіла незразумелая трывога.

«Можа, захварэў?» — мільганула ў Раброва думка.

Ён дастаў цыгарэты, закурыў.

Афіцыянт, лысаваты грузны мужчына, падобны да цыгана, прынёс заказ. Бліснуўшы залатым зубам, нядбайна кінуў:

— Чым багаты — тым і рады.

Раброў наліў сабе гарэлкі, выпіў. Узяўшы агурок, адкусіў трохі, астатняе паклаў на талерку: есці не хацелася. Наліў другую чарку і толькі паднёс яе да рота, як пачуў знаёмы бас:

— А я думаю, хто гэта?.. Ваня?..

Іван Васільевіч падняў галаву. Перад ім, расплыўшыся ў лагоднай усмешцы, узвышаўся яго былы аднакурснік Цімафей Андрэевіч Зданевіч. Поўны, чырвоны, быццам пераспелы памідор, ён злёгку хістаўся і з п’янай любоўю пазіраў на Раброва.

— Ты, брат, усё такі ж. — Цімафей Андрэевіч жартаўліва пагразіў Івану Васільевічу тоўстым пальцам. — Спартыўны, як тады, у інстытуце... Ну, што сядзіш, абдымемся, ці што?..

— Прывітанне, — узрадаваўся Раброў падымаючыся.

Адразу падабрэўшы ад гэтай нечаканай і прыемнай сустрэчы, ён нейкі час збянтэжана стаяў, нібы баяўся, што Зданевіч як з’явіўся, так можа і знікнуць, пасля чаго падаўся да яго.

— Якімі лёсамі тут? — прагрымеў Зданевіч, пляснуўшыся ў крэсла, якое жаласліва зарыпела пад магутным седаком. І тут жа, дурнавата прыжмурыўшыся, папракнуў: — Мяне, напэўна, ужо не памятаеш?..

— Як жа, цябе забудзеш, — аджартаваўся Іван Васільевіч. — Ты ж, бачу, расцеш усё... Феномен.

— Гм... — Цімафей Андрэевіч кіўнуў палыселай галавой, паляпаў далонню-рыдлёўкай па сваім тоўстым жываце. — Не расту, брат, а старэю.

— Добра, справа звычайная. — Раброў зноў засумаваў. — Давай вып'ем, раз нас занесла сюды абаіх.

— Давай, — згадзіўся Зданевіч. — Перакулім, як у юнацтве, гэтую горыч. Дзе наша не прападала?.. — Ён падняўся, узяў з суседняга століка, за якім нікога не было, чарку, сам наліў у яе гарэлку. — Ну, за сустрэчу.

Выпілі. Цімафей Андрэевіч папрасіў афіцыянта прынесці што-небудзь з мясных страў і дзвесце грамаў гарэлкі. Не прайшло і пяці хвілін, як афіцыянт падаў на стол нарэзку з мяса і каўбасы, паставіў графін з гарэлкай. Закусваючы, Іван Васільевіч і Зданевіч маўчалі, з цікавасцю пазіраючы адзін на аднаго. Яно і зразумела: столькі гадоў не бачыліся.

— Расказвай, — першым пацікавіўся пра жыццё свайго былога аднакурсніка і прыяцеля Цімафей Андрэевіч. — Што, дзе, як?..

— У цябе пытанні, быццам у следчага, — заўважыў Раброў.

— А ты меў справу са следчымі? — Зданевіч уважліва паглядзеў на Івана Васільевіча. — Га?..

— Не накаркай, — кінуў Раброў. — Я працую сумленна.

— Я таксама, — уздыхаючы, выціснуў Цімафей Андрэевіч. — Ва ўсякім выпадку стараюся... Ну, слухаю цябе.

— А чаго мяне слухаць, — пацізнуў плячыма Іван Васільевіч. — Прыехаў вось да вас у раён па ягады. Ужо трэці дзень тут.

— Фу-ты, ну-ты, — развязна фыркнуў Зданевіч. — Напэўна, за журавінамі?

— У асноўным за імі.

— А колькі табе іх трэба?

— Хоць бы тону, дзве, — пацізнуў плячыма Раброў. — А атрымаецца больш — яшчэ лепш.

— У такім выпадку табе да мяне трэба звяртацца. — Цімафей Андрэевіч пераможна кіўнуў. — Я тут у раёне не апошні чалавек. Не апошні... — Зданевіч узняў угору ўказальны палец. — Я, брат, намеснік старшыні райспажыўсаюза. Адчуваеш?..

— Адчуваю, — усміхнуўся Іван Васільевіч і ўжо па-свойску, па-добраму, як блізкі чалавек, прапанаваў: — Давай яшчэ вып'ем.

— Налівай, — не адмовіўся гаваркі і вясёлы Цімафей Андрэевіч.

— А ты ж інжынер-канструктар, — нагадаў свайму быломy аднакурсніку Раброў.

— Быў, — прытворна ўздыхнуў Зданевіч. — Усе мы былі рысакамі... Усе мы — я маю на ўвазе наша пакаленне — былыя: выраслі пры Саюзе, а цяпер не разбярэш, хто і дзе... — Цімафей Андрэевіч гучна, але нявесела рагатнуў. — Быў я канструктарам, у райкаме партыі інструктарам, а сёння займаюся гандлем... Гандлёвы чалавек... Перабудова, суверэнітэт, а на самай справе — ратуйся, хто як можа.

— Другімі словамі, жыві, як можаш, — уставіў Іван Васільевіч.

— Адзін чорт, што першымі, што другімі, — махнуў рукой Зданевіч і, наліўшы сабе чарговую чарку, спустошыў яе адным махам. — Вось так...

— Калі б так, а то за грошы, — прамовіў Раброў. — Мабыць, нашы шляхі падобныя. Я зараз таксама займаюся, як кажуць, купі-прадай.

— Значыць, лёс, — падвёў рысу пад быццам бы вясёлай, нават некалькі задзірлівай, а па сутнасці, сумнай размовай Цімафей Андрэевіч. — Сам ведаеш... Быў бы капітал, працаваў бы на сябе, а так прыходзіцца гарбаціцца на дзяржаву. А яна прагная, рубля лішняга не дасць... Нават не прасі.

— Прыватнікі яшчэ горш, — з ноткамі злосці ў голасе прамовіў Іван Васільевіч. — Я вось у камерцыю падаўся. Думаў, кучу грошай зараблю, але не выйшла — што атрымаю, тое і раскідаю.

— А-а... Не будзем... — Зданевіч павёў асалавелымі вачыма па зале рэстарана, якая была амаль ужо амаль запоўнена, і рашуча гаркнуў:

— Пятровіч!

Няспешна падышоў афіцыянт — усё той жа мужчына цыганскай знешнасці. На яго масляністым твары чыталася знарочыстая паслужлівасць, змешаная з насмешкай.

— Што, Цімафей Андрэевіч?

— Як заўсёды! — стукнуў па стале цяжкім кулаком Здановіч. — Каб добра выпіць і са смакам паесці... Толькі хутка.

Афіцыянт паспешліва прынёс салату з капусты, салёныя агуркі, смажаную каўбасу і літровую бутэльку гарэлкі «Гарбачоў». Адставіўшы чаркі, наліў у фужэры. Амаль па-поўнаму.

Цімафей Андрэевіч няцвёрдай рукой узяў фужэр і, заплюшчваючы вочы, паглядзеў на Раброва.

— Ну, за ўсё добрае, што было ў нас і што будзе...

Здановіч так махнуў рукой, у якой трымаў відэлец, што з яго зляцеў агурок. Не звяртаючы на гэта ўвагі, асушыў фужэр да дна.

Іван Васільевіч, ужо добра захмялелы, няпэўна кіўнуўшы цяжкай галавой у знак згоды, выпіў сваю гарэлку.

## III

Былыя аднакурснікі, а цяпер проста знаёмыя, Раброў і Здановіч сядзелі доўга, да самага закрыцця рэстарана. Гаварылі, здаецца, пра ўсё, пра што могуць гаварыць п'яныя мужыкі. У гэтай зацягнутай размове яны ўсё больш скардзіліся адзін аднаму на свае праблемы, абураліся жыццём: і сваім, і тым, якое іх акружае. Тон іх гутаркі, якая пачалася адносна мірна і весела, стаў да наступу ночы нервовы, агрэсіўны. Ці таму, што пастарэлі — ім ўжо было пад пяцьдзясят, — ці таму, што лёсы ў аднаго і другога склаліся не проста, са зрывамі і няўдачамі, ці таму, што перабралі лішняе. А хутчэй, ад усяго разам узятага.

Іван Васільевіч распавядаў пра тое, як сышоў з аб'яднання, калі развалілся савецкі рынак і айчынныя тэлевізары, у параўнанні з заходнімі сусветна вядомымі мадэлямі, безнадзейна састарэлі, сталі амаль незапатрабаванымі ў пакупнікоў. І па якасці, і па дызайне, і па кошце. Пачаліся скарачэнні рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў. Раброў, чалавек па натуры горды, звольніўся, праўда, сам. Але што з таго?.. Іншай добрай работы па сваёй спецыяльнасці не знайшоў, стаў выпіваць. І жыццё яго, якое абяцала спачатку сямейны дабрабыт і ўдалую службовую кар'еру, пакацілася ўніз. Ён развёўся з жонкай і сышоў жыць у інтэрнат, дзе камунальны побыт корміцца не

толькі чалавечай цярплівасцю жыхароў, але і іх чалавечымі слабасцямі. Менавіта з-за гэтага ў характары Івана Васільевіча адбыўся пералом. Пакуль яшчэ нязначны, ледзь адчувальны, але пачуццё няўпэўненасці, страх перад будучыняй, безвыходнасць завалодалі Рабровым.

Зданевіч, па характары добры і гаварлівы, таксама, аказалася, заблукаў на рынкавых прасторах. Збіўшыся са шляху, ён пачаў калясіць па былым Саюзе ў пошуках простага чалавечага шчасця, якое будуецца ў добрай сям'і, на нармальнай працы, пад надзейным дахам над галавой. Але, на жаль, марна. Паматаўшыся некалькі гадоў па неабсяжных прасторах былой вялікай краіны, Цімафей Андрэевіч вярнуўся ў свой родны гарадок, на бацькаўшчыну. Добра, што ў рэшце рэшт уладкаваўся на нядрэнную  прыбытковую працу ў райспажыўсаюзе. Спачатку быў простым спецыялістам у гандлёвым аддзеле, потым выбіўся ў намеснікі старшыні па гандлі. Але што пасады, грошы, калі сям'я пасля шматлікіх пераездаў распалася, і ў былой кватэры, якая засталася яму ад бацькоў у спадчыну, пасялілася адзінота. Здавалася, назаўжды.

І Раброў, і Зданевіч апынуліся выкінутымі за борт новага, невядомага ім жыцця. Аб былым у іх засталася толькі памяць, ды і тая паступова сыходзіла ў нябыт.

— А ўсё ён нарабіў! — ткнуўшы пальцам у этыкетку з выявай Гарбачова, загрымеў на ўсю залу Цімафей Андрэевіч. — Ён, перабудоўшчык,  халера яго бяры!.. Усё ён!..

І так чырвоны, Зданевіч пабарвавеў. На яго злым, перакошаным твары чыталася нянавісць, якая збіралася доўга і цяпер смела, адчайна выплюхвалася вонкі.

Іван Васільевіч і сам не ўспрымаў тых змен, якія адбыліся ў рэчаіснасці, але вярнуць назад былое немагчыма.

— Не дуры, — паспрабаваў ён супакоіць Цімафея Андрэевіча. — Усе мы вінаватыя, усе.

— Не, ён, Гарбачоў! — не сунімаўся Зданевіч.

Наведвальнікі рэстарана спачатку толькі паглядалі на ап'янелых сяброў, але ўжо праз некалькі хвілін сталі з цікавасцю назіраць за сцэнай, якая разыгрывалася за іхнім сталом.

— Маўчы, — папрасіў Раброў. Яму стала няёмка за Цімафея Андрэевіча. — Перажывём, не такое перажывалі.

— Сумняваюся, — незадаволена сказаў Здановіч. — Даўно ўжо сумняваюся.

— Перажывём, — упэўнена, але і не настойваючы на сваім, глуха паўтарыў Іван Васільевіч, супакойваючы ўжо не толькі Здановіча, але і сябе.

Пасля бурнай сцэны былыя аднакурснікі змоўклі. Цімафей Андрэевіч апусціў галаву і, здавалася, ціха, без слёз, плакаў. Раброў стомлена і раўнадушна глядзеў у цёмнае акно, нібы там, за даўно нямытым, брудным шклом вось-вось з'явіцца той, хто супакоіць душу Здановіча, а заадно і яго, Івана Васільевіча, душу, верне былое, не вельмі сытны, але адносна добры стары час, у якім засталіся іх маладосць, надзеі, бурнае жыццё. Верне не толькі гады, але і ўсё тое, у што верылася і здавалася непахісным, вечным. Яно, гэтае непарушнае і вечнае, абяцала поўнае радасці і поспехаў жыццё. На жаль, амаль нічога не спраўдзілася і ўжо наўрад ці спраўдзіцца.

Цімафей Андрэевіч раптам рэзка падняў галаву, павольна, ужо праз сілу, выпіў гарэлку, што засталася ў фужэры, цяжка падняўся і шумна выдыхнуў:

— Паедзем да мяне.

Раброў адмоўна пакруціў галавой. Яму было дрэнна, хацелася спаць.

— Паедзем, — яшчэ раз прапанаваў Здановіч, які прыкметна хістаўся, хоць і трымаўся за спінку крэсла.

Іван Васільевіч няўпэўнена ўстаў, працягнуў руку і паабяцаў:

— Я заўтра прыеду.

— А сёння? — не хацеў адступіцца ад свайго Цімафей Андрэевіч.

— У мяне тут машына, — патлумачыў Раброў. — Да пабачэння, Цімафей.

Здановіч горача абхапіў руку Івана Васільевіча сваімі мядзведжымі лапамі, потым моцна абняў прыяцеля, абслюнявіў яго худую жылістую шыю.

Абдымаючыся, яны ледзь не ўпалі на падлогу.

— А можа, усё ж такі паедзем? — у які раз запытальна прагудзеў Цімафей Андрэевіч.

Раброў закрыў вочы. Здавалася, ён вось-вось засне стоячы. З сілай расціснуўшы набрынялыя павекі, Іван Васільевіч з цяжкасцю павярнуў да дзвярэй здаравеннае цела былога аднакурсніка, якое аддавала гарачынёй.

— Ідзі. — Раброву стала шкада былога аднакурсніка. — Ідзі...

Зданевіч, развітваючыся, моцна абняў Івана Васільевіча, нібы праводзіў яго так далёка і так надоўга, што нават не ведаў, ці пабачыць яшчэ калі-небудзь. Потым, доўга корпаючыся ў кішэнях, знайшоў сваю візітную картку, сунуў яе Раброву і, ледзь не падаючы, паплёўся да выхада.

Іван Васільевіч з палёгкай апусціўся на крэсла. Цела яго адразу абмякла, усё вакол паплыло, навалілася дрымота.

## IV

Рэстаран закрываўся апоўначы. Афіцыянты прыбіралі са сталоў посуд і падлічвалі выручку.

Раброў, падпёршы галаву рукамі, засынаў і ўжо бачыў сон, але гэта было быццам наяве, цяпер, у гэтым рэстаране. На Івана Васільевіча глядзеў рыжы пастух, што гнаў кароў з пашы. Глядзеў доўга, уладна, нібы ацэньваў. У яго вывернутых вуснах дымілася самакрутка. Густы чорны дым ад яе падымаўся да столі, засцілаў святло. І калі ў зале стала амаль зусім цёмна, пастух выплюнуў недакурак і голасам, які не церпіць пярэчання, загадаў:

— Уставайце!

Раброў хацеў устаць, але цела не слухалася: усе суставы сталі быццам драўлянымі. Пастух, вывернуўшы вусны ў пагардлівай і знішчальнай ухмылцы, рэзка махнуў пугай. Іван Васільевіч здрыгануўся і... прачнуўся.

Над ім, схіліўшыся, стаяў афіцыянт. Абдымаючы Раброва, лёгенька штурхаў яго ў плячо.

— Уставайце...

Іван Васільевіч з цяжкасцю прыйшоў у сябе.

— З вас восемдзясят тры тысячы. — Афіцыянт паклаў на стол рахунак. — Вось...

Раброў машынальна кіўнуў:

— Дзякуй. Адну хвіліну...

Ён палез у кішэню за партманетам, але яго не было. Іван Васільевіч праверыў усе кішэні — пуста.

— Дзе ж грошы? — прамармытаў сам сабе.

Афіцыянт цярпліва чакаў. Па яго расчырванелым перад канцом змены твары было зразумела, што ён павячэраў ужо, не без гарэлкі, вядома. А таксама, што афіцыянт можа дазволіць сваім кліентам не вельмі спяшацца, нават пасядзець і выпіць яшчэ. Але, зразумела, за дадатковую плату.

— Прабачце. — Раброў вінавата ўсміхнуўся. Усмешка атрымалася крывой і жаласлівай. — Я партманет, мабыць, у гасцініцы забыўся. Зараз прынясу.

З твару афіцыянта адразу ж зляцела дабрадушнасць. Ужо строга, з адценнем перавагі, ён працадзіў:

— Гэта вам будзе каштаваць даражэй. Сашка!..

З-за століка, што стаяў у самым куце, падняўся высокі мардаты хлопец з чорнай кучаравай шавялюрай.

— Правядзі кліента, — паказаўшы вачыма на Івана Васільевіча, коратка загадаў афіцыянт. — З яго сто тысяч.

Хлопец важна падышоў да Раброва, бесцырымонна ўзяў пад руку.

— Пайшлі.

Гэта абразіла Івана Васільевіча і ён, адкінуўшы руку нейкага Сашкі, якога афіцыянт прыставіў да яго як праважатага, рэзка падняўся. Ад гэтай рэзкасці Раброва гайданула. Ледзьве ўтрымаўшыся на нагах, ён няцвёрдай хадой накіраваўся да выхада. За ім следам заспяшаўся мардаты дзяцюк.

Выйшаўшы на вуліцу, Іван Васільевіч прагна ўдыхнуў свежае, змяшанае з пахам адцвітаючага бэзу паветра. Сілячыся прагнаць хмель, ён правёў узмакрэлай далонню па твары і адразу ж адчуў боль у страўніку, а за ёй — млоснасць. Неўзабаве яго вынітавала.

Бамбіза грэбліва паморшчыўся, сплюнуў сабе пад ногі.

Вынітавала, і Іван Васільевіч адразу ж адчуў палёгку, уздыхнуў і, няўцямна зірнуўшы на хлопца, прамовіў:

— Хадзем.

Гарадок ужо спаў. Па паўасветленай вуліцы нетаропка хадзіла маладая падвыпіўшая пара, ды ля смеццевага кантэйнера, бліскаючы вачыма, збіраліся каты.

Ля ўвахода ў гасцініцу Раброў спыніўся, папрасіў свайго правадніка:

— Пачакай тут, я хутка.

— Хадзем разам, — холадна буркнуў малады здаровы мужчына.

Яго мясісты, хмуры і незадаволены твар чымсьці быў падобны да твара афіцыянта з рэстарана — Пятровіча.

Іван Васільевіч, паціснуўшы плячыма, прамовіў:

— Ну, як хочаш.

Дзяжурная ў вестыбюлі гасцініцы абыякава бліснула на Івана Васільевіча і яго спадарожніка вялікімі лінзамі сваіх акуляраў і ўтаропілася ў пакамечаную газету «Комсомольская правда».

«Ціха, як на балоце, — міжволі падумаў Раброў. — Да чаго б такая цішыня?..»

Адкрыўшы свой нумар, ён кінуў хлопцу:

— Праходзь.

Пераступіўшы парог, здаравяк бухнуўся ў крэсла. Напаўлежачы, шырока расставіўшы ногі, на якіх, здавалася, трашчалі джынсы, паглядаў на Івана Васільевіча.

Абвёўшы гасцінічны нумар уважлівым поглядам, Раброў на хвіліну задумаўся: «Дзе ж партманет?..» Ён праверыў кішэні курткі, паглядзеў у шуфлядах пісьмовага стала, глянуў на падаконнік, перабраў асабістыя рэчы ў чамадане, нават зазірнуў пад падушку — партманета нідзе не было. «Можа, у машыне?» — няўпэўнена падумаў Іван Васільевіч. Узяўшы ключы, ён падаўся да дзвярэй.

— Куды? — падымаючыся з крэсла, насцярожана спытаў хлопец. У яго калючых вачах было нешта нядобрае, гатовае вось-вось выбухнуць. — Я доўга чакаць не буду.

— Пайшлі, — спрабуючы ўсміхнуцца, міралюбна сказаў Раброў, спадзеючыся, што партманет знойдзецца. — Хутчэй за ўсё, грошы я пакінуў у сваёй машыне.

Адчуваючы на сабе халодны пранізлівы позірк, ён нахаду павярнуўся і, як старэйшы па ўзросце, павучальна заўважыў:

— Грошы будуць, было б здароўе.

— Давай, шагай, — бамбіза груба штурхнуў Івана Васільевіча ў спіну.

Раброў стрываў, але ўнутры яго ўжо кіпела. Ён прыспешыў крокі, амаль цалкам стаў цвярозым.

«Разбярэмся...»

Машыну, старэнькія «Жыгулі», Іван Васільевіч паставіў не на аўтастаянцы, а каля яе, каб у любы час, не пытаючыся вартаўніка, можна было б забраць. Машына стаяла на тым жа месцы і была ў тым жа стане. Хіба што пыл, які ліп да «Жыгулёў» ужо некалькі дзён, трохі змяніў колер фарбы: зацямніў задзірліва-чырвоную паліроўку і зрабіў амаль нябачнай невялікую расколіну на лабавым шкле.

Раброў нервова сунуў ключ у дзвярны замок і рэзка павярнуў. Але ключ да канца не павярнуўся. Іван Васільевіч паспрабаваў яшчэ раз адкрыць дзверы, але яго старанні былі марнымі: замок не спрацаваў.

— Халера! — вылаяўся Раброў.

— Дай я. — Хлопец нецярпліва працягнуў руку да Івана Васільевіча. — Ключы... Сам адкрыю.

Раброў, зло зірнуўшы на мардатага здаравяка, павольна, у трэці раз, стаў адчыняць дзверы сваіх «Жыгулёў», імкнучыся паставіць замок у нейтральнае становішча.

— Дай сюды! — зароў дзяцюк і рэзка выхапіў з рук Івана Васільевіча ключы.

— Ты што? — абражана выдыхнуў Раброў.

Яму нясцерпна захацелася накрычаць на гэтага блазнюка, ударыць у яго бычыную шыю.

— Я што?! — узвіўся хлопец, хапаючы Івана Васільевіча за палу пінжака. — А ты-ы?! Смяешся?!

Задыхаўшы Раброву ў твар, бамбіза нечакана і амаль імгненна стукнуў кулаком Івану Васільевічу пад дых. Потым, схапіўшы яго за валасы, з сілай сагнуў і ўдарыў каленам у грудзі.

Раброў скурчыўся ад болю, яго занудзіла, перад вачыма ўсё паплыло.

— Ды ты, ды ты... — захрыпеў ён.

І зноў мардаты выцяў яго нагой. На гэты раз у жывот. Адчуваючы, як унутры нешта рвецца, Іван Васільевіч скурчыўся ад болю, апусціўся на калені і, нязграбна прыхінуўшыся да плота аўтастаянкі, застагнаў.

У гэты час да машыны падышоў невысокі сутулы хлопец, апрануты не па сезоне — у скураную доўгую куртку. На шыі ў яго блішчаў масіўны залаты ланцуг.

— Што, праблемы? — спытаў ён.

— Не без іх, — раздражнёна адказаў мардаты дзяцюк. — Хочаш праехацца?

У яго голасе чулася не пытанне, а хутчэй прапанова, якая прымушала да дзеяння.

— Калі трэба, — хмыкнуў сутулы, косячыся на Раброва.

— На ключы ад машыны. — Здаравяк сунуў іх сутуламу. — Будзеш руліць.

Ён вывернуў з-пад плота камень, стукнуў ім па шкле дзвярэй «Жыгулёў». Шкло рассыпалася. Мардаты адчыніў дзверцы знутры, пасля загадаў хлопцу, які падышоў да іх:

— Сядай... Паедзеш, калі скажу.

Сутулы буркнуў:

— Гэта можна.

Павярнуўшыся да Івана Васільевіча, які стаяў нерухома, не маючы сілы супраціўляцца, здаравяк працадзіў:

— Уставай, паедзем.

Раброў маўчаў: яму было дрэнна, так дрэнна, як калісьці ў войску, на вучэннях, калі яго, напаўжывога, выцягнулі з баявой машыны пяхоты, якая танула.

— Уставай! — прыкрыкнуў бамбіза і, не чакаючы пакуль Іван Васільевіч устане, падхапіў яго пад рукі, павалок у машыну. Запіхнуўшы на задняе сядзенне, сеў побач і з сілай зачыніў дзверы.

З цяжкасцю разумеючы, што адбываецца, Раброў павольна выпрастаўся, склаў рукі на жываце, нібы збіраўся паміраць, і адкінуў галаву назад. Дыхаў ён шумна, цяжка.

— Ну што? — засвідраваў яго вачыма здаравяка. — Я не жартую.

Раброў маўчаў.

— Плаціць будзеш? — пагрозліва прашыпеў мардаты дзяцюк, пакрываючыся барвовымі плямамі. — Я сапраўды не жартую... Спадзяюся, ты зразумеў.

— Што, няма ў кліента грошай? — падаў голас той, хто сядзеў за рулём і, павярнуўшыся, параіў: — Ты яму кішэні выверні, можа, знойдзеш што.

— Ды што ў яго ёсць? — выціснуў бамбіза.

— А ты глянь, — не хацеў адступацца ад свайго сутулы.

Падумаўшы, мардаты ўсё ж пагадзіўся:

— Спроба не катаванне.

Ён абхапіў за шыю Івана Васільевіча і з сілай ірвануўшы так, што, здаецца, у яго затрашчалі косткі, прыціснуў да сябе, пасля чаго скамандаваў свайму сябру:

— Давай ты паглядзі, а то мне няёмка трымаць яго і ў той жа час шукаць грошы.

Сутулы абмацаў кішэні Раброва, але ў іх нічога не было. Толькі змятая сотня ды візітоўка з адрасам Зданевіча. Непрыкметна сунуўшы купюру ў сваю кішэню, працягнуў візітоўку мардатаму дзецюку:

— Вось.

Адпусціўшы Івана Васільевіча, здаравяк прачытаў адрас Цімафея Андрэевіча, яго пасаду. Задаволена ўсміхнуўшыся, дыхнуў у твар Раброву:

— Зданевіч, значыць, сябар твой?..

— Сябар, — ледзь чутна прамовіў Іван Васільевіч.

— Вось ён нам і заплаціць, — упэўнена сказаў бамбіза. — Паехалі на вуліцу Цэнтральную. Гэта каля старога рынка...

Паездзіўшы з паўгадзіны па вузкіх вулачках і завулках, пад'ехалі да шматпавярховага цаглянага дома, які аднавока глядзеў на пусты двор, абкружаны чарнаствольмі чорнымі дрэвамі, кроны якіх былі размаляваны ўжо жаўцізной.

— Схадзі да гэтага Зданевіча, — здаравяка кінуў уладны і ўзбуджаны позірк на кіроўцу. — Скажы, няхай аддасць грошы за свайго сябра, а то я яго закапаю.

Сутулы неахвотна адкрыў дзверцы машыны і знік у цёмным пад'ездзе.

Раброў, аслабелы, змучаны, з нянавісцю павярнуўся да свайго крыўдзіцеля, імкнучыся запомніць яго твар. Але бачыў Іван Васільевіч дрэнна: было цёмна, у вачах мільгалі мудрагелістыя барвовыя цені, балела галава. Напружваючы зрок і памяць, ён усё ж спрабаваў разгледзець здаравяка. Той, заўважыўшы гэта, пагардліва хмыкнуў:

— Што, успомніў, дзе грошы?

— Успомніў, — з намаганнем вымавіў Раброў. — Ты імі хутка падавішся.

— Я? — з выклікам спытаў дзяцюк, прыплюшчваючы вочы, нібы перад ім быў не чалавек, а маленькі дажджавы чарвяк, якога не шкада раздушыць. — Пакуль я, ты падавішся!

Ён рэзка ўдарыў у вуха Івану Васільевічу, потым у вока, яшчэ і яшчэ раз у галаву, не зважаючы, куды і як б'е.

— Сам напрасіўся...

«Сам», — скрыгатаў зубамі Раброў, адчуваючы як разам са слінай з яго рота пайшла кроў...

Адкрыўшы дзверы, бамбіза выштурхнуў Івана Васільевіча з машыны, выскачыў сам і стаў біць ляжачага Раброва нагамі. Біў доўга, прыгаворваючы:

— На, на!..

Іван Васільевіч ужо не адчуваў болю. Губляючы прытомнасць, ён раптам убачыў яркае святло, у якім калыхалася нешта вялікае. Яно імкліва набліжалася і ўрэшце накрыла яго ўсім сваім цяжарам, пагражаючы раструшчыць. Раброў, задыхаючыся, страціў прытомнасць. Калі ачуняў, над ім, схіліўшыся, галасіў Цімафей Андрэевіч:

— Што ж яны зрабілі, Божа!.. Што зрабілі...

Іван Васільевіч з неймавернай цяжкасцю ўзняў галаву, агледзеўся. Яго мучыцеля ўжо не было. Машына стаяла побач.

— Апамятайся, брат, апамятайся, — жаласна паўтараў Зданевіч.

Цела Раброва не слухалася. Ні пра што не думалася. Хацелася толькі аднаго — спакою.

## V

Прачнуўся Іван Васільевіч пазней звычайнага і адразу, як толькі павярнуўся, адчуў, што баліць усё цела. Асабліва балела ў правым баку, аддавала вышэй, у грудзях. Ад гэтага дыхаць было цяжка, а калі глыбока ўздыхаў, перахоплівала так, што, здавалася, сканае. Раброў, сціснуўшы зубы, усё ж прыўзняўся, сеў на ложку.

За акном ужо па ўсім абсягу разлівалася ранішняе святло. Крывы прамень узыходзячага сонца падаў прама на канапу. На гэты светлы, жаўтлявы кавалачак падлогі Іван Васільевіч з цяжкасцю паставіў ногі, якія дрэнна слухаліся. Потым павольна, як стары, аджыўшы сваё, дзед, устаў і асцярожна пакульгаў у ванную. Упёршыся рукамі ў ракавіну, утаропіўся ў люстэрка. І... не пазнаў сябе. На Раброва глядзеў апухлы ад сінякоў і ранак мужчына няпэўнага ўзросту. Толькі вочы, хоць і нейкія чужыя, усё ж нагадвалі Івана Васільевіча.

— Сволач, — сіпла выціснуў Раброў, успамінаючы мардатага дзецюка з рэстарана. — Сволач...

Іван Васільевіч няўпэўнена, без лішніх рухаў, каб не так балела, памыўся. Ледзь дакранаючыся ручніком да цела, быццам прамакаткай, асцярожна стаў выцірацца. Калі адчуў, што твар высах, хацеў ісці ў пакой, прылегчы, але не змог: закружылася галава, павяло ўбок. Раброў прысеў на краёчак ванны, спыніў позірк на сцяне. Яму здалося, што белая плітка захісталася, потым стала як быццам шурпатай, падобнай на чысты снег. Івану Васільевічу захацелася зачэрпнуць далонню жменю гэтага снегу, прыкласці да твару, замарозіць пухліну і сінякі, каб суняць боль. Але праз хвіліну міраж знік: замест снегу перад вачыма зноў з'явілася плітка. І не шурпатая, а гладкая: бліскучая паліроўка быццам аддавала гарачынёй. І раптам плітка разам са сцяной зноў захісталася. Раброў, каб не ўпасці, мац-

ней сціснуў пальцамі край ванны. Пасядзеўшы так некаторы час, падняўся і цяжка патупаў на кухню: хацелася выпіць чаго-небудзь халоднага. Ён адкрыў халадзільнік, дастаў бутэльку кефіру. Піў доўга, у некалькі прыёмаў. Унутры трохі адлягло. Іван Васільевіч прайшоў у залу, лёг на канапу і адразу ж задрамаў. Калі прачнуўся, гадзіннік паказваў поўдзень. Было чуваць, як на кухні лілася з крана вада, нешта варылася на газавай пліце. «Здановіч», — здагадаўся Раброў. Яму зноў прыгадалася ўчарашняе: рэстаран, гасцініца, пабоі, словы мардатага дзецюка: «Сам напрасіўся...»

Чым больш падрабязна Іван Васільевіч успамінаў усё тое, што здарылася з ім, тым больш балюча было яму, дарасламу мужчыне, які пабачыў жыццё. І фізічна, і душэўна. Хацелася ўстаць, сысці, схавацца ад гэтай ганьбы, ад усяго таго, што акружала яго зараз, а галоўнае — задушыць у сабе ўвесь гэты цягучы, калючы і рэжучы боль, нават калі будзе яшчэ горш. Раброў міжволі закрыў твар рукамі і тут жа ад неасцярожнага дотыку застагнаў. Гэта яго вярнула ў сапраўдны стан. Ён зразумеў, што трэба сядзець у чужой кватэры і чакаць, пакуль хоць трохі сыдзе пухліна і зажывуць ранкі.

Іван Васільевіч міжвольна застагнаў. На гэты стогн у пакой увайшоў Цімафей Андрэевіч. Выглядаў ён няважна: пад вачыма сінелі вадзяністыя мяшкі, пад носам блішчаў пот.

— Ну, як? — спагадліва пацікавіўся Здановіч.

— Не ведаю, — адварочваючыся, паціснуў плячыма Раброў.

— Я разумею... — Цімафей Андрэевіч пакруціў галавой. — Сам аднойчы апынуўся ў такой сітуацыі... Не дай бог.

— Каб ведаў, дзе ўпаду, саломку б падаслаў, — хмура прамовіў Іван Васільевіч. — Пройдзе.

— Павінна прайсці, — не зусім упэўнена падтрымаў свайго былога аднакурсніка Здановіч. — Ты ўставай і давай да стала. Трэба табе, брат, паесці... Падмацавацца...

Іван Васільевіч, абапіраючыся на бакавіну канапы, падняўся, прайшоў на кухню. Цімафей Андрэевіч паклаў яму ў талерку яечню і кавалак вяндліны.

— Еш, папраўляйся.

Раброў не адказаў. Адрэзаўшы кавалачак мяса, стаў жаваць, але млява, неахвотна, бо апетыту не было.

— Можа, наліць? — спытаў Зданевіч.

— Давай, — абыякава пагадзіўся Іван Васільевіч, усведамляючы, што ехаць яму дадому прыйдзецца не раней, чым праз тыдзень-два: пабоі не жартоўныя, выходзяць з хрыпамі, кашлем і крывёй у сліне.

Цімафей Андрэевіч наліў па паўшклянкі «Рускай». Гледзячы ў стол, прапанаваў:

— Ну, каб усё наладзілася.

Раброў выпіў моўчкі, запіў вадой. Бачачы, што Зданевічу неяк не па сабе, прамовіў:

— Усё наладзіцца.

— Вядома, — павесялеўшы, усміхнуўся Цімафей Андрэевіч. — Ты еш, еш.

— Не турбуйся. — Раброў паклаў відэлец. Уважліва, наколькі гэта было магчыма ў яго становішчы, паглядзеў у вочы Зданевічу і прама спытаў: — Табе няёмка за мяне?

Цімафей Андрэевіч сумеўся.

— Ты чаго?

— Нічога. — Іван Васільевіч узяў відэлец. Калупаючы ім мяса, здушана прамовіў: — Мне не сорамна, павер. Але я сам вінаваты, што выпіў лішняе. Сам... Ведаеш, мне нават пра гэта сказаў хлопец з рэстарана, які мяне біў... Так. І я пагадзіўся. Але ўнутры ў мяне ўсё роўна агонь... Ён не проста гарыць, ён разгараецца. Разумееш?

— Не зусім, — насцярожыўся Цімафей Андрэевіч, адчуваючы сваю віну ў тым, што адбылося.

— Брыдка. — Раброў скрывіўся. — Не хочацца жыць.

— Ды я, ды я... За цябе... — Зданевіч, не дагаварыўшы, узбуджана падхапіўся, паклаў тоўстую руку на плячо Раброва. — Ты гэта, брат, кінь. Мы — сябры.

— Так, — пагадзіўся Іван Васільевіч, — больш не буду. — Ён стомлена заплюшчыў вочы, але тут жа адкрыў іх і, каб не маўчаць, бяздумна спытаў ці то Цімафея Андрэевіча, ці то сябе: — Можа, у міліцыю паведаміць?

Зданевіч змяніўся ў твары.

— Ты што, гэта ж крымінальнікі, — пераходзячы ад хвалявання на шэпт, паведаміў ён. — Не чапай іх.

Раброву, які і так пакутаваў ад болю, стала яшчэ больш балюча: Цімафей Андрэевіч, вялікі і моцны мужчына, на выгляд ліхі казак, нарэшце, далёка не апошні чалавек у раёне, спалохаўся.

— Добра. — Іван Васільевіч апусціў галаву. — Закрыем тэму... І так хоць вый.

Размова паміж былымі аднакурснікамі, якія з радасцю сустрэліся і амаль урачыста адзначылі гэтую падзею, больш не клеілася.

Зданевіч, хутка паеўшы, зазбіраўся на працу. Сыходзячы, вінавата, хаваючы погляд, прамовіў:

— Я хутка вярнуся, і мы ўсё вырашым. А ты адпачывай, патэлефануй, калі хочаш, сабе на службу.

Ён пайшоў. Раброў зноў лёг на канапу, заскрыгатаў зубамі ад бяссілля і крыўды.

## VI

Больш за тыдзень Іван Васільевіч праваляўся на канапе Цімафея Андрэевіча. Пухліна амаль спала. Ранкі пакрыліся скарынкай, якая трэскалася і злазіла.

Фізічны боль у Івана Васільевіча сышоў. Але гэтае месца заняў боль душэўны. Ён прыходзіў раптоўна, пры нервовых прыступах, адпускаў павольна, быццам здзекуючыся. Гэты боль не даваў Раброву нармальна есці, спаць, думаць. Ён быццам шукаў для сябе нейкі толькі яму вядомы выхад, каб аднойчы пакінуць цела Івана Васільевіча і ўсяліцца ў каго-небудзь іншага альбо загінуць разам з ім. І нарэшце знайшоў.

Раброў, пакутуючы ад бяссоння, уключыў тэлевізар. На экране ішоў чарговы баявік. Чарнявы, сярэдняга ўзросту паліцэйскі на велізарным джыпе з шалёнай хуткасцю імчаў па закінутай паўпустой дарозе. На вяроўцы, прывязанай да аўтамабіля, крывавіла зямлю цела знявечанага бандыта. Упіваючыся сваёй уладай, хуткасцю і пачуццём помсты, паліцэйскі крычаў:

— Ты хацеў гэтага, хацеў!..

Прывязаны бандыт, пакутуючы ад невыноснага болю, паміраў. На ўвесь экран гарэлі яго вялікія, пашыраныя ў вар'яцтве вочы.

— Атрымлівай тое, што ты рабіў з іншымі! — крычаў паліцэйскі, і яго твар гарэў ад праведнага гневу.

Іван Васільевіч, не адрываючыся, глядзеў у тэлевізар. Яму захацелася зрабіць гэтак жа са сваім катам — мардатым бамбізам з рэстарана. І Раброў вырашыў: «Я заб'ю яго...»

У гэтую ноч ён ужо не мог спаць. Узбуджаны сцэнай справядлівага, на яго погляд, гвалту, Іван Васільевіч абдумваў дэталі сваёй помсты. Менавіта яна, жорсткая і неадкладная, здавалася яму, будзе яго выратаваннем ад болю, ганьбы, крыўды, безвыходнасці, якая, як п'яўка, ненаедна высмоктвала з яго кроў. Толькі адпомсціўшы, з надзеяй думаў Раброў, ён пакончыць са сваім старым і ўжо брудным жыццём і зажыве новым — незамутнёным, чыстым.

Назаўтра, устаўшы крыху раней, Іван Васільевіч прыняў душ, чыста пагаліўся, апрануўся.

— Ого! — убачыўшы Раброва, усклікнуў Зданевіч. — Ты, брат, як жаніх... Кажу, што думаю.

Іван Васільевіч, упершыню за некалькі дзён, выціснуў усмешку. Але яму было не да весялосці: думка пра помсту, якая захапіла яго ноччу, не давала пакою, падштурхоўвала да дзеяння, якое невядома чым можа скончыцца. Але што вырашана, то вырашана.

— Цімафей, даведайся мне прозвішча і адрас таго хлопца здаравеннага, што біў мяне, — без лішніх размоў папрасіў Раброў. — Даведайся, мне трэба.

Зданевіч уздыхнуў. З сілай, нібы праганяючы сваю нядаўнюю слабасць, расцёр сабе патыліцу і, уважліва паглядзеўшы ў вочы свайму былому аднакурсніку, згодна кіўнуў:

— Добра. Толькі я табе нічога не гаварыў.

Іван Васільевіч працягнуў руку.

— Само сабой.

Цімафей Андрэевіч удзячна і моцна яе пацiснуў, хрыплавата сказаў басам:

— Ты даруй мне, даруй... Мне жыць тут. Жыць.

— Я разумею...

Яны адчулі, што развітваюцца. Быць можа — назаўсёды.

Калі Зданевіч пайшоў на працу, Раброў прысеў, але тут жа ўстаў, нервова захадзіў па пакоі, адчуваючы трывогу, якая ішла аднекуль знутры, здавалася, з самага сэрца, прымушаючы яго біцца часцей, потым — раптам павольна, яшчэ больш марудна...

«Як перад смерцю», — міжволі падумаў Іван Васільевіч і спалохаўся сваёй думкі. У гэтым стане ён хутка прайшоў на кухню, дрыготкімі рукамі ўключыў кран, набраў шклянку халоднай вады і залпам выпіў. Паступова сэрца Раброва супакоілася, страх прайшоў. Іван Васільевіч сеў у крэсла і заглядзеўся ў акно.

У двары грузны пажылы мужчына ў спартыўным трыко прагульваў сабаку — вялізнага чорнага дога. Непадалёк на лаўцы сядзела маленькая высахлая бабулька ў доўгай старамоднай сукенцы і гладзіла пухнатага рыжага ката, які, гулліва выгінаючы спіну, цёрся каля яе ног. Гуляючы, дог увесь час паглядаў на ката, гыркаў. Калі мужчына на кагосьці заглядзеўся, прыслабіў ланцужок, дог вырваўся і панёсся да ката. Спалоханы кот, надзьмуўшыся, засіпеў, але тут жа кінуўся наўцёкі. Бабулька ад страху ўскрыкнула. Гаспадар сабакі закрычаў на ўвесь двор:

— Джэк, Джэк, месца!..

І кот, і сабака зніклі за суседнім домам. За імі заспяшаліся мужчына і бабулька — гаспадары сваіх хатніх любімцаў.

«Вось яно, жыццё, — падумаў Раброў. — Перамагае сіла».

Ён устаў, закурыў. Зацягнуўшыся некалькі разоў і не дакурыўшы цыгарэту, кінуў яе, зноў захадзіў па пакоі.

У гэты час зазваніў тэлефон. Іван Васільевіч зняў трубку і насцярожана прамовіў:

— Слухаю вас.

Тэлефанаваў Цімафей Андрэевіч. Спытаў ціха, з прыдыханнем:

— Усё нармальна?

— Так. — Раброў чамусьці глянуў на ўваходныя дзверы і паўтарыў: — Так.

— Запісвай адрас...

Запісаўшы, узбуджаны Іван Васільевіч падышоў да акна. Мужчына ў трыко, быццам нічога не здарылася, гуляў з сабакам. Самотна сядзела на лаўцы бабулька. Ката нідзе не было відаць.

Двор жыў сваім звычайным жыццём.

«Трэба ехаць», — вырашыў Раброў і стаў збірацца.

Ён склаў свой, як называў, паходны прыбор для брыцця, зняў з батарэі вымытыя шкарпэткі, кашулю. Загарнуўшы усё ў газету, паклаў у сумку і задумаўся: «Што яшчэ?..»

Іван Васільевіч збіраўся нязвыкла вяла, задумліва: нешта яго не адпускала, трымала. Закрыўшы на замок сумку, ён сеў на канапу, якая стала  за гэты час для яго роднай, паклаў рукі на калені і абыякава ўтаропіўся ў сцяну. Яшчэ паўгадзіны таму поўны энергіі і рашучасці адпомсціць свайму крыўдзіцелю, цяпер Раброў не хацеў ехаць, што-небудзь рабіць.

Так ён сядзеў доўга і амаль нерухома.

Стрэлкі гадзінніка набліжаліся да дванаццаці. Калі яны сышліся, пачуўся гулкі звон, які нагадваў царкоўны.

Іван Васільевіч здрыгануўся, агледзеўся і неяк асуджана падняўся. У апошні раз агледзеўшы сваё часовае жыллё, узяў сумку і не спяшаючыся выйшаў на вуліцу.

Яго «Жыгулі» стаялі пад домам: цэлыя, вымытыя, з новым шклом у дзвярах, якое паставіў Зданевіч. Звыкла агледзеўшы машыну, Раброў заўважыў, што каўпакоў на колах няма. «Хуліганнё», — незласліва абазваў ён выкрадальнікаў. Сеўшы за руль, павольна паехаў у цэнтр горада.

Па дарозе Іван Васільевіч убачыў злашчасны рэстаран. І адразу ж, не па сваёй волі, адчуў, як галаву абдало гарачынёй. Яму здалося, што ў акне рэстарана паказалася тлустая постаць афіцыянта Пятровіча і з ім яго пасыльнага — здаравеннага, упэўненага ў сабе і сваёй беспакаранасці мардатага дзецюка.

Успомнілася Раброву тая ноч...

Ён, скрыгатнуўшы зубамі, націснуў на газ. Спыніўся ўжо за горадам. Цела яго дрыжала, чамусьці хацелася есці.

«Я заб'ю яго, заб'ю!» — зноў застукала, прычым з новай сілай, у запаленым мозгу Івана Васільевіча.

Сціснуўшы руль, ён паспрабаваў засяродзіцца. Але з гэтага нічога не выйшла. Раброў адчыніў дзверцы, выйшаў з машыны, вырваў жмут травы, расцёр ёю твар. Трохі супакоіўшыся, уздыхнуў з палёгкай, паглядзеў на неба. Яно было бяздонна-цёмным, як велізарны вір, які прыцягвае да сябе, быццам у ім ёсць нешта тое, чаго не хапае людзям у іх звычайным жыцці.

— М-так, — няпэўна кінуў Іван Васільевіч, сядаючы ў машыну.

Запусціўшы рухавік, ён паехаў назад у горад: трэба было сапраўды што-небудзь перакусіць.

Спыніўся каля крамы. Каля ўвахода, на ганку, стаялі два падвыпіўшыя мужыкі, апранутыя ў брудныя робы. Адзін — высокі, з доўгімі светлымі валасамі і вуграватым хваравітым тварам, а другі — сярэдняга росту, лысы, круглатвары, з барвовым носам-бульбінай, адвіслым мешкаватым жыватом. «Дарожнікі», — падумаў Раброў. Ён хацеў прайсці паўз іх, але яны яго спынілі. Высокі, паказваючы закарэлы кулак з паднятым дагары вялікім пальцам і адтапыраным мезенцам, прапанаваў:

— Трэцім будзеш?

Івану Васільевічу трэба было супакоіцца, сабрацца з думкамі, і ён згодна кіўнуў:

— Буду.

Рабочыя тут жа пайшлі ў краму. Праз хвілін пяць вярнуліся. На іх грудзях адтапырваліся целагрэйкі, пад якімі адгадваліся бутэлькі.

— Куды пойдзем? — дзелавіта спытаў лысы.

Раброў агледзеўся.

— Дык да мяне ў машыну.

— Ідзе, — ухмыльнуўся высокі. — Будзем як у рэстаране.

— І вы туды ж, — нервова крутануў галавой Іван Васільевіч. — Сукі.

І высокі, і лысы, пераглянуўшыся, няўцямна паглядзелі на Раброва.

— Гэта я не вам, — махнуў рукой Раброў. — Аднаму афіцыянту і яго сябру... Не звяртайце ўвагі.

— Глядзі, — папярэдзіў высокі. — Мы людзі простыя, можам і ў вуха даць.

— Гэта не вам, — паўтарыў Іван Васільевіч.

— Добра, — выціснуў лысы, — забылі...

У машыне рабочыя паклалі на сядзенне тры бутэлькі таннага партвейна і шкляначкі, дасталі няхітрую закусь: кавалак сала, хлеб, галоўку часнаку. Адкаркавалі бутэлькі.

— Ну, будзем, — лысы падняў напоўненую шкляначку каламутнай вадкасцю, якая непрыемна пахла.

— Будзем, — падтрымаў яго высокі.

Яны выпілі, налілі яшчэ і зноў апаражнілі свае шкляначкі. Пасля гэтага, без перапынку, у чарговы раз напоўнілі свой посуд вермутам.

«Будзем», — выпіваючы, у думках прамовіў сам сабе Раброў. Закусваючы, як бы між іншым спытаў:

— А вы ў мясцовым рэстаране бываеце?

— Бывае, што заходзім на піва, — сказаў лысы, хмялеючы. — А што?

— Ды нічога. — Іван Васільевіч кінуў у рот зубок часнаку, зажаваў з хлебам, адчуваючы горыч. — Там афіцыянт, пра якога я казаў, працуе. На цыгана падобны.

— А-а, — працягнуў высокі. — Гэта Сцяпан Моніч, мой сусед. Там і сын яго падзарабляе.

У Раброва усярэдзіне пахаладзела.

— Гэта хто? — спытаў ён.

— Дык Сашка, здаравенны такі бугай, — патлумачыў высокі. — Ужо адседзеў, паскуда...

— А які хатні адрас у гэтых Монічаў? — спытаў Раброў, ужо сумняваючыся, што Монічы жывуць там, дзе гаварыў Цімафей Андрэевіч, дыктуючы іх адрас па тэлефоне.

— Адрас?.. — Высокі ўхмыльнуўся. У яго мутных вачах з'явілася насцярожанасць, але тут жа знікла. — Адрас звычайны: вуліца Чапаева, дом шаснаццаць... Я ж кажу: жыве са мной па суседстве...

Горыч ад часнаку апякла нутро Івана Васільевіча, перахапіла дыханне. Ён уявіў сябе ў рэстаране, зноў убачыў крыва-

ногага пастуха, яго ўхмылку, пачуў свіст бізуна, жорсткі загад: «Уставайце!..»

Раброву ўспомнілася, як яго будзіў афіцыянт. «Вось яно што, — мільганула ў Івана Васільевіча здагадка. — Партманет ён скраў, Пятровіч. А сынок падзякаваў... Падзякую і я...»

Раброў больш не піў. Яго зноў ахапілі дрыжыкі, паднялася і выходзіла вонкі злосць. З нецярпеннем дачакаўшыся, пакуль рабочыя дап'юць віно, ён пацікавіўся:

— Вы зараз куды?

— Пабуду яшчэ тут, — прамовіў лысы, закурваючы цыгарэту. — Каля крамы. Можа, каго знаёмага сустрэну.

— А я дадому, — кінуў высокі. — Жонка сказала, каб прыйшоў крыху раней.

— Я давязу.

Іван Васільевіч, хутка выкінуўшы рэшткі сціплага балявання, рэзка павярнуў ключ запальвання. «Жыгулі» спачатку няўпэўнена, а потым усё хутчэй паляцелі па раённым горадзе. Як толькі павярнулі на вуліцу Чапаева, высокі крыкнуў:

— Тармазі!..

Раброў высадзіў добра падвыпітага рабочага каля яго дома і адразу ж, трохі ад'ехаўшы, паставіў свае «Жыгулі» за маладой нізкарослай бярозкай, каб яны не так кідаліся ў вочы. У ветравое шкло Іван Васільевіч бачыў усе чатыры пад'езды новага трохпавярховага дома, дзе жыў жорсткі Сашка і яго бацька — старэйшы Моніч.

Ужо вечарэла. Адразу за горадам дагараў барвовы захад. На гароды, з якіх цягнула агурочным пахам, садзілася смуга туману. Вакол было ціха і амаль бязлюдна.

Раброў чакаў. Ён адчуваў: вось-вось з'явіцца яго кат. Але таго не было. Прайшла гадзіна, другая, трэцяя...

Нервовае напружанне ў Івана Васільевіча нарастала. У нейкае імгненне ён не вытрымаў, захацеў было кінуць гэтае страшнае дзяжурства, з'ехаць. Але крыўда, што сядзела ў ім, перамагла. Яна, здавалася, крычала, выварочвала зняважаную душу Раброва, надзімала ў ім дзікую, безразважную злосць. І ён застаўся. Узіраючыся ў ледзь асветленыя пад'езды, праводзіў вачыма кожнага, хто ўваходзіў у дом ці выходзіў з яго.

Непрыкметна наступіла ноч. Стала халаднавата. Іван Васільевіч закурыў. І тады ён убачыў мардатага дзецюка. Той ішоў павольна, злёгку хістаючыся. «П'яны, — узрадаваўся Раброў. — Добра...»

Асцярожна адкрываючы левай рукой дзверцы машыны, правай Іван Васільевіч сціснуў рыльца бутэлькі з-пад партвейна, якую ён прадбачліва пакінуў у сваіх «Жыгулях». Не спяшаючыся, баючыся зрабіць лішні рух, Раброў вылез з машыны. Сэрца яго адчайна білася, з кожным імгненнем усё часцей і часцей.

Малады здаровы мужчына набліжаўся да свайго дома. Іван Васільевіч, сцяміўшы, што можа не паспець ажыццявіць помсту, рушыў наперад. Ледзь стрымліваючыся, каб не павярнуць, уцячы, ён ішоў насустрач свайму кату. Вось і ён...

Раброў, каб спыніць яго, хацеў папрасіць закурыць, як гэта звычайна робяць падлеткі, калі прыстаюць да якога-небудзь небаракі, але не змог вымавіць ні слова.

Мардаты дзяцюк, гледзячы сабе пад ногі, дыхнуў перагарам і прайшоў міма Івана Васільевіча. Той, хутчэй інстынктыўна, чым свядома, рэзка павярнуўся, узмахнуў бутэлькай і наводмаш ударыў ёю па галаве свайго крыўдзіцеля. Бутэлька разляцелася на дробныя шкельцы. Аглушаны нечаканым ударам, хлопец ступіў па інерцыі некалькі крокаў і ўпаў тварам у кучу пяску. Валасы на яго галаве заблішчалі макроццем. «Кроў!» — здагадаўся Раброў і кінуўся да сваёй машыны. У гарачцы сеў у яе, завёў і на хуткасці пад'ехаў да пад'езда, дзе ляжаў Сашка. З цяжкасцю зацягнуўшы яго грузнае цела на задняе сядзенне, Іван Васільевіч панёсся за горад.

Па дарозе дзяцюк апрытомнеў. Не разумеючы, дзе ён і што з ім, глуха выціснуў, звяртаючыся да Раброва:

— Ты хто?

Прыгледзеўшыся, пазнаў. Пацягнуўшы рукой па скрываўленай галаве, стаў патроху цяміць. І калі да яго дайшло, што адбываецца, сутаргава пацягнуўся рукамі да шыі Івана Васільевіча. Убачыўшы ў люстэрка небяспеку, той з сілай націснуў на тормаз і выскачыў з машыны. Спрабаваў адкрыць заднія дзверцы, ачомаўшыся, і бамбіза. Калі ён, нарэшце, адчыніў іх і стаў вылазіць, Раброў прыгнуўся, быццам рыхтаваўся да скачка, і дзіка, у нервовым прыступе, закрычаў:

— Што, зноў?!

Ён укладаў у гэтае «зноў» увесь свой боль, які яму прыйшлося перажыць, а яшчэ — нянавісць, прагу помсты. Кінуўшыся да мардатага дзецюка, гвазтануў яму нагой у пах, потым у жывот, твар, яшчэ раз у жывот, яшчэ і яшчэ...

Іванам Васільевічам авалодала жывёльнае пачуццё страху, змешанае з жаданнем смерці свайму ворагу. Цяпер быў яго, Раброва, час: не ён, а яго крыўдзіцель, убогі і бездапаможны, з крывёю і слінай на мясістых вуснах, качаўся па зямлі, трацячы апошнія сілы і, напэўна, жадаючы лепш памерці, чым так пакутаваць.

— Атрымлівай!..

У запаленым мозгу Івана Васільевіча пранеслася тэлевізійная карцінка, на якой чарнявы паліцэйскі цягнуў на джыпе жорсткага бандыта. Ужо не цямячы, што робіць, Рабров хутка дастаў з багажніка вяроўку, прывязаў ёю да машыны напаўмёртвага бамбізу і пацягнуў па дарозе. Усё хутчэй і хутчэй...

Наперадзе бліснулі фары сустрэчнага грузавіка. Іван Васільевіч, спалохаўшыся, уціснуўся ў сядзенне і на нейкае імгненне адпусціў руль. «Жыгулі» ў тую ж хвіліну зляцелі з дарогі.

— Усё, — з адчаем смяротніка ціха выдыхнуў Рабров.

Пераварочваючыся ў паветры, машына стала падаць у асушаную і глыбокую канаву. Азірнуўшыся, Іван Васільевіч убачыў амаль чорнае, знявечанае цела свайго ворага, якое перашкаджала гэтаму свабоднаму, лёгкаму палёту і цягнула яго, Раброва, і машыну назад, на грэшную зямлю...



# ЧАКАННЕ ЖАНЧЫНЫ

## I

— Ты хочаш пазнаёміцца з жанчынай? — спытаў у інваліда, які сядзеў у калясцы, дзябёлы мужчына гадоў сарака з нечым.

Інвалід быў худы, даўно няголены, бязногі. Пачуўшы гэта, ён нервова ўсміхнуўся.

— Цябе маё пытанне здзіўляе?

Мужчына, апрануты ў цёмна-сіні расшпілены плашч з узнятым каўняром, з-пад якога выглядаў новы, таксама цёмна-сіняга колеру касцюм, гледзячы на інваліда, сумеўся:

— Не, я проста пра гэта не падумаў.

Яго буйны мясісты твар, заціснуты пад цяжкім падбародкам тугім вузлом паласатага гальштука, стаў незадаволены.

Інвалід спахмурнеў, ды так, што наліўся чырванню: рваны шрам, які пачынаўся каля левага вуха і цягнуўся да падбародка, напяўся. Здавалася, яшчэ імгненне, і ён сарвецца: пачне крычаць, патрабаваць да сябе ўвагі, але той маўчаў.

— Прабач, — мужчына апусціў галаву, — але я сапраўды не падумаў...

— Не падумаў? — Інвалід глядзеў жорстка і прама. — Не, Рыгор, ты падумаў пра гэта. Толькі табе шкада грошай, хоць ты багаты, вельмі багаты. І ўсё ж ты прыходзіш да мяне. Да мяне — беднага. А чаму?.. Тлумачэнне простае. Таму што я твая адзіная нітачка, якая звязвае цябе з тваім мінулым, яшчэ адносна чыстым і шчырым, а значыць, і з тваім сумленнем. Парвецца гэтая нітачка — і ты загінеш, знікнеш, таму што цябе з'ядуць такія ж, як ты. А потым... Потым табе проста прыемна сюды прыходзіць, каб адчуваць сваю перавагу, каб яшчэ нехта цябе аб нечым папрасіў. Нават, калі гэта сябра... Былы сябра.

— Няпраўда.

— Праўда!

— Не трэба, Сяргей, я прашу, — ціха прагаварыў мужчына. — Я вінаваты. У ва мне сапраўды нешта змянілася, гэта так. Але, павер, я не хачу гэтай змены. І ты мне тэлефануй, калі што. Я прыйду.

— Добра, — стомлена кіўнуў інвалід, — ідзі.

У апусцелай аднапакаёвай кватэры, абстаўленай старой абадранай мэбляй, інвалід застаўся адзін.

## II

Што рабіць, калі аднаго жыццё лашчыць, а другога прымушае прыніжацца і прасіць міластыню. І як з гэтым жыць — не кожны зразумее. А жыць трэба.

Інвалід, па пашпарце Сяргей Іванавіч Лагвіновіч, з усяе сілы крутануў колы сваёй каляскі і заехаў у маленькую куханьку. Там ён дастаў з паўпустога халадзільніка пачатую літровую бутэльку гарэлкі, адпіў пару глыткоў і ўтаропіўся ў акно без фіранак.

За акном вiравала жыццё вялікага горада з каменным сэрцам: у адзін і другі бок праносіліся аўтамашыны, спяшаліся па сваіх справах мінакі, нешта абмяркоўвалі на лаўцы ў двары дома бабулькі.

Ва ўсіх было сваё жыццё, нейкая мэта, сэнс, жаданне жыць далей, а таму ўсе яны ехалі, ішлі, нешта рабілі, пра нешта гаварылі.

Сяргею, у першыя гады як стаў інвалідам, вельмі хацелася далучыцца да гэтай бурлівай чалавечай мітусні. І калі б хто сказаў яму: «Ідзі да людзей, яны чакаюць цябе», — ён на сваёй інваліднай калясцы, здаецца, паскакаў бы ўніз па лесвічных прыступках, упаў бы ў чалавечы мурашнік і доўга ляжаў бы там, удыхаючы на поўныя грудзі гарадское паветра, у якім змяшаліся дым і гар, мужчынскі пот і жаночыя духі. Але яго ніхто не паклікаў і не пакліча. А ўсё таму, што ён — інвалід. А гэта азначае, што лішні сярод здаровых людзей, у якіх ёсць сіла і імкненне выбіцца наперад. Тыя людзі, з-за якіх ён быў абмежаваны, часта любілі гаварыць пра міласэрнасць, пра тое, што любяць чалавецтва. Але, на жаль, сярод гэтага чалавецтва ім не даводзілася мець справу хаця б з кімсьці адным, каго ўсе проста і дакладна называюць калекам.

## III

Ужо была ноч. Сяргей прачнуўся, і яго рука машынальна пацягнулася да бутэлькі — даймала смага, — але бутэлька была пустая.

— Дрэнь! — пачаў лаяцца Сяргей. — Дрэнь!

У бутэльку ён набраў з-пад крана халоднай вады, зрабіў некалькі глыткоў і паехаў на калясцы ў пакой. Там спыніўся каля акна, за якім у святле ліхтароў бесклапотна драмаў яго, Сяргееў, горад, і ў той жа час не яго. А ўсё таму, што за апошнія гады горад змяніўся і не да лепшага: справа ад Сяргеевага акна, у магазіне, які пабудавалі нядаўна, ішоў начны бойкі гандаль; з чыгуначнага вакзала, што быў недалёка, чуўся гул цягнікоў; у дварэ суседняга дома завывала сігналізацыя раскошнага «Мерседэса».

За сцяной у суседняй кватэры нешта бразнулася і адразу ж пачуўся жаночы голас:

— Ідзі адсюль!..

«Няма спакою, — раздражнёна падумаў Сяргей, — і не будзе».

Ноч раставала, нічога новага яна не прынесла. Усё гэта ўжо было шмат, вельмі шмат разоў.

«Як усё надакучыла...»

Сяргей з сумам глядзеў на горад праз шкло, вымытае дажджом. У шматпавярхоўцы, што стаяла насупраць, святло было толькі ў адным акне. Гэтае святло было цьмяным, бардова-чырвоным. Яно быццам дражніла і клікала да сябе.

Сяргей доўга і ўважліва ўглядваўся ў тое акно. Пры гэтым твар яго нейкі час не мяняўся. Спачатку нерухомы, быццам прыціснуты, ён раптам ажывіўся, стаў напружаным: на лбе прыкметна акрэсліліся маршчыны, вочы расшырыліся, у іх з'явіўся бляск, які нечым нагадваў той, што бывае ў салдат, якія выконваюць сваё баявое заданне, або ў заўзятых паляўнічых у час гону на ваўкоў, лісіц, іншых драпежнікаў...

Не адводзячы вачэй ад акна, Сяргей пад'ехаў да тумбачкі, дастаў адтуль вялікі вайсковы бінокль, навёў яго на святло ў доме насупраць. Крыніца гэтага святла, начная шкляная лямпа, напоўненая густой вадкасцю, стаяла на падстаўцы каля вялікага шырокага ложка. На ложку, ледзь прыкрыўшыся тонкай коўдрай, спала маладая пара.

Праз лінзы бінокля Сяргей «перабраў» светлыя густыя валасы маладой жанчыны, пяшчотна пагладзіў іх, пасля чаго дыханне яго стала частым.

— Але... — вены на Сяргеевай шыі напяліся, на твары выступіў пот. — Вось яно, жыццё...

Сяргей рэзка апусціў бінокль на ногі, адрэзаныя да калень, скрыгатнуў зубамі: «Не магу...»

Ён скінуў бінокль на падлогу, моцна крутануў правае кола каляскі і хутка паехаў да ўваходных дзвярэй.

На паветра.

## IV

На лесвічнай пляцоўцы было халаднавата і вільготна, сюды праз расчыненыя дзверы далятаў вецер.

З цяжкасцю прыкурыўшы цыгарэту, Сяргей з палёгкай выдыхнуў першую зацяжку і, адкінуўшы галаву назад, заплюшчыў вочы: захацелася забыць карціну чужога замілавання, якую толькі што бачыў употай. Але нядоўгай была цемра, што засціла вочы. Здаецца, яна толькі насунулася і адразу ж пачала святлець, чырванець. А праз хвіліну ператварылася ў бардова-чырвонае святло той самай лямпы насупраць акна яго кватэры, за якім двое былі паяднаны нябачнай, салодкай і такой прывабнай для Сяргея тайнай. Тое, што ён бачыў, салодка прыгнятала, шчымліва раздражняла: побач з гэтай прыгожай жанчынай быў не ён, Сяргей...

Думаючы пра гэта, ён нават забыўся пра цыгарэту. Магчыма, пакутуючы ад убачанага, Сяргей тут, на лесвічнай пляцоўцы, і заснуў бы, што было б для яго не так і дрэнна. Але нечакана звон разбітага шкла і гучны рэзкі жаночы голас «Дурань!», які пачуўся недзе на пятым або шостым паверсе, ускалыхнуў ягоную свядомасць. Сяргей расплюшчыў вочы і прыслухаўся.

Зверху да яго па лесвіцы шумна спускаліся маладыя людзі. Ён, безумоўна, быў абуты ў красоўкі, а яна — у чаравічкі, абцасікі якіх стукалі лёгка і мякка. Калі хлопец з дзяўчынай параўняліся з Сяргеем, ён адразу ж прыціснуўся каляскай да сцяны.

«Так і ёсць...»

Хлопец і дзяўчына, убачыўшы інваліда, ды яшчэ аднаго, ноччу, спачатку сумеліся, потым здзіўлена паглядзелі адно на аднаго і, абыходзячы яго каляску, на імгненне прыпыніліся, не ведаючы, што рабіць.

«На падпітку», — адразу ж вызначыў Сяргей, пазіраючы на высокага няголенага хлопца ў акулярах. Затым ён перавёў позірк на дзяўчыну, стройную, сярэдняга росту, з густа нафарбаванымі векамі, з кароткай прычоскай.

Хлопец і дзяўчына былі апрануты ў пацёртыя джынсы, у такія ж курткі з закасанымі ледзь не па локці рукавамі.

— Добрай ночы, — заікаючыся, павітаўся хлопец.

— Прывітанне, — ледзь чутна прамовіла дзяўчына і вінавата ўсміхнулася.

Сяргей, не адказваючы на прывітанне, панура паглядзеўшы на іх, пацікавіўся:

— Ёсць праблемы?

— А ты што, дапа-аможаш? — з выклікам спытаў хлопец.

— Супакойся, — бліснула на яго вачыма дзяўчына.

Сяргею гэта не спадабалася. Ягоны твар пабляднеў, на ім рэзка праявіўся рваны шрам, але ён усё ж стрымаў сябе, адказаў:

— Чым магу — дапамагу.

— На бу-утэльку дасі? — выдыхнуў хлопец.

Ён злёгку пахістваўся, але не міргаючы глядзеў на інваліда. Твар хлопца, парослы рэдкай шчэццю, пакрыўся чырвонымі плямамі.

— Дам, — Сяргей адчуў, як смаліць у перасохлай глотцы. — Дам, але з адной умовай: ты, хлопча, бяжыш у начны магазін, а мы з дзяўчынай пойдзем да мяне. У мяне, калі прыйдзеш, і вып’ем.

Хлопец, паглядзеўшы на дзяўчыну, пацiснуў плячамі.

— Добра.

Інвалід выцягнуў з нагруднай кішэні сарочкі дзесяцідоларавую купюру і падаў яе хлопцу.

— Ідзі, — сказаў і звярнуўся да дзяўчыны: — А ты пойдзеш са мной.

## V

У Сяргеевай кватэры дзяўчына адчувала сябе крыху няёмка. Ды і ён — таксама. І, каб хоць як пазбавіцца няёмкасці, Сяргей прапанаваў:

— А давайце перад святам душ пазнаёмімся. Я — Сяргей.

— А я — Насця, — назвала сваё імя дзяўчына і спытала: — У вашай кватэры курыць можна?

Сяргею не падабалася, калі жанчыны, тым больш дзяўчаты, кураць. Але гэта была не яго дзяўчына, і ўказваць ёй ён не мог, а таму кіўнуў:

— Курыце.

— Дзякуй.

— Не стойце, сядайце. — Сяргей паказаў на крэсла, што стаяла каля акна. — Цяпер я буду глядзець не ў акно, а на вас.

— Вы любіце глядзець у акно? — пацікавілася дзяўчына.

— Люблю, — прызнаўся Сяргей. — І часта гляджу, назіраю.

— За чым назіраеце?

Госця выпусціла клуб густога дыму і, як здалося Сяргею, паглядзела на яго насмешліва: яна адчувала, што гаспадар гэтай беднай, амаль жабрацкай кватэры нешта ўтойвае, кажа загадкамі, і не магла зразумець сэнсу гэтага.

— А навошта гэта вам? — спытала яна.

— Навошта? — Сяргей пачаў злаваць: у апошні час яго нервы ўсё часцей здавалі. Нават без усялякіх прычын. Колькі хвілін Сяргей сядзеў моўчкі, раздумваючы, што адказаць, і раптам рэзка — унутры нешта абарвалася — падаўся наперад, з болем выдыхнуў: — Таму што я хачу ўбачыць ваша чалавечае жыццё, ад якого я адвык і якога ў мяне даўно няма... Няма!.. Я хачу ўдзельнічаць у гэтым жыцці, а не назіраць за ім. Я калека, але таксама хачу жыць. Разумееш?..

Дзяўчына, перастаўшы курыць, маўчала. Яна не ведала, што адказаць, як паводзіць сябе далей.

Стомлена апусціўшы галаву, Сяргей таксама маўчаў. Потым схапіўся за горла, пачаў расціраць яго, пакідаючы на скуры чырвоныя, быццам рваныя плямы.

Госця не чакала такой хуткай змены ў настроі гаспадара кватэры, спалохана падхапілася:

— Я пайду.

Сяргей паволі ўзняў галаву, паглядзеў на дзяўчыну. У яго вачах было столькі болю, што, здавалася, не стрымаецца, зноў закрычыць. Але ён толькі і мовіў:

— Прабачце, нервы.

Дзяўчына, быццам яе засталі за нечым кепскім, апусцілася ў крэсла. У кватэры стала ціха, і гэтая цішыня доўжылася.

— Я ўсё ж пайду.

Яна зноў паднялася.

Сяргей нічога не сказаў. На яго шчоках хутка засоўгаліся жаўлакі. Дзяўчына, пазіраючы на яго са шкадаваннем, з хвіліну моўчкі пастаяла, затым хутка выйшла з кватэры. Ён жа ўтаропіўся ў акно кватэры шматпавярховага дома насупраць. Акно было цёмным і змрочным. Бардова-чырвонае святло, якое гарэла ў ім яшчэ гадзіну таму, пагасла. Дом быццам вымер, растварыўся ў начной цемры.

«Шкада, што мая кватэра не на высокім паверсе, — падумаў Сяргей, — можна было б адчыніць акно і — хай бы ўсё знікла бясследна...»

З цяжкім пачуццём ён пад'ехаў да акна, адчыніў яго, паглядзеў уніз. Там, метры за два ад падаконніка — Сяргей жыў на першым паверсе, — чарнела зямля, над якой ледзь прыкметна пакалыхвалася мроіва туману. «Дыхае», — зазначыў Сяргей, і яму стала неяк лягчэй: у начной цемры таксама адчувалася жыццё. Ледзь улоўнае, але жыццё...

## VI

На досвітку, не распранаючыся, Сяргей абяссілена паваліўся на ложак і заснуў. Спаў ён моцна ажно да абеду. Калі прачнуўся, спякотнае летняе сонца ўжо стаяла высока. У кватэры было суха і душна.

Сяргей аблізаў патрэсканыя губы і, няўклюдна адштурхнуўшыся ад матраца, падняўся. Крыху пасядзеў, нахіліўся ўперад-узад, управа-ўлева — як лічыў, размяў пазваночнік. Зрабіўшы на ложку зарадку, з цяжкасцю перапоўз у каляску, пад'ехаў да акна, адкрыў яго. У твар ударыла гарачае паветра.

«Нагрэлася, аднак», — падумаў Сяргей, успомніўшы, што так заўсёды казаў бацька, калі раніцой на дачы праз акно ў домік урывалася цяпло. Некалі ў дзяцінстве ён любіў ездзіць з бацькамі на дачу — маленькі ўчастак у шэсць сотак з домікам у садова-агародным таварыстве з сімвалічнай назвай «Надзея». Раніцой менавіта ён, Сяргей, адкрываў акно іх дачнага доміка і з захапленнем любаваўся разнастайнасцю навакольнага свету. Гэты свет увасабляў у сабе карціну вясковага і ў той жа час

напаўгарадскога, любага і блізкага чалавечай прыродзе быту. Зелянелі градкі, на якіх былі пасаджаны бульба і памідоры, пасеяны агуркі і сланечнікі, што суседнічалі з акуратна складзенымі альховымі і бярозавымі дровамі каля сцяны маленькага хлеўчука. Крыху далей стаяла высокая вішня, на якую рэгулярна залазіла кацяня і сядзела там, жаласліва мяўкаючы, пакуль ён не здымаў яго. Тады кацяня лашчылася, а ён пяшчотна гладзіў мяккую поўсць... А галоўнае — у суседніх дачных доміках адпачывалі добрыя і ўважлівыя суседзі, з якімі было прыемна і весела гаварыць пра ўсё, што цікавіла.

Акно зачынялася толькі позна вечарам, калі ў дом ужо ўлівалася прахалода, а з ёю залятали камары. Праз гэтае акно маленькі Сяргей спазнаваў навакольнае жыццё, шчыра і даверліва ўспрымаючы ягоную нязлобную і даступную мудрасць.

Ці мог тады падумаць, што ўсяго праз дзесяць з нечым гадоў акно ўвогуле стане для яго адзіным праваднікам у свет людзей?.. У той свет, які асабіста для яго будзе абмяжоўвацца невялікім, напалову заасфальтаваным дваром, на якім будуць стаяць чужыя аўтамабілі і па якім з раніцы да вечара будзе праходзіць мноства знаёмых або зусім незнаёмых яму людзей...

Успамінаючы мінулае, Сяргей падумаў пра сваё цяперашняе — куксы замест ног — і зноў яму стала горка, балюча і адзінока, ды так, што захацелася закрычаць на ўсю моц: «Дапамажыце мне, людзі!» Але ён не закрычаў. Ён, Сяргей, сядзеў у сваёй інваліднай калясцы і глядзеў у акно, за якім праплывалі і знікалі малюнкі яго дзяцінства, а на іх месца лезла ў вочы сапраўдная і жорсткая рэчаіснасць, у якой для яго амаль не было месца суцяшэнню і спагадзе.

## VII

— Ты-ы чаму ся-адзіш?.. Чаму?..

Голас Сяргею здаўся знаёмым. Ён прыгледзеўся. Так і ёсць: начны знаёмы. Ён стаяў перад акном і, паблісківаючы на сонцы круглымі прафесарскімі акулярамі, з насмешкай глядзеў на Сяргея.

— А ты чаму ноччу не прынёс бутэльку? — хмура спытаў Сяргей.

— Дык На-асцю па дарозе сустрэў, з ёй і выпілі, — шчыра прызнаўся хлопец. — Я зараз, па-ачакай, прынясу.

Хутка павярнуўшыся, ён накіраваўся да магазіна.

— А як цябе завуць? — услед яму крыкнуў Сяргей. — Зноў знікнеш, шукай тады цябе.

— Дзі-іма, — павярнуўшыся, адказаў хлопец і дадаў: — Студэнт я, сту-удэнт...

Праз паўгадзіны яны сядзелі ў Сяргеевай кватэры і пілі гарэлку — што было рабіць беспрацоўнаму інваліду і студэнту, які праспаў заняткі... На стале ляжала вараная каўбаса, нарэзаная тоўстымі кавалкамі, хлеб, стаяў слоік салянкі.

— Дзе но-огі стра-аціў?

Хлопец кіўнуў на кароткія кульці гаспадара кватэры.

Сяргей, з-пад ілба глянуўшы на госця, выпіў, крыху закусіў, памаўчаў, пасля чаго хмура заўважыў:

— Табе лепш гэтага не ведаць.

— Не хочаш — не ка-ажы. — Хлопец пацісνуў плячамі і пацягнуўся да бутэлькі. — Мне чужыя тайны не патрэбны.

— Можа, табе хопіць? — Сяргею не хацелася напівацца самому, але больш ён не хацеў, каб у яго кватэры нехта напіўся. — Малады яшчэ гарэлку піць.

— Ты ча-аго? — Хлопец пакрыўдзіўся. — Я не сла-абак. Гэта з выгляду хілы. А та-ак — ого...

— Ну, давай, ого, — Сяргей іранічна ўсміхнуўся. — Я пагляджу.

Выпіўшы чарговую шклянку, хлопец моцна ап'янеў і з цяжкасцю варочаў языком.

— Сяброўка твая дзе? — пацікавіўся Сяргей.

Яму захацелася ўбачыць дзяўчыну, яшчэ раз папрасіць прабачэння за тое, што сарваўся ноччу, сказаў грубыя словы. Сяргей хацеў проста пагаварыць «за жыццё», расказаць пра тое, што думаў і чаго жадаў. Толькі без выпіўкі, цвяроза.

— Спа-адабалася? — ледзь вымавіў хлопец.

— Не ведаю яшчэ. — Сяргей выціснуў усмешку: усе пытанні, якія тычыліся жанчын, для яго, інваліда, былі пакутлівымі. — Але гэта цябе не павінна хваляваць.

— Зра-азумела.

Хлопец нагнуўся і зваліўся б з крэсла, каб не сцяна, на якую абапёрся плячом. Заплюшчыўшы вочы, ён пачаў засыпаць.

— Ты чаго?

Сяргей пад'ехаў да госця. Хлопец ачнуўся, ненатуральна выпрастаўся і, амаль застыўшы ў гэтай позе, прагаварыў:

— Ты-ы-ы за-аплаці ёй і яна пры-ыйдзе.

Непрыемная здагадка кальнула Сяргея. Наліўшы сабе, ён выпіў, прыкусіў каўбасой.

— Яна... Гэтая самая? — спытаў Сяргей, баючыся пачуць сцвярджальны адказ.

— Не-а, — закруціў галавой хлопец. — Дзетдо-омаўская яна. Ня-аняй у бальніцы працуе. Гро-ошай няма, па-адпрацо-оўвае, да-агляда-ае такіх, як ты. За-а та-абой та-аксама можа па-анаглядаць.

— Зразумела. — Сяргей з палёгкай уздыхнуў. Яму стала шкада дзяўчыну, але яшчэ больш шкада сябе. — Ты не мучайся, — сказаў ён хлопцу. — Табе гарэлка не ідзе. Давай, кладзіся на канапу, спі.

Хлопец, хістаючыся, паслухмяна лёг на Сяргееў ложак і адразу ж заснуў.

Сяргей пад'ехаў да акна і рэзка расхінуў фіранкі: па шкле стукалі рэдкія буйныя кроплі дажджу. Яны, размываючы пыл, пакідаючы брудныя сляды, паволі сцякалі ўніз. Здавалася, што нехта нябачны заглядвае ў кватэру і ціха плача.

Вечарам Сяргей задрамаў. У нейкае імгненне ён адчуў, што нехта гладзіць яго па галаве. «Мама...» Ён усміхнуўся. Яна, гладзячы, падымала яго з ложка. Радасны, Сяргей расплюшчыў вочы, але побач нікога не было. Толькі над непрыбраным сталом нізка лятаў камар, а на ложку, уткнуўшыся тварам у змятую падушку, пасопваў хлопец.

Да горла Сяргея падкаціўся агідны застарэлы ком. Стрыпянулася і часта застукала сэрца. Дыхаць стала цяжка. Сяргей

узняў галаву, моцна правёў па горле пальцамі і хутка пад'ехаў да стала. Выліў у шклянку гарэлку, што заставалася ў бутэльцы, выпіў залпам. Праз нейкі час адчуў палёгку, сэрца адпусціла, але ў горле па-ранейшаму давіла. Шрам наліўся, стаў цвярдзець. Сяргей да болю сціснуў шрам пальцамі, адцягнуў яго з такой сілай, што здавалася, яшчэ крыху — адарве ад скуры, выкіне ў акно. Але, адчуўшы невыносны і пякучы боль, расціснуў пальцы. «Праклён...»

Яму захацелася застацца аднаму, каб ніхто яго не бачыў і каб ніхто не сачыў за ім. Нават мімаходзь: Сяргей баяўся паказаць сваю слабасць. Ён разбудзіў хлопца, які яшчэ не працверазеў і не зусім разумеў, што адбываецца, і нічога не тлумачачы, груба правёў яго да дзвярэй.

— Ідзі дадому, ідзі.

Застаўшыся адзін, Сяргей доўга і бязмэтна глядзеў у акно. Над шматпавярховымі бетонна-каменнымі аграмаднымі дамамі гарэў бардова-чырвоны захад. Жыццё ў горадзе замірала.

«Зноў», — з болем падумаў Сяргей.

Зноў наступіла бяссонная ноч, падобная да папярэдніх. Нічога добрага яна не абяцала.

«Хоць бы з кім пагаварыць», — падумаў ён, бо не мог больш заставацца адзін. Ён сумна правёў вачыма па сваім непрыбраным халасцяцкім жытле. Убачыўшы тэлефон, вырашыў: «Пазваню». Калі станавілася вельмі цяжка ў адзіноце, Сяргей набіраў нумар «Службы даверу» і шукаў палёгкі ў шчырай размове, якая ні да чаго не абавязвала ні яго, ні таго, з кім гаварыў аб сваёй нялёгкай долі. І цяпер, набраўшы знаёмы нумар, крыху сумеўшыся, але смела — за ім жа ніхто не падглядае — павітаўся.

— Добры дзень, — адразу ж пачуў прыемны жаночы голас. — Што у вас?

— Душа баліць.

Сяргей нявесела ўсміхнуўся.

— Не толькі ў вас аднаго, — супакоіла яго жанчына. — Расслабцеся, пачытайце што-небудзь або паглядзіце тэлевізар.

— Разбіў я тэлевізар, — раздражнёна кінуў Сяргей.

— Тады схадзіце да суседа або паклічце яго да сябе, — параіла жанчына.

— Зразумела...

Сяргей паклаў трубку: больш гаварыць не было пра што. Ды і які сэнс? Усё, што сказала б гэтая, напэўна, добрая і мілая жанчына са «Службы даверу», ён ведаў. І гаварыў з ёй таму, што любому чалавеку, а тым больш, калі ён калека, размова вельмі патрэбная. Але ў гэты момант Сяргею хацелася большага: жывой, а не тэлефоннай гаворкі, шчырых адносін, разумення і хоць маленькага, але суцяшэння.

Сяргей згараў ад жадання хоць каму-небудзь расказаць пра сваю адзіноту і нікому, як яму здавалася, ужо непатрэбнае ягонае жыццё. Хацелася, каб хоць хто супакоіў і сагрэў скалечаную душу.

Некалькі разоў нервова праехаўшы ўзад-уперад па пакоі, Сяргей спыніўся каля акна і стаў глядзець у двор. За акном было ўжо зусім цёмна. Хутаючыся ў празрыстае мроіва, гарэлі ліхтары. У шматпавярхоўцы, што ўзвышалася насупраць, свяціліся амаль усе вокны. І сярод іх выдзялялася знаёмае акно.

«Што там?..»

Сяргей узяў бінокль, навёў яго на гэтае акно, якое так прываблівала. «Цікава...»

На ложку сядзела маладая жанчына і чытала кнігу. Яе густыя валасы рассыпаліся па халаце, адна пала якога ссунулася на падлогу, агаліла круглую доўгую белую нагу.

Сяргей апусціў бінокль, міжволі глянуў на свае куксы і ледзь не заплакаў: ён — інвалід і ніколі не выйдзе са сваёй кватэры, не дагоніць на вуліцы гэтую жанчыну і не пазнаёміцца з ёй.

Ад таго, што жыццё такое несправядлівае, ад усведамлення свайго калецтва, у душы ўсё дрыжала. Каб хоць як супакоіцца, Сяргей узяў газету, якую ўчора пакінуў хлопец, пачаў спешна гартаць. На прадапошняй рэкламнай старонцы знайшоў рубрыку: «Пасланні для мужчын». Прачытаў: «Сімпатычная, прыгожая целам і душой жанчына, прыемная ў зносінах з мужчынамі, пазнаёміцца з мужчынам».

Адчуваючы, як у галаве стала горача, а па ўсім целе пайшло цяпло, Сяргей узяў тэлефонную трубку і набраў нумар, надрукаваны пад гэтай абвесткай.

— Слухаю.

Голас быў ветлівы і прыемны.

— Вы можаце да мяне прыехаць? — не спытаў, а хутчэй папрасіў Сяргей, з цяжкасцю стрымліваючы дрыжыкі.

— Вядома, — шматабяцальна прагаварыла жанчына. — Дваццаць пяць долараў за гадзіну.

Для яго, інваліда, які атрымліваў маленькую пенсію, гэта было вельмі шмат, але ён згадзіўся: яго невыносна стомленае і спакутаванае цела патрабавала суцехі.

— Прыязджайце, толькі ведаеце... — Сяргей на хвіліну запнуўся, — я інвалід.

На другім канцы провада стала ціха. Паўза працягвалася з паўхвіліны, потым жанчына пацікавілася:

— А што за інваліднасць?

— Няма ног, — коратка і груба адказаў Сяргей.

— Тады... А ўвогуле, я ўжо сказала колькі за гадзіну...

Ветлівы мяккі голас у трубцы не змяніўся: жанчына згадзілася прыехаць.

— Прыязджайце, — амаль умольна выдыхнуў Сяргей і назваў свой адрас. — Толькі, калі можна, праз гадзіну.

Паклаўшы трубку, ён выцер успацелы лоб, дастаў з кішэні сарочкі грошы, якія пакінуў яму Рыгор, пералічыў: дзевяноста долараў — усё, што ў яго было.

## IX

Сяргей ужо суткі ці двое не мыўся, таму сарочка была брудная, памятая. Трэба тэрмінова памыцца, прыбрацца ў кватэры.

Хвілін праз сорак, памыўшыся, пагаліўшыся і пераапрануўшыся, Сяргей сядзеў за сталом, накрытым чыстым абрусам, і чакаў «сімпатычную, прыгожую целам і душой» жанчыну.

Час ішоў марудна. Чамусьці ў думках Сяргея з'явілася параўнанне, быццам і недарэчнае, а ўсё ж: час цячэ, што замёрзлая

салярка з ягонага старэнькага армейскага бронетранспарцёра, якую яны, салдаты тэрміновай службы, мянялі ў жыхароў афганскіх высакагорных аулаў, дзе не было заправак, на віно ці іншыя алкагольныя напоі...

Сяргей глянуў у акно. Яно было непрыветным. У шыбу па-ранейшаму барабаніў дождж, які ў апошні тыдзень часта пачынаўся нечакана, калі неба ледзь цямнела, таксама хутка праходзіў, каб праз нейкі час зноў адарыць горад прахалодай і свежасцю...

«Хутка, успомніце мае словы, канец свету», — Сяргей прыгадаў суседку бабку Надзю, сухую згорбленую жанчыну, якая часам выходзіла ў двор і, ледзь клыпаючы каля ягонай кватэры, расказвала такім жа, як і сама, старым жанчынам пра сваё нялёгкае жыццё.

Успамінаў і ўсміхаўся: да яго вярнуўся добры настрой, як гэты дождж вярнуўся ў горад. Але ці надоўга застанецца такі настрой, Сяргей не ведаў.

У дзверы нясмела пастукалі. Ён ад'ехаў ад стала, напружыўся.

— Заходзьце.

На парозе з'явілася высокая стройная жанчына з шыкоўнай чорнай сумачкай і вялікім папяровым пакетам у руках.

— Добры дзень. — Яна міла ўсміхнулася і адразу ж паправіла сваё прывітанне: — Дакладней, добрай ночы.

Сяргей сумеўся: перад ім стаяла тая самая жанчына, за якой ён назіраў у бінокль.

— Вы? — разгублена сказаў ён, не ведаючы, радавацца або абурацца: жанчына, якой ён так захапляўся, была...

Яму не хацелася нават у думках прамаўляць гэтае слова, якім называюць жанчын, што прадаюць сваё цела.

Яна, не разумеючы, што здарылася, перастала ўсміхацца і з ноткамі холаду ў голасе спытала:

— Гэта вы тэлефанавалі па аб'яве?

Сяргей пачырванеў: яму стала няёмка і сорамна за тое, што кепска падумаў пра гэтую жанчыну.

«Якое я маю права асуджаць? Я ж бачу яе першы раз...»

— Так, так, праходзьце, распранайцеся, — замітусіўся Сяргей.

Ён пад'ехаў да жанчыны, спыніўся за крок ад яе, адчуў нейкі салодкі і таемны пах. Галава ў яго крыху закружылася, кепскія думкі тут жа выветрыліся.

Узяўшы ў жанчыны пакет, Сяргей паставіў яго на канапу і, гледзячы, як госця не спяшаючыся, артыстычна здымае белы плашч, прапанаваў:

— Павесьце ў шафу.

— Добра. — Жанчына зноў міла ўсміхнулася. — А разуцца можна?

Сяргей толькі зараз заўважыў, што яго госця стаіць у мокрых вастраносых чаравічках на тонкіх высокіх абцасах. Яшчэ ён убачыў, што ў яе вельмі прыгожыя і стройныя ногі, якія выглядваюць з кароткай скуранай чорнай спадніцы. Увогуле, жанчына была надзвычай прыгожай.

— Ну, будзем знаёміцца, — яна зрабіла крок да Сяргея. — Ірына.

— Сяргей. — Ён мітусліва і сарамліва падаў ёй руку і, затрымаўшы яе далонь у сваёй, дадаў: — Да мяне рэдка хто заходзіць.

— Да мяне — таксама, — нявесела сказала Ірына.

— Не верыцца, — нібы сам сабе ціха прамовіў Сяргей.

— Гэта праўда, — уздыхнула яна. — Але так было не заўсёды.

— Значыць, ваша жыццё было іншым, — з палёгкай прагаварыў Сяргей, бо, наглядаючы праз бінокль за кватэрай сваёй госці, бачыў шмат з таго, што там адбывалася.

— Так, іншым.

— А калі?

— Мне абавязкова расказваць?

— Не, канешне ж... Але, даруйце, мне хочацца ведаць.

— Добра... Мае жыццё было іншым, калі я працавала ў Італіі, — прызналася жанчына. — Там я ўдзельнічала ў паказах моднай вопраткі адной папулярнай фірмы.

— Дык вы мадэль?

Сяргей надзвычай востра адчуў, як гняце яго тое, што ён фізічна непаўнавартасны. Ён сціснуўся, быццам чакаў, што зараз яго нехта плясне па твары.

— Былая, — сумна мовіла жанчына. — Не будзем успамінаць старое. Тым больш, што там засталося нямнога таго добрага і карыснага. Вы здзівіцеся, але менавіта ў Італіі мае працадаўцы навучылі мяне бачыць і цаніць прыгажосць. А яна не толькі ў яркіх фарбах, але і ў чорных, цёмна-сініх, шэрых... Галоўнае, каб усё было ў меру, гарманічна. Разумееце?

— Так.

— Павячэраем? — прапанавала госця.

Сяргей успомніў, што ў яго ў халадзільніку акрамя сырога мяса і некалькіх яек нічога няма. Жанчына заўважыла, што ён разгубіўся і, зычліва ўсміхнуўшыся, сказала:

— Я ўсё прынесла.

Яна дастала сыр, парэзаную на тонкія кавалкі, загорнутую ў цэлафан вяндліну, масла, белы хлеб, два лімоны і бутэльку брэндзі.

— Кілішкі, нож ёсць?

— Так, — Сяргей спешна кіўнуў, — на кухні.

Чаго-чаго, а што госця заявіцца да яго з вячэрай, ён не чакаў. Як, між іншым, не думаў, што яна наогул прыйдзе да яго, інваліда.

Калі жанчына, акуратна парэзаўшы хлеб і сыр, зрабіла бутэрброды, Сяргей спытаў:

— Вы адна жывяце?

Вядома, ён разумеў, што ў жанчыны па выкліку не можа быць мужа, але...

— Вам гэта цікава?

Сяргей не ведаў, што адказаць. Ён не хацеў лезці ёй у душу, але разам з тым яму хацелася ведаць пра гэтую жанчыну як мага больш. І яна, не дачакаўшыся яго адказу, расказала многае са сваёй біяграфіі.

— У мяне некалі быў муж. Італьянец. Па прафесіі — мадэльер. Ён загінуў у аўтамабільнай катастрофе. Цяпер я жыву адна. Але не заўсёды. Вы таксама не зусім адзінокі. Праўда?

Сяргей прамаўчаў: усё так. Але толькі з адной папраўкай: блізкіх адносін з жанчынамі ў яго не было ніколі па адной прычыне — яго інваліднасці.

Сяргей уздыхнуў, узяў бутэльку, адкаркаваў, асцярожна наліў у кілішкі брэндзі і прапанаваў:

— Давайце, Іра, вып'ем за нашу сустрэчу.

Ён глядзеў у яе глыбокія, як яму здавалася, вочы, жадаючы ў гэтую хвіліну толькі аднаго: спадабацца ёй. Хоць крышачку...

— Давайце, — жанчына падняла кілішак. — А мы з вамі ў нечым падобныя. Так?

— Напэўна...

Выпілі, крыху памаўчалі.

— Можа, яшчэ? — прапанаваў Сяргей.

— Можна і без гэтага, — задуменна прамовіла жанчына.

Яна ўстала, абышла каляску, у якой сядзеў Сяргей, раптам абняла яго ззаду, прыціснулася шчакой да яго шчакі, затым пацалавала ў шыю, у грудзі...

Ён напружыўся, куксы яго таргануліся, шрам уздуўся і пабялеў.

— У нас, напэўна, мала часу, — прашаптала жанчына.

Сяргей сціснуў зубы, закрыў вочы. На нейкае імгненне яму здалося, што падлога ў кватэры стала падымацца адным канцом і ён, разганяючыся ў сваёй інваліднай калясцы, панёсся ўніз, у бясконцую бездань, што пылала недзе наперадзе барвова-чырвоным колерам.

## X

— Мы сталі бліжэйшымі, — сказала пад раніцу Іра, збіраючыся дадому.

— Але, — стомлена згадзіўся Сяргей. Ён быў шчаслівы. А праз хвіліну, калі Ірына пачала апранацца, занепакоена спытаў: — Ты яшчэ прыйдзеш?

— Калі пазавеш, — крыху гуллівa і загадкава адказала яна. У рэшце рэшт мы яшчэ маладыя і наперадзе ў нас цэлае жыццё. Ці не так?

— Напэўна. — Сяргей прыўзняўся. — Дзякуй табе.

— Пакуль.

— Да сустрэчы.

Ён упершыню за некалькі апошніх дзён адпачываў не ў інвалiднай калясцы, а ў сваім ложку. Гэта было так добра, што больш нічога не хацелася. Ды і ці магло быць нешта лепшае, чым гэтая ноч, якая падаравала яму яшчэ ўчора незнаёмую і недасяжную жанчыну, здаровую і маладую. І каму? Яму, калеку...

Успамінаючы той час, калі яны былі разам, Сяргей думаў: «За што мне дадзена такое шчасце?..» Думаючы пра Іру, ён незаўважна для сябе заснуў і прачнуўся толькі апоўдні. Але не адразу: напаўрасплюшчыўшы вочы, звычна павярнуў галаву да акна. Промень сонечнага святла, што ўрываўся ў пакой між фіранкамі, адразу ж ударыў у вочы. Гэта было так нечакана, што, спалохаўшыся, Сяргей інстынктыўна адхіліўся, замёр: на імгненне здалося, што убачыў бліскучы прыцэл снайперскай вінтоўкі, напраўлены яму ў галаву.

Мінула хвіліна, другая, трэцяя. Нарэшце Сяргей ачомкаўся: «Што за насланне? Навошта?..»

Сунуўшы рукі пад коўдру, сціскаючы пальцы, правёў імі па голых куксах — балюча... «Вайна, хай будзе яна праклятая...»

Боль вярнуў Сяргея да рэальнасці. Трэба было ўставаць, гатаваць сняданак: варыць кашу, яйка, чай — самае простае. Ён падняўся, сяк-так апрануўся і, асядлаўшы сваю каляску, без усялякага жадання рассунуў фіранкі. Пакой заліло яркае святло. У яго празрыстай, насычанай ранішняй свежасцю плыні пераліваліся чырванаватыя адценні сонца, што ўставала з-за шматпавярхоўкі насупраць акна Сяргеевай кватэры, як ніколі вабілі да сябе... «А ўсё ж добра жыць, — узрушана падумаў Сяргей, — нават калі ты калека...»

## XI

— Прывітанне! — раптам пачуў Сяргей праз акно.

Ён працёр вочы, паглядзеў праз нямытае шкло: перад акном

стаялі хлопец у акулярах і яго сяброўка Насця. Абое ў тых жа пацёртых джынсах і куртках, сарочках навыпуск.

— За-айсці мо-ожна? — спытаў хлопец.

— У мяне няма нічога выпіць, — папярэдзіў Сяргей.

— А мы-ы з раніцы не п'ём, — сказаў хлопец і ўважліва паглядзеў на сяброўку. — Во-ось вечарам — гэта іншая справа.

— Добра, заходзьце.

— Ды-ык я адзін зайду.

Хлопец накіраваўся да дзвярэй. Не заходзячы ў кватэру, праз дзверы, якія расчыніў Сяргей, сунуў яму лісток з агульнага сшытка.

— Ту-ут тэлефоны... Мой і На-асці. Звані, калі што.

— Ды мне нічога не трэба.

Сяргей паспрабаваў вярнуць лісток хлопцу, але той не ўзяў.

— Бяры. Ты-ы мужык добры. Мы-ы заўсёды табе да-апаможам. Бясплатна.

— Ну-у... — Сяргей даўно адвык ад увагі малазнаёмых яму людзей, таму не ведаў, як быць. — Дзякуй.

— Звані, — яшчэ раз сказаў хлопец, павярнуўся і пабег да сяброўкі, якая чакала яго ўнізе.

Сяргей зноў застаўся адзін у пустой кватэры. З аднаго боку, у яго з'явіліся новыя добрыя знаёмыя, нават сябры, з другога — іх быццам і не было. Не было таму, што не ён быў ім патрэбен, а яны былі патрэбны яму, і не яны запрашалі яго ў госці, а ён прасіў іх зайсці да яго, не яны былі адзінокімі, а ён, ён...

У нейкі момант нервы напружыліся, і Сяргею захацелася закрычаць ад сваёй абяздоленасці і абдзеленасці, але ён стрымаўся... Гэтыя пачуцці жылі ў ім даўно, з таго самага часу, калі ён, ачнуўшыся ў вайсковым шпіталі, не ўбачыў сваіх ног. Сяргей тады яшчэ не зразумеў усяго таго няшчасця, якое здарылася з ім, а ўжо ўбачыў слёзы маладзенькай медсястры і цяжкі, жорсткі погляд старога падпалкоўніка — ваеннага хірурга.

«Пракляцце!»

Колькі разоў Сяргей паўтараў сам сабе гэтае слова і амаль заўсёды пачынаў думаць аб самым страшным, грахоўным: на-

класці на сябе рукі. Але цяпер ён пра гэта не думаў: апошнія дні і асабліва апошняя ноч змянілі яго жыццё.

«Можа, мне ажаніцца? — нечакана падумалася Сяргею. — На Іры. Яна ж сказала: «Уперадзе ў нас цэлае жыццё». Так, цэлае жыццё... Ён ухапіўся за гэтую думку. «Іры патрэбны грошы, а мне патрэбна яна. Я дастану грошы, Рыгор дасць, дасць...»

Сяргей пад'ехаў да акна і з надзеяй стаў глядзець на шматпавярховы дом насупраць. Там, у сваёй кватэры, была жанчына, без якой ён ужо не ўяўляў свайго далейшага жыцця.

## XII

Прайшоў яшчэ адзін дзень, праляцела яшчэ адна ноч. Сяргею здавалася, што мінула вечнасць. Ён амаль не спаў і не еў, а думаў пра адно і тое ж: «Я жанюся, маю права. Я ж жывы, жывы...» І разам з тым ён сумняваўся: у яго ж не было працы, грошай, а самае страшнае — ён быў калекам.

Пасля пакутлівага і доўгага роздуму, які раздзіраў мозг, душу і сэрца, Сяргей вырашыў выпрабаваць лёс.

«Што будзе, тое і будзе. Хіба ж упершыню...»

Ён доўга сядзеў каля тэлефона, пакуль набраў знаёмы нумар.

— Рыгор, гэта я. — Сяргею было цяжка гаварыць, ён хваляваўся. — Прыязджай да мяне. Толькі прашу цябе, зараз.

Хвілін праз дваццаць да «хрушчоўкі», у апошнім пад'ездзе якой жыў Сяргей, пад'ехаў раскошны новы джып «Вольва». Хлопец, які сядзеў на пярэднім сядзенні побач з вадзіцелем, выскачыў з машыны і адкрыў заднія дзверцы. З салона джыпа выкаціўся даволі грузны мужчына. Яго сіні касцюм блішчэў на сонцы.

— Здарова! — памахаў яму з акна Сяргей. — Дзверы адчынены, заходзь.

Мужчына ўважліва паглядзеў па баках, зайшоў у пад'езд, затым у кватэру Сяргея. Павітаўшыся з гаспадаром за руку, спытаў:

— Што здарылася?

Сяргей не ведаў, з чаго пачаць размову. Маўчаў. Мужчына дастаў цыгарэты, закурыў.

— Грошы, Рыгор, патрэбны, — апускаючы вочы, глуха прагаварыў Сяргей.

— Колькі і навошта? — пацікавіўся мужчына.

— Не ведаю. — Сяргей узяў цыгарэту, некалькі разоў цыркнуў, пакуль запаліў яе, прыкурыў. — Жаніцца хачу.

— Н-да... — Рыгор дапытліва паглядзеў на Сяргея. — Гэта сур'ёзна?

Сяргею гэта пытанне не спадабалася, ён зазлаваў:

— Ты думаеш, што я не магу жаніцца, што я нікому не патрэбны?

— Супакойся і не наступай на мяне, — таксама раззлаваўся мужчына. — Мяне гэтым не возьмеш. А ўвогуле, я ж павінен ведаць, куды і на што пойдуць мае грошы.

Твар Сяргея наліўся чырванню, яго куксы быццам працяў ток.

— А я, Рыгор, нічога не пытаў, калі там, у гарах, закрыў цябе сваім целам ад душманскай гранаты. — Сяргееў голас задрыжаў. — І пра ўзнагароды, а тым больш пра твае грошы, якія ты там зарабляў, гандлюючы марыхуанай ды опіумам, не думаў.

— Не трэба, — выдыхнуў мужчына. — Я проста прывык лічыць грошы. Даруй.

Сяргей, насупіўшыся, маўчаў.

— Колькі трэба? — сказаў Рыгор і, не чакаючы адказу, дастаў з кішэні партманет, адлічыў дзесяць стодоларавых купюр, паклаў на стол. — Гэта на вясельны касцюм, пярсцёнкі і іншую дробязь. Астатняе — калі распішацеся. Вяселле зладзім, кватэру тваю давядзём да ладу.

Сяргей стаў адтаваць.

— Дзякуй, мне толькі на вяселле, больш не трэба.

— Не перажывай, — Рыгор спагадліва і вінавата ўсміхнуўся. — І не думай пра мяне так кепска. Яшчэ невядома, дзе лепш: тут, аднаму ў тваёй кватэры, або там, за тваім акном,

сярод розных, вельмі розных людзей. І такіх, як ты, і такіх, як я, і такіх, як усе мы разам.

Ён абняў Сяргея, паляпаў па плячы:

— Трымайся.

— Трымаюся.

Сяргей заплюшчыў вочы: на душы раптам стала так цяжка і пуста, што ўжо нічога не хацелася. Толькі — спаць.

## XIII

Выспаўшыся, Сяргей супакоіўся. І дзіўна: яшчэ вастрэй, чым раней, адчуў сваю адзіноту. Захацелася звязаць сваё жыццё з жанчынай, якая не проста падаравала яму ноч кахання, але і дала зразумець, што ў іх роднасныя душы. А значыць, яна пацвердзіла ягоную роднасць з навакольным светам, у якім ён, як і іншыя, меў права на шчасце. Тое самае права, якое з'явілася ў яго некалі ў дзяцінстве, а потым так недарэчна і жорстка знікла на вайне, чужой і непатрэбнай яму...

Сяргей асцярожна ўзяў трубку, паволі, баючыся памыліцца, набраў Ірынін нумар. Пачуліся гудкі. Яны былі доўгімі, вельмі доўгімі. Нарэшце трубку паднялі і прагучаў ветлівы знаёмы голас:

— Я слухаю вас.

Сяргей радасна закрычаў:

— Іра, гэта я, Сяргей! Прыйдзі да мяне, прыйдзі!..

Нейкі час жанчына маўчала. Потым ці то раздражнёна, ці то заклапочана сказала:

— Добра, чакай.

У трубцы адразу ж пачуліся кароткія гудкі.

Сяргей адчуў нешта нядобрае, але часу на роздум не было. Ён пачаў ліхаманкава прыбіраць у кватэры. Аб'язджаючы пакой, зачапіўся і зваліўся з каляскі.

«Кепская прымета», — падумаў ён, але не прыдаў гэтаму асаблівага значэння. Сціснуўшы зубы, ухапіўся рукамі за канапу, з цяжкасцю забраўся ў каляску, пад'ехаў да акна, стаў чакаць.

Прайшло паўгадзіны, гадзіна, паўтары. Розум падказваў яму, што Ірына не прыйдзе, але душа не хацела ў гэта верыць. Душа спадзявалася і чакала.

«Напэўна, нешта здарылася», — падумалася Сяргею.

Ён ад'ехаў ад акна, дастаў з тумбачкі бінокль, навёў яго на Ірыніна акно і — скалануўся: яна была не адна. Ірына сядзела за сталом з нейкім мужчынам. Яны выпівалі і аб нечым гаварылі.

Сяргей не вытрымаў і з усяе сілы шпурнуў бінокль у акно. Яно дзынкнула, бінокль бразнуўся аб асфальт, побач рассыпаліся асколкі шкла...

З двара данёсся візглівы голас нейкай жанчыны:

— Звар'яцелі, п'яніцы праклятыя!..

Сяргей заскрыгатаў зубамі, замітусіўся ў калясцы па пакоі, не находзячы сабе месца. Калі праз нейкі час сяк-так супакоіўся, успомніў хлопца ў акулярах, пазваніў яму:

— Зайдзі тэрмінова!

Той неўзабаве з'явіўся.

— Што-о?

Дрыжачым пальцам Сяргей паказаў на акно жанчыны, на якой хацеў ажаніцца.

— Сходзі, пакліч... Яе завуць Ірынай. Скажы, што ў мяне ёсць грошы. Калі яна захоча, то можа паехаць у Італію.

— На-авошта?

— Гэта наша справа. Ты скажы ёй.

— До-обра.

Хлопец не спяшаўся.

— Ідзі, — папрасіў Сяргей. — Калі ласка. І па дарозе купі што-небудзь выпіць. Вось грошы...

Хлопец пайшоў. Сяргей стаў чакаць. Ён не ведаў, што будзе казаць ды і пра што яны будуць гаварыць, калі яна прыйдзе. Але яму хацелася многае расказаць ёй, вельмі многае. Можа быць, пра сваё жыццё ды і пра ўсё наогул. Але гаварыць яму нічога не давялося: хлопец неўзабаве вярнуўся. Ён быў адзін. З пакетам. Сяргей усё зразумеў. Толькі і сказаў:

— Налівай.

— Яна мне не адчыніла, — быццам апраўдваючыся, мовіў хлопец.

— Налівай, — паўтарыў Сяргей.

Яны моўчкі пілі і не закусвалі: хлопец хутка ап’янеў, паваліўся на канапу і заснуў.

Сяргей, утаропіўшыся ў разбітае акно, нервова засмяяўся: усё, да чаго нарэшце ён прыйшоў у жыцці, растала, як чарговая ноч. Не засталося нават надзеі: ён быў адзінокім калекам. А жанчына, якую так хацеў кахаць, не хацела ці не магла быць ягонай...

Ён так ясна ўсё гэта зразумеў, нават уявіў сябе і яе ў гэтым свеце, што старая, ужо, здавалася б, забытая, думка накласці на сябе рукі раптам зноў рэзка ўзнікла ў яго галаве і на імгненне заглушыла ўсе астатнія пачуцці.

Не спяшаючыся, але мэтанакіравана Сяргей пад’ехаў да акна, абдзіраючы да крыві рукі аб асколкі шкла, адчыніў раму, ухапіўся за падаконнік, падцягнуўся і стаў караскацца на яго. Караскаўся ён цяжка і доўга. У апошні раз падцягнуўшыся, ён перакуліўся і рынуўся да чорнай зямлі, на якой нядаўна старыя жанчыны, суседкі па пад’ездзе, пасадзілі кветкі...

Ён не чуў, як нехта звар’яцела закрычаў: «Глядзіце, глядзіце, інвалід падае!..» Не чуў, як нехта заклікаў: «Ды дапамажыце яму!..» Не чуў, як бабулька Надзя загаласіла: «Што ж гэта робіцца на свеце...»

Калі ж Сяргей ачомаўся, то ўбачыў, што вакол яго стаяць людзі: суседзі і выпадковыя прахожыя. І сярод іх была Ірына. Яна плакала...

Мінулае жыццё Сяргея ў гэты кароткі міг заканчвалася і пачыналася новае. Для першай і адзінай у яго скалечаным жыцці жанчыны, якую ён так доўга і пакутліва чакаў.



# ІМГНЕННЕ ВЕЧНАСЦІ

## I

Ні за прошлую ноч, ні за прошлы дзень нічога вакол не змянілася, але для Антона Гарэліка як быццам ужо нічога не было. Ні гэтай ночы, ні гэтага свету, ні гэтага жыцця.

Згорбіўшыся, ён сядзеў на гнілой калодзіне каля старога закінутага калодзежа, бетонныя кольцы якога адсвечвалі сіняватым лёдам, і тупа глядзеў на зоркі. Бледны, няголены, з вадзяністымі мяшкамі пад слязлівымі вачыма, ён не адчуваў холаду, часу, сябе. Больш-менш ясная свядомасць толькі на імгненне вярталася да яго, але гэтае імгненне было такім кароткім, што цвяроза зразумець, што адбываецца, было немагчыма. Ды і не хацелася што-небудзь удакладняць, пра што-небудзь думаць. У галаве Антона цяжка, але ўпарта варочалася толькі адна думка, якая валодала ім ужо даўно: «Вось бы ўтапіцца...»

Гледзячы на зоркі, ён нервова пагойдваўся ўзад і ўперад, быццам аплакваў сябе і сваё няўдалае жыццё, развітваўся з

усім і ўсімі. Маўкліва, пакорліва, як пабіты сабака, стары і ўжо нікому не патрэбны, Антон змірыўся са сваёй доляй і жадаў зараз аднаго — смерці.

Зоркі абыякава гойдаліся ў чарнеючай, ледзь разведзенай жаўтлявым святлом вышыні, а іх адбыткі сіратліва плавалі на дне напаўабваленага, але яшчэ глыбокага калодзежа, што стаяў непадалёк ад урослай у заснежаную зямлю маленькай драўлянай хаты, за якой пачыналіся гарадскія дачы.

У бяссіллі прываліўшыся да застыглага бетоннага кальца, Антон закрыў вочы і адразу ж праваліўся ў нябыт. Але ненадоўга. Ён зноў, хоць і з цяжкасцю, адкрыў іх. Адкрыў цяпер на імгненне. Яшчэ адно імгненне яго жыцця, у якім ужо не было нічога, акрамя страшнай стомы і абыякавасці.

## II

На жаль, чалавек нараджаецца, каб памерці. І калі адкінуць усе напышлівыя словы пра сэнс жыцця, яго неабходнасць для працягу чалавечага роду, то так яно і павінна быць. Усё астатняе, як калісьці сказаў Эклезіяст, пустая марнасць, усё — марнасць. Гэтыя жорсткія, але мудрыя словы, пачутыя аднойчы ад мясцовага святара, не раз паўтараў пра сябе Антон. І толькі ў апошнія месяцы, нават дні, ён па-сапраўднаму ўсвядоміў, хутчэй нават адчуў нутром іх сэнс. І калі гэта адбылося, яго захаладзелая душа стала ці то зусім лёгкай, ці то зусім пустой і на здзіўленне спакойнай. Антон перастаў думаць пра сябе, пра сваё месца ў гэтым жыцці. Ён як быццам адарваўся ад зямлі і вісеў, як гэтыя зоркі, у халоднай прасторы, маўкліва пазіраючы на вірлівы і ўжо чужы зямны свет. І пакуль Антон не сышоў з гэтага свету, яго на зямлі ўтрымлівала толькі памяць. Дакладней, тое, што засталося ад памяці. Ён ужо не хацеў нават піць...

Успомніўшы раптам пра выпіўку, Антон аблізаў шурпатым языком распухлую, запечаную крывёй пабітую губу і не зусім свядома, незласліва падумаў: «Сволач...» Сволаччу Антон абазваў свайго былога суседа Мікалая Раманюка, які прыходзіў

раніцай, у гадзін дзесяць. Антон у гэты час яшчэ драмаў, з галавой накрыўшыся бруднай парванай коўдрай.

— Уставай, — былы сусед знарок груба і рэзка штурхнуў Антона ў жывот сваёй кашчавай рукой.

Антон скурчыўся ад болю, але нічога не сказаў. Паляжаўшы, пакуль боль у жываце сціх, стаў падымацца.

Мікалай, доўгі і худы, нечым падобны на мыліцу, хмура пацікавіўся:

— Жывы яшчэ?

— Жывы, — адказаў Антон.

— Сядай тады, — прапанаваў былы сусед.

Ён дастаў з цэлафанавага пакета бутэльку таннага віна, хлеб, сала, цыбулю. Наліўшы віно ў гранёныя шклянкі і зло агледзеўшы даўно не белены, з паўразбітай, амаль старажытнай мэбляй пакой, працадзіў:

— Звольнілі мяне ўчора з працы. Па скарачэнні. Рынак зараз у нас, кажуць. А па-мойму, не рынак, а базар. Базар, каб яму праваліцца на гэтым свеце, а апынуцца на тым — у пекле!..

Залпам выпіўшы шклянку віна, Мікалай прыкусіў хлебам.

Антон шумна праглынуў сліну, дрыготкай рукой асцярожна і беражліва ўзяў сваю шклянку і стаў піць. Ён піў доўга і пакутліва. Віно, здавалася, не хацела ўваходзіць ўнутр, адрыгвалася. Але Антон упарта ліў яго ў сябе, імкнучыся суняць свой боль, заглушыць свае непаваротлівыя думкі, заліць сваю памяць.

— Звольнілі мяне, — паўтарыў Мікалай. — Цяпер кожны сам па сабе. А не хочаш сам па сабе, дык ідзі туды працаваць, куды не завуць, але дзе возьмуць. Карацей кажучы, цярпі і маўчы...

Антон, ужо захмялелы і падабрэлы, без якой-небудзь задняй думкі вымавіў:

— А добра, што звольнілі. Будзем, калі хочаш, разам жыць.

Твар былога суседа, і без таго чырвоны, зморшчаны, наліўся крывёй. Ён прыўстаў і з размаху заехаў кулаком Антону ў сківіцу.

— Я цябе буду, сука... Жыць са мной захацеў... Зусім у цябе дах паехаў?..

Выпрастаўся, плюнуў і пайшоў, бразнуўшы за сабой дзвярыма так, што пасыпалася тынкоўка.

Антон доўга ляжаў на падлозе, нібы дзікі звер, залізваючы рану. Ён прывык да людской жорсткасці і ўжо не ўспрымаў яе як абразу. Вось толькі боль...

З цяжкасцю падняўшыся, ён выйшаў на двор. У вочы яму ўдарыла некранутая бель снегу. Ён зачэрпаў далонню трохі, прыклаў да губы. Палягчэла.

Салдаты, ваенная часць якіх стаяла побач, праходзячы міма, з усмешкай павіталіся. Антон нічога не адказаў. Яму было ўсё роўна, што пра яго падумаюць, скажуць. І тыя, якія былі калісьці самымі блізкімі і роднымі людзьмі, і ўсе астатнія, як гэтыя незнаёмыя салдаты. Антон не хацеў ведаць нікога і нічога. Ды і ён нікому быў не патрэбны. Нібы пустэльнік, Антон жыў у сваёй хаце, якая засталася яму ў спадчыну ад бацькоў. Прыходзіў да яго толькі былы сусед, якому ён абяцаў аддаць гэтую хату за яго клопат. Клопат гэты, скупы і абыякавы, заўсёды выліваўся ў выпіўку і няхітрую закуску. Часам, праўда, Мікалай прыносіў гарачую гарбату або каву. Але гэта было рэдка. Антон звычайна піў са старога калодзежа, з якога з цяжкасцю, асабліва ў апошнія дні, даставаў вядро з вадой.

Ён не скардзіўся і не ныў, таму што ўсё ўжо было ў мінулым: і сям'я, і праца, і само жыццё. Толькі востры боль у страўніку прымушаў Антона схамянуцца і думаць пра людзей, іх дапамогу. Але пасля чарговай выпіўкі боль заціхаў, і яму зноў было ўсё роўна. Антон згасаў, задыхаўся, як быццам ішоў на дно з цяжкім каменем на шыі.

Толькі зоркі, на якія па начах у дрымоце, з мутнай свядомасцю глядзеў Антон, пакутуючы ад бяссонніцы і ўсё часцей ад галаўнога болю, падзялялі яго адзіноту і непрыкаянасць. Зорак было шмат, але ўсе яны адчужана віселі ў небе, кожная сама па сабе. І гэтая адчужанасць чымсьці прыцягвала Антона, давала зразумець, што ён не адзін такі самотны, нарэшце, яднала яго з далёкім, незразумелым светам, што набліжаўся да яго, дзе павінна супакоіцца душа Антона і павінен супакоіцца, растварыцца ён сам.

## III

Цела Антона зусім закалела ад холаду. Ён паспрабаваў устаць, але не змог. Так і сядзеў на калодзіне, прыхінуўшыся да выкапанага яшчэ дзедам калодзежа, на дне якога налівaліся чырванаватым святлом адбіткі далёкіх і таямнічых зорак.

Антон на імгненне адкрыў і тут жа закрыў вочы. Ён не мог больш нічога бачыць, але, дзіўная справа, бачыў. Прама, зусім блізка былі нейкія агеньчыкі. Яны то з'яўляліся, то знікалі, пакуль не зліліся разам у невялікі, але яркі агонь. Гэты агонь доўга стаяў у вачах Антона, потым пачаў павольна аддаляцца і, калі амаль знік, раптам зноў успыхнуў зусім блізка, каб асляпіць і знікнуць ужо назаўсёды. І ён знік. І на вочы быццам хтосьці накінуў прасціну.

Менавіта гэтая прывідная прасціна на імгненне разбудзіла памяць Антона, і ён убачыў, што ляжыць на ложку. Убачыў сябе амаль яшчэ дзіцем, трох- ці чатырохгадовым малым, падстрыжаным нагала, з вялікімі блакітнымі і дапытлівымі вачыма. Маленькі Антон ляжаў і слухаў казку, якую расказвала яму маці — Кацярына Пятроўна, яшчэ маладая, круглатварая, са звісаючай уздоўж рукі тоўстай русай касою.

— Жылі-былі стары са старой, — распавядала маці і падобраму ўсміхалася. — Вось стары і просіць: «Спячы мне, старая, калабок». — «А з чаго спячы? — пытаецца старая. — Мукі няма». — «Эх, старая, — не сунімаецца стары, — па свіране памяці, па засеках паскрабі — вось і набярэцца». Старая так і зрабіла. Памяла, паскрэбла і набрала жмені дзве мукі. Замясіла цеста, скруціла калабок, запякла яго на алеі і паклала на акно, каб астыў.

Антон усміхнуўся. Маці пагладзіла яго маленькую галоўку рукой і працягвала расказваць казку.

— Надакучыла калабку ляжаць. Пакаціўся ён з акна на лаву, з лавы на падлогу, з падлогі за дзверы. А там — за вароты і далей...

Дзіўная штука — жыццё. Яно падобнае на казку, а казка падобная на быль, якая і ёсць жыццё.

Нарадзіўся Антон у палескай вёсцы. Рос, гадаваўся ў вялікай сям'і, у якой усе былі сялянамі. І бацькі, і дзяды, і прадзеды. Жыць бы і яму ў сваёй роднай вёсцы, хлеб вырошчваць ды дзяцей на ногі ставіць. Але не захацеў, за лепшай доляй пагнаўся. Усё кінуў і паехаў у горад. Працаваў на будоўлі, служыў у арміі, потым на заводзе рабіў. Неяк незаўважна для сябе ажаніўся, атрымаў кватэру. Нарадзіўся ў яго сын. Спачатку ўсё вельмі добра складвалася. Ды, відаць, перабегла дарогу Антону чорная кошка. Ці то тады, калі з вёскі ад'язджаў, ці то ўжо пазней, калі ў горад перабраўся. Не заладзілася неўзабаве ў сям'і Антона, а потым і на працы справы пайшлі так, што горш няма куды. Асабліва пасля развалу Савецкага Саюза. Антон, як гэта часта бывае, стаў выпіваць. З гадамі ўсё часцей і часцей. З працы яго за гэта выгналі, і жонка знайшла сабе другога. Антон, да таго часу ўжо зусім спіты, з падарваным здароўем, новаму мужу сваёй былой жонкі, з якой незадоўга да гэтага развёўся, не здзівіўся. Моўчкі сабраў у чамадан свае пажыткі, пацалаваў сына і з'ехаў жыць у бацькоўскі дом, які ўжо некалькі гадоў пасля смерці бацькі і маці стаяў без нагляду. Браты і сёстры Антона раз'ехаліся па свеце, і ён у старой хаце стаў і за гаспадара, і за вартаўніка. Піў яшчэ больш. Піў з усімі і адзін, гробячы сваё здароўе. Піў з нагоды і без нагоды. Піў, каб напіцца і, прападзі яно ўсё пропадам, памерці.

Бліжэй да раніцы прывідная прасціна на мутных, пачырванелых вачах Антона стала быццам чарнець. Ён паспрабаваў яшчэ раз адкрыць вочы, але павекі, нібы налітыя свінцом, нават не прыўзняліся.

Антон замярзаў. Калі яго свядомасць на нейкі час вярнулася, ён пачуў размову двух незнаёмцаў, якія праходзілі міма.

— Глядзі, п'яны, ці што?

— Так і замерзнуць можна.

— Не замерзне.

— Давай на ўсялякі выпадак паглядзім, можа, ён ужо таго...

— Ды ну яго, звязвацца.

І яны пайшлі.

Антону было ўсё роўна. Ён быў адзін, зусім адзін. І ад гэтай адзіноты, якая так падштурхоўвала яго сысці з жыцця і больш ні пра што не думаць, а галоўнае — не клапаціцца аб сваім хваравітым, непаслухмяным целе, Антон павольна, вельмі павольна, але мэтанакіравана стаў паварочвацца да калодзежа. І калі ўпёрся грудзьмі ў бетоннае кальцо, то ўзрадаваўся — значыць, жывы яшчэ. Ён нават забыўся, для чаго паварочваўся, але потым успомніў, і жаданне ўтапіцца захапіла яго яшчэ больш, мацней. Яшчэ гадзіну таму непаваротлівая і цяжкая думка ажыла. Антон ужо ні пра што не думаў. Ён зрабіў вялізнае намаганне над сабой, прыўзняўся, пераваліўся цераз застылае бетоннае кальцо і спачатку павольна, а потым усё хутчэй і хутчэй паляцеў уніз, да патанулых зорак, а дакладней, да іх слабых водбліскаў.

Зваліўшыся ў ваду, Антон яшчэ жыў. Задыхаючыся, ён адчуў раптам страх і ўсвядоміў сваё вар’яцтва. Але гэты пробліск яго свядомасці доўжыўся толькі адно імгненне, аб’яднаўшае ў сабе мінулае, сучаснае і будучае.

Імгненне вечнасці.



# ЗВЫЧАЙНАЯ ГІСТОРЫЯ

Нечакана для сябе яна задрамала. І ёй на імгненне здалося, што падае яна з велізарнай вышыні, задыхаючыся ад сустрэчнага халоднага паветра і скаваўшага ўсё яе цела страху. Да зямлі заставалася самая драбніца... Яшчэ трохі, і...

Яна прыйшла да памяці. Але не зусім. Спачатку не зразумела: сон гэта ці праўда. З хвіліну сядзела раздумваючы, нарэшце сцяміла: сон... Проста сёння яна выпіла больш, чым звычайна. Такое, праўда, здаралася рэдка, але ўсё ж здаралася. Цяпер вось зноў...

У бары ўжо амаль нікога не было. Тоўсты чырванатвары бармен збіраў са столікаў шклянкі, талеркі, замасленыя сурвэткі, паперкі ад цукерак.

— Пара ўжо, — заўважыў ён.

«Ды ну цябе», — падумала яна, але нічога не сказала. Яна недалюблівала барменаў і афіцыянтаў. Можа таму, што часта бачыла іх.

Бармен паглядзеў на яе і, нічога не сказаўшы, ухмыльнуўся.

Насупраць, праз два столікі, сядзеў мужчына ў акулярах. Ён абыякава перамешваў саломінкай кактэйль і глядзеў у стол. Адчуўшы яе погляд, падняў галаву. «І вочы іх сустрэліся», — змрочна пажартавала яна пра сябе, знаходзячы, аднак, што мужчына даволі прыгожы з твару.

— Усё! — гучна сказаў бармен. — Выключаю святло. Прашу пакінуць памяшканне.

Яна неахвотна паднялася і, нядбайна кіўнуўшы мужчыну, нібы старому знаёмаму, выйшла з бара.

На вуліцы было ціха. Горад засынаў, і толькі зрэдку сустракаліся закаханыя пары. У душы яна зайздросціла ім і горка крыўдавала на свой лёс. Ёй, незамужняй жанчыне, ужо каля трыццаці...

«Як хутка ляціць час, — думала яна. — Здаецца, нядаўна я была жыццярадасным дзіцем».

У дзяцінстве яна хацела стаць актрысай. Аднойчы нават знялася ў тэлевізійным маламетражным фільме. Але так ужо атрымалася, што стала цырульніцай. Добрай цырульніцай. Яна і валасы сама сабе падстрыгала. Яны ў яе русыя, доўгія, прыгожа акрэсліваюць маленькі кірпаносы твар. Яна ўвогуле ўся маленькая, зграбная, нібы вытачаная. Асабліва прыгожыя ў яе вочы. Трохі вільготныя, сумныя, з аксамітнымі чорнымі вейкамі, яны свецяцца жаноцкасцю і дабрынёй. Праўда, калі яна бывае ў бары, вочы становяцца абыякавымі і не такімі прывабнымі... Успомніўшы пра бар, яна раптам падумала пра таго мужчыну ў акулярах, і ёй захацелася зноў убачыць яго.

Назаўтра яна зноў была ў тым бары. Мужчына сядзеў за тым жа столікам, што і ўчора, і рассеяна памешваў саломінкай кактэйль. «Напэўна, у яго гэта звычка», — адзначыла яна сама сабе. Яна цяпер крадком разглядала гэтага чалавека: сіваватыя скроні, высокі лоб, прамы нос, тонкія вусны...

«Шкада, цёмна, не відаць вачэй. Якія яны ў яго? Карыя, блакітныя... Можа быць, я закахаюся ў яго?.. Хоць навошта гэта?..»

Яна ўсё ніяк не магла забыць свайго мужа, з якім развялася. Дакладней, ён кінуў яе, кінуў, як непатрэбную рэч. Успамі-

наючы пра гэта, яна плакала ад неўладкаванасці і пустэчы свайго жыцця і ўсё часцей прыходзіла сюды...

«Як няўтульна быць нешчаслівай...»

Яна сцялася, быццам сядзела на скразняку і шукала таго, хто абагрэе яе, паглядзела на мужчыну ў акулярах. «І вочы...» Яна спатыкнулася на гэтай сентыментальнай фразе, хоць у душы ў яе не было ніякага пэўнага пачуцця.

Кактэйль яна ў гэты вечар амаль не піла. Зрэшты, ёй і раней не хацелася яго піць. Проста вечарам у сваёй пустой кватэры страшна самотна, халодна, і кожны ўдар насценнага гадзінніка болем адгукаецца ў сэрцы. Але ты нічога не можаш зрабіць: час не спыніш, лёс не пераробіш. Колькі ўжо прайшло такіх дзён і начэй, а яна пасля разводу так нікога і не сустрэла.

«Нічога», — падумала яна і міжволі зноў паглядзела на мужчыну ў акулярах.

Сціскаючы саломінку ў сваіх доўгіх тонкіх пальцах, ён задуменна і, здавалася, невідушча глядзеў скрозь яе. Ад яго абыякавасці ёй раптам захацелася заплакаць. Заплакаць гучна, наўзрыд, каб хоць хто-небудзь пашкадаваў яе, падышоў і, як калісьці ў дзяцінстве, супакойваючы, пагладзіў па галаве. Вочы яе ўзмакрэлі, да горла падкаціў ком. Каб і напраўду не расплакацца, яна ўзняла галаву і, гледзячы на мужчыну ў акулярах, вінавата ўсміхнулася. Мужчына таксама ёй усміхнуўся. І яна зразумела, што глядзіць ён на яе зусім неабыякава, а ўважліва і, мабыць, думае пра яе. Шчокі яе запунсавелі, у роце стала суха...

Яна паднялася і пайшла да стойкі. Бармен лісліва ашчэрыўся:

— Кактэйль, шампанскае?

— Вады, калі ласка...

Яна ўзяла бутэльку мінеральнай і пайшла да свайго століка. Бармен, правёўшы яе змрочным позіркам, пстрыкнуў выключальнікам магнітафона. З дынаміка палілася прыемная меладычная музыка.

Яна паглядзела на мужчыну ў акулярах. Ён адсунуў свой кактэйль, падняўся і з сур'ёзным выглядам накіраваўся ў яе бок.

«Да мяне...»

Ёй зрабілася горача.

— Можна вас? — ён запрашаў яе на танец.

Шклянка ў яе руцэ ледзь прыкметна задрыжала. Яна нетаропка адпіла глыток, паставіла мінералку на столік і, яшчэ не верачы таму, ціха вымавіла:

— Можна...

Яны танцавалі адны на маленькім пятачку, вольным ад столікаў. Ён асцярожна прыціскаў яе да сябе, і яна не пярэчыла: ёй было прыемна. Калі музыка скончылася, ён, падзякаваўшы, нясмела спытаў:

— А можна, я правяду вас дадому?

Яна дапытліва і ў той жа час спалохана паглядзела ў яго ледзь раскосыя, прыкрытыя тоўстымі шкельцамі акуляраў вочы, імкнучыся зразумець яго намеры.

— Я толькі правяду, правяду дадому, — паспешліва сказаў мужчына, палохаючыся, што яго не так зразумеюць.

— Толькі дадому, — падкрэсліла яна з палёгкай і, пазней, ужо з некаторай доляй какецтва, дадала: — Я жыву не блізка...

Яна зноў, як калісьці раней, адчула ў сабе тое, што падымаецца над крыўдай і мітуснёй, — годнасць жанчыны, якая можа кахаць і быць каханай.

## МАСТАК

За акном ноч.

Па затоптаным дыване, над якім, падымаючыся да столі, сцелецца гаркаваты цыгарэтны дым, лянів і мякка ступае велізарная пухнатая котка. Раз-пораз спыняючыся, яна неахвотна, хутчэй па звычцы, азірае невялікі напаўцёмны пакой. У вачах коткі, вялікіх, зялёных, з дробнымі чорнымі адмецінамі, якія чымсьці нагадваюць водарасці пад марской вадой, то ярка, то цьмяна адлюстроўваецца свет мастака: яго жыццё, творчасць, рэальнасць, ілюзіі...

Мастак спіць. Пад яго доўгім і худым целам, апранутым у паношаныя джынсы і кашулю ў клетку, старая зашмальцаваная канапа, засланая мятым пледам, прагінаецца і глуха паскрыпвае. Гэтак жа глуха, з прысвістам, храпе яе гаспадар.

Котка жмурыцца, падыходзіць да канапы, нюхае недапітае віно ў бакале і пакрыўджана адварочваецца. Пастаяўшы з хвіліну, глядзіць на ўключаны шыпячы тэлевізар, пераводзіць погляд на столік з недаедзенай вячэрай. Глядзіць доўга, пільна.

Мастак варочаецца. Яму сніцца стары заснежаны гарадскі парк, пасярод якога ўзвышаецца велізарная ў сваім дыяметры клумба. Яна гэтак жа, як і ўсё вакол, засыпана снегам. Нешта дзіўнае і незразумелае на першы погляд прыцягвае да сябе ўвагу мастака. Ён прыглядаецца і бачыць, як з-пад снегу растуць ружы. Непадобныя да звычайных, яны неяк ненатуральна гнуцца да зямлі, быццам ім боязна і страшна глядзець на гэты свет. Прыгледзеўшыся яшчэ больш уважліва, мастак бачыць, што ў руж пачарнелі пялёсткі. Яны нежывыя. І толькі дрыготкія лісточкі яшчэ жывыя, але і яны ад халоднага ветру, здаецца, марнеюць...

«Гэта наша жыццё», — здагадваецца мастак.

Котка раптам рашуча і спрытна скача на столік, хапае кавалачак каўбасы, тут жа саскоквае, перакульваючы хвастом недапітую бутэльку віна. Бутэлька падае і са звонам скочваецца на падлогу.

Мастак прачынаецца, здзіўлена падымае галаву і доўга не можа зразумець, дзе ён і што з ім. Нарэшце садзіцца, апусціўшы босыя ногі на пабляклы дыван, уключае начнік. Жоўтае святло імгненна выхоплівае з кута карціну, на якой акуратна выпісана аблічча Хрыста. За галавой Збавіцеля такое ж жоўтае, але больш яркае святло. Святло ад начніка і ззянне за галавой Хрыста ствараюць адчуванне чагосьці жывога і звышнатуральнага, што пранікае ў душу, прымушае яе на імгненне пакінуць тленнае чалавечае цела, вылецець з пракуранага пакоя на волю. Туды, дзе заўсёды ясна і спакойна.

Мастак доўга глядзіць на сваю карціну, дакладней, на гэтае цудоўнае ззянне, што нечакана прыадчыніла яму нейкую таямніцу, якую ён ведаў у дзяцінстве, але забыўся. А на мастака журботна і задуменна глядзіць Збавіцель. На твар Яго кладзецца цень, злёгку змазваючы ўжо праступаючыя

маршчынкі, хаваючы страшную стомленасць. Але нават скрозь цень пранізліва і востра глядзяць вочы Хрыста. Вялікія, выразныя, яны, здаецца, бачаць усё і ўся: мінулае, сучаснасць і будучыню. Але разам з тым у іх спачуванне і дабрыня.

Не, нельга перадаць гэты погляд...

Мастак зноў задрамаў. Котка, з'еўшы кавалачак каўбасы, асцярожна ўвайшла ў залу і стала лісліва і вінавата церціся аб босыя ногі свайго гаспадара. Гэтыя лёгкія, але разам з тым настойлівыя дотыкі абудзілі мастака. Ён абвёў позіркам пакой, на сценах якога ў беспарадку віселі яго карціны. Быццам бы зразумелыя, свае і ў той жа час як бы чужыя, яны апавядалі пра пакутлівыя пошукі ісціны. На адных карцінах былі намаляваны запамінальныя, выразныя чалавечыя твары, акружаныя павуцінкай незразумелых ліній, таямнічымі знакамі, старажытнымі сімваламі. На іншых — сіратлівыя, нераспушчаныя кветкі пры далёкіх, сыходзячых у неба дарогах. На трэціх — ілюзорны, фантастычны свет з халоднымі зоркамі і плаваючымі чалавечымі галовамі. Большасць гэтых карцін жылі сваім, толькі ім зразумелым жыццём, у якое не пускалі нават свайго стваральніка.

Мастак пацягнуўся да бакала віна, выпіў і зноў задрамаў. Котка, бачачы, што на яе дотыкі гаспадар не рэагуе, пакрыўджана ўляглася побач і ўтаропілася ў ледзь святлеючае, занавешанае акно. Вочы яе гарэлі, і калі б у гэтую хвіліну хто-небудзь паглядзеў у іх, то ўбачыў бы, як скрозь няшчырую пакорлівасць праступае нешта хітрае і страшнае.

Мастак ужо спаў. А вакол яго кружыліся шматаблічныя вобразы многіх карцін. Тых, што былі ў пакоі, і тых, якія даўно віселі ў музеях і прыватных калекцыях. У гэтым усё набіраючым тэмп кружэнні было нешта абуральнае і сатанінскае. І толькі Хрыстос заставаўся спакойным і маўклівым.

Калі пад раніцу мастак, прагнаўшы рэшткі сну, увайшоў у ванную, паглядзеў на свой нявыспаны твар з мяшкамі пад вачыма, ускудлачанай барадой, то адразу і не пазнаў сябе. З хвіліну ён дапытліва вывучаў свой вобраз і толькі потым,

правёўшы далонню па ўзлахмачаным стрыжаным чубе, ледзь прыкметна ўсміхнуўся. Не, гэта ён, самотны і вар'яцкі геній.

## ПАЎСОН

Мне здавалася, што я спаў. Але не, гэта было не так. Менавіта таму я чуў, як гудзела абуджаная цяплом муха, як патрэсквалі дагараючыя ў печы дровы, адчуваў стары мяккі правісаючы матрац, ад якога ныла спіна, калюча аддавалася ў каленях і потым павольна, неахвотна адпускала.

Муха гудзела манатонна і доўга, патрэскванне ж дроў сціхла. І ад гэтага мне чамусьці стала так няўтульна, самотна, нават балюча, што захацелася памерці. Менавіта памерці.

У сутнасці, што такое смерць? І ці можна гэта назваць смерцю ў тым нашым разуменні, ад якога становіцца страшна, жудасна і хочацца бегчы? Бегчы далей. Бегчы спатыкаючыся, падаючы, устаючы, але хутчэй і хутчэй. Ці варта?

Мы чапляемся за жыццё нават у падзенні, у сконе, у апошнім уздыху, не разумеючы і не жадаючы зразумець, што наша існаванне ў гэтым свеце — гэта пакута, якая выяўляецца ў бяссіллі перад часам, прасторай, хваробамі, старасцю і, нарэшце, смерцю. Так, смерцю. Яна прысутнічае ўсюды. Нябачна, таемна, неадрыўна ад кожнага. Назірае за намі і бязгучна смяецца, чакаючы сваёй чарговай перамогі. Смяецца над намі ў нашым жа жыцці.

Мяне перасмыкнула ад крыўды і агіды.

Не, мне не патрэбна жыццё з пастаяннай прысутнасцю смерці. Не будзе жыцця — не будзе і смерці. Мімаволі, пад уздзеяннем гэтых змрочных думак, я усклікнуў: «Госпадзі, прышлі за мной смерць!..»

Творца, на здзіўленне, пачуў мяне. Я тут жа стаў павольна падымацца над сваім ложкам усё вышэй і вышэй. Дакрануўся да заседжанай мухамі люстры, столі, быццам прывід прайшоў скрозь яе. Некаторы час павісеў на гарышчы, разглядаючы непатрэбныя закінутыя рэчы, і раптам, з сілай прабіўшы дах, узнёс-

ся над усім светам. Гэта было так хутка, рэзка і ў нейкі момант асляпляльна, што я закрыў на хвіліну вочы. А калі адкрыў, то ўбачыў пад месяцовым халаднаватым, але пяшчотным святлом добра знаёмую маленькую вёсачку з рэдкімі агеньчыкамі. Наводшыбе стаяў мой невялікі, але ўтульны дачны домік. Ад яго міма да крыўднага маленькай градкі рассцілаўся полаг дрыготкай, пажоўклай леташняй травы, якая спускалася да драўлянага мастка ў выгібе ракі. Прама пад мастком мірна спалі гусі.

Мне ўсяго гэтага чамусьці стала шкада. Так шкада, што захацелася аж заплакаць. Толькі мне гэтага захацелася, як нехта ўверсе цяжка ўздыхнуў і я ў тое ж імгненне каменем упаў на свой стары ложак. І зноў пачуў гудзенне мухі, адчуў ныючы і жорстка гуляўшы па ўсім хрыбетніку боль. Павярнуўшы да ледзь святлеючага акна галаву, відаць нязграбна, закашляўся. Знутры тут жа вырваліся хрыпы і падступіла салёная, непрыемная сліна. «Дрэнь!» — вылаяўся я. Нехаця ўстаў, выглянуў у акно. За ім было цёмна, але ўсё ж я разгледзеў завялую, прыбітую да яшчэ халоднай зямлі траву, раку, якая спакойна і бязгучна несла сваю ваду, надакучлівых і крыклівых гусей, што зноў прыбіліся да майго ўчастка.

Усё было звычайна, будзённа і неяк паныла.

Свет спаў. А дакладней паўспаў. Але нават у гэтым паўсне ён жыў поўным і вялікім жыццём, якое неспасціжна змянялася на вачах. Росная трава павольна бялела і яшчэ больш гнулася да зямлі ад цяжару мірыяды ільдзінак, якія перад раніцай пачыналі раставаць. Над ёй утвараўся вільготны, падобны на вялізныя і празрыстыя гусіныя пёры туман, які ўздымаўся да ўсё больш і больш святлеючага неба. Гэта сыходзіла надакучлівая зіма, і наступала хоць і ранняя, але доўгачаканая вясна.

Ужо пад цёплай коўдрай я зноў падумаў пра смерць, але ўжо не захацеў яе прыходу, не...

## БОЛЬ ДУШЫ

У жыцці праходзіць усё. Але застаецца памяць. Яна стукаецца ў душу, абуджае думкі, плача аб мінулым.

І я ўспамінаю.

Хата наводшыбе, сад, крапіва ля плота. Я яшчэ сплю, а ўжо адчуваю пах мёду і свежага сырадою. Чую голас бабкі: «Цішэй, стары!..» Дзед, накурыўшыся, прыглушана і вінавата кашляе. Мне становіцца шкада яго. Я ўстаю, выбягаю на ганак і доўга гляджу, як з-за саду выкочваецца жаўтлява-чырвонае, падобнае на велізарны спелы шыпшыннік сонца. Яго святло пазалочвае лісце дрэў, гуляе на пераспелых вішнях, іскрамі рассыпаецца па расе.

— Унучак! — кліча бабка.

Я быццам не чую: стаю і захоплена гляджу на ганарлівы сланечнік, засохлую цыбулю, белалобага шчанюка, які гуляе з канцом вяроўкі, што вісіць на плоце...

На жаль, час бязлітасны. У мяне ўжо няма бабкі з дзедам. Зусім пакасілася іхняя хата. Высыхае некалі квітнеючы сад. Засталася ад старых памяць ды Біблія, гледзячы на якую чую пабожны голас бабкі: «Трэці анёл затрубіў, і ўпала з неба вялікая зорка, палаючы, нібы светач, і ўпала на траціну рэк і крыніцы водаў. Імя гэтай зорцы палын; і траціна ўсіх водаў зрабілася палыном, і многія людзі памерлі ад водаў, бо яны прагорклі...»

Памяць не зыходзіць, не пакідае. Яе не хочаш, не прымаеш, яе праганяеш, а яна ўсё роўна прыходзіць.

І мне зноў прыгадваецца.

Паводка. На многія-многія кіламетры вакол разліліся адталыя воды. У іх густой сіні весела плёскаюцца мірыяды сонцаў. Яны гулліва кружаць вакол дрэў і кустоў, на галінках якіх распускаюцца зялёныя, жоўтыя, барвова-карычневыя пупышкі. Толькі-толькі з'явіўшыся, яны з пяшчотай аддаюцца ў абдымкі кожнаму цёпламу дыханню ветрыку, радуючыся, што нарадзіліся і жывуць на гэтым свеце.

Вясновыя воды супакойваюць і надаюць сілы. Толькі ля закрытага шлюза, дзе ляжыць бруднавата-чырвоная куча ядахімікатаў, неяк пустэльна і няўтульна, не відаць зеляніны. З вады тырчыць самотны счарнелы камель ці то асіны, ці то алешыны ды плавае вялікі дохлы лінь, выставіўшы дагары набухлы гнілы жывот — нямое, жалобнае сведчанне бяды.

Густая сінь вясновых вод павольна афарбоўваецца тут у колер ржавага жалеза...

Памяць пастаянная, як свет. Яна ўнутры мяне. Яна вакол.

І я ў каторы раз успамінаю.

Поле. Неабсяжнае поле. Яно сыходзіць за гарызонт і недзе там, далёка-далёка, як быццам зліваецца з небам. Поле толькі што ўзарана. Зямля на ім чорная, пахне свежай пожняй. Па нізінах сцелецца пар. Гляджу на яго, і мне здаецца, што поле дыхае. Яно — жывое!

— Э-ге-гей! — радасна крычу я, заглушаючы птушыны гоман.

За мной назірае бацька. Задаволены, ён усміхаецца, заўважае:

— Добра на полі, прасторна.

— Добра, — згаджаюся.

— Шкада, што многія не бачаць гэтай прыгажосці, з’язджаюць у гарады, — працягвае як бы між іншым бацька. — Адвыкаюць ад нашых сельскіх клопатаў, забываюць свае карані. А чалавек без каранёў, што трэска на вадзе. Куды вецер, туды і плыве. Так вось...

— Я не паеду, — упэўнена кажу.

Бацька сумнеўна ківае галавой, доўга маўчыць, цяжка ўздыхае...

Памяць пераследуе мяне днём і падымае сярод ночы. У прастору цемры яна раптам урываецца імклівай зоркай, а ў празрыстасць святла ўваходзіць чорнай хмарай.

І я зноў успамінаю.

Лес. Апошні зімовы дзень. Ён кісне, слязіцца. Ад радасці, узляцеўшы на самую высокую сасну, спявае бойкая сініца. Унізе, на старым пні, спрабуе свой картавы голас варона. Доўга, раскрыўшы веерам featured рознакаляровы хвост, ходзіць глушэц па паляне, малюючы на снезе апушчанымі пругкімі крыламі мудрагелістыя ўзоры.

З-за кустоў я ўважліва сачу за глушцом і, калі ён спыняецца, насцярожваецца, спускаю курок двухстволкі. У імгненне цішыня рассыпаецца. Глушэц недарэчна падскоквае і падае на бок, крывавячы і без таго мокры снег...

Неўзабаве цямнее. На змрочным небе з'яўляецца бледны месяц. Здаецца, што ён глядзіць на зямлю з перавернутага глыбокага калодзежа. Паступова месяц жоўкне, наліваецца вадзяністай чырванню і становіцца падобным на чыёсьці злавеснае вока. Становіцца страшна. Я паскараю крок: «Дадому, дадому...»

У нейкае імгненне азіраюся. Крывавы погляд далёкага і халоднага месяца смяецца і як быццам кажа: «Ад лёсу не сыдзеш». Я гляджу на гадзіннік. Стрэлка паказвае за поўнач. Надыходзіць вясна 1986 года, вясна, павенчаная з Чарнобылем.

Набліжаецца тупы, непраходны боль маёй душы...

## ПАРТРЭТ НА ВЯСЕЛЛІ

Вяселле, як і звычайна ў вёсцы, гуляла шырока і адкрыта. Шматлікія госці раз-пораз падхоплівалі: «Горка!» Маладыя — ён і яна рослыя, дужыя — стомлена і шчасліва ўсміхаліся ў пацалунку.

— Глядзі ты, смачна, — даволі ўсміхаўся ў густыя абвіслыя вусы і галоўны сват — дзядзька жаніха. Ён пляскаў па плячы вялікалобага дурнаватага хлопца-фатографа з раённага гарадка. — Здымі, брат, на памяць.

Хлопец падхопліваўся, рабіў два-тры кадры і зноў сядаў за стол: яму было сумна. Ён бы, напэўна, так і прасядзеў усю імпрэзу, калі б не мілавідная блакітнавокая дзяўчына, якая сядзела за сталом насупраць і ўпотай паглядала на прыезджага маладога фатографа. Калі аб'явілі «жаночы» танец, яна падышла да хлопца:

— Можна вас?

— Можна, але я дрэнна танцую, — сумеўся той.

— Тады сфатаграфуйце, — знайшлася дзяўчына.

— Добра, — узрадаваўся фатограф.

Яны выйшлі на двор. Дзяўчына села на лаўку пад яблыняй, галіны якой гнуліся пад цяжарам чырвоных сакавітых пладоў.

— Я гатовая.

Хлопец адышоў, доўга і старанна наводзіў рэзкасць старэнькага «Кіева», на якім ледзь прыкметна бялеў выгравіяваны надпіс: «Свет выдатны». А дзяўчына, юная і велічная, пільна глядзела на фатографа. На яе пухлых вуснах гуляла загадкавая ўсмешка, а ў выразных добрых вачах было столькі пранікнёнай сілы, што, здавалася, яна ўжо бачыла і свой лёс, і лёс гэтага хлопца.

Нарэшце пачулася знаёмая пстрычка фотаапарата.

— Усё гатова...

Нейкае імгненне яны глядзелі адно на аднаго, адкрываючы для сябе яшчэ невядомую, але ўжо злучаючую іх таямніцу. Потым некалькі скавана, але ахвотна і доўга танчылі. Фотаапарат жа сіратліва ляжаў каля свата, паблісквaючы выгравіраваным надпісам. Хацелася падысці і дадаць да гэтага радка яшчэ некалькі слоў, каб гучалі яны так: «Свет выдатны, таму што жыве ў ім Каханне».

# ЗМЕСТ


Аповесці

Пра што іграе піяніст . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Падаў снег . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 53

Апавяданні

Помста . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 120

Чаканне жанчыны . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 147

Імгненне вечнасці . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 172

Звычайная гісторыя . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 179

Мастак . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 182

Паўсон . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 185

Боль душы . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 186

Партрэт на вяселлі . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 189

Літаратурна-мастацкае выданне

**Разановіч** Анатоль Іванавіч

**ПРА ШТО ІГРАЕ ПІЯНІСТ**

*Аповесці, апавяданні*

Рэдактар *Л. У. Сідарава*
Мастацкі рэдактар *Н. Р. Агародная*
Тэхнічны рэдактар *А. Р. Праватарава*
Карэктары *В. І. Смірнова, А. Д. Даўгушова*

16+ Падпісана да друку 25.10.2019. Фармат $60 \times 90^{1}/_{16}$.
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 12,0. Ул.-выд. арк. 9,1. Тыраж 800 экз. Заказ 1729.

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 ад 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
Надрукавана: Філіял № 1 ААТ «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Вул. Савецкая, 80, Баранавічы, 225409.
www.poligraph.by; e-mail: sales@poligraph.by



**АНАТОЛЬ**
**ІВАНАВІЧ**
**РАЗАНОВІЧ**

Журналіст, пісьменнік.
Нарадзіўся і вырас на Брэстчыне.
Скончыў факультэт журналістыкі БДУ
і Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.
Аўтар шматлікіх мастацкіх і публіцыстычных твораў.
Сярод іх: «Воўчае жыццё», «Зразуменне ісціны»,
«Я размаўляю з іншапланецянамі», «Пустэльнік»,
«Варшаўскі экспрэс», «Палын-вада» і іншыя.

ISBN 978-985-01-1333-7

АНАТОЛЬ РАЗАНОВІЧ

# ПРА ШТО ІГРАЕ ПІЯНІСТ